НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

ПАЎСТАННЕ 1863–1864 гг. у ПОЛЬШЧЫ, БЕЛАРУСІ, ЛІТВЕ і УКРАІНЕ:

гісторыя і памяць

Зборнік навуковых артыкулаў

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

ПАЎСТАННЕ 1863–1864 гг. у ПОЛЬШЧЫ, БЕЛАРУСІ, ЛІТВЕ і УКРАІНЕ: гісторыя і памяць

Зборнік навуковых артыкулаў

Мінск
«Беларуская навука»
2014

УДК 94(438+476+474.5+477)«1863/1864»(082)
ББК 63.3(4)5Я43
П21

Укладальнікі:

В. В. Яноўская, А. У. Унучак, А. Э. Фірыновіч

Рэдакцыйная калегія:

А. А. Каваленя (старшыня), В. В. Даніловіч, М. П. Касцюк, В. Л. Лакіза, А. П. Салаўянаў, А. У. Унучак, А. Э. Фірыновіч, В. В. Яноўская

Рэцэнзенты:

доктар гістарычных навук, прафесар А. М. Літвін,
доктар гістарычных навук, прафесар А. М. Люты

Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі, Літве
П21 і Украіне : гісторыя і памяць : зб. навук. арт. / уклад. : В. В. Яноўская, А. У. Унучак, А. Э. Фірыновіч; рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 427, [18] с. : іл.
ISBN 978-985-08-1737-2.

У зборнік увайшлі навуковыя артыкулы па актуальнай навуковай праблеме «Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі, Літве і Украіне», якія дэманструюць розныя падыходы ў беларускай, расійскай і ўкраінскай гістарыяграфіях. Тэматычнае кола пытанняў, пастаўленых аўтарамі, ахоплівае самыя розныя бакі паўстання: баявыя дзеянні, мерапрыемствы расійскай адміністрацыі, пакаранні і амністыі паўстанцаў, удзел у падзеях розных сацыяльных груп.

Адрасаваны не толькі даследчыкам, але ўсім, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

УДК 94(438+476+474.5+477)«1863/1864»(082)
ББК 63.3(4)5Я43

ISBN 978-985-08-1737-2

© Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2014
© Афармленне. РУП«Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2014

АД РЭДАКЦЫЙНАЙ КАЛЕГІІ

Прайшло 150 год з пачатку паўстання 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі, Літве і Украіне, але да гэтага часу не сціхаюць спрэчкі і не знікае цікавасць да гэтай падзеі. Ва ўмовах развалу навуковай прасторы савецкіх часоў, якая дэманстравала практычна адзінадушныя канцэпцыі на тым ці іншым адрэзку часу, сучасныя гістарыяграфічныя падыходы навукоўцаў былых савецкіх рэспублік, а зараз незалежных дзяржаў розняцца не толькі своеасаблівым выкладаннем падзей, ацэнкамі паўстання, але і тэрміналогіяй. Калі расійская гістарыяграфія па-ранейшаму называе гэтае паўстанне «польскім», украінская дыпламатычна вагаецца, спасылаючыся на недастатковую вывучанасць праблемы, то беларуская дэманструе шырэйшы дыяпазон – ад прызнання гэтай падзеі лёсавызначальнай для гісторыі беларускай нацыі і дзяржаўнасці да цалкам негатыўнай яе ацэнкі – як занесенай звонку. У нейкай ступені гэта было прадэманстравана і падчас канферэнцыі, што адбылася ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, матэрыялы якой пакладзены ў аснову гэтага зборніка.

Тым больш прыемна адзначыць, што акадэмічныя гісторыкі, пачынаючы з першага дырэктара Інстытута У. Ігнатоўскага, «заклалі беларускую канцэптуальную парадыгму ў вывучэнні гісторыі паўстання 1863–1864 гг.: падзеі паўстання разглядаліся імі ў агульным кантэксце барацьбы за беларускую дзяржаўнасць у XIX – пачатку XX ст.». Гэтыя словы дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі В. В. Даніловіча былі пацверджаны аналізам найноўшай беларускай гістарыяграфіі акадэміка М. П. Касцюка. Абсалютная большасць беларускіх гісторыкаў,

спецыялістаў па гісторыі паўстання 1863–1864 гг., адназначна ацэньвалі і ацэньваюць яго як важную вяху ў змаганні за беларускую дзяржаўнасць, асабліва падкрэсліваючы выдатную ролю ў гэтым кіраўніка паўстання – Кастуся Каліноўскага (1838–1864). Адметная пазіцыя прадэманстравана кандыдатам гістарычных навук, галоўным рэдактарам часопіса «Беларуская думка» В. Ф. Гігіным. Аўтар паставіў пад сумненне вызначэнне спадчыны К. Каліноўскага як помніка беларускай грамадска-палітычнай і філасофскай думкі, назваўшы яго ідэйную спадчыну прапагандысцкай. Гэтыя разыходжанні паказваюць наяўнасць розных думак у беларускай гістарыяграфіі на сучасным этапе і выклікаюць неабходнасць больш дасканалага і глыбокага вывучэння праблемы.

Пазіцыя ўкраінскай гістарыяграфіі прадстаўлена ў артыкуле доктара гістарычных навук, прафесара В. С. Шандры. Яна паказала, што хаця ва Украіне паўстанне 1863–1864 гг. слаба вывучана, але відавочна, што менавіта гэтыя падзеі падштурхнулі прадстаўнікоў адукаваных пластоў насельніцтва, якія былі моцна паланізаваны, звярнуцца да ўкраінскасці. Расійскі даследчык М. В. Падпратаў, доктар гістарычных навук, загадчык кафедры Пермскага дзяржаўнага нацыянальнага даследчага ўніверсітэта, звярнуў увагу на тое, што ў апошнія гады ў расійскай гістарыяграфіі выкарыстоўваюцца звесткі, што сярод ссыльных паўстанцаў былі і выхадцы з беларуска-літоўскіх губерняў.

Зборнік структурна падзяляецца на тры часткі: 1) *Гістарыяграфічны вобраз паўстання, яго дакументальная база і выбітныя асобы падзей 1863–1864 гг.;* 2) *Палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і нацыянальна-культурныя аспекты паўстання 1863–1864 гг.*; 3) *Вынікі і наступствы паўстання 1863–1864 гг.* Унутры частак рубрыкацыя складзена паводле прозвішчаў аўтараў, пададзеных у алфавітным парадку.

Навуковыя артыкулы даюць магчымасць выявіць розныя падыходы ў беларускай, расійскай і ўкраінскай гістарыяграфіях да паўстання 1863–1864 гг. Разам з тым выказана шмат цікавых думак, заснаваных на выніках навуковых даследаванняў. Так, канстатуецца, што да гэтага часу фактычна адсутнічае цэлас-

ная і дэталёвая рэканструкцыя падзей паўстання 1863–1864 гг. з прыцягненнем масіву беларускага матэрыялу. Заслугоўвае ўвагі думка аб тым, што перш чым весці прадметную навуковую дыскусію пра паўстанне, даследчыкам трэба выпрацаваць тэрміналогію, навуковую лексіку, якой яны карыстаюцца, і прыйсці да аднолькавага разумення яе зместу. Пры вывучэнні гістарыяграфіі паўстання вельмі важна звяртаць адмысловую ўвагу на палітычны і культурны кантэкст, у якім яна стваралася.

Тэматыка навуковых артыкулаў, дыскусіі, што разгарнулася па асобных аспектах азначанай праблемы падчас канферэнцыі, дазваляе сцвярджаць, што сацыяльная і нацыянальная (у тым ліку і канфесійная) база паўстання 1863–1864 гг. была значна шырэйшай, чым прынята лічыць у гістарыяграфіі. А паглыбленне ў канкрэтныя аспекты праблемы дае магчымасць не толькі рэканструяваць гістарычныя падзеі 1863–1864 гг. у беларуска-літоўскіх губернях, але і выявіць рэгіянальную спецыфіку, унікальнасць паўстання і яго наступстваў для беларускіх зямель у параўнанні з Царствам Польскім і іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі.

У зборніку дэманструецца шмат падыходаў у асвятленні гісторыі паўстання, шматлікасць аспектаў. І – шмат разыходжанняў. Рэдакцыйная калегія не ставіла перад сабой задачу прывесці ўсе прадстаўленыя матэрыялы да роўніцы і з вялікай павагай паставілася да розных, няхай сабе і супрацьлеглых, пунктаў погляду. Усе канцэптуальныя падыходы аўтараў былі захаваны, як і аўтарская тэрміналогія ў ацэнках паўстанцкага руху на тэрыторыі Польшчы, Беларусі, Літвы і Украіны, у тым ліку і тая, якой рэдакцыйная калегія не прытрымліваецца.

Падсумоўваючы, можна сцвярджаць, што ўсебаковае вывучэнне гісторыі паўстання 1863–1864 гг. магчыма толькі супольнымі намаганнямі даследчыкаў з розных краін і з выкарыстаннем усяго комплексу архіўных дакументаў. Таму выданне зборніка навуковых артыкулаў павінна стаць яшчэ адным крокам для дасягнення мэты дэталёвай і аб'ектыўнай рэканструкцыі гісторыі паўстання 1863–1864 гг. і вызначэння яго ўплыву на нацыя- і дзяржаватворчыя працэсы ва Усходняй Еўропе.

ПРЫВІТАЛЬНАЕ СЛОВА ДЫРЭКТАРА ІНСТЫТУТА ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ ВЯЧАСЛАВА ВІКТАРАВІЧА ДАНІЛОВІЧА НА МІЖНАРОДНАЙ НАВУКОВАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ «ПАЎСТАННЕ 1863–1864 гг. У ПОЛЬШЧЫ, БЕЛАРУСІ, ЛІТВЕ І УКРАІНЕ: ГІСТОРЫЯ І ПАМЯЦЬ» (МІНСК, 17 КАСТРЫЧНІКА 2013 г.)

Так склалася, што лёс гістарычных падзей падобны да лёсу пэўнага чалавека. У адным выпадку, ён роўны і просты, у другім – мудрагелісты і заблытаны. Адна падзея як экстраверт – цалкам адкрытая свету, другая нагадвае інтраверта, заглыбленага ўнутр сябе самога. Прыкладам апошняга ў гісторыі Беларусі XIX ст. выступае паўстанне 1863–1864 гг., якое да сённяшнага дня не раскрыла нашчадкам усіх сваіх сакрэтаў. Тым не менш даследчыкі розных эпох і розных краін старанна імкнуліся і імкнуцца пранікнуць у таямніцы падзей 1863–1864 гг. Не з'яўляецца выключэннем і Інстытут гісторыі НАН Беларусі.

Упершыню праблема паўстання ў праектах навукова-даследчай дзейнасці беларускай акадэмічнай навукі паўстала ў 1920-я гг., яшчэ ў часы Інбелкульта. Перспектыўны план секцыі польскага аддзела гістарычнай камісіі Інбелкульта на 1925–1929-я гг. прадугледжваў працу па выяўленні, камплектацыі і сістэма-тызацыі крыніц па гісторыі паўстання ў Беларусі. Планавалася выданне зборніка дакументальнай спадчыны «Год 1863 на Беларусі». Збор матэрыялаў меркавалася ажыццяўляць па губернях: на Мінскую адводзіліся 1925–1926; Віцебскую – 1926–1927; Магілёўскую – 1927–1928; Смаленскую – 1928–1929 гг. Праўда, вырашыць пастаўленыя задачы ўдалося толькі част-

кова. Быў апублікаваны адзін зборнік з планаваных чатырох. Ён выйшаў у 1927 г. пад назвай «1863 год на Міншчыне». Унікальнасць уведзенага ў навуковы ўжытак дакументальнага комплексу заключалася ў сістэматызацыі крыніц паводле тэрытарыяльнага прынцыпу, навізне іх інфармацыйнага патэнцыялу, які датычыўся непасрэдна беларускай тэрыторыі. Прадстаўнікі маладой беларускай гістарычнай навукі (Ян Віткоўскі, Усевалад Ігнатоўскі, Іван Цвікевіч і інш.) заклалі беларускую канцэптуальную парадыгму ў вывучэнні гісторыі паўстання 1863–1864 гг.: падзеі паўстання разглядаліся імі ў агульным кантэксце барацьбы за беларускую дзяржаўнасць у XIX – пачатку XX ст.

Напрацоўкі 1920-х гг. былі значныя не толькі ў канцэптуальным плане. Гісторык Я. Віткоўскі стварыў калекцыю копій выяўленых у архіве Інбелкульта матэрыялаў. Дзякуючы яго знаходкам, у 1928 г. у працы Самуіла Агурскага «Очерки по истории революционного движения в Белоруссии (1863–1917)» упершыню былі апублікаваныя лацінкай усе 7 нумароў «Мужыцкай праўды». Па словах С. Агурскага, ён скарыстаў копіі, якія зрабіў Я. Віткоўскі з арыгіналаў, што знаходзіліся ў справе № 230 пад назвай «О возмутительных воззваниях» фонда III аддзялення былога Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Масквы.

Аб тым, што паўстанне 1863–1864 гг. у адзначаны перыяд займала адно з цэнтральных месцаў у даследаваннях беларускіх гісторыкаў, сведчыць актыўная публікацыйная дзейнасць супрацоўнікаў Інстытута. У 1930 г. выйшла грунтоўная праца У. Ігнатоўскага «1863 год на Беларусі. Нарыс падзей»; а ў 1931 г. – манаграфія Я. Віткоўскага «Паўстаньне 1863 году і расійскі рэвалюцыйны рух пачатку 1860 гадоў (Спроба параўнаньня праграм і дзейнасьці паводле падпольных выданьняў)».

Любое тагачаснае тэматычнае выданне не заставалася па-за ўвагай Інстытута. Так, у лютым 1929 г. на пасяджэнні Прэзідыума камісіі па гісторыі Беларусі XIX–XX стст. абмяркоўвалася манаграфія Сяргея Цытовіча «Падзеі паўстаньня 1863 г. у Горы-Горках». Праца атрымала станоўчыя водгукі. Неаднаразова на пасяджэннях адзначанай камісіі праводзіліся чытанні навуко-

вых дакладаў. Уласна, у сакавіку 1929 г. перад калегамі выступіў У. Ігнатоўскі з дакладам на тэму «Пастаноўка пытаньня аб паўстаньні 1863 г.».

На жаль, трагічныя абставіны наступнага дзесяцігоддзя (1930–1940-я гг.) прыпынілі навуковую дзейнасць у гэтым накірунку – да тэмы паўстання супрацоўнікі Інстытута гісторыі АН БССР вярнуліся толькі пасля 1945 г., і гэты зварот быў звязаны з імем кіраўніка паўстання ў Беларусі і Літве К. Каліноўскага. У жніўні 1945 г. Вучоны савет Інстытута гісторыі разглядаў спіс дакладаў на сесію Акадэміі навук БССР, якая павінна была адбыцца ў верасні гэтага ж года ў Мінску. Для зачытвання быў вылучаны даклад сапраўднага члена АН Уладзіміра Перцава «Кастусь Каліноўскі».

У 40–50-я гг. XX ст. распрацоўвалася серыя «Замечательные люди Белоруссии» («Выдающиеся люди Белорусской земли») у 5 кнігах. У ліку выдатных і знакамітых асобаў быў і К. Каліноўскі, нарыс пра якога рыхтаваў У. Перцаў.

У 1950-я гг. калектыў Інстытута гісторыі плённа працаваў над выданнем двухтомнай гісторыі БССР. Сёмы раздзел першага тома «Развитие капитализма в Белоруссии во 2-й половине XIX в. и формирование рабочего класса» ўключаў главу пад назвай «Восстание 1863 г.» пад аўтарствам Уладзіміра Перцава і Дзяніса Дудкова (тэкст быў напісаны яшчэ да смерці Д. Дудкова ў 1948 г., у друк рыхтаваўся У. Перцавым). Праца спарадзіла новую канцэпцыю асвятлення падзей 1863–1864 гг., якая кардынальна рознілася ад ідэйных установак 1920-х гг. Яна суадносілася з вядучымі пастулатамі марксісцка-ленінскай метадалогіі, дзе 1863–1864 гг. разглядаліся як «класавая барацьба сялян супраць паноў» у межах сумесных рэвалюцыйна-дэмакратычных памкненняў народаў СССР.

1960-я гг. сталі асабліва прадуктыўнымі для даследавання праблематыкі паўстання 1863–1864 гг. У сувязі са святкаваннем 100-гадовага юбілею паўстання, сумеснымі намаганнямі польскіх і савецкіх гісторыкаў складаліся зборнікі дакументаў з цэнтральных архіваў Польшчы, Літоўскай ССР і БССР. Гэта быў міжнародны археаграфічны праект паводле дамовы аб на-

вуковым супрацоўніцтве паміж АН СССР і Польскай АН, падпісанай 28 сакавіка 1957 г. Выданнем серыі зборнікаў «Восстание 1863 г. Материалы и документы» займалася спецыяльна створаная камісія, у склад якой уваходзілі супрацоўнікі Інстытута славяназнаўства АН СССР У. Каралюк, І. Мілер, намеснік кіраўніка Галоўнага архіўнага праўлення МУС СССР Л. Якаўлеў. Польскі бок прадстаўлялі супрацоўнікі Інстытута гісторыі Польскай АН С. Кяневіч, Э. Халіч і адзін з кіраўнікоў Галоўнай дырэкцыі дзяржаўных архіваў Польшчы К. Канарскі. Актыўнымі ўдзельнікамі гэтага праекта былі супрацоўніцы сектара гісторыі БССР дасавецкага грамадства Інстытута гісторыі С. Байкова (Самбук) і Н. Булдакова.

Менавіта Сусанна Міхайлаўна Байкова (Самбук) стала вядучым даследчыкам палітычных падзей другой паловы XIX ст. у Беларусі. Усе публікацыі, якія выходзілі з-пад яе пяра ў 70–80-я гг. XX ст., тым ці іншым чынам датычыліся паўстання. І ў калектыўных выданнях Інстытута яна заўсёды адказвала за раздзелы аб паўстанні 1863–1864 гг. або грамадска-палітычных рухах другой паловы XIX ст. (*Гісторыя Беларускай ССР у 5 т. Том 2. Беларусь у перыяд капіталізму (1861–1917)).*

Пачынаючы з 1990-х гг. тэму паўстання ў Інстытуце гісторыі распрацоўвалі М. Біч, А. Філатава, В. Грыгор'ева (Яноўская), М. Сакалова. Навуковыя інтарэсы даследчыкаў акрэсліваліся засваеннем папярэдняй айчыннай і замежнай (расійскай, польскай і літоўскай) гістарыяграфічнай спадчыны; тэарэтыка-метадалагічным асэнсаваннем палажэнняў палітычнай пазіцыі дзяржаўных лідараў і кіраўнікоў паўстання, увядзеннем новых аспектаў праблемы. Даследчыкі спрабавалі ўдакладніць, паглыбіць, удасканаліць доказную базу, прааналізаваць рэгіянальныя асаблівасці падзей. Вынікі іх працы прадстаўлены ў шматлікіх артыкулах і калектыўных манаграфіях.

Такім чынам, відавочна, што тэма паўстання на працягу ўсяго перыяду існавання Інстытута гісторыі ўваходзіла ў сферу цікавасці і даследчай дзейнасці вядучых супрацоўнікаў. Зразумела, абысці ўвагай юбілейны 2013 г. Інстытут гісторыі таксама не мог. На працягу года супрацоўнікі актыўна выступалі

кансультантамі ў арганізацыі выстаў да 150-годдзя паўстання («Старонкі гісторыі паўстання 1863–1864 гг.» (ЦНБ ім. Я. Коласа), «З гісторыі падзей 1863–1864 гг.» (Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь)); удзельнічалі ў міжнародных і нацыянальных навуковых мерапрыемствах. Да юбілею прымеркавана і выданне манаграфіі А. Э. Фірыновіч «Паўстанне 1863–1864 гг.: вядомыя і невядомыя крыніцы беларускіх архіваў», прэзентацыя якой запланавана ў межах канферэнцыі. Спадзяюся, што сённяшняя канферэнцыя, прысвечаная паўстанню 1863–1864 гг., прынясе адпаведны плён і дапаможа адказаць на наяўныя, часам спрэчныя, пытанні.

Адкрыццё Міжнароднай навуковай канферэнцыі
«Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі, Літве і Украіне:
гісторыя і памяць» (Мінск, 17–18 кастрычніка 2013 г.)

З прывітальным словам да ўдзельнікаў канферэнцыі выступае дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі В. В. Даніловіч

Прэзентацыя манаграфіі А. Фірыновіч *(на здымку злева)* «Паўстанне 1863–1864 гг.: вядомыя і невядомыя крыніцы беларускіх архіваў»

Удзельнікі канферэнцыі

Гістарыяграфічны вобраз паўстання, яго дакументальная база і выбітныя асобы падзей 1863–1864 гг.

УДК 323.1(476)«1929/1941»

М. К. АЛЬХОВІК

ПАЎСТАННЕ 1863–1864 гг. І ЭВАЛЮЦЫЯ БАЛЬШАВІЦКАЙ ІДЭАЛОГІІ НА БЕЛАРУСІ Ў 1929–1941 гг.

Аналізуючы пазіцыю савецкіх гісторыкаў і ідэолагаў адносна паўстання 1863–1864 гг., беларускія даследчыкі звычайна звяртаюць увагу на 1920-я гг. і на 1941–1991 гг., г. зн. на той перыяд, калі выступленне народаў былой Рэчы Паспалітай супраць расійскага самадзяржаўя ацэньвалася ў асноўным станоўча. У выніку з-пад увагі гісторыкаў выпаў значны супярэчлівы перыяд, калі інтэрпрэтацыя паўстання 1863–1864 гг. і асобы К. Каліноўскага прайшла значную і складаную эвалюцыю.

У 1929–1938 гг. бальшавіцкая ўлада ў Беларусі прыклала шмат намаганняў па выкараненні г. зв. нацыяналістычных установак у гісторыі і геаграфіі Беларусі, беларускай этнаграфіі, літаратуры, выяўленчым мастацтве і культуры ў цэлым. Практычна ўсе дзеячы беларускай гісторыі, культуры і навукі былі абвешчаны «рэакцыянерамі і прыгнятальнікамі». Прапагандысцкія і рэпрэсіўныя органы аб'явілі вайну альтэрнатыўным падыходам у асвятленні і асэнсаванні гістарычнага шляху беларускага народа. Разгарнулася барацьба з польскім, яўрэйскім, літоўскім і інш. нацыяналізмам.

Адной з праяў ідэалагічнай вайны ў Беларускай ССР з'яўлялася пераацэнка паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі і асобы К. Каліноўскага. Яе распачаў навуковы работнік Інстытута гісторыі партыі і Кастрычніцкай рэвалюцыі пры ЦК КПБ(б)Б С. Агурскі, выступіўшы ў 1930 г. супраць працы У. Ігнатоўскага «1863 год на Беларусі». Думку С. Агурскага аб рэакцыйным характары паўстання 1863–1864 гг. падтрымаў загадчык аддзела культуры і прапаганды пры ЦК КП(б)Б А. Сянкевіч: «...перад намі

сёння стаіць пытанне развянчаць такіх “нацыянальных герояў”, як Кастусь Каліноўскі, прадстаўніка шляхецкай, а не хлопскай рэвалюцыі ў польскім паўстанні 1863 г.» [20, с. 169].

Партыйна-савецкія дзеячы і работнікі культуры ў сваіх выступленнях неаднаразова «раскрывалі» палітычныя прычыны выкарыстання імя К. Каліноўскага г. зв. нацыянал-дэмакратамі і нацыянал-апартуністамі. Так, у 1931 г. першы сакратар ЦК КП(б)Б К. Гей адзначаў, што «тэорыя самабытнасці вяла да ідэалізацыі феадальнага і буржуазнага мінулага і знайшла сваё адлюстраванне, у прыватнасці, у шуканнях росквіту беларускай культуры ў эпоху сярэдневякоўя, у ідэалізацыі шляхецкіх рэвалюцыянераў накшталт Кастуся Каліноўскага і г. д.» [10, с. 278–279]. Культурны работнік Э. Гірчак абвінаваціў беларускіх нацыяналістаў у тым, што яны даказвалі пераемнасць беларускай савецкай літаратуры і творчай спадчыны пісьменнікаў-нашаніўцаў, К. Каліноўскага і Ф. Скарыны, а дырэктар Інстытута літаратуры і мастацтва АН БССР В. Вольскі – «у раздзіманні вакол дробнабуржуазнага рэвалюцыянера <...> нацыяналістычнага культу ўсенароднага, агульнанацыянальнага героя» [2, с. 153; 1, с. 127].

Пасля кастрычніцкага пленума ЦК КП(б)Б (1930 г.) партрэты і скульптуры К. Каліноўскага былі зняты з грамадскіх месцаў і знішчаны. У фільме «Кастусь Каліноўскі» і п’есе Е. Міровіча «Кастусь Каліноўскі» партыйныя ідэолагі ўбачылі ідэалізацыю «дробнабуржуазнага героя» і адлюстраванне не «класавых людзей, а людзей данай нацыянальнасці наогул, іх <нацыянальнага духу> асяроддзя» [11, арк. 151–152]. Паэт Т. Кляшторны быў раскрытыкаваны за зборнік вершаў «Хада падзей» (забаронены для друку ў 1932 г.): «Ён нават улюбёнага нацдэмаўскага героя Кастуся Каліноўскага выстаўляе <душой Беларусі>: «Калісьці даўно генерал Мураўёў / Мячамі, агнём і прымусам / На тонкай сасне беларускіх гаёў / Павесіў душу Беларусі». «Культ» К. Каліноўскага быў выяўлены і ў шэрагу адукацыйных устаноў БССР [16, арк. 120, 324].

Некаторыя беларускія ідэолагі і гісторыкі спрабавалі заклікаць сваіх калег да стрыманасці ў ацэнцы паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі. Газета «Звязда», у прыватнасці, пісала аб тым,

што «калі нацыянал-дэмакратызм зрабіў Кастуся Каліноўскага нацыянальным героем і папярэднікам бальшавікоў у Беларусі, дык <вульгарызатарам> трэба сказаць якраз наадварот, што К. Каліноўскі ёсць чорны рэакцыянер, яшчэ горшы, чым Мураў-ёў-вешальнік» [19, с. 2].

Тым не менш выказванні на адрас К. Каліноўскага станавіліся ўсё больш радыкальнымі. Паводле З. Жылуновіча, Кастусь Каліноўскі – гэта «асоба, цесна звязаная з нацыяналістычнымі буржуазна-памешчыцкімі коламі ў часе польскага паўстання 1863 года, <якая> перавяртаецца <нацыянал-дэмакратамі> ў гарачага прыхільніка працоўных Беларусі. Вакол Кастуся Каліноўскага складаецца поўны культ <беларускага героя>, апетага ў вершах, узнесенага ў тэатры, прыхарошанага ў кіно. Яго буржуазны шавінізм замазваецца выпукленнем народніцка-рэвалюцыйнай чыннасці» [4, с. 130].

Э. Гірчак падкрэсліваў: «Каліноўскі аніякае барацьбы супроць польскае шляхты не вёў, ні за якую незалежнасць Беларусі не змагаўся, а наадварот, з'яўляўся ўпаўнаважаным польскага жонда і прадстаўніком варшаўскага цэнтральнага камітэта». Дакладна такія ж перасцярогі і абвінавачванні вылучаліся наркамам асветы БССР А. Платуном у дачыненні да прадстаўнікоў «нацыянал-дэмакратычнага» ўхілу «сярод, відавочна, значнай часткі працоўных, асабліва інтэлігенцыі, маецца аблуда, што нацыянал-дэмакраты з'яўляюцца ідэолагамі "беларускай дзяржаўнасці"», носьбітамі "беларускай нацыянальнай ідэі". Гэта, таварышы, блеф, гэта лухта. Нам неабходна ў што б там ні было выкрыць іх па гэтай лініі, трэба адняць у іх гэты сцяг – сцяг "абаронцаў" "нацыянальнай справы", бо гэты сцяг незаконна гэтыя спадары прысвойваюць <...> Нацдэмы вялі не да нацыянальнага вызвалення беларускага народа, а да нацыянальнага закабалення пад ботам пілсудчыны» [10, с. 278]. У 1934 і 1936 гг. партыйныя работнікі В. Зайцаў і А. Джэлюк адкрыта называлі Кастуся Каліноўскага і іншых лідараў паўстання ў Беларусі «правадырамі польскіх памешчыкаў» [5, с. 17]. У сярэдзіне 1930-х гг. беларускія гісторыкі згадвалі аб тым, што падчас паўстання 1863–1864 гг. сяляне вялі барацьбу як супраць рускага царызму, чыноўнікаў і паліцыі, так

і супраць «польскіх паноў», «шляхецка-панскіх атрадаў», «сваіх і чужых абшарнікаў», якія быццам бы «зверскі распраўляліся» з паўстанцамі [21, с. 14].

У 1933–1937 гг. карэнным чынам змяняецца нацыянальная палітыка ВКП(б). У СССР разгортваюцца працэсы акультурацыі, дэнацыяналізацыі, а таксама рэабілітацыі рускай гісторыка-культурнай спадчыны. Барацьба супраць нацыянал-дэмакратычных установак у гістарычнай навуцы актывізавалася. У 1935 г. першы сакратар ЦК КП(б)Б М. Гікала ўказваў на тое, што ў Беларусі «не разбілі і не перамаглі тэорый <...> трацкісцка-нацыяналістычнага клубка» [15, арк. 77]. Першы сакратар ЦК КП(б)Б В. Шаранговіч на XVI з'ездзе КП(б)Б (1937 г.) адзначыў, што ў БССР «не ўскрыта да канца тэорыя аб тым, што беларуская дзяржаўнасць быццам пачала стварацца ў XIII і XIV стагоддзях у форме літоўска-беларускай дзяржавы. Не выкрыта тэорыя аб тым, што росквіт беларускай дзяржаўнасці і росквіт Беларусі быццам адносіцца да таго перыяду, калі Беларусь і Літва былі звязаны з Польшчаю так званай Люблінскай уніяй <...> Зусім відавочна, што такая фальсіфікацыя гісторыі мела на мэце адчужэнне беларускага народу ад рускага. Беларускія нацыяналісты паставілі сваёй мэтай даказаць, што быццам у мінулым беларускі народ, блакуючыся з Літвой і Польшчай, жыў лепш, дабіўся свайго росквіту» [12, арк. 112].

16 лютага 1933 г. работнік Інстытута эканомікі Беларускай Акадэміі навук (БелАН) Р. Парэчын быў звольнены за «ідэалізацыю шляхецкага рэвалюцыянера Каліноўскага». У 1933 г. быў арыштаваны дырэктар Інстытута польскай пралетарскай культуры БелАН прафесар І. Віткоўскі. Ён быў абвінавачаны ў тым, тым што «заадно з Ігнатоўскім» ідэалізаваў паўстанне 1863–1864 гг. У 1934 і 1935 гг. І. Віткоўскага абвяшчаюць «польскім нацыяналістам і контррэвалюцыянерам», а ў 1937 г. адзін з удзельнікаў XVI з'езда КП(б)Б ацаніў яго навуковую дзейнасць з пункту гледжання геапалітыкі: «...у гэтай кнізе («Паўстанне 1863 года і расійскі рэвалюцыйны рух пачатку 1860-х гадоў». – *М. А.*) ён кажа аб «маскалях», з якімі трэба заўсёды змагацца, біцца, гэта вечныя ворагі. У гэтай кнізе ён робіць фактычна стаўку на

Захад» [13, арк. 192]. Дэлегаты першага Усебеларускага з'езда настаўнікаў-ударнікаў (1934 г.) адзначылі: «...факт ідэалізацыі Кастуся Каліноўскага, з якім нямала насіліся, зводзіўся к таму, што Кастусь Каліноўскі гэта, маўляў, вядомы беларускі рэвалюцыянер, арганізатар чуць не чырвоных партызанскіх атрадаў на Беларусі. Нашто нацдэмам была патрэбна гэта фальсіфікацыя? Перш за ўсё, каб паказаць, што пачатак рэвалюцыйнага руху на Беларусі звязаны з польскім паўстаннем, што працоўныя Беларусі крывёю звязаны з буржуазіяй Польшчы ў барацьбе супроць царскай улады, усё гэта ім патрэбна было для таго, каб стварыць гістарычны аргумент для арыентацыі на буржуазны Захад. У гэтым асноўная задача нацыянал-дэмакратаў у справе фальсіфікацыі гісторыі БССР» [17, с. 48].

У другой палове 1937 г. быў выпушчаны падручнік па гісторыі СССР пад рэдакцыяй А. Шастакова. Ён адпавядаў новым устаноўкам кіраўнікоў бальшавіцкай партыі на прызнанне пераемнасці паміж Савецкім Саюзам і Расійскай імперыяй і на рэабілітацыю захопніцкай палітыкі расійскага самадзяржаўя. Паўстанне 1863–1864 гг. было ўключана ў летапіс лакальных сацыяльных паўстанняў народных мас Расіі і збольшага пазбаўлена нацыянальнага характару: «Асабліва моцнае паўстанне было ў Беларусі. Тут пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага, узброеныя косамі і сякерамі, сяляне палілі памешчыцкія сядзібы, знішчалі дробныя атрады рускіх войск, забівалі памешчыкаў, царскіх чыноўнікаў і афіцэраў».

У наступным годзе К. Каліноўскі быў рэабілітаваны і ў беларускай савецкай гістарыяграфіі: у падручніках і манаграфіях ён падаваўся як «сялянскі рэвалюцыянер», «рэвалюцыянер-дэмакрат», «правадыр беларускага сялянства», «кіраўнік дэмакратычных мас Беларусі супроць прыгонніцтва і нацыянальнага гнёту рускага самадзяржаўя», а яго праграма – як «рэвалюцыйная буржуазна-дэмакратычная». К. Каліноўскі, на думку гісторыка І. Лочмеля, «быў звязаны з рэвалюцыйным рухам у Расіі, праводзіў перадавыя рэвалюцыйныя ідэі той эпохі, і таму належыць беларускаму і рускаму народам, а не беларускім і польскім нацыянал-фашыстам» [8, с. 2; 18, с. 14].

У артыкулах і манаграфіях адзначалася, што Каліноўскі змагаўся «за знішчэнне памешчыцкага землеўладання, за перадачу ўсёй зямлі сялянам, за вольную дэмакратычную Беларусь», «ненавідзеў царскае самадзяржаўе і <польскіх> паноў-магнатаў, якія імкнуліся адрадзіць панскую Польшчу і прыгнятаць беларускі народ». «Праграма» Каліноўскага ацэньвалася як «рэвалюцыйная і буржуазна-дэмакратычная». На думку беларускіх савецкіх гісторыкаў і ідэолагаў, польскае дваранства імкнулася схіліць беларускіх сялян на барацьбу пад нацыянальнымі лозунгамі «Польшчы ў межах 1772 г.», аднак большасць беларускага сялянства быццам бы выключна варожа ставілася да гэтых лозунгаў, «ненавідзела польскіх паноў і баялася аднаўлення панскай Польшчы». У адмоўным кантэксце замест слоў «рускі» і «расійскі» выкарыстоўваўся прыметнік «царскі»: «царскія войскі», «царскія чыноўнікі» і г. д. [9, с. 2].

Беларускія савецкія гісторыкі паказвалі паўстанне 1863–1864 гг. як барацьбу беларускіх сялян пад кіраўніцтвам рэвалюцыйных дэмакратаў супраць польскіх, рускіх і беларускіх памешчыкаў і царскіх чыноўнікаў на фоне паўстання народаў былой Рэчы Паспалітай: «<у паўстанні> прымалі ўдзел і палякі-памешчыкі, якія марылі аб вялікай Польшчы <ад мора да мора>, прымала ўдзел польская інтэлігенцыя і сяляне, якія змагаліся супроць нацыянальнага прыгнечання, прымалі ўдзел і беларускія працоўныя масы». Дзейнасць М. Мураўёва ацэньвалася адмоўна, але пры гэтым увага звярталася і на той факт, што «подлыя і баязлівыя польскія паны звярталіся да цара і Мураўёва са зневажальнымі адрасамі, адмаўляліся ад рэвалюцыянераў, аблівалі іх струменямі бруду. Асабліва ненавідзелі яны Каліноўскага. Польскія рэвалюцыянеры, актыўныя дзеячы паўстання Дамброўскі і Урублеўскі эмігравалі за мяжу і далучыліся там да пралетарскага рэвалюцыйнага руху». Сцвярджалася аб тым, што класавы саюз расійскага самадзяржаўя і польскіх памешчыкаў перашкодзіў сялянам у справе сацыяльнага вызвалення: «польскія і беларускія арыстакраты-паны дапамагалі царызму падавіць паўстанне. За гэта царызм дапамагаў панам прыгнятаць сялян» [7, с. 81].

Перад беларускімі гісторыкамі была пастаўлена задача выкрыць ідэалагічныя ўстаноўкі «беларускіх нацыяналістаў, якія фальсіфікавалі факты і скажалі ролю К. Каліноўскага. Яны паказвалі яго як агульнанацыянальнага героя, барацьбіта толькі за незалежную Беларусь, усямерна выпіналі і смакавалі нацыянальныя лозунгі паўстання і зусім затушоўвалі яго класавую сутнасць. <...> Нацыянал-фашысты пазней спаганілі вобраз Кастуся Каліноўскага, абвешалі яго нацыяналістычнымі бразготкамі. Нашым гісторыкам трэба аднавіць сапраўдны вобраз Кастуся Каліноўскага, адважнага барацьбіта супроць царызму, арганізатара сялянскіх атрадаў, якія змагаліся не толькі супроць царскіх войск, але і супроць прыгоннікаў-памешчыкаў. Кастусь Каліноускі не быў і не мог быць пралетарскім рэвалюцыянерам, а значыць, не мог быць да канца паслядоўным рэвалюцыянерам. Яго абмяжоўвала шляхецкае асяроддзе, што нарадзіла яго, яго абмяжоўвала, яго звязвала супадзенне сялянскага паўстання з паўстаннем палякаў-памешчыкаў, што праследавалі дыяметральна процілеглыя сялянам мэты. Паўстанне было задушана мёртвай удаўкай генерала Мураўёва-вешальніка. Загінуў на шыбеніцы і Кастусь Каліноўскі» [18, с. 14]. Некаторай крытыцы падверглася і ранейшая г. зв. вульгарызатарская фальсіфікацыя паўстання, калі К. Каліноўскі падаваўся як «польскі памешчык і нацыяналіст».

Рэабілітацыя К. Каліноўскага мела далёкасяжныя наступствы. У 1938–1939 гг. пры абыякавай пазіцыі партыйна-савецкіх органаў шэраг навукоўцаў і культурных дзеячаў пачалі паступовае пераасэнсоўванне ў станоўчым накірунку дзейнасці і творчасці такіх постацяў, як Ф. Скарына, В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч, А. Пашкевіч (Цётка), М. Багдановіч, Я. Чачот, Я. Баршчэўскі, А. Рыпінскі, Я. Лучына, Ядвігін Ш., Я. Карскі і інш., паэм «Тарас на Парнасе», «Энеіда навыварат» і г. д. У 1939 г. СНК БССР стварыў цэнтральную ўрадавую камісію па ахове помнікаў у БССР (раней савецкія органы займаліся выключна пытаннем аховы рэвалюцыйных помнікаў). У друку з'явіліся заклікі да спынення знішчэння рэлігійных помнікаў. У гістарычных творах падкрэслівалася прагрэсіўная роля

праваслаўнай царквы ў дакастрычніцкай гісторыі Беларусі [6, с. 3]. Разам з тым партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва Беларускай ССР патрабавала, каб вывучэнне і пераасэнсаванне гістарычнай, культурнай і літаратурнай спадчыны беларускага народа ішло на карысць сацыялістычнага будаўніцтва, умацавання «інтэрнацыянальных сувязей беларусаў і рускіх, а таксама барацьбы з "нацыяналістычнай ідэалогіяй"».

Такім чынам, з 1929 па 1938 г. бальшавіцкая ўлада ў Беларусі на фоне масавых рэпрэсій супраць нацыянальных дзеячаў разгарнула сапраўдную барацьбу супраць «нацыянал-дэмакратычнай» і «нацыянал-апартуністычнай» інтэрпрэтацыі паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі. Гэта адсунула на задні план вывучэнне і ацэнку самога паўстання. З 1937 г. на ўказанне з Масквы адбывалася рэабілітацыя дзейнасці паўстанцкай плыні «чырвоных» у Беларусі. Паводле новых ідэалагічных установак паўстанне ацэньвалася як чарговы сацыяльны выбух у Расійскай імперыі. Савецкія гісторыкі былі вымушаны прытрымлівацца гэтага падыходу да канца існавання бальшавіцкай улады ў Беларусі.

Літаратура

1. *Вольскі, В.* Сучасныя праблемы беларускай савецкай драматургіі / В. Вольскі // Полымя рэвалюцыі. – 1933. – № 6. – С. 124–144.

2. *Гірчак, Э.* Нацыянал-дэмократызм у беларускай мастацткай літаратуры / Э. Гірчак // Полымя. – 1931. – № 2. – С. 148–156.

3. *Глебка, П.* Адам Міцкевіч / П. Глебка // Полымя рэвалюцыі. – 1940. – № 11. – С. 112–125.

4. *Жылуновіч, З.* Як прыгоньнік стаў народнікам / З. Жылуновіч // Полымя. – 1931. – № 1. – С. 130–155.

5. *Зайцаў, В.* Перамога ленінскай нацпалітыкі / А. Джэлюк, В. Зайцаў // Камуністычнае выхаванне. – 1934. – № 3–4. – С. 11–21.

6. *Ларчанка, М.* Да пытання аб гісторыі старажытнай і пачатку новай беларускай літаратуры / М. Ларчанка // Літаратура і мастацтва. – 1938. – 10 лют. – С. 3.

7. *Лочмель, И. Ф.* Очерк истории борьбы белорусского народа против польских панов / И. Ф. Лочмель. – М.: Воениздат, 1940. – 164 с.

8. *Лочмель, И. Ф.* Об учебнике по истории Белоруссии / И. Ф. Лочмель // Сов. Белоруссия. – 1938. – 17 июля. – С. 2.

9. *Лочмель, І. Ф.* Паўстанне 1863 г. у Беларусі / І. Ф. Лочмель // Звязда. – 1939. – 8 крас. – С. 2.

10. На крутым павароце. Ідэолага-палітычная барацьба на Беларусі ў 1929–1931 гг.: дакументы, матэрыялы, аналіз /Бел. навук.-даслед. ін-т дакументазнаўства і арх. справы; аўт.-склад. Р. П. Платонаў. – Мінск: НДІДАС, 1999. – 384 с.

11. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Ф. 4П. – Воп. 1. – Спр. 6099.

12. НАРБ. – Фонд 4П. – Воп. 1. – Спр. 10 917.

13. НАРБ.– Фонд 4П. – Воп. 1. – Спр. 10 921.

14. НАРБ. – Фонд 4П. – Воп. 1. – Спр. 14 721.

15. НАРБ. – Фонд. 4П. – Воп. 1. – Спр. 6196.

16. НАРБ. – Фонд 4П. – Воп. 1. – Спр. 6293.

17. Першы Усебеларускі з'езд настаўнікаў-ударнікаў (2–4 сак. 1934 г.). – Менск: Дзярж. выд-ва Беларусі, 1934. – 87 с.

18. Савецкая Беларусь / пад рэд. В. В. Бедзіна [і інш.] – Менск: Дзярж. выд-ва Беларусі, 1938. – 45 с.

19. *Садоўскі, Ф. П.* За актыўнае змаганьне з вялікадзяржаўным шовінізмам / Ф. П. Садоўскі // Сав. краіна. – 1931. – № 4. – С. 3–11.

20. *Сянькевіч, А.* За ленінскую лінію ў нацпалітыцы / А. Сянькевіч // Полымя. – 1930. – № 11–12. – С. 159–175.

21. Юбілейная сесія Цэнтральнага выканаўчага камітэта Беларускай ССР XI склікання. – Менск: Выд. ЦВК БССР. Дом Урада, 1936. – 186 с.

Резюме

Н. К. АЛЬХОВИК

ВОССТАНИЕ 1863–1864 гг. И ЭВОЛЮЦИЯ БОЛЬШЕВИСТСКОЙ ИДЕОЛОГИИ В БЕЛАРУСИ В 1929–1941 гг.

Рассматривается эволюция отношения государственных идеологов и белорусских советских историков к восстанию 1863–1864 гг. в Беларуси и представителям политического лагеря «красных» в контексте политической ситуации и национальной политики в БССР в 1929–1941 гг. На основе проведенного исследования предлагается выделить несколько этапов в освящении данного восстания в пропаганде и историографии. Особое внимание обращается на использование фактора восстания в политической борьбе представителей интернационалистического крыла КП(б)Б против т. н. национал-демократов и национал-оппортунистов, против «националистической» идеологии. Отмечается, что реабилитация восстания, произошедшая в 1937–1938 гг., послужила образцом для изменения отношения партийно-государственных деятелей к историко-культурному наследию белорусского народа.

Summary

M. ALHOVIK

THE UPRISING OF 1863–1864 AND THE EVOLUTION OF THE BOLSHEVIK IDEOLOGY IN BELARUS IN 1929–1941

The article describes the evolution of the relationship of the state ideologies, as well as the Belarusian Soviet historians to the uprising of 1863–1864 in Belarus and some representatives of the political camp of «red» in the context of the political situation and the national policy in the Belarusian SSR in 1929–1941. Based on the research, the author proposes to identify the steps in the interpretation of the uprising in propaganda and historiography. Special attention is paid to the using of the uprising factor in the political struggle of the internationalist wing of the Communist Party (Bolsheviks) of Belarus against the so-called National Democrats and National Opportunists and against the «nationalist» ideology. It is noted that in 1937–1938 the rehabilitation of the uprising served as a model for changing attitudes of the party and state leaders to the historical and cultural heritage of the Belarusian people.

Паступіў у рэдакцыю 12.12.2013

УДК 94(476)«1863/1864»:930.1(= 16)

В. В. ГАРБАЧОВА

УДЗЕЛЬНІКІ ПАЎСТАННЯ 1863–1864 гг. У БЕЛАРУСІ: МЕТОДЫКА СТАТЫСТЫЧНЫХ ПАДЛІКАЎ

Вызначэнне дакладнай лічбы ўдзельнікаў паўстання 1863–1864 гг. і пакараных за ўдзел у паўстанні ў нацыянальным дыскурсе з'яўляецца досыць складаным пытаннем. У многім праблема тлумачыцца недахопам метадалагічнага асэнсавання наяўнай крыніцазнаўчай базы.

На сённяшні дзень можна вызначыць некалькі наяўных у замежнай і айчыннай гістарыяграфічнай традыцыі падыходаў да статыстычных паказчыкаў па паўстанцкай праблематыцы. Адным з падыходаў, якія захаваліся і ў сучаснай даследчыцкай практыцы, з'яўляецца *выкарыстанне статыстыкі*, якая фігуруе ў афіцыйным справаводстве. Ля вытокаў гэтага падыходу стаяў рускі гісторык канца XIX – першай трацiны XX ст. А. І. Мілавідаў, які адзначыў, што агульная колькасць удзельнікаў паўстання склала каля 77 тыс. чалавек. Апрацоўка матэрыялаў Мураўёўскага музея дазволіла яму канстатаваць, што пад пакаранне трапіла толькі каля 16 % удзельнікаў паўстання [1, с. LIV, LVII].

Па пытанні колькасці пакараных удзельнікаў паўстання сярод найбольш аўтарытэтных даследаванняў можна назваць працу расійскага этнографа другой паловы XIX ст. С. В. Максімава. Вывучаючы на падставе афіцыйных крыніц, на працу з якімі ён атрымаў адпаведны дазвол, пытанне ссылкі і катаргі ў Сібір удзельнікаў паўстання, даследчык вызначыў, што туды было адпраўлена 18 623 чалавекі, з якіх 10 407 – у Заходнюю і 8 199 – ва Усходнюю Сібір [15, с. 80]. У далейшым даныя С. В. Максімава паўтараліся шэрагам аўтараў да канца XX ст.: калектыўнай манаграфіі аб ссылцы ў Табольскую губерню, напісанай у 60-я гг. XX ст. [14, с. 13], даследаваннях У. М. Дваранава [9, с. 68],

Э. Качынскай [30, s. 66]. Гэты ж падыход выкарыстоўваецца і Н. П. Міцінай. Дакументы Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі дазволілі даследчыцы вызначыць агульную колькасць сасланых пасля паўстання 1863–1864 гг. у 36 459 чалавек, з якіх непасрэдна ў Сібір было адпраўлена 18 606 чалавек [18, с. 10–11].

Між тым афіцыйная статыстыка ўтрымлівае шэраг недакладанасцяў і хібаў. Так, інфармацыя Аўдытарыятнага дэпартамента вайсковага міністэрства, складзеная на падставе даных Часовага палявога аўдытарыята пры штабе Віленскай вайсковай акругі [23], ахоплівае не ўсіх удзельнікаў паўстання[1]. Туды трапілі толькі тыя, хто ўдзельнічаў у паўстанні са зброяй у руках ці аказваў непасрэдную дапамогу паўстанцам. Гэтая крыніца не ўключае тысяч паўстанцаў, якія не праходзілі праз судова-следчыя павятовыя і губернскія камісіі. На сённяшні час вядома таксама пра шматлікія выпадкі, калі расійскія вайскоўцы, а разам з тым і цывільныя ўлады, не адсылалі ў судова-следчыя ўстановы справы, якія падаваліся ім не вартымі асаблівай увагі [29, s. 295]. У такіх выпадках прысуды выносіліся самастойна ў адміністрацыйным парадку. Зразумела, што дадзеныя факты не траплялі ў агульную статыстыку, якая прадстаўлялася следчымі і судовымі камісіямі. Можна нават вызначыць тэндэнцыю, што адпаведны лаяльны падыход атрымаў шырокае распаўсюджанне ў дачыненні да сялянства [32, s. 118].

Застаецца пытанне і з колькасцю тых, хто ўдзельнічаў непасрэдна ў ваенных дзеяннях, загінуў у сутыкненнях ці трапіў у палон і быў забіты ў няволі расійскімі вайскоўцамі. Згодна з афіцыйнай расійскай статыстыкай XIX ст., загінула 5 934 чал.,

---

[1] Гэтая крыніца была пакладзена ў аснову даследавання У. М. Зайцава, які падлічыў, што ў выніку паразы паўстання 1863–1864 гг. з беларуска-літоўскіх тэрыторый у ссылку, арыштанцкія роты ці на катаргу было накіравана 8,2 тыс. чалавек. Разам з тым трэба адзначыць, што ў якасці даследчыцкай мэты было абрана высвятленне сацыяльна-саслоўнага складу паўстанцаў, што абумоўлівае выкарыстанне аб'ёмнай рэпрэзентатыўнай крыніцы, але не патрабуе адказу на пытанне аб дакладнай колькасці ўдзельнікаў і пакараных [10, с. 98–194].

было паранена 733 чал., трапіла ў палон 1 361 асоба. Аднак гэта не канчатковыя звесткі, таму што расійская адміністрацыя не валодала інфармацыяй пра загінулых у 45 сутыкненнях, параненых у 150 баях, палоненых – у 95 [1, с. LIV; 17, с. 7–30].

У афіцыйным справаводстве адсутнічала дакладная статыстыка і па колькасці рэпрэсаваных, пра што сведчыць рапарт Дэпартамента паліцыі Міністэрства ўнутраных спраў на запыт III Аддзялення Імператарскай канцылярыі ў асобе графа П. А. Шувалава пра колькасць асобаў, якія вяртаюцца з «водворения» (1872 г.). Міністэрства карысталася прыкладнай лічбай, якая складала 40 тыс. сасланых, палова з якіх прыходзілася на высланых на пасяленне ці так званае *водворение* [31, s. 17].

Другі накірунак у вырашэнні пастаўленага пытання – гэта так званы *колькасны падыход*. У дачыненні да выніковых лічбаў ён выкарыстоўваецца ці шляхам вызначэння колькасці дзейных паўстанцкіх атрадаў і прыкладнай колькасці іх удзельнікаў[2], ці з колькасці сутычак [17]. Зразумела, што такая статыстыка будзе досыць умоўнай. Па-першае, на сённяшні дзень невядома колькасць дробных партызанскіх атрадаў, якія існавалі непрацяглы час. Пытанні выклікае таксама статыстыка па колькасным складзе паўстанцкіх атрадаў і ваенных сутыкненняў.

Шырэй распрацавана пытанне ў дачыненні да пакараных за ўдзел у паўстанні. У гэтым выпадку лічбы падаюцца на падставе выкарыстання абранага даследчыкамі тыпу крыніц. Першыя напрацоўкі адпаведнага кшталту з'явіліся яшчэ ў XIX ст. у польскай гістарыяграфіі. Так, У. Шувальскі зафіксаваў прозвішчы, від пакарання і месца адбывання пакарання для 1 143 сасланых. Аб'ектам аналізу для даследчыка сталі малітоўнікі паўстанцаў [27, с. 69–72].

У XX ст. свой уклад у дадзеным накірунку рабілі і расійскія даследчыкі, якія вывучалі матэрыялы расійскіх, у тым ліку і сібірскіх архіваў, што дазваляла ім фіксаваць больш

[2] А. Мілавідаў прыводзіць дадзеныя, што на беларуска-літоўскіх тэрыторыях у паўстанні 1863–1864 гг. дзейнічала каля 230 значных партызанскіх атрадаў. Сярэдняя колькасць паўстанцаў у такіх атрадах магла вагалася ад 300 да 400 чалавек [1, с. LXII].

набліжаную да рэальнасці колькасць высланых на месцах у асобныя перыяды часу. Так, Л. П. Рашчэўская на аснове справаздач табольскіх губернатараў выявіла, што ў Сібір было выслана 23 056 паўстанцаў [24, с. 79–80].

Польскія даследчыкі канца XX – пачатку XXI ст. пераважна абапіраюцца на крыніцы, якія дазваляюць фіксаваць тэрмін ссылкі па прысудах. Так, С. Стрыжэўская свае высновы аб кольскасці асуджаных да ссылкі ва ўнутраныя губерні Расіі робіць на падставе аналізу спісаў паўстанцаў і асоб, якія падтрымалі паўстанне [28, с. 128; 33]. Гэтыя спісы захоўваюцца ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве ў фондзе Упраўлення генерал-паліцмайстара Царства Польскага. Пэўным недахопам пазначанай крыніцы з'яўляецца яе тэрытарыяльная абмежаванасць, то бок прыведзеная статыстыка тычыцца толькі Царства Польскага.

Цікавы падыход у вырашэнні праблемы прапаноўваецца польскім даследчыкам Л. Заштаўтам, які, абапіраючыся на матэрыялы Дэпартамента духоўных спраў замежных веравызнанняў, высвятліў, што колькасць каталікоў у Сібіры з 1863 па 1868–1871 гг. толькі ў вялікіх цэнтрах і іх наваколлі павялічваецца больш чым на 24 тыс. чалавек[3]. Тым не менш, як адзначаецца самім гісторыкам, прадстаўленая крыніца мае пэўныя хібы, бо ўлічвае даныя не ўсіх рэгіёнаў і тыпаў паселішчаў Расійскай імперыі, адначасова з гэтым існуе магчымасць дублявання некаторых даных у сувязі з распаўсюджанай практыкай перамяшчэння па этапах [11, с. 169].

Трэці метад у вырашэнні пастаўленага пытання можна вызначыць як *прасапаграфічны*. У расійскай гістарыяграфіі ён паўстаў з крытыкі колькаснага (статыстычнага) падыходу канца XX ст. Разгорнутую крытыку статыстычнай методыкі адным з першых зрабіў якуцкі гісторык П. Л. Казаран. Для вырашэння пастаўленай праблемы гісторыкам была прапанавана методыка, якая спалучае ў сабе прыёмы статыстычнага аналізу

[3] У гэты лік трапляюць, зразумела, не толькі самі паўстанцы, але і члены іх сем'яў [11, с. 168].

і персаналізацыі падзей, то бок не механічны перанос прозвішча сасланага з аднаго спісу ў другі, а ўключэнне канкрэтнай асобы ў склад той ці іншай катэгорыі сасланых [13, с. 7].

Выкарыстанне прасапаграфічнага метаду ў вывучэнні акалічнасцяў ссылкі 1863 г. у Якуціі дазволіла П. Л. Казарану аднавіць склад паўстанцаў, якія адбывалі ссылку ў Алякмінскай акрузе [12] і вызначыць якуцкую ссылку ў кольскасці 255 паўстанцаў [13]. Персанальны склад удзельнікаў паўстання 1863–1864 гг. і рэвалюцыянераў-дэмакратаў 1860-х гг., сасланых на Алтай, аднавіла І. Н. Нікуліна [21]. Дадзеная методыка была скарыстана С. А. Мулінай для даследавання персанальнага складу больш за 4 тыс. сасланых Заходняй Сібіры [19; 20, с. 80–112].

Яшчэ раней прасапаграфічная методыка ўсталёўваецца ў польскай навуковай традыцыі. У даваенны перыяд грунтоўная картатэка паўстанцаў была складзена Э. Малішэўскім, на сённяшні час яна лічыцца страчанай у часы Другой сусветнай вайны.

У XX ст. аб'ёмныя картатэкі былі створаны расійскімі даследчыкамі Ю. Штакельбергам, У. Дзякавым, групай даследчыкаў пад кіраўніцтвам І. Мілера, польскім гісторыкам Э. Казлоўскім, кракаўскім ксяндзом Ручкай. У 60-я гг. XX ст. адпаведная праца праводзілася супрацоўнікамі гістарычнага архіва ў Вільні, а таксама ў гістарычным архіве ў Львове [31, s. 12].

Згаданыя вышэй картатэкі былі скарыстаны міжнароднай групай даследчыкаў, заснаванай пры Інстытуце гісторыі Польскай акадэміі навук у Варшаве пад кіраўніцтвам прафесара В. Слівоўскай, якая з канца XX ст. распачала працу па росшуку даных пра лёс паўстанцаў 1863–1864 гг. [26, с. 15–19; 4, с. 520–523]. На 2004 г. складзеная на падставе працы польскіх, расійскіх, украінскіх, літоўскіх і беларускіх навукоўцаў картатэка налічвала 51 346 прозвішчаў людзей, якія мелі дачыненне да паўстання на тэрыторыі Царства Польскага, Беларусі, Літвы і Украіны. Трэба адзначыць, што гэтая лічба далёкая ад рэчаіснасці, бо пачатковай мэтай творчага калектыву выступаў пошук сасланых на ўскраіны Расійскай імперыі. На час закан-

чэння праекта лічба сасланых удзельнікаў паўстання склала ў картатэцы 38 997 прозвішчаў. Польскімі даследчыкамі быў праведзены папярэдні аналіз гэтай базы па пытанні паходжання сасланых. Трэба адзначыць, колькасць такіх асобаў з беларуска-літоўскіх тэрыторый склала прыкладна 2/3 ад агульнай колькасці сасланых [31, s. 17], што ў выніку можа складаць ад 24 да 26 тыс. чалавек.

У беларускай гістарыяграфіі да сённяшняга часу самастойных падлікаў у дачыненні да колькасці ўдзельнікаў паўстання і пакараных не праводзілася. Большасць аўтараў карыстаецца ўстойлівай гістарыяграфічнай інфармацыяй, узятай з *афіцыйнага справаводства.* У перыяд працы над зборнікам дакументаў па паўстанні 1863–1864 гг. у Беларусі і Літве рабілася спроба змяніць гэты стан рэчаў [5]. Супрацоўнікамі Нацыянальнага гістарычнага архіва ў Мінску пачаў распрацоўвацца каталог удзельнікаў паўстання ў Беларусі, аднак у рэальнасці ўсё скончылася стварэннем павярхоўнага пераліку са спасылкамі на крыніцы аб падзеях паўстання з фондаў НГАБ. С. М. Самбук (Байкова) увяла ў навуковы ўжытак новыя архіўныя крыніцы па гісторыі паўстання [2, с. 223–224], што тым не менш не змяняе агульнай сітуацыі [2, с. 225]. У сваёй манаграфіі даследчыца, згадваючы колькасць пакараных за ўдзел у паўстанні, прыводзіла лічбы, узятыя з дакументаў афіцыйнага справаводства [25, с. 25; 5, с. 95–98, 99].

Гэтая тэндэнцыя захавалася і ў сучасных даследаваннях. Так, у артыкуле А. П. Грыцкевіча з «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» згадваецца аб 12 483 пакараных [8, с. 450]. А. Ю. Бендзін сцвярджае, што колькасць рэпрэсаваных складае ўсяго 12,5 тысяч [3, с. 42–46]. Відавочна, што гэтая лічба прадстаўлена на падставе выкарыстання матэрыялу А. П. Грыцкевіча. Акрамя гэтага, згаданымі даследчыкамі сцвярджаецца, што ў кола пакараных трапілі ў асноўным каталіцкія святары ці шляхта, доля якіх вызначана – вышэй за 95 %. У шасцітомнай «Гісторыі Беларусі» М. В. Біч са спасылкай на С. М. Самбук называў – называе лічбу – 16 131 сасланых, з якіх 3 776 былі пакараны адміністрацыйным чынам [6, с. 241]. Афіцыйная статысты-

ка XIX ст. пакладзена і ў аснову сцвярджэнняў аўтара аднаго з апошніх выданняў, прысвечаным праблемам паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі [16, с. 104].

Выкарыстанне даследаванняў, пабудаваных на прасапаграфічнай методыцы, дазваляе прапаноўваць больш верагодную інфармацыю. Так, у энцыклапедычным выданні за 2006 г. намі адзначаецца, што з беларускіх тэрыторый на руднікі, катаргу, пасяленне ці ў арыштанцкія роты было скіравана каля 21 тыс. чалавек [7, с. 818]. Паводле меркавання гарадзенскага гісторыка А. Радзюка, лічба сасланых з тэрыторыі Беларусі, Літвы і Украіны складае каля 30 тыс. асоб [22, с. 151].

Між тым механічнае аперавание статыстычнымі матэрыяламі, якое дамінуе ў айчыннай гістарыяграфіі, не здымае праблем, якія назапасіліся ў нацыянальным дыскурсе па асэнсаванні паўстання 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі. Толькі шляхам персаналізацыі падзей, даследавання разнастайных крыніц і стварэння картатэкі ўдзельнікаў падзей у Беларусі можна падысці да вырашэння асноўных пытанняў з гісторыі паўстання 1863–1864 гг.

Літаратура

1. Архивные материалы Муравьевского музея, относящиеся к польскому восстанию 1863–1864 гг. в пределах Северо-Западного края. Ч. 2. Переписка о военных действиях с 10-го января 1863 года по 7 января 1864 года / сост. А. Миловидов // Виленский временник. – Кн. VI. – Вильна: Губерн. тип., 1915. – 466 с.

2. *Байкова, С. М.* О движущих силах восстания 1863 г. на территории Белоруссии / С. М. Байкова // Историко-социологические исследования (на материалах славянских стран). – М.: Наука, 1970. – С. 222–253.

3. *Бендин, А. Ю.* Образ Виленского генерал-губернатора М. Н. Муравьева в современной белорусской историографии / А. Ю. Бендин // Беларус. думка. – 2008. – № 1. – С. 42–46.

4. *Брус, А.* Данные о польских ссыльных в Сибири и России после январского восстания / А. Брус // Сибирь в истории и культуре польского народа: пер. с польск. – М.: Ладомир, 2002. – С. 520–523.

5. Восстание в Литве и Белоруссии 1863–1864 гг.: сб. док. / предисл. Ю. Жюгжды, В. Неупокоева. – Wrocław; М.: Наука, 1965. – 586 с.

6. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч, В. Яноўская, С. Рудовіч [і інш.] – Мінск: Экаперспектыва, 2005. – 519 с.

7. *Горбачева, О.* Восстание 1863–64 гг. в Польше, Литве и Беларуси / О. Горбачева // Республика Беларусь: энцикл.: у 6 т. – Мінск: Беларус. энцыкл., 2006. – Т. 2. – С. 818.

8. *Грыцкевіч, А. П.* Паўстанне 1863–1864 у Польшчы, Беларусі і Літве / А. П. Грыцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: Беларус. энцыкл, 1999. – Т. 5. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – С. 448–450.

9. *Дворянов, В. Н.* В сибирской дальней стороне... (Очерки истории царской каторги и ссылки. 60-е годы XVIII в. – 1917 г.) / В. Н. Дворянов. 2-е изд. – Мінск: Наука и техника. 1985. – 302 с.

10. *Зайцев, В. М.* Социально-сословный состав участников восстания 1863 г. (Опыт статистического анализа) / В. М. Зайцев. – М.: Наука, 1973. – 232 с.

11. *Заштовт, Л.* Депортации и переселения польского населения из Западных губерний вглубь Российской империи после январского восстания 1863–1864 гг. / Л. Заштовт // Польская ссылка в России XIX–XX веков: региональные центры – Polscy zesłańcy w Rosji XIX–XX stuleciu: ośrodki regionalne. – Казань: Мастер Лайн, 1998. – С. 165–169.

12. *Казарян, П. Л.* Олекминская политическая ссылка. 1826–1917 гг. / П. Л. Казарян. 2-е изд., доп. – Якутск: Сахаполиграфиздат, 1996. – 496 с.

13. *Казарян, П. Л.* Численность и состав участников польского восстания 1863–1864 гг. в Якутской ссылке / П. Л. Казарян. – Якутск: ИГИ АН РС (Я), 1999. – 48 с.

14. *Кашихин, Л. С. [и др.].* Участники польского восстания 1863–1864 гг. в Тобольской ссылке / Л. С. Кашихин, Д. И. Копылов, Н. П. Митина, Б. Г. Пекут. – Тюмень, 1963. – 75 с.

15. *Максимов, С. В.* Сибирь и каторга / С. В. Максимов: в 3 ч. – СПб.: Типо-литография Н. Стефанова, 1871. – Ч. III. Политические и государственные преступники. 2 изд., испр. и доп. – 377 с.

16. *Матвейчык, Д.* Паўстанне 1863–1864 гадоў у Беларусі: нарыс баявых дзеянняў / Д. Матвейчык. – Мінск: Медысонт, 2013. – 121 с.

17. *Миловидов, А. И.* Перечень боевых столкновений русских войск с польскими повстанцами в кампанию 1863–1864 гг. в пределах Северо-Западного края, с указанием времени, места боев, численности и командного состава русских и повстанческих отрядов, равно и потерь с обоих сторон / А. И. Миловидов. – Вильно: Губерн. тип., 1915. – 40 с.

18. *Митина, Н. П.* Во глубине Сибирских руд (К столетию восстания польских ссыльных на Кругобайкальском тракте) / Н. П. Митина. – М.: Наука, 1966. – 144 с.

19. *Мулина, С. А.* Мигранты поневоле. Адаптация ссыльных участников польского восстания 1863 года в Западной Сибири / С. А. Мулина. – СПб.: Алетейя, 2012. – 199 с.

20. *Мулина, С. А.* Участники восстания 1863–1864 гг. в омской ссылке: анализ численности и персонального состава / С. А. Мулина // Вопросы социальной истории России конца XVIII – начала XX вв.: сб. науч. тр. / под ред. В. Н. Худякова. – Омск: изд-во ОмГПУ, 2004. – С. 80–112.

21. *Никулина, И. Н.* Политическая ссылка на Алтай в XIX в. (20–90-е гг.) / И. Н. Никулина: дис. ... канд. ист. наук. – Томск, 1990.

22. *Радзюк, А.* Знішчэнне шляхецкіх ваколіцаў на Гродзеншчыне ў 1863–1864 гг. / А. Радзюк // Arche. – 2010. – № 12. – С. 151–173.

23. Российский государственный военно-исторический архив (РГВИА). – Фонд 801. – Оп. 92/37. – I отдел. – I стол. – 1863 г. – Д. 94. – Т. 1–38.

24. *Рощевская, Л. П.* История политической ссылки в Западной Сибири во второй половине XIX в. (60 – нач. 80-х гг.) / Л. П. Рощевская: учеб. пособие для студентов ист. ф-та по спецкурсу. – Тюмень: тип. изд-ва «Омская правда», 1976. – 138 с.

25. *Самбук, С. М.* Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. / С. М. Самбук. – Минск: Наука и техника, 1980. – 224 с.

26. *Сливовска, В.* Составление «Словаря польских ссыльных первой половины XIX в.» и компьютерной базы данных о польских ссыльных – участниках восстания 1863 г. в Институте истории Польской академии наук / В. Сливовска // Польская ссылка в России XIX–XX веков: региональные центры – Polscy zesłańcy w Rosji XIX–XX stuleciu: ośrodki regionalne. – Казань: Мастер Лайн, 1998. – С. 15–19.

27. *Сливовская, В.* Молитвенники польских ссыльных как источник сведений о судьбах поляков Восточной Сибири / В. Сливовская // Сибирско-польская история и современность: актуальные вопросы: сб. материалов Междунар. научн. конф. – Иркутск, 2001. – С. 69–72.

28. *Стшижевская, С.* Ссыльные участники Январского восстания / С. Стшижевская // Сибирь в истории и культуре польского народа: пер. с польск. – М.: Ладомир, 2002. – С. 124–134.

29. *Fajnhauz, D.* 1863. Litwa i Białoruś / D. Fajnhauz. – Warszawa: Neriton, 1999. – 367 s.

30. *Kaczyńska, E.* Wstęp / E. Kaczyńska // Zesłanie i katorga na Syberii w dziejach Polaków 1815–1914 / opr. A. Brus, E. Kaczyńska, W. Śliwowska. – Warszawa: Wydawnictwo naukowe PWN, 1992. – S. 5–166.

31. *Śliwowska, W.* Kartoteka uczestników powstania styczniowego w Instytucie Historii PAN / W. Śliwowska // Powstanie styczniowe 1863–1864. Walka i uczęstnicy. Represje i wygnanie. Historiografia i tradycja. – Kielce: Wydawnictwo Akademii Świętokrzyskiej, 2005. – S. 11–19.

32. *Śmialowski, J.* Głos w dyskusji nad referatem S. Kieniewicza / J. Śmialowski // Powstanie styczniowe. 1863. IX Powszechny Zjazd Historyków Polskich. – Warszawa: Polskie Towarzystwo Historyczne, 1964. – T. 2. Referaty i dyskusja. – S. 117–121.

33. Zesłańcy Powstania Styczniowego z Królestwa Polskiego. Wykaz nazwisk z akt w zasobie Archiwum Głównego Akt Dawnych / oprac. Z. Strzyżewska. – Warszawa: Wyd-wo NDAP, 2001. – 156 s.

Резюме

О. В. ГОРБАЧЕВА

УЧАСТНИКИ ВОССТАНИЯ 1863–1864 гг. В БЕЛАРУСИ: МЕТОДИКА СТАТИСТИЧЕСКИХ ПОДСЧЕТОВ

Рассматривается статистическая информация по истории восстания 1863–1864 гг. в Беларуси, которая базируется на трех основных подходах, сложившихся к настоящему времени в отечественной и зарубежной историографии. Данные о количестве участников восстания, репрессированных лиц, персональном составе повстанческих отрядов и др. подаются исследователями на *основе использования информации, представленной в официальном российском делопроизводстве XIX в. либо посредством применения* количественного (статистического) и просопографического методов. Доказывается, что в национальном дискурсе по-прежнему преобладает механическое заимствование количественных показателей, что приводит к нерешенности ряда основополагающих вопросов в истории восстания 1863–1864 гг. в Беларуси.

Summary

O. GORBATCHEVA

THE PARTICIPANTS IN THE UPRISING OF 1863–1864 IN BELARUS: METHODS OF STATISTICAL COUNTING

The article shows that the reporting of statistical information on the history of the uprising of 1863–1864 in Belarus is based on three basic approaches, current in national and foreign historiography. Data on the number of participants in the uprising, repressed persons, on the composition of the detachments of insurgents and other, is served researchers on the basis of use of the information in the official Russian papers of the *XIX* century, either through the application of quantitative (statistical) method and prosopography. This article argues that in the national discourse is dominated mechanical adoption of quantitative indicators, which leads to unresolved a number of fundamental issues in the history of the uprising of 1863–1864 in Belarus.

Паступіў у рэдакцыю 9.12.2013

УДК94(476)«18»(092)Каліноўскі

В. Ф. ГІГІН

ПРАПАГАНДЫСЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ В. К. КАЛІНОЎСКАГА: ВЫТОКІ, МЕТАДЫ, НАСТУПСТВЫ

У айчыннай гістарыяграфіі шмат публікацый, прысвечаных постаці Вікенція Канстанціна Каліноўскага. У іх раскрываюцца розныя рысы яго дзейнасці, біяграфіі. Аднак, нягледзячы на даволі падрабязны, як падаецца на першы погляд, разбор яго твораў, гэта праца засталася незавершанай і ў значнай ступені павярхоўнай. Між тым трэба пагадзіцца з меркаваннем Г. В. Кісялёва, які адзначаў: «І, магчыма, нават не будзе вялікім перабольшваннем, калі скажам, што Каліноўскі-тэарэтык, Каліноўскі-ідэолаг – ярчэйшы, цікавейшы за Каліноўскага-практыка, бо многае са сваіх задум яму не ўдалося ператварыць ў жыццё» [1, с. 67].

Публіцыстычная спадчына В. К. Каліноўскага атрымала ў навуковай традыцыі розныя назвы. У ёй, часам беспадстаўна, знаходзілі рысы і літаратурных, і філасофскіх твораў. Але найбольш удала можна акрэсліць іх як менавіта прапагандысцкія, калі мець на ўвазе, што прапаганда – гэта «мэтанакіраванае распаўсюджванне ў грамадстве пэўных ідэй, каштоўнасцяў, норм і праграм паводзін» [2, с. 163].

Да прапагандысцкіх твораў В. К. Каліноўскага варта аднесці найперш «Мужыцкую праўду», 7 нумароў якой выйшлі, як вядома, з ліпеня 1862 г. да чэрвеня 1863 г. Кожны нумар мае сваю акрэсленую тэматыку. Так, 1-ы і 3-і змяшчаюць крытыку сялянскай рэформы 1861 г., 2-і і 5-ы накіраваны супраць рэкруттчыны і падаткаў, 4-ы – непасрэдна супраць цара і бюракратыі, 6-ы – супраць праваслаўя і за царкоўную унію, 7-ы, выпу-

шчаны ва ўмовах спаду паўстання, заклікае да актывізацыі барацьбы. Як тыповы прыклад прапаганды трэба разглядаць і шэраг артыкулаў у польскамоўным друку (газеце «Chorągiew swobody»), а таксама «Лісты з-пад шыбеніцы», «Ліст ад Яські-гаспадара з-пад Вільні да мужыкоў зямлі польскай» (хоць некаторыя даследчыкі ставяць пад сумнеў аўтарства гэтага твора), і шэраг афіцыйных дакументаў паўстанцаў, якія асэнсавана ствараліся для масавага чытання ў публічных месцах, напрыклад, «Маніфест Часовага ўрада Літвы і Беларусі» і інш. Акрамя таго, В. К. Каліноўскі быў адным з ініцыятараў стварэння газеты «Głos z Litwy», якая выходзіла ў 1864 г.

Адной з галоўных праблем пры вывучэнні спадчыны В. К. Каліноўскага з'яўляецца сістэмнасць такіх даследаванняў. Гісторыкі і філолагі да гэтага часу не правялі тэксталагічны аналіз твораў, якія прыпісваюцца гэтаму аўтару. Мы не ведаем многія дэталі іх стварэння. Часткова такое становішча можна растлумачыць канспіратыўнымі абставінамі дзейнасці паўстанцаў. Але відавочныя і недахопы ў методыцы даследаванняў, іх пэўная абмежаванасць, схематычнасць. Сітуацыю вельмі трапна ахарактарызаваў А. Смалянчук: «Адсутнічае комплексны аналіз усіх тэкстаў «Яські-гаспадара». <...> Можна казаць толькі пра спробы такога аналізу» [4, с. 24].

Між тым прапагандысцкая дзейнасць з'яўлялася не проста адным з заняткаў В. К. Каліноўскага, але яго ўлюбёнай справай. Сам рэвалюцыянер разглядаў прапаганду сваіх ідэй, публіцыстыку ўвогуле як прыарытэтны напрамак, неад'емную прыкмету рэвалюцыйнай барацьбы і, галоўнае, найважнейшую ўмову перамогі. Ю. Каліноўскі ў сваіх паказаннях на следстве так характарызаваў памкненні В. К. Каліноўскага: «Адмовіўшыся аднойчы ад грамадства, ён не разумеў яго патрэб, і як утапіст, ён усё ж хацеў праводзіць свае ідэі ў грамадстве. Адным з яго жаданняў было выдаваць які-небудзь часопіс...» [4, с. 87].

Польскія паўстанцы надавалі масавай прапагандзе надзвычай важнае значэнне. Так, пункт 10 «Інструкцыі для ваенных начальнікаў, ваяводскіх і павятовых» прадпісваў: «Паўстанцкую прапаганду ўзняць на самы высокі ўзровень, накіроўваючы яе

асабліва на вясковых жыхароў і сялян, аднак ні ў якім выпадку не адштурхоўваць іх і не раздражняць гвалтам і дрэнным абыходжаннем» [5, с. 97].

Цікава, што ніхто з даследчыкаў творчасці В. К. Каліноўскага не выявіў дакладна вытокі яго прапагандысцкай дзейнасці. Так, па незразумелых падставах Г. В. Кісялёў піша, што да такіх вытокаў можна аднесці творчасць А. Міцкевіча, А. С. Пушкіна і чамусьці паэму «Тарас на Парнасе», якія нібыта стаялі на паліцы ў сядзібе Каліноўскіх. І амаль ніхто не звярнуў увагу на непасрэдную крыніцу натхнення, узор, па якім В. К. Каліноўскі і стварaў непасрэдна «Мужыцкую праўду». Гаворка ідзе пра так званую польскую падпольную прэсу, якая з'явілася ў 1861–1864 гадах.

Трэба ў некалькіх словах акрэсліць гэту цікавую з'яву. Ужо адразу пасля правалу Лістападаўскага паўстання 1830–1831 гг. польскія эміграцкія цэнтры спрабавалі праз кур'ераў нелегальна даставіць на тэрыторыю Расійскай імперыі сваю літаратуру, інструкцыі і звароты. Арганізаваная дзейнасць па выпуску агітацыйна-прапагандысцкай літаратуры непасрэдна на тэрыторыі самой Расійскай імперыі звязана з падрыхтоўкай новага паўстання. У жніўні 1861 г. у Царстве Польскім з'яўляецца першая падпольная газета «Strażnica», якая ўжо ў лістападзе трапляе і ў Літву. З пачаткам самаго паўстання гэта праца была арганізавана на больш высокім узроўні. У маі 1863 г. пры Нацыянальным урадзе ў Варшаве быў створаны аддзел прэсы. Усяго да ліпеня 1864 г. выйшла 304 нумары падпольнай польскай прэсы, у тым ліку ў Царстве Польскім – 212, у Галіцыі – 42, на літоўскіх землях – 23, на рускіх землях – 16, 11 – за межамі былой Рэчы Паспалітай (у Кёнігсбергу, Лондане і г. д.) [6].

Найбольш вядомымі з падпольных выданняў з'яўляюцца «Dziennik Narodowy», «Głos Kapłana Polskiego», «Kosynier», «Partyzant», «Pobudka», «Prawda», «Ruch», «Sternik», «Strażnica».

Калі чытаеш гэтыя падпольныя выданні, то нельга не звярнуць увагу на тоеснасць і падабенства многіх з польскіх нелегальных газет і твораў В. К. Каліноўскага. Польскі даследчык С. Кяневіч у прадмове да выдання «Падпольная прэса 1861–1864 гг.» з серыі «Паўстанне 1863 года: матэрыялы і дакументы»

ўзгадаў пра «Мужыцкую праўду», аднак назваў яе «выключэннем асаблівай важнасці». Потым на яго спаслаўся В. Шалькевіч, які аднак не развіў гэтую думку ў сваіх даследаваннях [7, с. 163].

Па духу, змесце, манеры падачы інфармацыі найбольш блізка да «Мужыцкай праўды» стаіць газета «Kosynier», што выходзіла з 21 жніўня па 28 верасня 1862 г. Месца яе выдання засталося невядомым, усяго выйшла чатыры нумары. Выдавалі газету Уладзіслаў Анчыц і Міхал Балуцкі [8]. Яна таксама напісана простай мовай, часам з адыходам ад літаратурных форм. Артыкулы ўтрымлівалі прамыя заклікі да насельніцтва і фактычна з'яўляліся лістоўкамі. Цікава, што формы звароту да сялян («Moi Bracia», «Włościanie») вельмі падобныя і па змесце блізкія да «дзецюкоў» В. К. Каліноўскага. Тэксталагічны аналіз дазваляе сказаць, што і ў астатніх падрабязнасцях тэксты таксама вельмі блізкія. У другім нумары «Мужыцкай праўды» В. К. Каліноўскі піша: «Ачынялі то былі мужыкі, угледзелі, што кепска, дай давай бунтаваціся пад Касцюшкаю; а Касцюшка то кажэ: "Калі мужыкі хочуць ужэ самі бараніці сваю зямлю, так няхай жэ не служаць паншчыны да і не плацяць у казну аброку за зямлю". От гэта так справядлівасць! – но што ж, калі Маскаль спыніў Маніхвэст Касцюшкі, каб не пабунтаваў усіх мужыкоў. Для таго то і пабілі Маскалі Касцюшку, бо каб мужыкі ўсе разам былі збунтаваліся і ўхапілі за сякеры, нажы і косы, так бы Маскаль мусіў бы прапасці без паўстаня, і мы на век вякоў ужэ былі бы вольныя» [5, с. 29]. Гэта амаль даслоўная калька з польскіх тэкстаў падпольнага друку. Увогуле, сюжэт з Касцюшкам быў вельмі папулярны сярод паўстанцаў. У «Лістах з-пад шыбеніцы» В. К. Каліноўскі піша: «Енарал Касьцюшка, што то, кажуць, каля Слоніма радзіўся і а каторым народ наш спявае, што ён вельмі быў добрым і маскаля крэпка біў, высказаўся ён за вольнасць нашу» [5, с. 41]. Фактычна мы маем справу з аўтарскай адаптацыяй да беларускіх умоў польскіх тэкстаў, бо ў беларускім фальклоры не выяўлена песняў, што ўсхваляюць Касцюшку.

Нарэшце, цікавай праблемай з'яўляецца і тое, да якога жанра аднесці сем выпускаў «Мужыцкай праўды». Вельмі распаўсюджана меркаванне, што гэта асобныя нумары газеты. Аднак наўрад

ці мы маем сур'ёзныя падставы так лічыць. Супраць таго, каб выданні В. К. Каліноўскага называць газетаю рашуча выступаў вядомы дзеяч беларускага руху А. Луцкевіч. У 1933 г. ён пісаў: «Цяпер <...> мы можам увачавідкі пераканацца, што газэтай "Мужыцкая праўда" не была. Гэта быў папросту цыкл адозваў пад адным агульным загалоўкам, змешчаным зверху дробным друкам, з чарговымі нумарамі (як, да прыкладу, у прыказах або цыркулярах улады). Кожны нумар змяшчаў у сабе толькі адну адозву і – нічога болей. Выходзілі яны неперыядычна і наагул з газетай не мелі нічога супольнага. <...> Характэрна, што сам жа Каліноўскі ў «Мужыцкай праўдзе» называе гэтыя лістоўкі сваімі пісьмамі, ня маючы ніякай прэтэнзіі на назову "газэты"» [9, с. 191].

Сапраўды, газета – гэта друкаванае перыядычнае выданне, якое выходзіць не радзей, чым раз на месяц. У «Мужыцкай праўдзе» нічога не сказана пра яе перыядычнасць. Акрамя таго, кожнае выданне ўтрымлівала толькі адзін артыкул, што вельмі незвычайна для газеты. Нам дакладна вядома, што паміж выхадам шостага і сёмага нумароў прайшло некалькі месяцаў. Разам з тым выдаўцы «Мужыцкай праўды» старанна маскіраваліся пад газету. У ёй нават змешчаны кошт – 5 грошаў. Відавочна, гэта было зроблена, каб павялічыць давер да выдання, надаць яму пэўную афіцыйнасць. Улічваючы ўсё гэта, лістоўкі, што выходзілі пад назвай «Мужыцкая праўда», можна акрэсліць як спецыфічны прапагандысцкі жанр – эрзац-газета.

Насуперак вельмі распаўсюджанаму меркаванню, якое, на жаль, сустракаецца і ў навуковых працах, «Мужыцкую праўду» нельга лічыць і першым альбо ўнікальным для свайго часу выданнем на беларускай мове. В. К. Каліноўскі не быў першаадкрывальнікам, ён усяго толькі ішоў у рэчышчы агульнай тэндэнцыі таго часу.

Першымі выкарыстоўваць беларускую мову ў масавым перыядычным друку пачалі не польскія паўстанцы, а царскія ўлады. У сакавіку 1861 г. у Магілёве па даручэнні губернатара Аляксандра Пятровіча Беклямішава была складзена брашура «Бяседа старога вольніка з новымі, пра іхнае дело» (31 стар.). Аўтарам яе быў, верагодна, Апанас Кісель. У 1862 г. у трох нумарах «Моги-

левских губернских ведомостей» была надрукавана на беларускай мове вершаваная «Прамова старавойта да сялян аб свабодзе (для чытання маім землякам)». Аўтар – Франц Феліксавіч Блус. Шырока распаўсюджанай была «Гутарка Данілы са Сцяпанам», а таксама больш позні «Разгавор пана з мужыком». Ва ўсіх гэтых творах антыпанскі матыў пераклікаецца з павагай да цара.

Адзін з заснавальнікаў навуковага беларусазнаўства Я. Ф. Карскі прыводзіць таксама працы прапагандысцкага характару, якія распаўсюджвалі польскія паўстанцы: «Гутарка старого дзеда» (аўтар В. Каратынскі), «Добрыя весці», «Гутарка двох суседоў», «Песні набожныя», «Перадсмертны разгавор Пустэльніка Пятра», «Крыўда і праўда» Ф. Пшыцкага і г. д. [10, с. 87–90]. Спасылаўся на іх і М. Багдановіч. Усе яны, напісаныя лацінкай, вельмі падобныя па сваіх ідэях да твораў Каліноўскага: накіраваны супраць праваслаўя («схізмы»), русафобскія па сваім змесце, утрымліваюць рэзкую крытыку непасрэдна цара. Але па форме адрозніваюцца, бо ў асноўным уяўляюць з сябе вершаваныя радкі.

Дарэчы, Я. Ф. Карскі лічыў, што творы В. К. Каліноўскага, як і іншыя прапагандысцкія матэрыялы, літаратурнага значэння не маюць [10, с. 84]. Трэба адзначыць, што ў нас няма ніякіх сведчанняў, што за выключэннем сваёй прапаганды, В. К. Каліноўскі дзесьці выкарыстоўваў беларускую мову. Уся яго перапіска ішла па-польску, як і дакументацыя паўстанцаў. Зразумела, што ў кантактах з расійскімі ўладамі В. К. Каліноўскі выкарыстоўваў рускую мову. Трэба пагадзіцца з меркаваннем А. Д. Гронскага, які лічыць, што «Каліноўскі выкарыстоўваў беларускую мову толькі ў мэтах прапаганды сярод сельскага насельніцтва» [11, с. 85].

Да таго ж у творах В. К. Каліноўскага сустракаецца вялікая колькасць паланізмаў. Вось толькі некаторыя з іх: *вшэхмоцны, здзерства, крулества, ронд, ксёнжка, мэнкі* і г. д. Усяго больш за тры дзясяткі слоў.

Як і любы прапагандысцкі дакумент, «Мужыцкая праўда» ўтрымлівае шмат недакладнай, гіпербалізаванай, нават хлуслівай інфармацыі. Вось прыклад з 7-га нумара: «Узяў пяцёх

з тысячы, а цяпер давай сто з воласці, а ў осені яшчэ можа дзвесце ці трыста захочэ, бо цар са сваімі маскалямі не падужае мужыкоў, што падняліся ў Польшчы, і не падолее Пранцуза, што за Польшчу ўступіўся. У Польшчы мужыкі таксама, як і мы, спадзяяліся на цара да ждалі волі ад няго – да як пабачылі, што цар толькі лёстачкамі душу вымае, а новымі падаткамі, некрутам да чыншамі астатню сарочку з ніх здзерці хочэ, – от усі разам з віламі да з косамі пайшлі дабівацца зямлі да праўды, а іншы і святой уніяцкай веры. От і дабіліся» [5, с. 38]. Для таго, хто ведае сапраўднае становішча рэчаў у той час, відавочна, што ў гэтым тэксце амаль ніводнае слова не адпавядае рэчаіснасці.

У сувязі з нацыянальна-дзяржаўнымі поглядамі В. К. Каліноўскага знаходзіцца праблема аўтарства іншага прапагандысцкага твора – «Ліст ад Яські, гаспадара з-пад Вільні да мужыкоў зямлі польскай». Яе аўтар кажа аб сваёй прыналежнасці да польскай палітычнай нацыіі, разглядае Літву і Беларусь як часткі агульнай Польскай зямлі і будучай адроджанай дзяржавы: «Мы, што жывемо на зямлі Польскай, што ямо хлеб Польскі, мы, Палякі з вякоў вечных. Трэба, нарэшце, і нам прыйсці да таго розуму, што адно сілаю да й касою даб'ёмся справядлівай вольнасці і веры нашых дзядоў і прадзедаў» [12].

У сучаснікаў не выклікала сумненняў, што гэты твор належыць В. К. Каліноўскаму. Менавіта такой пазіцыі прытрымліваўся Я. Гейштар. С. Пісарскі у сваім каталогу піша, што тэкст «Ліста» правіў сам Каліноўскі. Не сумняюцца ў аўтарстве В. К. Каліноўскага А. Баршчэўскі, М. Міско. Аднак супраць такога меркавання выступілі некаторыя даследчыкі: А. Станкевіч, К. Канкалеўскі, А. Смірноў, Г. Кісялёў, М. Біч. У сваіх перакананнях яны абапіраюцца на два аргументы: на «Лісце» стаіць пячатка варшаўскага Нацыянальнага ўрада, і, галоўнае, В. К. Каліноўскі не мог выказваць такіх прапольскіх думак.

Тым не менш прапольскія настроі, асэнсаванне сябе часткай польскай палітычнай нацыі зусім не супярэчылі поглядам В. К. Каліноўскага. Афіцыйны расійскі гістарыёграф польскага паўстання генерал В. Ф. Ратч сведчыў: «Каліноўскі стаяў пільным вартаўніком інтарэсаў Літвы і адстойваў, каб сродкі і сілы Літвы

зусім не ішлі б на справу Царства Польскага» [5, с. 154]. Аднак той жа аўтар, на якога найчасцей спасылаюцца падчас абмеркавання нацыянальна-дзяржаўных поглядаў В. К. Каліноўскага, некалькі разоў падкрэслівае, што ў аснове «незалежніцкіх» поглядаў В. К. Каліноўскага палягалі не нацыянальныя, а выключна сацыяльна-рэвалюцыйныя погляды: «Ён зусім не хацеў перарабіць на новы лад старыя шляхецкія традыцыі, але хацеў зрабіць Літву, якую ён мог бы ператварыць з усеагульным ураўнаваннем правоў і станаў на новых асновах камуністычнай бязглуздзіцы, якую прапаведуе Герцэн і кампанія, знаходзячы нават, што галіцыйскай разні будзе замала, каб вызваліць народ ад усякага ўплыву шляхецтва, якога і наступнае пакаленне можа ўваскрасіць з часам дамаганні цяперашнія» [5, с. 153].

Цікава, што ні ў адным з прапагандысцкіх твораў В. К. Каліноўскага не ідзе гаворка пра ідэі незалежнасці Беларусі і Літвы. Паўсюль ён застаецца верным сынам польскай Айчыны, нават ідэалізуе былыя часы Рэчы Паспалітай. Пра нейкія «сепаратысцкія» альбо «федэратыўныя» памкненні В. К. Каліноўскага да нас дайшлі выключна ўскосныя, вельмі цьмяныя і няпэўныя даныя. Аднак яго прапагандысцкая дзейнасць цалкам адпавядае поглядам самога В. К. Каліноўскага, якія ён даволі шчыра выклаў у тлумачальнай запісцы, падрыхтаванай 28 лютага, ужо за кратамі, незадоўга да пакарання. Ён пісаў: «Сець, што ахоплівае нас усіх ва ўсіх класах і ўлучае з Польшчай, мае столькі падстаў у традыцыях і нават забабонах, што распутаць яе, знішчыць і аднавіць нешта новае складае векавую, сістэматычную і разумную працу» [5, с. 145]. Іншымі словамі, сам В. К. Каліноўсукі не верыў у магчымасць адарваць край ад Польшчы. Гэтае сцверджанне ўдакладняе і адзін з сведкаў, што быў знаёмы з Каліноўскім і пакінуў успаміны – Б. Ліманоўскі. Ён адзначае, што В. К. Каліноўскі сапраўды «раўніва пільнаваўся поўнай роўнасці і самастойнасці Літвы», але адначасова ўдакладняе і прычыну прагі такой самастойнасці: «Вызваленне сялян, ператварэнне іх у грамадзян – вось галоўная мэта. Але да гэтага можна прыйсці толькі ўласнымі намаганнямі, самастойнай барацьбой». Ён жа асобна сведчыць: «Любіў ён Польшчу,

лічыў, што унія з ёй была гістарычнай неабходнасцю і што надалей яна застанецца такой неабходнасцю» [5, с. 161–162]. Потым гэты ж аўтар яшчэ раз падкрэслівае, што «люду і федэратыўнай Польшчы ён быў аддадзены сэрцам».

Адной з галоўных праблем пры вывучэнні прапагандысцкай дзейнасці В. К. Каліноўскага з'яўляецца яе эфектыўнасць. Іншымі словамі, ці знаходзіла яна водгук у тых, на каго была накіравана, гэта значыць у беларускіх сялян. Прапагандысцкія творы В. К. Каліноўскага, асабліва «Мужыцкая праўда», сапраўды шырока разыходзіліся па краі. Аднак эфект ад іх быў зусім не той, на які разлічваў аўтар, а часам нават і зусім супрацьлеглы. Цікавы рапарт прыстава 2-га стану Навагрудскага павета Езерта, які паведамляў 11 лютага 1863 г. пра рэакцыю сялян вёсак Струміліна і Заполле на чытанне «Мужыцкай праўды»: «А толькі ўсе мяркуюць і разважаюць паміж сабой, што гэта піша, верна, не Яська з-пад Вільні, а які-небудзь памешчык» [4, с. 407].

«Мужыцкая праўда» вельмі нязначна паўплывала на настроі беларускага сялянства, на якое яна непасрэдна і была разлічана. Мы ведаем, што ў сваёй пераважнай большасці сяляне не толькі не падтрымалі паўстанне, але і выступілі рашуча супраць яго.

Іван Карскі, псаломшчык і карэспандэнт этнографа П. Шэйна, так апісваў настроі сялян Гродзенскай губерні: «Палякаў не любяць увогуле, памешчыкаў жа польскіх проста ненавідзяць. У кожным паляку ім уяўляецца пан альбо ўпраўляючы пана, якія іх пастаянна пераследавалі і прыгняталі» [13, с. 21].

Жандарскі штаб-афіцэр Б. К. Рэйхарт даносіў 5 лютага 1863 г. аб настроях сялянства Мінскай губерні: «А між тым усе яны (паўстанцы. – *В. Г.*) бяссільны таму, што сяляне, колькі мне не даводзілася з імі гутарыць, выказваюць прыхільнасць да гасудара і ненавідзяць сваіх былых прыгнятальнікаў» [4, с. 402].

Падсумоўваючы, трэба адзначыць, што прапагандысцкая дзейнасць В. К. Каліноўскага не была нейкай унікальнай з'явай. Яе трэба разглядаць як своеасаблівую (беларускамоўную) плынь падпольнага польскага друку пачатку 1860-х гадоў. У значнай ступені В. К. Каліноўскі з'яўляўся носьбітам народніцкіх, сацыялістычных ідэй, распаўсюджаных у расійскім грамадстве.

У сваіх творах ён не заклікаў да стварэння незалежнай Беларусі альбо Літвы, а распальваў сацыяльную і нацыяналаьную варожасць, імкнучыся пашырыць базу паўстанцаў сярод народа. Трэба прызнаць, што намаганні В. К. Каліноўскага засталіся беспаспяховымі, бо беларускае сялянства ў пераважнай сваёй большасці не толькі не падтрымала паўстанцаў, але, наадварот, выступіла рашуча на баку расійскіх улад, што і прывяло да паражэння польскага паўстання 1863–1864 гг.

Літаратура

1. *Кісялёў, Г.* Сейбіты вечнага: артыкулы пра беларускіх пісьменнікаў і дзеячаў рэвалюцыйнага руху 1863 года; Скарынаўская сімволіка: вытокі, традыцыі, інтэрпрэтацыі / Г. Кісялёў. – Мінск: Медысонт, 2009. – 544 с.

2. *Назаретян, А. П.* Агрессивная толпа, массовая паника, слухи. Лекции по социальной и политической психологии / А. П. Назаретян. – СПб.: Питер, 2004. – 192 с.

3. *Смалянчук, А.* Беларуская гісторыя: знайсці чалавека / А. Смалянчук. – Мінск: І. П. Логвінаў, 2013. – 155 с.

4. Восстание в Литве и Белоруссии. 1863–1864 гг. / предисл. Ю. Жюгжды и В. Неупокоева; ред. кол.: В. Дьяков [и др.] – Wrocław; М.: Наука, 1965. – 586 с.

5. *Каліноўскі, К.* За нашую вольнасць / уклад., прадм., паслясл., пер. і камент. Г. Кісялёва. – Мінск: Бел. кнігазбор, 1999. – 459 с.

6. Dwieście lat polskiej prasy podziemnej // Kultura. – 1982. – № 12. – S. 91–104.

7. *Шалькевич, В. Ф.* Кастусь Калиновский: Страницы биографии / В. Ф. Шалькевич. – Минск: Университетское, 1988. – 240 с.

8. Kosynier // Wystawa wirtualna «Powstanie Styczniowe» / Biblioteka Narodowa. – 2007 [Электроны рэсурс]. – Рэжым доступу: http:// www. bn. org. pl/powstanie/index. php? url=kosynier. – Дата доступу: 30.09.2013.

9. *А. Л.* Праўда аб «Мужыцкай Праўдзе» // Гадавік Беларус. навук. тав-ва. – Вільня, 1933. – С. 191.

10. *Карский, Е. Ф.* Белорусы / Е. Ф. Карский. – Варшава; Вильна; М.; Петроград, 1903–1922. – Т. 3: Очерки словесности белорусского племени, [вып.] 3: Художественная литература на народном языке. – Петроград: [б. и.], 1922.

11. *Гронский, А.* Касусь Калиновский: конструирование героя / А. Д. Гронский // Беларус. думка. – 2008. – № 2. – С. 82–87.

12. Пісьмо ад Яські-гаспадара з-пад Вільні да мужыкоў зямлі польскай [Электроны рэсурс]. – Рэжым доступу: http:// kalinouski. arkushy. by/archives/ pismo_jaska_haspadara. htm. – Дата доступу: 28.09.2013.

13. *Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения северо-западного края: в 3 т. / П. В. Шейн. – Т. 2. – СПб, 1892. – 715 с.

Резюме

В. Ф. ГИГИН

ПРОПАГАНДИСТСКАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ В. К. КАЛИНОВСКОГО: ИСТОКИ, МЕТОДЫ, ПОСЛЕДСТВИЯ

Анализируется публицистическое наследие Викентия Константина Калиновского и те оценки, которое оно получило в научной традиции. Представляя разные концептуальные оценки этих материалов в отечественной историографии, утверждается, что в них временами безосновательно находили черты литературных и философских произведений и категорически склоняется к их оценке как пропагандистских.

Отмечается, что ни в одном произведении Калиновского не представлена его четкая позиция о перспективе государственности Беларуси и Литвы. Более того, идеализирует прошлое времен Речи Посполитой. Что же касается «сепаратистских» или «федеративных» представлений Калиновского, то они изложены в его материалах достаточно косвенно и не конкретно.

Summary

V. HIHIN

ADVOCACY OF V. K KALINOUSKI: ROOTS, METHODS, CONSEQUENCES

The article analyzes the journalistic heritage of Vintsent Kanstantsin Kalinouski and those assessments, which it received in the scholar tradition. Representing different conceptual evaluation of those materials in the national historiography, the author argues that they sometimes wrongly found features of literary and philosophical works and supposes strongly to their consideration as propaganda. It is noted that in any works of Kalinouski was not distinctly presented his position on the future statehood of Belarus and Lithuania. Moreover, he idealizes the past times of Polish-Lithuanian Commonwealth. As for the «separatist» or «federalist» submissions of Kalinouski, they represented in his works rather indirectly and not clear.

Паступіў у рэдакцыю 19.12.2013

УДК 94(476)1863/1864: 930.11–28

Д. В. КАРЕВ

ВОССТАНИЕ 1863–1864 гг. В БЕЛОРУССКОЙ ИСТОРИОГРАФИЧЕСКОЙ ТРАДИЦИИ XIX–XX вв. (ПРОБЛЕМЫ И КОЛЛИЗИИ)

История восстаний 1830–1831 гг. и 1863–1864 гг. в Польше, Литве и Беларуси уже более ста лет является объектом исследований историков Беларуси. Очевидно, что это те события, которые породили мощную волну «резонанса» в политической и культурной жизни белорусского народа. События эти вызвали много вопросов у историков о роли этих явлений в формировании белорусской нации и ее национального сознания. Однако степень внимания белорусской историографии к обоим восстаниям очень разная. Можно сказать, что восстание 1830–1831 гг. (в сравнении с восстанием 1863–1864 гг.) какой-то значительной историографической традиции в исторической памяти белорусов не создало.

Эту особенность можно объяснить несколькими причинами:

1. Сама национальная белорусская историография оформилась достаточно поздно (только в конце XIX – начале XX в.), и это сконцентрировало внимание на проблемах более актуальных и более близких доминантным моментам жизни белорусов (темы «белорусской государственности» и «возрождения» белорусов как нации);

2. Большей актуальностью в контексте политический истории Беларуси конца XIX в. резонанса восстания 1863–1864 гг.;

3. Наконец, меньший интерес темы «восстание 1830–1831 гг.» для белорусской советской историографии XX в. в сравнении с возможностью исследования главной и любимой темы советских историков-марксистов – темы классовой борьбы.

Знаменательным является тот факт, что первое и единственное белорусское исследование в период 20–30-х гг. XX в., появившееся в 1929 г., по мысли его авторов И. Шпилевского и Л. Бобровича [1] должно было стать «побудительным стимулом» для разработки «ноябрьского» восстания на местах (в Беларуси в частности). Однако этот призыв белорусских историков 1920–1930 гг. не был замечен их коллегами. И В. Ю. Ластовский, В. М. Игнатовский и М. В. Довнар-Запольский только зафиксировали сам факт восстания как одного из заметных событий политической истории Беларуси первой половины XIX в., однако само явление не комментировали. Указывалось на его значение главным образом с точки зрения влияния на изменение государственной политики России в Беларуси (русификация, первое наступление на позиции костела, ликвидация униатской церкви, «разбор шляхты», ликвидация «литовского права» в белорусско-литовских губерниях и др.) [2]. Практически проблемы восстания 1830–1831 гг. оставались не исследованными до начала 90-х гг. XX в. Те историографические клише, которые путешествовали по страницам учебников по истории Беларуси и в работах, посвященных революционному движению в крае, в 40–80-х гг. XX в. повторяли оценки российских историков XIX в. о «шляхетском и польском характере» вооруженного восстания 1830–1831 гг.

Большее внимание обращалось на нереализованную программу «левицы» и на постановку крестьянского вопроса в программах этого движения. Ориентационной основой, которая определила характер историографических оценок тех лет, являлась оценка «польских» восстаний XIX в., данная К. Марксом, Ф. Энгельсом, В. Лениным (правда, в несколько сокращенном варианте), и быстро меняющийся в те годы политический контекст советско-польских отношений [3].

В белорусской историографии до сегодняшнего дня не издано ни одного сборника документов по этой тематике. В научно-популярных публикациях начала 90-х гг. XX в. обозначились две тенденции: 1) попытка «обелорусить» ноябрьское восстание, представить его «общенародным» делом белорусов, тесно свя-

занным с событиями в Польше и направленным против «колониальной» политики России [4]; и 2) показ восстания с позитивистско-фактографической точки зрения, максимально игнорируя моменты, связанные с его толкованием [5].

Единственная в Беларуси кандидатская диссертация по теме восстания 1830–1831 гг. была защищена в 1995 г. (О. В. Горбачева). Исследовательница пробует балансировать на основе вышеуказанных двух тенденций, не добавляя ничего нового (в концептуальном плане) к уже имеющимся историческим наработкам [6].

Такая ситуация в разработке важной научной проблемы, каковой является история восстания 1830–1831 гг., в белорусской историографии объясняется несколькими причинами, связанными как с низким уровнем его концептуального осмысления, так и существенными упущениями в подходах к исследованию этой проблемы: 1) проблема не осмыслена как органическое звено целой полосы восстаний конца XVIII – XIX в., которые происходили на территории бывшей Речи Посполитой; 2) очень слабо проанализирован и обработан богатый историографический «след» традиций изучения проблемы, который формируется в польской, российской, украинской и литовской исторической науке второй половины XIX – XX в.; 3) не подвергалась «инвентаризации» и не включена в источниковое поле реконструкции проблемы богатая археографическая традиция. Такое состояние проблемы может породить «новое» только с точки зрения появления публикаций или привести к тому, что события восстаний 1830–1831 гг. и 1863–1864 гг. станут вспомогательным материалом для политико-идеологических спекуляций современной публицистики.

В тематике восстания 1863–1864 гг. белорусской историографии повезло значительно больше. Можно сказать, что на развитие белорусской историографии первого пореформенного двадцатилетия (1861–1881 гг.) наибольшее влияние оказал тот резонанс, который был вызван в общественно-политической жизни России кровавыми событиями восстания 1863–1864 гг. и средствами его подавления. Они сконцентрировали внимание правительственной России и российского общества на западных губерниях империи. Эти события заставили многих публици-

стов, общественных и политических деятелей, ученых России открыть для себя Беларусь и «белорусский вопрос» не только как реалию политической жизни империи, но и как явление, имеющее свои исторические корни.

Это открытие в Беларуси прежде всего было сделано представителями правительства и руководством Святейшего Синода. Их влияние на белорусскую историографию в 60–70-х гг. XIX в. было решающим и сохранялось вплоть до начала XX в. После подавления восстания 1863–1864 гг. в целях контрпропагандистской игры против европейской прессы, по-своему (в антироссийском духе. – *Д. К.*) толковавшей эти события, царское правительство задалось целью доказать, что западные районы империи были районами русскими, которые были испорчены в XVII–XVIII вв. «узурпаторами-поляками». Для возрождения «русской народности и православной веры» в крае правительство мобилизовало целую систему административно-полицейских и идеологических средств.

Белорусская «тематика» создала в 60–70-е гг. XIX в. литературную традицию этой проблемы в газетах, журналах и книгах империи. В это же время образованное общество России получило информацию об этнографическом составе населения западных губерний и получило первое системное (по заказу правительства) понятие о его истории. Оно было внедрено в общественное сознание через представителей официального и клерикально-православного направлений историографии Беларуси, которые проводили великодержавно-монархические идеи: о «естественности, справедливости и правомочности государственного объединения» белорусских и литовских губерний с империей; о «воссоединении» без насилия униатов с православной церковью на Полоцком соборе 1839 г.; о восстании 1863–1864 гг. как «бунте польской шляхты, которая опасалась того, что Российское правительство после освобождения крестьян перетянет их на свою сторону». Эти исторические взгляды были провозглашены и внедрены в общественное сознание России под лозунгом «За упрочение в крае российских исторических начал» (М. О. Коялович и школа «западнорусов») [7].

Идеи западнорусизма распространялись и в конце XIX в., когда в Вильно в 1898 г. был открыт Муравьевский музей, большинство сотрудников которого были уроженцами Беларуси. В своих публикациях они трактовали события восстания 1863–1864 гг. как проявление «бунта польских панов», вносящего «несогласие в российскую семью». Политика М. Н. Муравьева-Виленского толковалась как «светлый этап» истории, заслуживший название «муравьевской эпохи».

Демократическое направление белорусской историографии смогло концептуально реализовать свое отношение к восстанию 1863–1864 гг. только в 20-х гг. XX в., – в период проведения политики «белорусизации» в БССР (М. Довнар-Запольский, А. Шлюбский, А. Цвикевич, Ф. Турук, И. Витковскиий, В. Игнатовский и др.) [8]. В это время, которое можно определить как переходное от ограниченного концептуального плюрализма до установления в исторической науке БССР марксистско-сталинской идеологии, проявились две тенденции освещения восстания 1863–1864 гг. Первая из них, представленная бывшими белорусскими эсерами, которые «перешли к коммунистам» (В. Игнатовский), характеризовала восстание с позиций вульгарно-социологических схем «классовой борьбы» и «подготовки предпосылок» Октябрьской революции в России. Активно, хотя и выборочно, были использованы оценки восстания 1863–1864 гг., данные Марксом, Энгельсом и Лениным. Политический элемент в этих работах доминировал над целями научного исследования. Очень слабо и фрагментарно использовались источники. Для большей части работ этого периода характерна ощутимая политическая ангажированность предвзятых схем. В 20-х гг. XX в. была опубликована первая биография Калиновского, в которой определялись его место и роль как руководителя восстания в Беларуси и Литве, опубликованы издания 3, 5 и 7-го номеров «Мужыцкай праўды», поставлены вопросы об участии крестьян Беларуси в восстании. В основе своей это были статьи, подготовленные на основе источников, опубликованных еще в конце XIX в., архивные материалы были использованы в незначительной степени [9].

Наиболее известный представитель этой тенденции, официальный глава исторической науки БССР, первый президент Белорусской академии наук В. Игнатовский в 1928 г. охарактеризовал восстание 1863–1864 гг. в такой концептуальной формуле: в период реализации крестьянской реформы произошло второе польское восстание 1863 г. Оно значительно затронуло и Беларусь, сделавшись тут, с одной стороны, крестьянским движением, направленным против панов, а с другой – политическим национально-освободительным движением, направленным против царизма. После создания в Варшаве повстанческого правительства в то же время и в Вильно было организовано литовско-белорусское руководство восстания. Руководство это очень выразительно делилось на две части – «белых» и «красных». «Белые» были представлены крупными белорусскими помещиками, которые выступали за создание великой Польши с сохранением общественного строя в Беларуси. «Красных» представляла мелкая шляхта, частично уже безземельная, а также интеллигенция простонародного происхождения, настроенная в радикально-народническом духе. Она ставила перед собой в качестве радикальной цели разрешение крестьянского вопроса и создание независимой от России и Польши Белорусской республики.

Сотрудничество в начале восстания этих двух группировок замедляет движение в Беларуси. Крестьяне, видя участие в восстании панов, не идут за повстанцами. Положение меняется, когда «красные» отделяются от «белых» и берут власть в свои руки. Во главе восстания в Беларуси становится революционер-народник, «красный диктатор» К. Калиновский. Движение приобретает антишляхетский характер. Крестьяне начинают прислушиваться к воззваниям «красных» и принимают участие в восстании. Напротив, «белая» часть повстанцев открыто переходит на сторону Муравьева-вешателя. «Красные» сражаются на два фронта: против «белых» – предателей и против Российского правительства. Такая борьба превышает их силы, и восстание постепенно начинает затухать [10].

Политические репрессии против деятелей «Второго белорусского Возрождения» в конце 20-х гг. XX в. породили к жизни вторую тенденцию в белорусской историографии восстания 1863–1864 гг. Ее можно охарактеризовать как реанимацию позиций «западнорусизма» в условиях коммунистического, советского режима. Представляющий ее глава Института истории партии при ЦК КП(б)Б С. Агурский, который стал позднее одним из инициаторов кампании борьбы с «национал-демократизмом» (к числу последних был причислен В. Игнатовский. – *Д. К.*), издал в 1928 г. книжку «Очерк истории революционного движения на Беларуси (1863–1917)». В этой книжке, полемизируя с «буржуазными националистами», он представляет восстание не как «общенародное», а как «организованное шляхтой и духовенством». Восстание проходило под «шовинистическим лозунгом», и «широкие массы крестьянской и городской бедноты» в нем не участвовали [11].

В таком контексте Калиновский выглядел как явный предтеча белорусских «националистов». Только в 1939 г., когда критики белорусских «нацдемов» сами были уничтожены молохом сталинских репрессий 1937–1939 гг., стала возможной частичная «реабилитация» восстания 1863 г. и К. Калиновского. Белорусский историк И. Лочмель снова обратил внимание исследователей на связь реформы 1861 г. и событий 1863–1864 гг., а Калиновского оценил как сторонника прогрессивных революционно-демократических идей Герцена и Чернышевского [12]. Оценку эту в те времена не разделяла большая часть исследователей. Характерно, что В. Пичета, который опубликовал в 1940 г. специальную работу об антифеодальных движениях в Беларуси и на Украине, даже не вспомнил о восстании 1863 г.

Такое игнорирование проблемы в историографии тех лет было отражением событий очередного раздела II Речи Посполитой, произошедшего в результате сговора Гитлера и Сталина в августе-сентябре 1939 г. Очевидно, что в таком политическом контексте заниматься личностью Калиновского, которого на XII съезде КПБ (1929 г.) Агурский назвал «мифическим героем», а в 1934 г. академик В. Щербаков «идеологом белорусской и польской шляхты», было делом небезопасным [12].

В таких условиях рождалось множество политизированных мифов, не имеющих ничего общего с реальной исторической действительностью 1863–1864 гг. Так, в книге И. Лочмеля восстание белорусских крестьян в Могилевской и Витебской губерниях, происходившее под лозунгом борьбы с повстанцами, автор оценил как движение прогрессивное, а восстание под руководством К. Калиновского декларативно представил как крестьянское, направленное против польских, российских и белорусских дворян и царских чиновников [12]. Достаточно противоречиво оценили восстание Н. Никольский, Д. Дудков, И. Лочмель в вводной статье ко второму тому «Документов и материалов по истории Беларуси» (Минск, 1940). Согласно их оценке, в Польше восстание было революционным, народно-освободительным, в Беларуси же – нет, поскольку народ Беларуси не выступал против российского правительства и отрицательно относился к польскому восстанию. Одновременно К. Калиновский был признан руководителем «крестьянского восстания» в Беларуси. По логике этих авторов восстание в Беларуси «под руководством Калиновского» было направлено не против царизма, а против «польской шляхты» [14].

Активное создание «историко-политизированных» мифов в трактовке проблем восстания 1863–1864 гг. продолжалось в историографии БССР и во второй половине 40 – начале 50-х гг. XX в. К старому мифу о «крестьянском характере» восстания в Беларуси, в 1945 г. академик АН БССР В. Перцев добавил «легенду» о К. Калиновском как «крестьянском революционере», который отстаивал создание суверенной Литовско-Белорусской республики, «независимой и от панской Польши и от имперско-правительственной России» [15].

Характерной чертой научной стилистики мифотворцев был дефицит ссылок на источники таких «реконструкций». Традиция В. Перцева относительно Калиновского, как предводителя крестьянского восстания в Литве и Беларуси, как выдающегося белорусского революционера-демократа и ученика «великих российских демократов», который мечтал о тесной федеративной связи Беларуси с революционной Россией, была развита в статьях белорусского философа И. Лущицкого, опубликованных в 40–50-х гг. XX в. [16].

К сожалению, вне поля внимания белорусских историков того периода остались вопросы истории шляхты, буржуазии, интеллигенции, характера белорусского национального движения, его идеология и исследования политики царизма в Беларуси в социально-культурной и национальной сфере. Эти моменты часто показывали низкое качество теоретического уровня осмысления проблемы восстания 1863–1864 гг., сильного влияния старого историографического наследия трактовки тех событий. Несмотря на это, начало поворота к научному исследованию этих проблем состоялось именно в указанные годы.

В подготовленной советско-польской серийной публикации «Восстание 1863 г.» два тома были посвящены непосредственно событиям в Литве и Беларуси [18]. В 1959 г. в Москве, а в 1963 г. в Минске были изданы две монографии А. Смирнова, посвященные К. Калиновскому, в 1962–1964 гг. – исследование этого же автора, посвященное восстанию 1863–1864 гг. в Беларуси и Литве. В связи со столетием восстания, в 1963 и 1966 гг. в Минске изданы книги Г. Киселева. Во время дискуссии конца 1960 – начала 1970-х гг. удивительное соединение двух борющихся элементов (старых схем и новой информации) создавало внутреннее противоречие концептуальных «реконструкций и эмпирического материала», которое приводило внимательного читателя к выводам и вопросам, прямо противоположным намерениям авторов публикаций тех лет. С этой точки зрения очень представительным выглядит творческое наследие А. Смирнова, взгляды которого на проблемы восстания 1863–1864 гг. на протяжении 50–60-х гг. XX в. претерпели значительную эволюцию. Однако принципиального отхода от главных позиций 40–50-х гг. XX в. не было. Хотя шляхетскому «элементу восстания» в работах 1960-х гг. Смирнов уделял большее внимание, но главная проблема исследования – отношение белорусских и литовских крестьян к вооруженной борьбе – аргументированного освещения так и не получила. В монографии ученого (1963 г.) выдвигается масса общих положений о характере и силах, определявших восстания в Литве и Беларуси, которые взаимно исключают друг друга и не соответствуют данным привлеченных источни-

ков. Считая восстание народным, историк одновременно отмечает, что «демократические силы не могли придать общественному движению народного характера». Крестьянское движение 1863 г. в Беларуси и Литве историк отождествляет с борьбой повстанцев в этих регионах. Приводимые данные об участии «простых людей», привлеченных к судебной ответственности, не дают возможности точно выяснить вопрос о количестве крестьян в общей массе повстанцев. Проблему анализа движущих сил восстания автор часто подменяет вопросом о борьбе революционно-демократического и реформистско-националистического направлений его руководства [17].

В 80-х гг. XX в. в центре внимания белорусских историков оказались вопросы, касающиеся роли Калиновского в восстании 1863–1864 гг., его личности и общественно-политических взглядов. Монографических исследований создано не было.

К 150-летию со дня рождения К. Калиновского был издан сборник статей юбилейной конференции (1988 г.), а также сборник документов «К. Калиновский. Из печатного и рукописного наследия» (1988 г.) [18].

Впервые были собраны в комплексе документы и материалы, позволяющие издателям дать более целостное и панорамное представление о личности и взглядах одного из руководителей восстания 1863–1864 гг. в Литве и Беларуси. Однако археографическая подборка документов и их подача в некоторых случаях вызывают существенное замечание. В частности это касается «Писем из-под виселицы», во время публикации которых составители сборника допустили значительные купюры, позволили себе поправить К. Калиновского. В своей монографии, посвященной К. Калиновскому [19], один из авторов сборника В. Шалькевич, приводит некоторые данные об эпохе и биографии Калиновского, основанные на традиционных для историографии 50–60-х гг. XX в. позициях.

Анализ белорусской историографии о жизни и деятельности Калиновского привел белорусского историка М. Бича к следующим выводам: 1) о необходимости создания новой научной биографии революционера без упрощений и искажений его взглядов

и характера революционной деятельности; 2) об актуальности написания фундаментальной истории восстания 1863–1864 гг. в Беларуси [20].

Однако призыв Бича не был реализован белорусскими историками ни в 90-е годы XX в., ни в начале XXI в. Белорусская национальная историография последнего десятилетия, как нам представляется, в исследовании данной проблемы должна пойти более длинной, но одновременно более верной дорогой: 1) освоения и анализа предыдущей историографической традиции (как отечественной, так и заграничной, прежде всего польской) и источникового «поля» событий (статьи А. Мухи, А. Смоленчука) [22]; 2) анализа наиболее сложных, дискуссионных сторон восстания (аграрный вопрос, роль конфессий в восстаниях и др.) [22].

В тех случаях, когда белорусские исследователи пробовали в начале 90-х гг. XX в. «поставить телегу перед лошадью» неизменно происходил отход либо к народническим схемам и мифам 20-х гг. XX в. (М. Бич, Г. Саганович, В. Орлов, И. Саверченко) [23] либо (вторая половина 90-х гг. XX в.) к версиям, очень близким своей идеологией западнорусизму (публикации В. Черепицы, авторов учебников по истории Беларуси для высшей школы под ред. Е. Новика и Г. Марцуля) [24].

Несомненно, сегодняшняя борьба белорусских историографических контроверсий по проблемам восстания 1863–1864 гг. часто зависит в значительной степени больше от политической позиции автора, чем от весомости представленных научных аргументов. Доминирование политизированной публицистики над конкретными историческими, источниковедческими исследованиями, нежелание и неумение слышать доводы оппонента, отсутствие солидных источниковедческих работ приводит к тому, что в современной белорусской историографии отсутствует монографическая работа, в которой бы конкретный анализ событий 1863–1864 гг. был соединен с анализом источников, на базе которых эти события реконструировались. Примечательно общее для белорусских исследователей данной проблемы слабое внимание, а в лучшем случае декларатив-

ное признание роли общеевропейского (внешнеполитического) и польского контекста восстания 1863–1864 гг. Все это отражается на деформированном восприятии белорусских «элементов» событий в общей системе «исторических составляющих» восстания как явления общеевропейского.

Поскольку сегодня на первый план в исследовании проблемы выходят работы источниковедческого жанра, постольку всякая новая нетенденциозная публикация документальных комплексов будет в наибольшей степени способствовать развязыванию тугих, дискуссионных «узлов», созданных в процессе долгого историографического бытования проблемы.

Литература

1. *Шпілеўскі, І., Бабровіч, Л.* Сынхраністычная табліца падзей паўстання на Беларусі, Літве і Польшчы ў 1830–1831 гг. / І. Шпілеўскі, Л. Бабровіч // Наш край. – 1929. – № 10. – С. 18–45.

2. *Ластоўскі, В. Ю.* Кароткая гісторыя Беларусі / В. Ю. Ластоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1992. – 126 с.; *Ігнатоўскі, У. М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. М. Ігнатоўскі. – Мінск: Беларусь, 1991. – 190 с.; *Доўнар-Запольскі, М. В.* Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі. – Мінск: Беларус. энцыкл., 1994. – 510 с.

3. *Чепко, В. В.* Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в. / В. В. Чепко. – Минск: Наука и техника, 1972. – 265 с.; *Козловский, П. Г.* Землевладение и землепользование в Белоруссии в XVIII – первой половине XIX в. / П. Г. Козловский. – Минск: Наука и техника, 1982. – 206 с.; *Улащик, Н.* Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. / Н. Улащик. – М.: Наука, 1965. – 480 с.; *Юхо, Я.* Кароткі нарыс дзяржавы і права Беларусі / Я. Юхо. – Мінск: Універсітэцкае, 1992. – 270 с.

4. 100 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі. – Мінск: Рэд. газ. «Звязда», 1993. – 80 с.; *Талерчык, А.* Лістападаўскае паўстанне 1830 г. і ўдзел у ім Міхала Валовіча / А. Талерчык // Спадчына. – 2000. – № 2. – С. 58–85; *Арлоў, У., Сагановіч, Г.* Дзесяць вякоў беларускай гісторыі (1862–1918) / У. Арлоў, Г. Сагановіч. – Вільня: Наша будучыня, 1999. – 223 с.; *Грыцкевіч, А. П.* Паўстанне 1830–1831 гг. у Польшчы, Беларусі і Літве / А. П. Грыцкевіч // Энцыкл. гісторыя Беларусі. – Т. 5. – Мінск: Беларус. энцыкл., 1999. – С. 447–448.

5. *Осмоловский, В. П.* История Беларуси: вопросы и ответы. – Минск: Беларусь, 1993. – 206 с. – С. 43–48.

6. *Горбачева, О. В.* Восстание 1830–1831 гг. на Беларуси: дис.... канд. ист. наук: 07.00.02 / О. В. Горбачева. – Минск, 1995. – 113 с.; *Она же.* – Вынікі і наступствы паўстання 1830–1831 гг. // Беларус. гіст. часоп. – 1999. – № 4. – С. 80–83.

7. *Цьвікевіч, А.* «Западно-руссизм»: Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX – пачатку XX в. / А. Цвікевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.; *Карев, Д. В.* Белорусская историография в конце XVIII – начале XX вв.: автореф. дисс. ... д-ра ист. наук: 07.00.09 / Д. В. Карев. – Минск, 1996. – 36 с.

8. *Доўнар-Запольскі, М. В.* Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі. – Мінск: Беларус. энцыкл, 1994. – С. 273–280; *Ігнатоўскі, У. М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. М. Ігнатоўскі. – Мінск: Беларусь, 1991. – 190 с.; *Цьвікевіч, І.* Кастусь Каліноўскі: біагр.-гіст. нарысы / І. Цьвікевіч // Полымя. – 1924. – № 2. – С. 3–18; *Шлюбскі, А.* «Мужьщкая праўда» і К. Каліноўскі / А. Шлюбскі // Полымя. – 1926. – № 1. – С. 160–166; *Мялешка, М.* Сялянскае пытаньне ў час паўстаньня 1863 г. у Беларусі / М. Мялешка // Полымя. – 1926. – № 8. – С. 179–186; *Васілеўскі, Д.* Сялянства Віцебскай і Магілёўскай губэрні ў паўстаньні 1863 г. / Д. Васілеўскі // Полымя. –1928. – № 6. – С. 148–161; *Ігнатоўскі, У. М.* 1863 год на Беларусі. Нарыс падзей / У. М. Ігнатоўскі // Запісы аддзелу гуманітарных навук. Працы Інстытуту гістарычных навук. – Менск: Бел. АН, 1930. – 274 с.; *Пічэта, В. І.* Формы нацыянальнага і апазіційнага руху на Беларусі / В. І. Пічэта // Полымя. – 1924. – № 2. – С. 142–162.

9. *Михнюк, В. Н.* Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919–1941 гг.) / В. Н. Михнюк. – Минск: Наука и техника, 1985. – 284 с.

10. *Ігнатоўскі, У. М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. М. Ігнатоўскі. – Мінск: Беларусь, 1991. – 190 с.

11. *Агурский, С.* Очерки по истории революционного движения в Белоруссии (1863–1917) / С. Агурский. – Минск, Белорус. гос. изд-во, 1928. – 348 с.

12. *Лочмель, И.* Очерк борьбы белорусского народа против польских панов / И. Лочмель. – М.: Воениздат, 1940. – 164 с.

13. Стенографический отчет XII съезду КП(б)Б. – Минск, 1929. – С. 48–49; *Шчарбакоў, В. К.* Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі / В. К. Шчарбакоў. – Менск: Бел. АН, 1934. – 105 с.

14. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. II. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1940. – 938 с.

15. *Перцаў, В. М.* Кастусь Каліноўскі / В. М. Перцаў // Полымя. – 1945. – № 9. – С. 138–141.

16. *Лушчыцкі, І.* Сацыяльна-палітычныя погляды Кастуся Каліноўскага / І. Лушчыцкі // Полымя. – 1949. – № 8. – С. 123–131; *Он же.* Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі ў другой палове XIX ст. – Мінск: БДУ, 1958. – 370 с.

17. Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861–1862 гг.: материалы и документы. – М.: Наука, 1964. – 707 с.; Восстание в Литве и Белоруссии 1863–1864 гг. – М.: Наука, 1965. – 586 с.; *Смірнов, А. Ф.* Кастусь Калиновский / А. Ф. Смирнов. – Минск, Госиздат БССР, 1963. – 200 с.; *Кісялёў, Г.* Сейбіты вечнага / Г. Кісялеў – Мінск: Дзярж. выд-ва БССР, 1963. – 304 с.

18. Константин Калиновский / [сост. Я. И. Мараш]. – Гродно, 1988; Кастусь Калиновский: из печатного и рукописного наследия. – Минск: Беларусь, 1988. – 207 с.

19. *Шалькевич, В. Ф.* Кастусь Калиновский. Страницы биографии / В. Ф. Шалькевич. – Минск: Университетское, 1988. – 240 с.

20. *Біч, М.* В. К. Каліноўскі і паўстанне 1863 г. у працах беларускіх савецкіх гісторыкаў / М. В. Біч // Весці АН БССР. – Сер. грамад. навук. – 1989. – № 3. – С. 118.

21. *Муха, А. Л.* Некаторыя пытанні паўстання 1863–1864 гг. у сучаснай зарубежнай гістарыяграфіі / А. Л. Муха // Весці НАН Беларусі. – Сер. грамад. навук. – 1999. – № 5–6. – С. 78–86; *Смалянчук, А.* Кастусь Каліноўскі ў польскай гістарычнай традыцыі / А. Смаленчук // Спадчына. – 1998. – № 2. – С. 84–105; *Stankiewic, A.* «Muzyckaja Prauda» i ideja nezaleznsci Bielarusi / A. Stankiewic // Спадчына. – 1998. – № 2. – С. 10–51.

22. *Біч, М.* Нацыянальнае і аграрнае пытанні ў час паўстання 1863–1864 гг. / М. Біч // Беларус. гіст. часоп. – 1993. – № 3. – С. 36–46; *Грыгор'ева, В. В.* Каталіцкае і праваслаўнае духавенства ў паўстанні 1863 г. / В. Грыгор'ева // Беларус. гіст. часоп. – 1993. – № 3. – С. 46–50.

23. *Біч, М. В.* Дзяржаўнасць Беларусі: станаўленне, барацьба за аднаўленне / М. В. Біч // Беларус. мінуўшчына. – 1993. – № 5–6. – С. 6–7; *Арлоў, У., Сагановіч, Г.* Дзесяць вякоў беларускай гісторыі (1862–1918) / У. Арлоў, Г. Сагановіч. – Вільня: Наша будучыня, 1999. – 223 с.; 100 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі. – Мінск: рэд. газ. «Звязда», 1993. – 80 с.

24. *Черепица, В. Н.* Михаил Осипович Коялович. История жизни и творчества / В. Н. Черепица. – Гродно: ГрГУ, 1998. – 328 с.; Гісторыя Беларусі: у 2 ч. Ч. 1. / пад рэд. праф. Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – 416 с.

Рэзюме

Д. У. КАРАЎ

ПАЎСТАННЕ 1863–1864 гг. У БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІЧНАЙ ТРАДЫЦЫІ КАНЦА XIX – XX ст. (ПРАБЛЕМЫ І КАЛІЗІІ)

Вызначаюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця поглядаў на характар і спецыфіку паўстання 1863–1864 гг. у беларускай гістарыяграфічнай традыцыі канца XIX – пачатку XX ст. Канкрэтызуюцца слабыя месцы гэтых пазіцый і кола пытанняў, якое патрэбна вывучаць больш дэталёва і аргументавана. Фіксуецца адсутнасць у беларускай гістарыяграфіі на сённяшні дзень сінтэзнай, абагульняючай працы па гэтай праблематыцы.

Summary

D. KAREV

THE UPRISING OF 1863–1864 IN BELARUSIAN HISTORIOGRAPHIC TRADITION OF THE END OF XIX – BEG. XX CEN. (PROBLEMS AND COLLISIONS)

In this article the author determines the main tendencies in the development of views on the character and specifics of the Uprising in 1863–1864 in Belarusian historiographic tradition of the end of XIX – beg. XX cen. The holes in these positions and a range of questions for a thorough study are being defined. The lack of a summary work on the problem in the present-day Belarusian historiography is being fixed.

Паступіў у рэдакцыю 16.12.2013

УДК 94(476) «1863/1864»:930(476)

М. П. КАСЦЮК

ЭВАЛЮЦЫЯ АЦЭНАК ПАЎСТАННЯ 1863–1864 гг. У БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ АПОШНІХ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯЎ XX – ПАЧАТКУ XXI ст.

Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі і Літве – гераічны акт вызвольнай барацьбы супраць самадзяржаўнага праўлення ў Расійскай імперыі. Яно выклікала і працягвае выклікаць павышаную ўвагу да многіх бакоў яго падрыхтоўкі, правядзення, да асобаў кіраўнікоў, лёсаў многіх іншых удзельнікаў.

У першую чаргу, усё гэта асэнсоўваецца гісторыкамі тых краін, дзе яно адбывалася, у тым ліку Беларусі. Гэтая цікавасць, натуральна, узрастае ў сувязі з юбілеямі паўстання – яго стагоддзем, а ў наш час, з 150-годдзем з часу яго пачатку. Да гэтых дат прымеркаваны пэўныя мерапрыемствы розных напрамкаў, у тым ліку правядзенне навуковых сесій, уключаючы цяперашнюю Міжнародную навуковую канферэнцыю.

Больш пільная ўвага да гэтай падзеі ў гісторыі Беларусі XX стагоддзя была звязана менавіта са 100-гадовым юбілеем паўстання. На радзіме К. Каліноўскага, у гарадскім пасёлку Свіслач Гродзенскай вобласці 29–30 чэрвеня 1963 г. была праведзена навуковая сесія, прысвечаная гэтай даце. Яе арганізатарамі выступілі Інстытут гісторыі Акадэміі навук БССР і кафедра гісторыі Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Я. Купалы.

Уступнае слова на навуковай сесіі зрабіў першы сакратар Гродзенскага сельскага абласнога камітэта КПБ У. Ф. Міцкевіч. Акадэмічны Інстытут гісторыі быў прадстаўлены яго дырэктарам І. С. Краўчанкам і шэрагам супрацоўнікаў. З дакладам «Сто-

летие со дня восстания 1963 года» выступіла старшы навуковы супрацоўнік інстытута, кандыдат (будучы доктар) гістарычных навук С. М. Байкова (Самбук).

Характэрна, што на дадзенай навуковай сесіі выступіў старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН СССР, доктар гістарычных навук А. Ф. Смірноў. Тэма яго даклада – «К. Калиновский в оценке исторической науки». Літва была прадстаўлена вучоным сакратаром Інстытута гісторыі АН Літоўскай ССР М. І. Зараўскайтэ. Яе выступленне – «Восстание 1863 года на территории Литвы». Прадстаўляць Гродзенскі дзяржпедінстытут было даручана мне, яго студэнту. Тэма майго выступлення – «Участие крестьян Слонимщины в восстании 1863 г.». Даклады рабіліся выключна на рускай мове.

На гэтай навуковай сесіі з улікам тагачасных навуковых падыходаў быў адлюстраваны ход паўстання з канцэнтрацыяй увагі да падзей на беларускай тэрыторыі, да асобы Кастуся Каліноўскага і яго некаторых паплечнікаў, да мясцін, дзе ён нарадзіўся і вырас. На працягу сесіі пэўным чынам была ўшанавана яго памяць. Аднак матэрыялы канферэнцыі выдадзены не былі, хаця ў Мінску з'явілася вуліца К. Каліноўскага.

Звяртае на сябе ўвагу акалічнасць, што ў тыя часы найбольш актыўна гісторыяй паўстання займаўся маскоўскі даследчык А. Ф. Смірноў. У 1959 г. у Мінску на беларускай мове ім была выдадзена кніга «Кастусь Каліноўскі ў паўстанні 1863 года». Затым, у 1963 г., у сувязі са 100-годдзем паўстання ён надрукаваў у Маскве сваё даследаванне «Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии». У гэтых публікацыях прыведзены значны дакументальны матэрыял па дадзенай тэме, у тым ліку які датычыцца асобы К. Каліноўскага. Падыходы аўтара да падзей паўстання і да яго дзеячоў, хаця і вызначаліся тагачаснай інтэрпрэтацыяй, але былі дастаткова ўзважанымі.

Прыкладна праз 10 гадоў пасля 100-годдзя з часу паўстання на яго гісторыю таксама была звернута павышаная ўвага ў сувязі з выданнем гісторыі Беларусі ў 5 тамах, хоць у тыя часы дадзеная праца называлася «Гісторыя Беларускай ССР». Даволі сур'ёзнае адлюстраванне гісторыя паўстання знайшла ў другім

томе – «Беларусь у перыяд капіталізму (1861–1917 гг.)». Гэтая кніга выйшла ў 1972 г. У ёй паўстанню прысвечаны асобны раздзел памерам у 25 старонак, аўтарам якога з'яўлялася С. М. Самбук. Ён быў выкананы на вялікім фактычным матэрыяле, натуральна, з тагачаснымі падыходамі, але з імкненнем да навуковай аб'ектыўнасці і ў пэўнай ступені адлюстраваннем беларускага пункту гледжання на гісторыю паўстання. Гэта стала вынікам не толькі пазіцыі аўтара, але галоўнага рэдактара тома, члена-карэспандэнта К. І. Шабуні і старшыні галоўнай рэдакцыйнай калегіі акадэміка І. М. Ігнаценкі.

Новы этап у асвятленні гісторыі паўстання 1863–1864 гг. на Беларусі і ролі яго дзеячоў на чале з К. Каліноўскім наступіў у канцы 1980 – пачатку 1990-х гадоў у сувязі з правядзеннем палітыкі перабудовы, распадам сацыялістычнай сістэмы і СССР, утварэннем суверэннай, незалежнай дзяржавы – Рэспублікі Беларусь. Гэтая дзейнасць, як і пераасэнсаванне іншых праблем беларускай гісторыі, ажыццяўлялася і працягвае ажыццяўляцца на аснове нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі гісторыі Беларусі.

А пачыналася ўсё гэта, у прыватнасці, у 1988 г. Я маю на ўвазе правядзенне тады юбілейнай канферэнцыі ў Гродне, прысвечанай 150-годдзю з часу нараджэння К. Каліноўскага і 125-годдзю паўстання. Уступнае і заключнае словы на канферэнцыі зрабіў акадэмік-сакратар Аддзялення грамадскіх навук АН БССР М. В. Бірыла. Сярод іншых былі заслуханы даклады маскоўскага даследчыка А. Ф. Смірнова «Выдатны сын беларускага народа», беларускага гісторыка М. В. Біча «Каліноўскі ў савецкай гістарыяграфіі». На канферэнцыі выступілі таксама беларускія вучоныя Я. Н. Мараш, Г. В. Кісялёў, І. П. Крэнь, В. М. Чарапіца, І. І. Коўкель, І. А. Фёдараў, А. М. Гесь і іншыя. У той час закладваліся асновы цяперашняга бачання падзей паўстання [10].

Адной з праяў гэтага з'явілася адлюстраванне падзей паўстання і ролі ў ім К. Каліноўскага ў першай частцы «Нарысаў гісторыі Беларусі». Аўтарам тэксту быў доктар гістарычных навук, прафесар М. В. Біч. У канцэнтраванай, нарыснай форме пададзены ход паўстання на беларускіх землях, роля ў ім К. Каліноўскага, яго імкненне да больш радыкальных формаў

барацьбы, нярэдкае супрацьстаянне Віленскага і Варшаўскага цэнтраў паўстання, яго вынікі. Падкрэслівалася, у прыватнасці, што «рэжым выключных законаў на Беларусі і ў Літве не быў ліквідаваны і ў пазнейшыя дзесяцігоддзі» [6, с. 329].

Прыкметнай адметнасцю эвалюцыі ўяўленняў аб гісторыі паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі і ролі ў ім К. Каліноўскага і яго паплечнікаў стала дыскусія, што вялася ў 1990-я гады на старонках беларускага друку паміж кандыдатам філалагічных навук У. М. Казбяруком і доктарам гістарычных навук, прафесарам М. Б. Бічом. Яны дыскутавалі з улікам таго, што ў свой час акадэмік У. М. Ігнатоўскі ў вядомай працы «1863 год на Беларусі: нарыс падзей» даў аб'ектыўную і абгрунтаваную характарыстыку тых падзей і ролі ў іх К. Каліноўскага як беларускага рэвалюцыянера-дэмакрата, ідэолага левых «чырвоных», не пазбаўленага хістанняў у прынцыповых пытаннях, які вымушаны быў пад цяжарам абставін ісці на кампрамісы з «белымі» [4]. Пры гэтым улічвалася, што ў канцы 1920 – пачатку 1930-х гадоў член-карэспандэнт Беларускай Акадэміі навук С. Агурскі называў К. Каліноўскага «міфічным героем» і «польскім шавіністам».

Пазіцыі апанентаў у гэтай дыскусіі былі даволі рознымі. У. М. Казбярук, у прыватнасці, сцвярджаў, што «ніхто з польскага кіраўніцтва ніколі не абяцаў К. Каліноўскаму незалежнасці так званай «Літвы». Змаганне вялося за адзіную і непадзельную Польшчу. І тым не менш Каліноўскі паслухмяна выконваў загады цэнтра, ва ўсёй дзейнасці няўхільна кіраваўся імі, заўсёды спасылаўся на іх» [1, с. 41].

Пярэчачы такім сцвярджэнням, М. В. Біч ацэньваў К. Каліноўскага як беларускага нацыянальнага дзеяча, які меў сваю пазіцыю ў поглядах на будучае Беларусі. Да таго ж ён пэўным чынам яе выказваў у палеміцы з кіраўнікамі польскага нацыянальнага камітэта і ўрада. Пры гэтым М. В. Біч рабіў у дыскусіі выснову, што менавіта такое стаўленне кіраўніка паўстання ў Беларусі паўплывала, у прыватнасці, на з'яўленне ў дэкрэце Цэнтральнага нацыянальнага камітэта ад 10 мая 1863 г. пункта аб забеспячэнні «братнім народам Літвы і Русі, злучаным з Польшчаю, найшырэйшага развіцця нацыянальнасці і мовы» [1, с. 41].

Звяртае на сябе ўвагу і пазіцыя ў гэтай дыскусіі галоўнага рэдактара папулярнага ў той час часопіса «Беларуская мінуўшчына», доктара гістарычных навук, прафесара Л. В. Лойкі. Ён, сярод іншага, пісаў, што «дзіўна было б чакаць ад маладога патрыёта (гэта значыць К. Каліноўскага. – *М. К.*) каб ён быў і палявым камандзірам, і вопытным рэдактарам, і тэарэтыкам беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай ідэі... Кастусь Каліноўскі, – заключаў ён, – застаўся сімвалам мужнасці і патрыятызму беларусаў» [1, с. 41].

Зыходзячы з нацыянальна-дзяржаўных пазіцый, выразная характарыстыка паўстання ў Беларусі і яго кіраўнікоў на чале з К. Каліноўскім утрымліваецца ў абагульняючай гістарычнай працы новага пакалення – 6-цітомнай «Гісторыя Беларусі», у яе чацвёртым томе «Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.)». Кніга пабачыла свет у 2005 г. Аўтар тэксту – М. В. Біч, рэдактары тома – В. В. Яноўская, С. С. Рудовіч, галоўны рэдактар выдання – М. П. Касцюк.

У дадзенай кнізе К. Каліноўскі характарызуецца як нацыянальны герой. Зроблены вывад, што «менавіта з яго дзейнасцю звязана перарастанне напярэдадні і ў час паўстання беларускага нацыянальна-культурнага руху ў палітычны. К. Каліноўскі адстойваў права беларусаў і літоўцаў на самавызначэнне, на ўтварэнне самастойнай дзяржавы ў форме Літоўска-Беларускай рэспублікі, у якой урад быў бы добрым слугою народу». Сцвярджаецца таксама, што для грамадскай плыні, узначаленай Каліноўскім, было характэрна ўсведамленне беларускага народа як мужыцкага і ў сувязі з гэтым арганічнае спалучэнне нацыянальнага і аграрна-сялянскага пытанняў. У тэксце таксама акцэнтуецца ўвага на значэнні паўстання, у першую чаргу яго ўздзеянні на становішча ў беларускім краі ў наступныя дзесяцігоддзі. Дзякуючы паўстанню, гаворыцца ў томе, сяляне Беларусі атрымалі ад урада істотныя саступкі, якія аблегчылі іх становішча і паскорылі развіццё новых адносін у вёсцы. Аднак гэта адбывалася ва ўмовах працяглай палітычнай рэакцыі [2, с. 243].

Значная ўвага паўстанню 1863–1864 гг. на Беларусі надаецца беларускімі гісторыкамі ў апошні час. Праявай гэтага, у прыватнасці, з'явілася выданне (у дзвюх кнігах), прысвечанае гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Яно падрыхтавана ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі. У першай кнізе гэтай тэме адведзены тэкст, дзе гаворыцца аб некаторых баках паўстання, якія звязваюцца з пытаннямі беларускай дзяржаўнасці. Так, аргументавана сцвярджаецца, што падчас падрыхтоўкі і ходу паўстання новае грамадскае гучанне атрымала пытанне дзяржаўнасці беларуска-літоўскіх зямель, што некаторая частка дваранства падтрымлівала думку аб аўтаноміі Літвы. Нават фігураваў намер стварыць дзяржаву на нацыянальных прынцыпах, магчыма, у выглядзе федэрацыі. Аўтары вылучылі некалькі этапаў развіцця ідэі дзяржаўнасці на беларуска-літоўскіх тэрыторыях [3, с. 219–226].

Праблема паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі займае пэўнае месца не толькі ў дзейнасці адпаведных структурных частак акадэмічнага Інстытута гісторыі і некаторых яго супрацоўнікаў, у прыватнасці, А. Э. Фірыновіч [7], а таксама і іншых даследчыкаў – В. В. Шведа, Д. Ч. Матвейчыка [5, 8, 9] і інш. У іх працах пабачылі свет не толькі новыя дакументальныя матэрыялы па гісторыі паўстання, але больш падрабязна адлюстраваны яго ход, характар распаўсюджання па беларускіх губернях. Да таго ж звернута ўвага на праявы беларускага менталітэту на працягу падрыхтоўкі і ажыццяўлення паўстання.

Натуральна, што цікавасць да гэтай праблемы значна павысілася ў апошні час у сувязі са 150-гадовым юбілеем дадзенай важнай з'явы ў гісторыі беларускага народа. Сведчаннем гэтага з'яўляецца і правядзенне нашай Міжнароднай навуковай канцерэнцыі з удзелам калег з суседніх краін.

Заканамерна, што ўвага да гісторыі паўстання 1863–1864 гг. у Польшчы, у Беларусі і Літве ў апошні час узрасла не толькі ў нас, але і ў нашых калег з суседніх краін. Характэрна, што пазіцыі гісторыкаў Рэспублікі Беларусь па гэтай праблеме ў асноўным істотна не разыходзяцца з даследчыкамі Расійскай Федэрацыі і Украіны. У цэлым блізка да беларускага пункту

гледжання яны адлюстроўваюць прычыны паўстання, яго падрыхтоўку, ход баявых дзеянняў, жорсткае падаўленне царскімі войскамі, вынікі і іншыя бакі гэтай з'явы.

Крыху большыя адрозненні ў поглядах на дадзеную праблему маюцца з гісторыкамі Польшчы. На працягу 1990-х гадоў мы, гісторыкі Рэспублікі Беларусь, неаднаразова дыскутавалі з імі па найбольш складаных і надзённых пытаннях нашай у многім агульнай гісторыі, у тым ліку закранаючы і характар паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі. У першую чаргу гэта адносілася да патрабавання аб аднаўленні польскай дзяржавы ў межах 1772 г. і імкнення перадавых прадстаўнікоў беларускага народа да рэалізацыі яго права на дзяржаўнае самавызначэнне. У выніку нашыя падыходы збліжаліся, і польскія калегі ў большай ступені разумелі іх, хаця пэўныя разыходжанні заставаліся.

Нельга не звярнуць увагу паважаных удзельнікаў Міжнароднай навуковай канферэнцыі яшчэ на адзін аспект праблемы, якую мы сёння абмяркоўваем. Я маю на ўвазе, што ва ўсе часы зусім недастаткова адлюстроўвалася сувязь паўстання 1863–1864 гг. з папярэднімі выступленнямі супроць расійскага царызму на польскай, літоўскай, беларускай тэрыторыях, а менавіта паўстаннем пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі і паўстаннем 1830–1831 гг. Як мы разумеем, прычыны гэтых радыкальных праяўленняў барацьбы ў многім з'яўляліся агульнымі. Да таго ж усе гэтыя тры паўстанні адбыліся на працягу няпоўных 70 гадоў, гэта значыць, фактычна за адно чалавечае жыццё, што не можа не расцэньвацца як унікальная з'ява ў гісторыі.

Літаратура

1. Беларуская мінуўшчына. – 1997. – № 5. – С. 32–36, 37–41.

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / М. Біч, В. Яноўская, С. Рудовіч [і інш.]; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэдактар) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2007. – Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) – 519 с.

3. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XX ст.: у 2 кн. – Кн. 1 / А. А. Каваленя [і інш.]; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]; Нац. Акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2011 – 584 с.

4. *Ігнатоўскі, У.* 1863 год на Беларусі. Нарыс падзей / У. Ігнатоўскі // Запіскі аддзелу гуманіт. навук. Працы Ін-ту гіст. навук. – Мінск: БелАН, 1930. – 274 с.

5. *Матвейчык, Д. Ч.* Паўстанне 1863–1864 гадоў у Беларусі: нарыс баявых дзеянняў / Д. Ч. Матвейчык. – Мінск: Медысонт, 2013. – 122 с.

6. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч. 1. / М. П. Касцюк, У. Ф. Ісаенка, Г. В. Штыхаў і інш. – Мінск: Беларусь, 1994. – 527 с.

7. *Фірыновіч, А. Э.* Паўстанне 1863–1864 гг.: вядомыя і невядомыя крыніцы беларускіх архіваў / А. Э. Фірыновіч. – Мінск: Беларус. навука, 2013. – 315 с.

8. *Швед, В.* Польскае пытанне і Беларусь у 1772–1863 гадах / В. Швед // Шлях да ўзаемнасці = Droga ku wzajemności. Кн. II.: матэрыялы VII міжнар. навук. канф., Беласток, 16–18 ліп. 1999 г. / пад рэд. М. Кандрацюка. – Беласток: Выд-ва Ун-ту ў Беластоку, 2000. – С. 273 – 283.

9. *Швед, В.* Праявы ліцвінскасці (беларускасці) у грамадска-палітычным жыцці зямель Беларусі ў 1772–1863 гг. / В. Швед // Шлях да ўзаемнасці = Droga ku wzajemności. Кн. IV: матэрыялы IX Міжнар. навук. канф., Беласток, 20–22 л-і пеня 2001 г. / пад рэд. М. Кандрацюка. – Беласток: Выд-ва Ун-ту ў Беластоку, 2002. – С. 301–316.

10. Кастусь Каліноўскі (1838–1864 гг.) Константин Калиновский: материалы респ. науч. конф., посвящ. 150-летию со дня рождения выдающегося бел. революционера-демократа и мыслителя К. Калиновского / сост. Я. И. Мараш. – Гродно, 1988. – 87 с.

Резюме

М. П. КОСТЮК

ЭВОЛЮЦИЯ ОЦЕНОК ВОССТАНИЯ 1863–1864 гг. В БЕЛОРУССКОЙ ИСТОРИОГРАФИИ ПОСЛЕДНИХ ДЕСЯТИЛЕТИЙ XX – НАЧАЛА XXI вв.

Отражаются различные подходы к оценке восстания 1863–1864 гг. на территории Беларуси и роли в нем предводителя К. Калиновского. Констатируется, что внимание к тем событиям возрастало в связи с юбилейными датами, когда проводились соответствующие научно-организационные мероприятия. Примечательно, что на них преобладали оценки восстания как патриотического акта, а его деятелей как борцов, преданных своему народу, что было характерно для последних десятилетий XX – начала XXI вв.

Summary

M. KASTSIUK

1863–1864 UPRISING APPRAISAL EVOLUTION IN BELARUSIAN HISTORIOGRAPHY IN THE LAST DECADES OF XXTH – THE BEGINNING OF XXITH CENTURIES

The author highlightes different approaches to the 1863–1864 uprising appraisal on the territory of Belarus, as well as the role of his leader K. Kalinousky. It is stated, that attention to these events depends on anniversary dates with associated scientific and organizational events. It should be noted, that revolt appraisal as a patriotic act and revolt personalities appraisal as patriots for people, were dominant during celebration. This situation was typical for the last decades of the XXth and the beginning of XXIth centuries.

Паступіў у рэдакцыю 13.12.2013

УДК 94(476) «18(092)Каліноўскі+ 94(476)«1863/1864»

В. Г. МАЗЕЦ

З НАГОДЫ СЛАЎНАГА ЮБІЛЕЯ, АБО ЯК АДЗНАЧАЛАСЯ Ў БССР 150-годдзе З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА І 125-годдзе ПАЎСТАННЯ 1863–1864 гг.

Кастусь Каліноўскі –
нязмерная мужнасць Радзімы,
Кастусь Каліноўскі –
адвагі прачыстая мова.

К. Кірэенка. «Кастусь Каліноўскі»

Напэўна, ніводная з гістарычных падзей XIX ст. не прыцягвала і не прыцягвае да сябе столькі ўвагі з боку шырокай грамадскасці, як паўстанне 1863–1864 гг., падзеі якога разгортваліся на землях Польшчы, Беларусі, Літвы і Украіны. І чым больш з'яўляецца публікацый, прысвечаных падзеям, што адбываліся паўтара стагоддзі таму, тым больш паўстае пытанняў, звязаных з тымі гераічнымі і трагічнымі падзеямі. Адно з галоўных – якое месца займае паўстанне 1863–1864 гг. у змаганні беларускага народа за права жыць ва ўласнай дзяржаве.

Спроба знайсці адказ на гэтае пытанне была зроблена чвэрць стагоддзя таму назад, калі ў Беларускай ССР на дзяржаўным узроўні, з шырокім удзелам грамадскасці адзначалася 150-годдзе з дня нараджэння Кастуся Каліноўскага і 125-годдзе паўстання 1863–1864 гг.

19 лютага 1986 г. на пасяджэнні клуба «Спадчына» было прынята рашэнне накіраваць зварот да Першага сакратара ЦК КПБ М. М. Слюнькова і сакратара ЦК КПБ А. Т. Кузьміна, у якім выказвалася «спадзяванне, што партыйныя і савецкія органы нашай рэспублікі прымуць адпаведныя рашэнні для ўшанавання памяці герояў паўстання 1863 г. і яго кіраўніка Кастуся Каліноўскага» [1].

У звароце прапаноўвалася ажыццявіць шэраг канкрэтных крокаў для ўсенароднага ўшанавання памяці:

– выдаць творы К. Каліноўскага, куды б увайшлі яго публіцыстычныя артыкулы з «Мужыцкай праўды», «Лісты з-пад шыбеніцы», матэрыялы следчай камісіі, успаміны пра дзейнасць К. Каліноўскага, іншых паўстанцаў і іншыя матэрыялы і дакументы;

– забяспечыць факсімільнае выданне ўсіх вядомых нумароў «Мужыцкай праўды»;

– выдаць матэрыялы і дакументы пра паўстанне 1863 г. у Беларусі;

– арганізаваць чытанні, прысвечаныя 150-годдзю з дня нараджэння К. Каліноўскага і 125-годдзю з пачатку паўстання 1863 г., мастацкую выстаўку, стварыць мастацкія і дакументальныя фільмы, прысвечаныя гэтым падзеям;

– стварыць музей паўстання 1863 г. у г. Мінску ці ў бліжэйшым зручным месцы каля Мінска. У ліку такіх найбольш зручных месцаў разглядалася вёска Плябань Маладзечанскага раёна каля чыгуначнай станцыі Уша, дзе былі пахаваны паўстанцы 1863 г. на чале з кіраўніком атрада Юльянам Бакшанскім. У гэтай вёсцы знаходзіўся будынак касцёла, які пасля рэстаўрацыі можна было прыстасаваць пад музей;

– стварыць музей К. Каліноўскага на яго радзіме ў г. п. Свіслач;

– стварыць і ўсталяваць помнікі К. Каліноўскаму ў гарадах Мінск і Гродна.

На стварэнне музеяў і помнікаў прапаноўвалася аб'явіць збор сродкаў і наладзіць правядзенне суботнікаў [1].

Ініцыятыва сяброў клуба «Спадчына» ЦК КПБ была падтрыманая, і 6 чэрвеня 1986 г. была выдадзена пастанова «Аб 150-годдзі з дня нараджэння Кастуся Каліноўскага».

У пастанове быў выкладзены афіцыйны падыход да разгляду асобы кіраўніка паўстання 1863–1864 гг. У прыватнасці адзначалася, што ў «савецкай гісторыка-партыйнай навуцы К. Каліноўскі разлядаецца як папярэднік сацыял-дэмакратычнага руху. Яго светапогляд і роля ў рэвалюцыйным руху непа-

рыўна звязаныя з дзейнасцю рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў В. Р. Бялінскага, А. І. Герцэна, М. Г. Чарнышэўскага, М. А. Дабралюбава». Сцвярджалася, што «загады і распараджэнні К. Каліноўскага, матэрыялы выдаванай ім газеты «Мужыцкая праўда», а таксама ўспаміны сучаснікаў сведчаць аб тым, што па сваіх грамадска-палітычных поглядах ён быў паслядоўным рэвалюцыйным дэмакратам. Яго погляды і рэвалюцыйная дзейнасць аказалі вялікі ўплыў на наступнае развіццё перадавой грамадскай думкі ў Беларусі, беларускай літаратуры. Ідэйна-тэарэтычная спадчына К. Каліноўскага ў цяперашні час вывучаецца ў курсе навуковага камунізму ва ўсіх ВНУ краіны» [2, арк. 35].

Комплекс мерапрыемстваў з нагоды 150-годдзя з дня нараджэння беларускага рэвалюцыянера-дэмакрата і мысліцеля, кіраўніка паўстання 1863–1864 гг. К. Каліноўскага, які быў прадугледжаны пастановай ЦК КПБ, быў нават больш маштабным, чым прапановы сяброў клуба «Спадчына».

Так, ЦК КПБ палічыў мэтазгодным ажыццяўленне шэрагу мерапрыемстваў.

Акадэмія навук БССР і Міністэрства культуры БССР павінны былі правесці юбілейную сесію Аддзялення грамадскіх навук АН БССР і апублікаваць яе матэрыялы ў «Вясцях Акадэміі навук Беларускай ССР».

Міністэрству культуры БССР, свіслацкім райкаму КПБ і выканкаму раённага Савета народных дэпутатаў даручалася:

– усталяваць у в. Якушоўка Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці мемарыяльную дошку на доме, у якім жыла сям'я К. Каліноўскага;

– рэстаўраваць будынак былой Свіслацкай гімназіі, дзе вучыўся К. Каліноўскі;

– рэстаўраваць помнік К. Каліноўскаму ў г. п. Свіслач;

– абнавіць экспазіцыю аб жыцці і дзейнасці К. Каліноўскага ў Свіслацкім гісторыка-краязнаўчым музеі.

Міністэрству культуры БССР было прапанавана:

– разгледзець пытанне аб наданні адной з бібліятэк г. Гродна імя К. Каліноўскага;

– пашырыць экспазіцыю аб рэвалюцыйнай дзейнасці К. Каліноўскага ў Дзяржаўным музеі БССР.

Дзяржаўнаму камітэту БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю даручалася выдаць у 1988 годзе пад грыфам Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП Беларусі:

– у выдавецтве «Беларусь» – зборнік друкаванай і рукапіснай спадчыны К. Каліноўскага з уключэннем у гэты зборнік успамінаў сучаснікаў пра яго рэвалюцыйную дзейнасць;

– у выдавецтве «Універсітэцкае» – кнігу В. Ф. Шалькевіча «К. Каліноўскі. Старонкі біяграфіі».

Дзяржаўны камітэт БССР па кінематаграфіі павінен быў прадугледзіць выпуск кароткаметражнага дакументальнага фільма, прысвечанага паўстанню 1863–1864 гг. і ролі ў ім К. Каліноўскага.

Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР пры ўдзеле Міністэрства культуры БССР абавязвалася забяспечыць выраб да 1988 года значка, а Міністэрству сувязі БССР – выданне ў 1987–1988 гг. паштовых марак і канвертаў з малюнкам К. Каліноўскага.

Дзяржаўны камітэт БССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні ў адпаведнасці з пастановай ЦК КПБ павінен быў арганізаваць у 1987–1988 гг. тэле- і радыёперадачы, прысвечаныя 150-годдзю з дня нараджэння К. Каліноўскага і 125-годдзю паўстання 1863–1864 гг.

Рэдакцыям газет «Звязда», «Советская Белоруссия», «Літаратура і мастацтва», «Голас Радзімы», часопісаў «Беларусь», «Полымя», «Маладосць», «Нёман» даручалася апублікаваць у студзені 1988 г. артыкулы і іншыя матэрыялы, прысвечаныя 150-годдзю з дня нараджэння К. Каліноўскага [2, арк. 36].

Прапанаваны ў пастанове комплекс мерапрыемстваў з'яўляўся сведчаннем таго, што дадзены юбілей будзе адзначаны на высокім дзяржаўным узроўні.

Неабходна адзначыць, што большая частка выкладзеных у партыйнай пастанове прапановаў былі рэалізаваныя на практыцы. Святкаванне 150-годдзя з дня нараджэння К. Каліноўскага атрымала шырокі грамадскі рэзананс у рэспубліцы. Так, ужо

30 кастрычніка 1987 г. Пастановай Савета Міністраў БССР Свіслацкай сярэдняй школе № 1 было прысвоена імя К. Каліноўскага [5, с. 77].

Праўда, з боку асобных партыйных функцыянераў выказвалася пэўная занепакоенасць у сувязі з правядзеннем юбілейных мерапрыемстваў. Так, 4 студзеня 1988 г. у ЦК КПБ быў накіраваны ліст лектара аддзела прапаганды і агітацыі ЦК Кампартыі Беларусі А. Вінакурава з аналітычнай інфармацыяй пра змест перадач радыёстанцый «Свабода» і «Ватыкан» за лістапад–снежань 1987 г., у якім адзначалася, што «асабліва актыўна ідэйны праціўнік спрабуе трактаваць з буржуазна-нацыяналістычных пазіцый ролю пэўных падзей, грамадскіх дзеячаў у гісторыі Беларусі, юбілейныя даты якіх будуць адзначацца ў 1988 годзе. Так, напярэдадні 150-годдзя з дня нараджэння К. Каліноўскага непамерна ўзвялічваецца яго ўклад у развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, ідэі беларускай дзяржаўнасці» [3, арк. 1–2]. Разам з тым дадзены ліст ужо не мог перашкодзіць правядзенню юбілейных мерапрыемстваў.

На радзіме К. Каліноўскага, у Свіслацкім раёне была створана адмысловая камісія, якая разгарнула актыўную работу. У рамках выканання запланаваных камісіяй мерапрыемстваў вучнямі Свіслацкай і Грынкаўскай школ была пасаджана алея ліп. Па памятных мясцінах Свіслаччыны, звязаных з імем Каліноўскага, на месцы дзейнасці паўстанцкіх атрадаў і распаўсюджвання «Мужыцкай праўды», была праведзена эстафета юных турыстаў, удзел у якой прынялі каманды ўсіх сярэдніх школ раёна. Фотакарэспандэнт газеты Ч. Горбач стварыў любіцельскі кінафільм, у якім былі паказаны памятныя мясціны, звязаныя з жыццём і дзейнасцю К. Каліноўскага. Да 150-годдзя з дня нараджэння К. Каліноўскага быў выпушчаны плакат «Навечна ў памяці народнай», падрыхтаваны супрацоўнікамі Свіслацкага раённага гісторыка-краязнаўчага музея, рэдакцыяй раённай газеты «Заветы Ильича» і раённым саветам Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Свіслацкай раённай бібліятэкай і рэдакцыяй раённай газэты была праведзена гістарычная віктарына, прысвечаная жыццю

і дзейнасці славутага земляка. У школах раёна вучні пісалі сачыненні на тэму «Наш славуты зямляк Кастусь Каліноўскі». Дарэчы, вытрымкі з гэтых сачыненняў былі надрукаваныя ў свіслацкай раённай газеце. На шклозаводзе «Нёман» былі выробленыя сувеніры з партрэтам К. Каліноўскага. [5, с. 77]

29–30 студзеня 1988 г. у Гродне і Свіслацкім раёне была праведзена рэспубліканская навуковая канферэнцыя, прысвечаная «150-годдзю выдатнага рэвалюцыянера-дэмакрата і мысліцеля Кастуся Каліноўскага і 125-годдзю паўстання 1863–1864 гадоў у Беларусі і Літве» [4]. У сваім уступным слове акадэмік-сакратар Аддзялення грамадскіх навук АН БССР М. В. Бірыла звярнуў увагу на прынцыпова новыя гістарычныя абставіны, у якіх праводзілася канферэнцыя: «Быў час, калі замоўчваліся некаторыя звязаныя з імі з'явы, факты. І таму нельга было ў поўным аб'ёме ўявіць сабе гэтую выдатную старонку жыцця беларускага народа, якая прадэманстравала яго рэвалюцыйную еднасць з брацкімі суседнімі народамі – польскім, літоўскім і рускім. І толькі цяпер, ва умовах перабудовы, у нашым гарачым імкненні да гістарычнай праўды можна поўнасцю, ва ўвесь голас гаварыць аб тым даволі далёкім ужо часе і больш аб'ектыўна яго ацэньваць» [5, с. 5].

Ён падкрэсліў інтэрнацыянальны і рэвалюцыйна-дэмакратычны характар паўстання, адзначыўшы, што «паўстанне 1863–1864 гадоў – выдатная падзея у гісторыі вызваленчага руху Расіі на яго рэвалюцыйна-дэмакратычным этапе» [5, с. 5].

Інтэрнацыянальны характар паўстання быў адзначаны і ў выступленні В. М. Чарапіцы: «Каліноўскі высока ацэньваў ідэю стварэння федэрацыі вызваленых славянскіх народаў, у складзе якой, на яго думку, народы Беларусі і Літвы дасягнуць поўнага нацыянальнага і сацыяльнага вызвалення», а «разгром царызму, паводле меркавання Каліноўскага, павінен суправаджацца знішчэннем памешчыцкага землеўладання...» [6, с. 50].

А. Ф. Смірноў у сваім выступленні адлюстраваў працэс фарміравання светапогляду К. Каліноўскага і паказаў фактары, якія ўплывалі на гэты працэс. Паводле меркавання расійскага

даследчыка, «Каліноўскі выступаў за неабходнасць стварэння агульнарасійскага фронту вызваленчай барацьбы, аб'яднання рэвалюцыйных сіл польскага, рускага, беларускага і літоўскага народаў, заклікаў у сваіх адозвах «народ зямлі літоўскай і беларускай» да саюза з рэвалюцыйнымі сіламі рускага народа» [7, с. 11]. Падкрэсліваючы, што ў тых гістарычных умовах паўстанне не мела шанцаў на поспех, А. Ф. Смірноў звяртаў ўвагу на вялікія патэнцыяльныя магчымасці беларускага народа, які ўзнімаўся на барацьбу за зямлю і волю: «Аб тым, якія перспектывы адкрываліся перад паўстанцамі ў выпадку паспяховага, паўсюднага ажыццяўлення аграрнай праграмы, сведчыць Мілавідаўская аперацыя, ажыццёўленая пад кіраўніцтвам Каліноўскага ў маі–чэрвені ў многіх вёсках Пружанскага, Ваўкавыскага і Слонімскага паветаў. Паўстанцы абвяшчалі сялянам волю, бязвыплатнае надзяленне іх зямлёй, уручалі ім акты на валоданне зямлёй, прыводзілі сялян да прысягі ў праваслаўных храмах (што асабліва ўразіла царскіх афіцэраў) на вернасць паўстанню. Сяляне ахвотна прысягалі на вернасць мяцяжу і не паведамляў уладам аб гэтым, ніхто не прыносіў уручаныя мужыкам паўстанцкія акты на валоданне зямлёй» [7, с. 12].

Трансфармацыю ацэнак паўстання і характарыстыкі асобы К. Каліноўскага ў савецкай гістарыяграфіі паказаў у сваім выступленні М. В. Біч. Ён падкрэсліў, што ў «дасавецкай рускай афіцыйнай, дваранскай і буржуазнай гістарыяграфіі пераважала ацэнка паўстання як справы рук польскіх паноў і каталіцкага духавенства, якія абвінавачваліся ў спробах адарваць ад Расіі Польшчу, Беларусь і Літву», а «для савецкіх гісторыкаў метадалагічнымі арыенцірамі ў асвятленні паўстання, яго характару і рухальных сіл сталі працы Маркса, Энгельса, Леніна, якія, як вядома, вельмі высока ацэньвалі гістарычнае значэнне гэтай падзеі» [8, с. 13].

Акрамя канферэнцыі, былі праведзеныя навукова-літаратурныя чытанні ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, а 1 лютага 1988 г. у Доме кіно адбылася прэм'ера дакументальнага

фільма, прысвечанага Каліноўскаму. Беларускі фонд культуры правёў дабрачынны музыкальна-літаратурны вечар, праграма якога цалкам складалася з твораў пра К. Каліноўскага. Даволі цікавы вечар быў арганізаваны 4 лютага 1988 г. у Беларускім тэхналагічным інстытуце. Перад студэнтамі і выкладчыкамі выступілі вучоныя-гісторыкі, была арганізавана экспазіцыя твораў беларускіх пісьменнікаў і вучоных аб К. Каліноўскім, а таксама разгорнута мастацкая выстаўка графікі і жывапісу з калекцыі А. Белага [9].

У выдавецтве «Беларусь» у 1988 г. выйшаў зборнік друкаванай і рукапіснай спадчыны К. Каліноўскага, падрыхтаваны пры Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КП Беларусі аўтарскім калектывам у складзе М. С. Сташкевіча, В. Ф. Шалькевіча і А. Ф. Гесь пад кіраўніцтвам Р. П. Платонава [10]. У гэтым зборніку былі змешчаны сем нумароў «Мужыцкай праўды», першы нумар газеты «Штандар свабоды», інструкцыі і пісьмы К. Каліноўскага, дакументы і ўспаміны сучаснікаў пра яго жыццё і паўстанцкую дзейнасць.

Яшчэ адно грунтоўнае даследаванне, прысвечанае жыццёваму шляху К. Каліноўскага, было падрыхтавана В. Ф. Шалькевічам [11].

У лютым 1988 г. у Рэспубліканскім Палацы мастацтваў была арганізаваная мастацкая выстава, прысвечаная 150-годдзю з дня нараджэння Кастуся Каліноўскага. Выступаючы на ўрачыстым адкрыцці выставы, загадчык аддзела культуры ЦК КПБ Я. К. Вайтовіч, першы сакратар Саюза мастакоў БССР С. Гарбунова, першы сакратар праўлення СП БССР Н. Гілевіч, пісьменнік і даследчык А. Мальдзіс, старшыня гісторыка-мемарыяльнай камісіі Саюза мастакоў Беларусі М. Купава, начальнік аддзела Беларускага фонда культуры А. Тоўсцік і іншыя адзначалі, «што Кастусь Каліноўскі – вялікі патрыёт і сапраўдны інтэрнацыяналіст, заўсёды будзе жыць у памяці ўдзячнага народа» [12].

Пераважная большасць прадстаўленых на экспазіцыі мастацкіх твораў была новай, што сведчыла аб імкненні творцаў розных пакаленняў увасобіць воблік чалавека, які займае адметнае

месца ў нацыянальнай гісторыі. Вялікую ўвагу наведвальнікаў выставы выклікалі трыпціх Г. Вашчанкі «За зямлю, за волю», твор В. Ціханава «Жыві ў свабодзе, мужыцкі народзе...».

Некаторыя аўтары падрыхтавалі цэлы цыкл твораў, прысвечаных Каліноўскаму і яго паплечнікам. Сярод іх неабходна адзначыць палотны А. Марачкіна: «Кастусь Каліноўскі», «Трыумф» Мураўёва-вешальніка». Водгулле паўстання 1863–1864 гадоў адчувалася ў карцінах «Каліноўскі з воінамі» В. Шматава, «Наступ інсургентаў» Ф. Янушкевіча, «Абуджэнне» В. Барабанцава і іншых. Верным гістарычнай тэматыцы заставаўся М. Купава, які падрыхтаваў ілюстрацыі да кнігі Г. Кісялёва «Сейбіты вечнага».

Воблік народнага героя прываблівaў і скульптараў. У экспазіцыі былі прадстаўленыя такія работы, як «Кастусь Каліноўскі» Л. Гумілеўскага, «1863 год» В. Янушкевіча, «Валеры Урублеўскі» В. Занковіча, «Прысяга» Г. Лойкі, «Словы Кастуся» К. Селіханава, «Правадыры паўстання – Кастусь Каліноўскі, Траўгут Рамальд, Урублеўскі Валяр'ян» А. Антыпіна, «Кастусь Каліноўскі» А. Шатэрніка і праект помніка змагару, выкананы В. Янушкевічам.

У зале дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва звярталі на сябе ўвагу наведвальнікаў выставы новыя творы В. Ціханава «Жыві ў свабодзе, мужыцкі народзе», габелен «Паўстанне 1863 года» Г. Крываблоцкай, шэраг мініяцюрных габеленаў, выкананых тонка, дакладна, з высокім мастацкім густам С. Свістуновічам. Убачылі гледачы і новыя медалі, зробленыя Ю. Анушкам, Я. Валасевічам, Я. Колчавым, С. Гумілеўскім, П. Лукам [12].

Выстава з калекцыі выкладчыка філасофіі БДУ імя У. І. Леніна А. Белага, прысвечанай 150-годдзю з дня нараджэння Кастуся Каліноўскага, і вечар у гонар беларускага «змагара за зямлю і волю» – адбыліся з 26 лютага па 6 сакавіка 1988 г. у Палацы культуры і спорту чыгуначнікаў Мінска.

З часткай прадстаўленых на выстаўцы работ (а іх было 45), гледачы мелі магчымасць пазнаёміцца раней. Гэта серыя графічных лістоў М. Купавы, ілюстрацыі да кнігі У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» А. Кашкурэвіча, адна з першых работ, прысвечаных барацьбіту, – ілюстрацыя да паэмы Міхася Машары «Смерць Кастуся Каліноўскага» П. Сергіевіча.

Былі і творы, якія раней не экспанаваліся. Гэта праект помніка Каліноўскаму скульптара В. Вараб'ёва, жывапісны партрэт героя, выкананы мастаком В. Барабанцавым; бюсты, аўтарамі якіх з'яўляліся скульптары С. Логвін і М. Несцяроўскі, і іншыя творы.

На вечары, які адбыўся пасля вернісажа, гледачоў таксама чакаў сюрпрыз. У выкананні студэнтаў Мінскага інстытута культуры прагучаў харал «А хто там ідзе?» на словы Я. Купалы і музыку Л. Рагоўскага. Была паказана інсцэніроўка паэмы А. Куляшова «Хамуціус», на сцэне тэатральнай залы палаца выконваліся вершы, прысвечаныя Каліноўскаму, урыўкі з яго «Лістоў з-пад шыбеніцы», нумароў «Мужыцкай праўды» [13].

Да 150-годдзя з дня нараджэння Кастуся Каліноўскага на эксперыментальным заводзе імя Гастэлы навукова-вытворчага аб'яднання «Прагрэс» быў выраблены памятны юбілейны значок. Эскіз распрацаваў мастак Г. Максімаў, гравіроўку зрабіў А. Холад. У гандлёвую сетку паступіла 10 тысяч 300 экземпляраў значкоў [14].

Шырока адзначыў 150-годдзе з дня нараджэння К. Каліноўскага і 125-годдзе паўстання і рэспубліканскі друк. Літаральна ўсе часопісы і газеты змясцілі артыкулы, прысвечаныя жыццю і рэвалюцыйнай дзейнасці К. Каліноўскага. Сярод іх неабходна адзначыць газету «Літаратура і мастацтва», часопісы «Беларусь», «Маладосць» і «Полымя». На старонках «Літаратуры і мастацтва» друкавалі свае творы, прысвечаныя паўстанню і К. Каліноўскаму, пісьменнікі, літаратуразнаўцы і мастакі. У ліку разнастайных публікацый безумоўна, неабходна вылучыць артыкул Я. Янушкевіча «Сейбіт праўды» ў першым нумары часопіса «Маладосць» за 1988 год. У дадзеным артыкуле аўтар, высока ацэньваючы значэнне «Мужыцкай праўды», адзначаў:

«Унікальнасць гэтай газеты відавочная: «Мужыцкая праўда» – ці не адзінае перыядычнае выданне сярэдзіны XIX стагоддзя ў Еўропе, непасрэдна адрасаванае селяніну, у якой так ясна былі акрэслены сацыяльная і палітычная мэты:

– вызваліцца ад прыгнёту царскага самаўладства;

– даць зямлю мужыку-беларусу» [15, с. 129].

Акрамя артыкула Я. Янушкевіча на старонках дадзенага часопіса былі надрукаваныя 7 нумароў «Мужыцкай праўды», а таксама «Лісты з-пад шыбеніцы» К. Каліноўскага [16].

Такім чынам, прыведзеныя вышэй факты сведчаць пра тое, што святкаванне 125-годдзя паўстання і 150-годдзя з дня нараджэння К. Каліноўскага было праведзена ў Беларусі на высокім дзяржаўным узроўні і выявіла значную грамадскую цікавасць да гэтага важнейшага этапу на шляху змагання за лепшую долю беларускага народа.

Літаратура

1. Зварот да Першага сакратара ЦК КПБ М. М. Слюнькова і сакратара ЦК КПБ А. Т. Кузьміна [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: http://spadchyna.net/index.php?option=com_content&view=article&id=1354&Itemid=554. – Дата доступу: 26.11.2013.

2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Фонд 4П. – Воп. 160. – Спр. 458.

3. НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 157. – Спр. 162.

4. Памяці рэвалюцыянера-дэмакрата // Літаратура і мастацтва. – 1988. – 5 лютага.

5. Кастусь Каліноўскі (1838–1864 гг.) = Константин Калиновский / [сост. Я. И. Мараш]. – Гродно, 1988.

6. Черепица, В. Н. Кастусь Калиновский и развитие революционных связей народов России и Польши / В. Н. Черепица // Кастусь Каліноўскі (1838–1864 гг.) = Константин Калиновский / [сост. Я. И. Мараш]. – Гродно, 1988.

7. *Смірноў, А. Ф.* Выдатны сын беларускага народа / А. Ф. Смірноў // Кастусь Каліноўскі (1838–1864 гг.) = Константин Калиновский / [сост. Я. И. Мараш]. – Гродно, 1988.

8. *Біч, М. В.* Кастусь Каліноўскі ў беларускай савецкай гістарыяграфіі. / М. В. Біч // Кастусь Каліноўскі (1838–1864 гг.) = Константин Калиновский / [сост. Я. И. Мараш]. – Гродно, 1988.

9. Вобраз Кастуся Каліноўскага ў літаратуры і мастацтве [Электронны рэсурс] / http://spadchyna.net/index. php?option=com_content&view=article&id=1357&Itemid=556&limitstart= 2. – Дата доступа: 26.11.2013.

10. К. Калиновский: из печатного и рукописного наследия / Ин-т истории партии при ЦК КП Белоруссии – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – Минск: Беларусь, 1988. – 208 с.

11. *Шалькевич, В. Ф.* Кастусь Калиновский. Очерки биографии // В. Ф. Шалькевич. – Минск: Университетское, 1988. – 127 с.

12. За зямлю, за волю // Літаратура і мастацтва. – 1988. – 12 лют.

13. Два цікавыя мерапрыемствы // Літаратура і мастацтва. – 1988. – 11 сак.
14. Юбілейныя значкі // Літаратура і мастацтва. – 1988. – 5 лют.
15. *Янушкевіч, Я.* Сейбіт праўды / Я. Янушкевіч // Маладосць. – 1988. – № 1. – С. 128–132.
16. Маладосць. – 1988. – № 1. – С. 133–142.

Резюме

В. Г. МАЗЕЦ

ПО СЛУЧАЮ СЛАВНОГО ЮБИЛЕЯ, ИЛИ КАК ОТМЕЧАЛОСЬ В БССР 150-ЛЕТИЕ СО ДНЯ РОЖДЕНИЯ КАСТУСЯ КАЛИНОВСКОГО И 125-ЛЕТИЕ ВОССТАНИЯ 1863–1864 гг.

Рассматривается комплекс мероприятий, которые проводились в БССР в связи с празднованием 125-летия восстания 1863–1864 гг. и 150-летия со дня рождения К. Калиновского. Исходя из анализа фактического материала, как архивного так и опубликованного, делается вывод, что данные мероприятия получили в республике большой общественный резонанс, что нашло свое отражение в активном участии в организации и проведении праздничных мероприятий представителей центральных и местных органов государственной власти, а также ученых, писателей, художников, представителей широкой общественности.

Summary

V. MAZETS

ON THE OCCASION OF THE ANNIVERSARY OF THE GLORIOUS, OR AS NOTED IN THE BSSR 150th ANNIVERSARY OF THE BIRTH KASTUS KALINOUSKI AND THE 125th ANNIVERSARY OF UPRISING 1863–1864

The article includes a complex of events which were held in the BSSR in connection with the celebration of the 125th anniversary of the 1863–1864 uprising and the 150th anniversary of the birth of K. Kalinouski. Proceeding from the analysis of the factual material as both archival and published, the author came to the conclusion that these activities have received a huge public outcry in our Republic. This is reflected in the active participation in organizing and holding festive measures of representatives of Central and local public authorities, as well as scientists, writers, artists, members of the General community.

Паступіў у рэдакцыю 11.12.2013

УДК 94(476)(029)Машэўскі+ 94(476.1)«1863»

Д. Ч. МАТВЕЙЧЫК

УЛАДЗІСЛАЎ МАШЭЎСКІ І СПРОБА ЎЗБРОЕНАГА ВЫСТУПЛЕННЯ Ў СЛУЦКІМ ПАВЕЦЕ Ў 1863 г.

Паўстанне 1863–1864 гг. з'явілася лёсавызначальнай падзеяй для тысяч жыхароў Беларусі і аказала вялікі ўплыў на ўсю яе далейшую гісторыю. Не з'яўляецца тут выключэннем і Мінская губерня, дзе ў падзеі паўстання была ўцягнутая вялікая колькасць людзей розных саслоўяў у розных яе паветах. І хаця паўстанне на Міншчыне разгортвалася нераўнамерна, а некаторыя тэрыторыі ўвогуле засталіся не ахопленыя ім, у той ці іншай ступені альбо ў той ці іншай форме яно закранула насельніцтва ўсіх паветаў без выключэння.

У навуковай літаратуры падзеям у Слуцкім павеце ў 1863 г. надаецца недастаткова ўвагі. Напрыклад, у манаграфіі Анатоля Смірнова дзейнасці атрада Машэўскага прысвечаны толькі адзін невялікі абзац [14, с. 210], у манаграфіі Усевалада Ігнатоўскага – усяго некалькі радкоў, насычаных факталагічнымі памылкамі [2, с. 154], а ў працы Давіда Файнгаўза – ніводнага слова [17]. Больш за тое, сама асоба Машэўскага мала вядома гісторыкам. Дастаткова сказаць, што ў «Польскім біяграфічным слоўніку» яго біяграма адсутнічае, а ў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» яму прысвечаны ўсяго дзевяць радкоў з самымі агульнымі звесткамі (без подпісу аўтарства) [16, с. 102]. Аднак і гэтая асоба, і ўвогуле падзеі на Случчыне займалі значнае месца ў планах паўстанцкага кіраўніцтва (як гэта будзе паказана ніжэй), таму варта запоўніць (хаця б у пэўнай ступені) гэты прабел айчыннай і замежнай

гістарыяграфіі, галоўным чынам на падставе крыніц, выяўленых у фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску (далей – НГАБ)[4].

Як сведчыць мапа адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай, уведзенага паўстанцкім Нацыянальным урадам [19], Слуцкі павет разам з Навагрудскім і Пінскім павінен быў складаць асобнае Навагрудскае ваяводства. Ваенным начальнікам Навагрудскага ваяводства напярэдадні ўзброенага выступлення быў прызначаны падпалкоўнік Генеральнага штаба Станіслаў Алендскі. Аднак палітычныя і ваенныя рэаліі ўнеслі свае карэктывы ў гэтыя планы. Ужо ўвесну 1863 г. Навагрудскі павет быў далучаны да Віленскага ваяводства, а Слуцкі падначалены кіраўніцтву Мінскага ваяводства [1, с. 93].

Выступленне ў Мінскай губерні, у тым ліку і ў Слуцкім павеце, было падначалена агульнаму стратэгічнаму плану, распрацаванаму «літоўскім ваяводам» Зыгмунтам Серакоўскім. Паводле яго, агульнае паўстанне планавалася адначасова ў Магілёўскай, Віцебскай і Мінскай губернях (Гродзенская, Віленская і Ковенская губерні ўжо былі ахоплены паўстаннем і там планавалася яго ўзмацненне і пашырэнне) на вясну 1863 г. [3, с. 37–40]. Адпаведна фарміраванне і пачатак дзейнасці паўстанцкіх атрадаў у Мінскай губерні былі запланаваны на красавік. Не планавалася выступленне толькі ў Бабруйскім, Пінскім, Мазырскім і Рэчыцкім паветах, дзе «з прычыны малой колькасці і непрыязнага настрою сялянаў няма падрыхтоўкі аніякай і немагчыма нават правесці арганізацыю» [1, с. 93]. Галоўная роля ва ўзняцці паўстання ў Слуцкім павеце адводзілася У. Машэўскаму.

---

[4] У манаграфіі А. Фірыновіч пададзены пералік крыніц НГАБ, што тычацца розных бакоў гісторыі паўстання 1863–1864 гг., у які ўключана 469 спраў [*Фірыновіч А. Э.* Паўстанне…] і які з'яўляецца найбольш поўным з апублікаваных да цяперашняга часу. Аўтарам гэтых радкоў на сённяшні дзень у фондах НГАБ выяўлена каля 3 тысяч спраў [гл.: *Матвейчык Д. Ч.* Паўстанне 1863–1864 гг.: крыніцы…], аднак і гэтая лічба не з'яўляецца поўнай. Далейшая распрацоўка фондаў архіва выявіць, безумоўна, яшчэ невядомыя матэрыялы, якія дазволяць запоўніць шмат якія прабелы ў даследаванні гісторыі паўстання ў Беларусі.

Біяграфічныя звесткі пра У. Машэўскага, што маюцца ў навуковай літаратуры, урыўкавыя і не дазваляюць скласці карціну яго жыцця і дзейнасці ў дапаўстанцкі перыяд. У пэўнай ступені яе дазваляюць дапоўніць архіўныя крыніцы. Так, вядома, што яго бацька Рамуальд-Ян-Тадэвуш Юзафавіч, служыў у войску Княства Варшаўскага і ў 1811 г. атрымаў чын капітана 16-га пяхотнага палка. За ўдзел у напалеонаўскіх войнах ён у 1814 г. быў узнагароджаны ордэнам Ганаровага легіёна. У 1815 г. ён выйшаў у адстаўку і асеў у спадчынным маёнтку Прусінава Мінскага павета (у цяперашні час – вёска Прусінава Нёманскага сельсавета Уздзенскага раёна Мінскай вобласці). У шлюбе з Каралінай Вайніловіч ён меў шасцёра сыноў – Атона-Антонія (нар. 08.09.1818), Юзафа-Браніслава (нар. 18.11.1819), Юзафа-Артура (нар. 06.10.1821), Уладзіслава-Міхала (нар. 07.10.1824), Зянона-Ксаверыя (нар. 30.06.1827) і Нарцыза-Рамуальда-Караля (нар. 31.10.1832) – і дзвюх дачок (Антаніну і Фабіяну). Сыны працягнулі прафесію бацькі – Уладзіслаў, Ксаверы і Нарцыз (выйшаў у адстаўку ў чыне падпалкоўніка) служылі ў расійскім войску.

Уладзіслаў-Міхал Машэўскі служыў у артылерыі і выйшаў у адстаўку ў чыне штабс-капітана. Ён быў жанаты з Ідаліяй Прашынскай, з якой меў сына Храбрыслава-Людвіка-Юзафа (нар. 07.12.1860 у вёсцы Радзівілімонты Слуцкага павета) [9]. Да паўстання ён жыў у Слуцкім павеце, дзе арандаваў зямлю ва ўладальніка маёнткаў Круговічы і Навадворцы каля Клецка памешчыка Напалеона Абуховіча [18, t. 2, s. 303].

Напярэдадні выступлення слуцкім павятовым начальнікам з'яўляўся памешчык Ежы-Павел Магільніцкі, які належаў да памешчыцкай групоўкі (падчас паўстання названай «белымі») і быў звязаны з яе кіраўніком (Якубам Гейштарам) прынамсі з 1862 г. [1, с. 449; 17, t. 1, s. 166, 178, 254, 351–352, 407]. У яго абавязкі ўваходзіла арганізацыя ўсіх мерапрыемстваў для падрыхтоўкі паўстання ў павеце (правядзенне агітацыі, збор сродкаў, нарыхтоўка зброі і г. д.), аднак нічога невядома пра яго дзейнасць на гэтай пасадзе.

Распаўсюджванне сярод насельніцтва Слуцка ідэй нацыянальна-вызваленчай барацьбы супраць Расіі было заўважана расійскім чыноўнікамі яшчэ да ўзброенага выступлення. Мінскі жандарскі штаб-афіцэр Барыс Рэйхарт 5 лютага 1863 г. дакладваў шэфу корпуса жандараў Васілю Далгарукаву: «Самы непакой заўважыў я ў гор. Слуцку. Усе жыхары-каталікі, як гэта: духавенства, дваране, чыноўнікі і вучні – заражаны рэвалюцыйным духам...» [1, с. 402].

У. Машэўскі атрымаў прызначэнне на пасаду ваеннага начальніка Слуцкага павета. У планах камісара Мінскага ваяводства Баляслава Свентарэцкага яму адводзілася ці не вызначальная роля ў кіраўніцтве паўстаннем у Мінскай губерні ў цэлым. Паводле яго задумы, Машэўскі павінен быў сфарміраваць і ўзначаліць паўстанцкі атрад у Слуцкім павеце, перайсці разам з ім у Ігуменскі і злучыцца з атрадам, дзе павінен быў знаходзіцца сам Свентарэцкі[5]. Пасля гэтага Машэўскі павінен быў атрымаць ад Свентарэцкага пасаду мінскага ваяводы і такім чынам узначаліць узброеныя сілы Мінскага ваяводства. Пры гэтым Свентарэцкі быў высокай думкі пра Машэўскага – «вельмі дзелавіты чалавек», аднак выказваў асцярогу, «каб Машэўскі не быў разбіты раней за злучэнне, бо пераход для яго партыі будзе вельмі цяжкім» [1, с. 93].

Падрабязнасці падобнага плана былі абмеркаваны паміж Свентарэцкім і Машэўскім на сустрэчы ўвесну 1863 г. Пасля сустрэчы Машэўскі пачаў у Слуцкім павеце (не пазней за 7 красавіка 1863 г.) арганізацыю атрада. Вялікую дапамогу пры гэтым яму аказваў сын памешчыка, уладальніка маёнтка Галынка Слуцкага павета Уладзіслава Вэндарфа, міравы пасярэднік Слуцкага павета Браніслаў Вэндарф[6] [7, арк. 7–10].

---

[5] Гэты атрад і быў сфарміраваны Свентарэцкім разам са Станіславам Ляскоўскім, які ў далейшым узначаліў яго, і дзейнічаў у лясах Ігуменскага павета да восені 1863 г.

[6] У рапарце ваеннага начальніка Слуцкага павета палкоўніка Астахава мінскаму грамадзянскаму губернатару Аляксандру Кажэўнікаву ад 25.04.1863 згадваецца, што Вэндарф і з'яўляўся арганізатарам гэтага атрада. Тое ж, са спасылкай «па офіцыйных расійскіх вестках», сцвярджаецца ў працы У. Ігнатоўскага, аднак іншых пацвярджэнняў гэтага не знойдзена. Больш за тое, далейшы лёс Б. Вэндарфа (гл. ніжэй) хутчэй абвяргае гэтыя сцверджанні.

У камандаванні атрадам Машэўскаму дапамагаў яго ад'ютант студэнт Кіеўскага ўніверсітэта Фелікс Клюкоўскі. Невядома, дзе канкрэтна атрад быў сфарміраваны. Мяркуючы па яго дзейнасці, гэта адбылося ў паўднёва-заходняй частцы Слуцкага павета, пры гэтым найбольш верагодным месцам уяўляецца менавіта вышэйзгаданы маёнтак Галынка, аднак прамых доказаў гэтага не выяўлена.

19 красавіка 1863 г. сфарміраваны атрад распачаў свае дзеянні. Увечары гэтага дня ён ссек 5 тэлеграфных слупоў за 10 вёрст ад паштовай станцыі Сіняўка і парваў дрот. Уначы атрад прыбыў у маёнтак (назва невядомая) князя Леана Радзівіла, дзе, узламаўшы акно, забраў 40 паляўнічых стрэльбаў, некалькі кінжалаў і скрыню пораху. На наступны дзень атрад рухаўся на ўсход «на пераменных падводах» на злучэнне з атрадам Свентарэцкага, падчас чаго былі гвалтоўна забраны сельскі засядальнік і ключвойт (першы з іх быў адпушчаны ў гэты ж дзень, а другі ўцёк) [6, арк. 71]. Прайшоўшы Слуцкі павет, атрад увайшоў на тэрыторыю Ігуменскага і спыніўся на адпачынак ля вёскі Азярцы Ігуменскага павета (у цяперашні час – вёска Азярцы Гацукоўскага сельскага савета Слуцкага раёна Мінскай вобласці)[7]. Аднак спраўдзіліся асцярогі Свентарэцкага. Падчас руху атрада расійскія ўлады атрымалі паведамленне ад селяніна з Азярцоў Міны Бурака пра месца яго дыслакацыі[8]. 21 красавіка паўстанцы былі атакаваны расійскім атрадам у складзе 50 чалавек пяхоты і 20 казакоў Данскога казацкага палка пад камандаваннем падпалкоўніка Драгапулы. Апісанне бою засталося ў рапарце палкоўніка Астахава:

«Падышоўшы на 50 крокаў, заўважыў іх (паўстанцаў. – *Д. М.*) у густых кустах.

---

[7] У некаторых навуковых працах, у тым ліку і аўтара гэтых радкоў, назва вёскі ўказваецца як Азярніцы (Азярніца) і месца яе знаходжання – Слуцкі павет [*Матвейчык, Д. Ч.* Паўстанне 1863–1864 гадоў у Беларусі: нарыс… С. 64], але гэта з'яўляецца вынікам недастатковай працы па яе лакалізацыі.

[8] У адным з атрадаў, што дзейнічаў на захадзе Ігуменскага павета, хадзілі чуткі, што Міна Бурак за свой учынак быў павешаны паўстанцамі [Восстание, с. 445], аднак архіўныя матэрыялы, якія б пацвярджалі гэта, не выяўлены.

Адкрыўшы агонь, узмацніўшы пры гэтым ланцуг, адбыўся непрацяглы, але ўпарты бой. Пры першых стрэлах праціўнік страціў свайго начальніка, адстаўнога капітана артылерыі памешчыка Машэўскага. Паводле словаў палонных, страта яго і шматлікасць ахвяр каля сябе ад трапнага і пачашчанага агню стралкоў прывялі іх у поўную збянтэжанасць. Пакінуўшы сваю пазіцыю, яны пусціліся наўцёкі праз паляну. Тут спадар Драгапула загадаў казакам кінуцца ў атаку. Тады мяцежнікі, пабегшы да балота, пачалі кідаць усялякую сваю зброю і хавацца ў лес. Таму як усё гэта адбывалася позна ўвечары, далейшае пераследаванне было немагчымым.

Страта мяцежнікаў, трэба меркаваць, значная, з іх 3 забіта на месцы, паранена 14 і ўзята ў палон 31. З нашага боку забіты 1 казак, цяжка паранены 1 гарніст, які памёр на наступны дзень. Пры гэтым узята: стрэльбы, пісталеты, шаблі, косы, порах, кулі, свінец, коні, якіх ведамасць да гэтага дадаю» [7, арк. 7–10].

Прыкладна падобным жа чынам апісаў гэты бой і сам падпалкоўнік Драгапула [цытату з яго рапарта гл.: 14, с. 210].

З паўстанцкага боку апісанне бою засталося ва ўспамінах Напалеона Абуховіча. У лісце да рэдакцыі серыі «Бібліятэка ўспамінаў», у межах якой былі апублікаваны ўспаміны Я. Гейштара, ён апісаў гэты бой і падзеі пасля яго наступным чынам:

«...На трэці дзень пасля выступлення 1 траўня 1863 г. [па новым стылі. – *Д. М.*] нас дагнала войска (2 ці 3 роты і сотня казакоў). У гэты момант мы былі аточаныя і засыпаныя градам куль. Я стаяў зусім побач каля Машэўскага. Пасля некалькіх нашых стрэлаў Машэўскі паў з куляй у сэрцы, паў таксама Мілярэўскі, што стаяў побач, студэнт Кіеўскага ўніверс[ітэта], паў шляхціц Асіеўскі і некалькі іншых. Я атрымаў кулю каля пояса, якая і сёння сядзіць дзесьці ў маім целе, хаця не турбуе мяне. І мы забілі некалькіх жаўнераў, але, натуральна, гэта не перашкодзіла нас атачыць, звязаць і пагнаць да бліжэйшай вёскі. Гэта адбывалася ў Ігуменскім павеце каля вёскі Азярцы. Вязняў завялі, а тых, што былі параненыя, завезлі ў Слуцк, адлеглы ў некалькіх мілях. Неабходна аддаць справядлівасць, што

абыходжанне з намі было чалавечае; параненых узяў пад сваю апеку лекар нашай партыі высакародны Кернажыцкі» [18, t. 2, s. 303–304].

Акрамя самога Машэўскага, у баі загінулі студэнт Кіеўскага ўніверсітэта Міраслаў Мілярэўскі і дваранін Базыль Траяноўскі. На працягу некалькіх дзён памерлі ад ран Фелікс Клюкоўскі і дваране Казімір Асяеўскі (Асіеўскі) і Францішак Пятроўскі.

На гэтым дзейнасць атрада Машэўскага скончылася.

Застаецца адкрытым пытанне пра колькасны склад атрада. Да вышэй згаданага рапарта Астахава далучаны спіс, з якога вядомы імёны 50 паўстанцаў. Разам з некалькімі яшчэ не палоненымі на той час гэта складае лічбу ў 56 чалавек (гл. Дадатак). Гэта і ёсць мінімальна вядомая колькасць атрада. Аднак сам жа гэты рапарт («далейшае пераследаванне было немагчымым») сведчыць пра няпоўнасць гэтай лічбы. З улікам наяўных ускосных звестак агульную колькасць атрада магчыма павялічыць на некалькі дзясяткаў чалавек (але не больш за 100). Магчыма таксама, што да гэтага атрада мелі дачыненне дваранін Казімір Замбрыцкі і паручнік Уладзімір Чарноцкі, якія былі схоплены сялянамі ў мястэчку Цімкавічы Слуцкага павета.

Варта таксама адзначыць, што ўраджэнцы Слуцкага павета ўдзельнічалі ў паўстанні не толькі ў складзе атрада Машэўскага. Паводле матэрыялаў Слуцкай следчай камісіі, з 14 траўня 1863 па 1 жніўня 1864 г. у ёй вяліся справы 202 падследных (уключаючы згаданых паўстанцаў з атрада Машэўскага), якія паходзілі не толькі са Слуцкага, але і з іншых паветаў [13]. Большая частка іх у далейшым была асуджана да розных відаў пакарання з высылкай з радзімы. Пры гэтым значную колькасць сярод падследных і асуджаных складалі вучні Слуцкай гімназіі. Да гэтай жа лічбы неабходна дадаць некалькі дзясяткаў ураджэнцаў Случчыны, якія прымалі ўдзел у паўстанні на іншых тэрыторыях.

Супастаўляючы звесткі з розных крыніц з фондаў НГАБ, магчыма паказаць сацыяльны склад атрада Машэўскага. Як відаць з ніжэй прыведзенага алфавітнага спісу, 56 паўстанцаў, сярод іх выразна пераважалі дваране – 39 чалавек (каля

75 %)[9], прадстаўнікоў падатковых саслоўяў (сяляне, мяшчане і аднадворцы) вядома толькі 13 чалавек (25 %). Таксама відавочная перавага каталікоў – 36 чалавек[10] (каля 84 %) супраць 5 праваслаўных (каля 11,5 %) і 2 пратэстантаў (каля 4,5 %). Варта адзначыць наяўнасць сярод паўстанцаў значнай колькасці асобаў, пра якіх вядома, што яны знаходзіліся на дзяржаўнай ці прыватнай службе (пісары, лекар, вазніцы і інш.) – 11 чалавек (каля 20 %). Звяртае на сябе ўвагу і дастаткова вялікая колькасць вучнёўскай моладзі сярод палонных – 12 чалавек (каля 21 %) навучаліся ў вышэйшых навучальных установах ці гімназіі.

Пасля паланення ўсе паўстанцы з атрада Машэўскага былі перавезены ў Слуцк і зняволены ў мясцовым астрогу. Следства над імі вяла Слуцкая следчая камісія [13]. Пасля прыкладна паўгадавога зняволення большасць з іх у кастрычніку 1863 г. была пераведзена ў Бабруйскую крэпасць і аддадзена пад палявы ваенны суд, заснаваны пры Бабруйскім арданансгаўзе. Падчас суда паўстанцы выбралі розную тактыку паводзінаў. Адныя (не менш за 14) не раскайваліся ў зробленым, іншыя (не менш за 16) выказвалі шкадаванне з прычыны ўдзелу ў паўстанні і прасілі літасці, трэція сцвярджалі, што далучыліся да атрада пад пагрозамі гвалту. Рашэнне суда было вынесена 11 снежня 1863 г. [12], пасля чаго справа 39 паўстанцаў была пададзена ў Часовы палявы аўдытарыят у Вільні. Яго прысуд быў пададзены на зацвярджэнне віленскаму генерал-губернатару Міхаілу Мураўёву. Паводле яго канфірмацыі ад 13 лютага 1864 г. 17 паўстанцаў з атрада (С. Баранцэвіч, Кернажыцкі, Янкоўскі, Крушынскі, Мацкевіч, В. Чарноцкі, Дашкевіч, Бародзіч, Багурскі, Саевіч, Кавельмахер, Н. Абуховіч, Ю. Пятроўскі, Далькевіч, Б. Нядзвецкі, Рудаміна, Флемінг) былі асуджаны да розных тэрмінаў ссылкі на катаргу, чацвёра (А. Абуховіч, Чаркоўскі, абодва Крагельскія) – да ссылкі на пасяленне

[9] У гэтых падліках фігуруюць 52 асобы; не фігуруюць 4 асобы, чыя саслоўная прыналежнасць невядома альбо пазначана ў спісе накшталт «дваранін ці вольны хлебароб» і г. д.

[10] У падліках па канфесійнай прыналежнасці фігуруюць 43 асобы.

ў больш аддаленыя месцы Сібіры, шасцёра (Шулякоўскі, К. Баранцэвіч, Юрэцкі, Мікульскі, Грыгаровіч, Ю. Асіповіч) – да ссылкі на жыхарства ў Томскую ці Табольскую губерні, васьмёра (Плаўскі, Кавецкі, Мінкевіч, Гудзіян, Клеер, Палоцкі, Кабак, Падгальскі) – да ссылкі ў арыштанцкія роты на тэрмін ад 2 да 4 гадоў (усе вышэйзгаданыя асобы таксама пазбаўляліся правоў стану, а іх маёмасць падлягала канфіскацыі); трое (Радкевіч, Ліпніцкі, Марчык) былі прызнаны невінаватымі ва ўдзеле ў паўстанні, бо «знаходзіліся ў шайцы выпадкова, супраць іх жадання» і падлягалі вяртанню на месца жыхарства з аддачай на парукі. Прысуд Леаніду Бараноўскаму не выносіўся, бо ён памёр да часу канфірмацыі [6, арк. 70–72 адв.].

На фоне гэтай канфірмацыі нехарактэрны лёс Браніслава Вэндарфа. Следства, нягледзячы на вышэйзгаданае паведамленне з рапарта Астахава, не мела звестак пра яго непасрэдны ўдзел у фарміраванні атрада. Пасля бою ля Азярцоў ён добраахвотна з'явіўся да расійскіх уладаў. Пачаткова ён быў арыштаваны і зняволены ў слуцкім астрогу, а яго маёмасць падлягала секвестру. На следстве ён даказаў, што захоплены ў атрад гвалтоўна, таму паводле загаду часовага ваеннага губернатара Мінскай губерні Васіля Забалоцкага ад 13 ліпеня 1863 г. ён быў вызвалены з-пад арышту і вернуты на месца жыхарства пад негалосны паліцэйскі нагляд [8, арк. 29–38, 272–272 адв.; 11, арк. 38; 13, арк. 2 адв.].

Лёс большасці ўдзельнікаў атрада Машэўскага пасля ссылкі невядомы, аднак звесткі пра некаторых захаваліся. Так, вядома, што Тамаш Кавецкі падчас ссылкі знаходзіўся ў Омску, Флярыян Мікульскі ў 1866–1867 гг. жыў у гарадах Тара, Семіпалацінск, Омск і служыў арганістам, Францішак Пятроўскі з 1865 г. жыў у Марыінскай акрузе Томскай губерні, Юзаф Пятроўскі знаходзіўся ў Томскай акрузе, дзе атрымаў матэрыяльную дапамогу на «домаабзавядзенне», а Антоні Шулякоўскі з 1864 г. займаўся сялянскімі працамі ў Томскай акрузе [5, с. 398, 421, 438, 483]. Адзінкавыя паўстанцы з атрада Машэўскага (Ю. Бародзіч, Саевіч, Далькевіч, Н. Абуховіч, Грыгаровіч, Крушынскі,

Мацкевіч, Б. Нядзвецкі, В. Чарноцкі) у выніку некалькіх амністый 1870-х гг. атрымалі дазвол на вяртанне на радзіму, і прынамсі шасцёра апошніх вярнуліся.

За актыўны ўдзел у паўстанні маёмасць Машэўскага падлягала канфіскацыі, аднак ніякай яго ўласнай нерухомасці ў Слуцкім павеце выяўлена не было [10, арк. 197 адв., 326–327, 333–334, 462–463]. Яго ўдзел у паўстанні не паўплываў на саслоўны стан яго сына. Паколькі «пазбаўленне правоў стану не распаўсюджваецца ні на жонку асуджанага, ні на дзяцей яго», з дапамогай дзядзькі Юзафа-Артура ён у 1867 г. атрымаў зацвярджэнне ў Герольдыі Сената правоў дваранства. Ідалія Машэўская разам з сынам пераехалі пасля паўстання ў Варшаву і ў 1867 г. былі запісаны ў склад яе сталых жыхароў. Там яны і жылі, калі 31 кастрычніка 1900 г. Храбрыслаў памёр у шпіталі Святога Яна, не стварыўшы сям'і [9, арк. 46–56].

ДАДАТАК

Алфавітны спіс вядомых удзельнікаў паўстання ў складзе атрада Уладзіслава Машэўскага[11]

Абуховіч Атон, 20 г., дваранін, пісар, каталік.
Абуховіч Напалеон, 23 г., дваранін, студэнт, каталік.
Асіповіч Казімір, 45 г., дваранін, каталік.
Асіповіч Юзаф, 16 г., дваранін, гімназіст, каталік.
Асяеўскі Казімір.

[11] У спісе пададзены толькі некаторыя з вядомых звестак – узрост, саслоўе, род заняткаў ці адукацыя, веравызнанне. Пры гэтым ужыты пэўныя абагульненні: пад тэрмінам «дваранін» разумеюцца як зацверджаныя, так і незацверджаныя дваране; пад тэрмінам «селянін» – як часоваабавязаныя, так і вольныя, пад тэрмінам «студэнт» – як асобы, якія ўжо скончылі вышэйшую адукацыю на момант паўстання, так і тыя, што яе працягвалі. Узрост пераважнай большасці асобаў пададзены паводле канфірмацыі М. Мураўёва ад 13.02.1864, аднак у самой канфірмацыі не растлумачана – гэта ўзрост на момант паланення паўстанцаў ці на момант вынясення прысуду. Узрост не згаданых у канфірмацыі асобаў (Асіповіч К., Блавачынскі, Буката, Вэндарф, Капашынскі, Клюкоўскі, Машэўскі) пададзены на падставе іншых крыніц з НГАБ з разлікам на 1863 г.

Багурскі Антоні, 20 г., дваранін, каталік.
Бараноўскі Леанід, 27 г., дваранін, каталік.
Баранцэвіч Канстанцін, 20 г., дваранін, каталік.
Баранцэвіч Стэфан, 29 г., дваранін, афіцэр, каталік.
Бародзіч Юзаф, 23 г., дваранін, каталік.
Блавачынскі Міхал, 32 г., дваранін ці вольны хлебароб.
Буката Лукаш, 22 г., селянін, каталік.
Вэндарф Браніслаў, 32 г., дваранін, міравы пасярэднік, каталік.
Грыгаровіч Баляслаў, 16 г., дваранін, гімназіст, каталік.
Грыгаровіч Юльян, дваранін, каталік.
Гудзіян (Гудар) Юзаф, 42 г., мешчанін.
Далькевіч Юльян, 22 г., дваранін, каталік.
Дашкевіч Адольф, 30 г., дваранін, каталік.
Кабак Фёдар, 25 г., селянін, прыватны службоўца, праваслаўны.
Кавельмахер Вацлаў, 26 г., мешчанін, студэнт, пратэстант.
Кавецкі Тамаш, 24 г., аднадворац, каталік.
Капашынскі Караль, 36 г., дваранін, каталік.
Кернажыцкі Канстанцін, 32 г., дваранін, лекар, праваслаўны.
Клеер Юльян, 20 г., мешчанін.
Клюкоўскі Фелікс, 22 г., дваранін, студэнт.
Крагельскі Аляксандр, 17 г., дваранін, каталік.
Крагельскі Ян, 19 г., дваранін, каталік.
Крушынскі Максімільян, 23 г., дваранін, студэнт, каталік.
Ласоўскі Антоні, дваранін, каталік.
Ліпніцкі Міхал, 21 г., мешчанін, праваслаўны.
Максімчык Пётр, селянін, праваслаўны.
Марчык Адольф, 25 г., селянін, вазніца, праваслаўны.
Мацкевіч Караль, 19 г., дваранін, студэнт, каталік.
Машэўскі Уладзіслаў, 38 г., дваранін, афіцэр.
Мікульскі Фларыян, 20 г., дваранін, аканом.
Мілярэўскі Міраслаў, дваранін, студэнт.
Мінкевіч Баляслаў, 21 г., селянін, гімназіст.
Нядзвецкі Бярнард, 22 г., дваранін, землямер, каталік.
Нядзвецкі Юзаф, дваранін, каталік
Падгальскі Базыль, 23 г., селянін, каталік.
Палоцкі Вінцэнт, 26 г., мешчанін ці селянін, лакей, каталік.

Плаўскі Адам, 20 г., аднадворац, каталік.

Пятроўскі Францішак, дваранін.

Пятроўскі Юзаф, 20 г., дваранін, студэнт, каталік.

Радкевіч Антоні, 19 г., дваранін, ляснік, каталік.

Рудаміна Юзаф, 18 г., дваранін, каталік.

Саевіч Уладзіслаў, 20 г., дваранін ці аднадворац, гімназіст, каталік.

Траяноўскі Базыль, дваранін.

Флемінг Георг, 19 г., іншаземец, гімназіст, пратэстант.

Чаркоўскі Станіслаў, 22 г., дваранін.

Чарноцкі Віктар, 30 г., дваранін, каталік.

Чарноцкі Ян, дваранін, афіцэр.

Шпакоўскі Мечыслаў, дваранін, афіцэр, каталік.

Шулякоўскі Антоні, 18 г., дваранін, арандатар, каталік.

Юрэцкі Юзаф, 22 г., дваранін, вазніца, каталік.

Янкоўскі Аляксандр, 31 г., дваранін, пісар, каталік.

Літаратура

1. Восстание в Литве и Белоруссии 1863–1864 гг.: сб. док. / [АН СССР, Ин-т славяноведения и др.]. – М.; Вроцлав: Наука, 1965. – 586 с.

2. Ігнатоўскі, У. 1863 год на Беларусі: нарыс падзей / У. Ігнатоўскі. – Мінск, 1930. – 275 с. (Запіскі Аддз. гуманіт. навук. – Кн. 13. – Пр. Ін-ту гіст. навук. – Т. V).

3. *Матвейчык, Д. Ч.* Паўстанне 1863–1864 гадоў у Беларусі: нарыс баявых дзеянняў / Д. Ч. Матвейчык. – Мінск: Медысонт, 2013. – 122 с.: іл.

4. *Матвейчык, Д. Ч.* Паўстанне 1863–1864 гг.: крыніцы з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (агульны агляд) / Д. Ч. Матвейчык // Архівы і справаводства. – 2013. – № 1. – С. 66–77.

5. *Мулина, С. Е.* Участники польского восстания 1863 года в западносибирской ссылке : дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / С. Е. Мулина. – Омск, 2005. – 498 с.

6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі у Мінску (далей – НГАБ). – Фонд 162. – Воп. 1. – Спр. 116. – Распараджэнні, загады Мінскага губернскага праўлення пра разгляд спраў аб канфіскацыі маёнткаў удзельнікаў паўстання 1863 года і іншых спраў, што знаходзяцца ў вытворчасці. 22.02.1862–14.12. 1864. – 179 арк.

7. НГАБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 1537. – Рапарты ваеннага начальніка і земскага спраўніка Слуцкага пав., жыцінскага благачыннага Бабруйскага павета аб з'яўленні паўстанцкіх атрадаў у паветах. 26.05.1863–15.09.1864. – 30 арк.

8. НГАБ. – Фонд 296. – Воп. 1. – Спр. 19. – Перапіска з Мінскай следчай па палітычных справах камісіяй, павятовымі ваеннымі начальнікамі і спраўнікамі аб правядзенні расследавання, арышце, высылцы з губерні, спагнанні штрафаў з асобаў, што абвінавачваліся ва ўдзеле ў паўстанні, альбо іх сваякоў, аб вызваленні з-пад арышту. Спіс асобаў, што абвінавачваліся ва ўдзеле альбо садзейнічанні паўстанню, канфірмаваных мінскім ваенным губернатарам з пачатку паўстання па верасень 1863 г. 02.05.1863–27.09.1863. – 281 арк.

9. НГАБ. – Фонд 319. – Воп. 2. – Спр. 2093. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Машэўскіх. 31.07.1823–30.12.1900. – 56 арк.

10. НГАБ. – Фонд 320. – Воп. 1. – Спр. 398. – Справа аб пошуку маёнткаў удзельнікаў паўстання 1863 г. для ўзяцця ў секвестр. 05.08.1863–30.09.1866. – 785 арк.

11. НГАБ. – Спр. 320. – Воп. 2. – Спр. 99. – Справа аб накладанні секвестру і канфіскацыі маёнткаў удзельнікаў паўстання 1863–1864 гг.

12. НГАБ. – Фонд 1418. – Воп. 4. – Спр. 1. – Справа аб прыцягненні да судовай адказнасці ўдзельнікаў паўстання 1863 г. 1863 г. – 12 арк.

13. НГАБ. – Фонд 1524. – Воп. 1. – Спр. 1. – Спіс асобаў, што былі пад следствам у Слуцкай следчай камісіі з 14 траўня 1863 года па 1 жніўня 1864 г. – б. д. – 16 арк.

14. *Смирнов, А. Ф.* Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии / А. Ф. Смирнов. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1963. – 391 с.

15. *Фірыновіч, А. Э.* Паўстанне 1863–1864 гг.: вядомыя і невядомыя крыніцы беларускіх архіваў / А. Фірыновіч. – Мінск: Беларус. навука, 2013. – 315 с.

16. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 5. М – Пуд // Беларус. энцыкл.; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск: Беларус. энцыкл., 1999. – 592 с.: іл.

17. *Fajnhauz, D.* 1863: Litwa i Białoruś / D. Fajnhauz. – Warszawa: Neriton, 1999. – 357 s.

18. *Gieysztor, J.* Pamiętniki z lat 1857–1865: W 2 t. / J. Gieysztor. – Wilno, 1913.

19. *Ramotowska, F.* Tajemne państwo polskie w powstaniu styczniowym 1863–1864: Struktura organizacyjna / F. Ramotowska. – Warszawa: DiG, 1999. – 727 s.

Резюме

Д. Ч. МАТВЕЙЧИК

ВЛАДИСЛАВ МАШЕВСКИЙ И ПОПЫТКА ВООРУЖЕННОГО ВЫСТУПЛЕНИЯ В СЛУЦКОМ УЕЗДЕ В 1863 г.

На основе сведений, содержащихся в опубликованных и неопубликованных рукописных, хранящихся в фондах Национального исторического архива Беларуси, источниках и научной литературе, показываются роль Слуцкого уезда в стратегических планах повстанцев и лица, в обязанность которых

входила подготовка вооруженного выступления в уезде, приводятся сведения о биографии Владислава Машевского в доповстанческий период, раскрываются его значение и участие в развитии восстания на территории Минской губернии в целом и формировании и действиях отряда в Слуцком уезде в частности, делается попытка реконструкции действий слуцкого повстанческого отряда и восстановления его численного состава, приводятся цитаты из исторических источников с описанием боя у деревни Озерцы Игуменского уезда, а также показывается судьба повстанцев из данного отряда после его поражения.

Summary

D. MATVEICHYK

ULADZISLAU MASHEUSKI AND AN ATTEMPT OF A UPRISING IN THE SLUTSK DISTRICT IN 1863

Based on the information contained in published and unpublished handwritten sources kept at the National Historical Archives of Belarus and scholarly literature the paper reveals the role of the Slutsk district in the strategic plans of the insurgents and the person who was responsible for the preparation of the uprising in the district, provides some information about Uladzislau Masheuski's biography in the pre-uprising period, sheds light on his role and involvement in the development of the uprising within the territory of the Minsk governorate in general and the formation and activities of the military unit in the Slutsk district in particular, and aims to reconstruct the activities of the Slutsk military unit and the renewal of its strength. The author provides citations from historical sources containing the description of the battle at the village of Aziartsy in the Ihumen district and reveals the fate of the insurgents from this unit after their defeat.

Паступіў у рэдакцыю 23.12.2013

УДК 930.1(09)

Е. В. СЕРАК

СОЦИОКУЛЬТУРНАЯ АДАПТАЦИЯ ССЫЛЬНЫХ УЧАСТНИКОВ ВОССТАНИЯ 1863–1864 гг. В СИБИРИ: ИСТОРИОГРАФИЯ ПРОБЛЕМЫ

Процесс социально-культурной адаптации в Сибири ссыльных участников восстания 1863–1864 гг. продолжает рассматриваться в работах отечественных и зарубежных исследователей XIX – начала XXI в. Историографию проблемы можно представить в хронологической последовательности, выделив в работах основные направления: изучение аспектов государственно-правового регулирования осуждения повстанцев и функционирование системы ссылки в Сибирь, условий реализации адаптативного потенциала изгнанников в местах ссылки, опыта профессиональной, просветительской и культурной деятельности.

Представители дореволюционной российской историографии восстание 1863–1864 гг. характеризовали как «польское». В рамках этой установки ссылка в Сибирь рассматривается в ракурсе этнической принадлежности. В связи с этим процессы, связанные с наказанием участников восстания 1863–1864 гг. из Литвы и Беларуси и их пребыванием в ссылке не получили надлежащего анализа. Изучение данной проблематики в контексте политики царизма позволило исследователям затронуть только некоторые аспекты законодательства и административной деятельности в отношении ссыльных. Изучение ссылки и адаптации участников восстания 1863–1864 гг. в Сибири начинается уже с 70-х гг. XIX в. Ссылка стала темой публицистических статей П. А. Кропоткина, который отметил несостоятельность ссылки в качестве исправительной меры [7]. В том же направлении, что и П. А. Кропоткин, проводил изучение проблемы русский публицист Н. М. Ядринцев [29].

Наиболее разноплановым исследованием дореволюционной российской историографии стала 3-томная монография С. В. Максимова [11]. Объектом исследования этого автора стала также деятельность ремесленных мастерских для ссыльных-горожан г. Тобольска за период 1864–1867 гг. Ученый пришел к выводу, что получив работу, ссыльные отказывались от государственного пособия, сокращалось число побегов, был сдержан наплыв в сибирские деревни ссыльных горожан, не приспособленных к земледелию. В рамках данного исследования было положено начало методологии изучения адаптационных процессов для ссыльных.

В советской историографии 20 – первой половины 30-х гг. XX в. происходило накопление и публикация отдельных материалов, связанных с историей политической ссылки в Сибири. Значительный вклад в этот процесс внес издававшийся Всероссийским обществом бывших политкаторжан и ссыльнопоселенцев журнал «Каторга и ссылка», где затрагивалась тема ссыльных повстанцев 1863–1864 гг. в Сибири. Так, С. П. Швецов и В. И. Николаев обозначили такое новое исследовательское направление, как культурное влияние политической ссылки и роль ссыльных в научно-просветительской и краеведческой деятельности в Сибири [16; 28].

В этот же период была издана работа П. Н. Луппова, в которой предметом анализа стала ссылка повстанцев 1863–1864 гг. в Вятку [10]. Уделив значительное внимание материальным, бытовым, социальным и профессиональным аспектам жизни ссыльных, автор детально проследил территориальные границы, в которых должны были находиться ссыльные «уроженцы Царства Польского и Западного края».

В историографии проблемы периода 60–80-х гг. XX в. появляется новый аспект. Адаптация в Сибири выходцев из Беларуси, впервые была вписана в адаптационный процесс ссыльных участников «польского» восстания 1863–1864 гг. Исследователи начинают разграничивать среди участников восстания уроженцев белорусско-литовских губерний и Царства Польского.

В рассматриваемый период Л. А. Ушакова и Р. Г. Круссер сформулировали методологию исследования данной проблематики, и в дальнейшем советская историография обращается к данным исследованиям [8; 25]. Г. И. Мендрина первой определила медицинскую практику ссыльных в Сибири как наиболее раннюю и распространенную форму просветительской работы [13]. Автор проследила роль ссыльных врачей в деле становления медицинского обслуживания в регионе и распространения санитарно-гигиенических знаний среди местного населения.

В 80-х XX в. в работе И. Г. Мосиной были поставлены вопросы участия ссыльных в общественно-политической и культурной жизни Сибири [14]. Эти авторы обратили внимание на характер отношений ссыльных с сибирской общественностью, осветили их вклад в научное изучение Сибири и влияние на формирование интеллигенции региона. При этом М. Г. Сесюнина попыталась выяснить и определить характер взаимоотношений, отметив, что контакты сибирской общественности и ссыльных строились на основе культурно-просветительской и научной деятельности [21].

Среди исследований, которые были посвящены культурно-бытовым и социально-экономическим аспектам ссылки в Сибирь во второй половине XIX – начале XX в., необходимо отметить работы А. Д. Марголиса, Е. И. Соловьевой [12; 24]. Для нашей работы значимы положения исследователей о принципах расселения, особенностях хозяйственного и бытового устройства, формировании отношений «пришлого» элемента и местного чиновничества, которое наиболее тесно соприкасалось с проблемами ссыльных. Обращение к работам названных авторов обусловлено стремлением выявить общее и особенное в процессе водворения, темпах и результатах социализации ссыльных в зависимости от районов их расселения.

В последнее десятилетие историками положено начало изучению судеб «рядовых» повстанцев. Значительные наработки в этом направлении представлены российскими историками В. Латыповой, С. Мулиной, В. Ханевичем [9; 15; 26]. Авторами немало сделано для выявления роли ссыльных белорусов

в общественном и культурном развитии Сибири, в частности в образовании, просвещении и медицине, а так же в промышленности и торговле.

Новый подход в осмыслении вопроса функционирования судебно-следственной системы и организации процесса судопроизводства используется в монографии А. Ф. Смирнова и статье Л. А. Обушенковой [18; 23]. Исследователи провели источниковедческий анализ материалов судебно-следственных учреждений по делам участников восстания 1863–1864 гг. и обратили внимание на особенности приемов, применяемых в ходе судебного производства и на принципы построения работы следственных и военно-судебных комиссий.

Изменение общественно-политической ситуации в 90-е гг. XX в. отразилось на проблематике российских исследований. В историографии адаптации ссыльных участников восстания 1863–1864 гг. в Сибири обозначены новые направления. На первый план выходят вопросы о роли ссыльных в научной деятельности. А. Ю. Дергачевым исследованы вопросы организации и функционирования научных обществ в Сибири в конце XIX – начале XX в., о роли ссыльных в привлечении местных жителей к практической научной деятельности, участии в организации экспедиций и создании ряда музеев [5].

Появляются также работы, анализирующие деятельность ссыльных какой-либо одной социальной группы. Исследования Д. Б. Билунова, Л. Е. Горизонтова, И. Н. Никулиной, с одной стороны, подчеркивают вклад католического духовенства в социокультурную жизнь сообщества ссыльных, с другой стороны, отмечают влияние духовной культуры ссыльных ксендзов, на формирование уклада жизни сибиряков [1; 4; 17]. Также И. Н. Никулина в своей монографии подчеркивает, что брак и семья облегчали задачу по поиску индивидуальной стратегии выживания, способствовали оптимальному использованию адаптивных ресурсов.

В белорусской историографии тема социокультурной адаптации в Сибири ссыльных участников восстания 1863–1864 гг. не стала предметом самостоятельного изучения. Тем не менее

некоторые отдельные аспекты затронуты в ряде исследований. Наиболее ценными, с нашей точки зрения, являются вышедшие в 20–30-е гг. XX в. работы В. М. Игнатовского и С. Г. Цитовича [6; 27]. Эти авторы акцентируют внимание на изучении репрессивной политики российских властей по отношению к участникам восстания 1863–1864 гг., отмечают специфику деятельности карательных структур в Беларуси в 1863–1865 гг.

Значительным явлением в белорусской советской историографии стала монография С. М. Самбук [20]. Автор, рассматривая функционирование системы осуждения в условиях военного положения на белорусско-литовской территории, опосредованно дает возможность использовать ее работу для освещения особенностей деятельности судебно-следственного аппарата. Позволяет определить роль и место ссылки в системе репрессивных мероприятий самодержавия. Свою оценку оформлению на территории Беларуси режима «исключительных законов» в ходе и после подавления восстания 1863–1864 гг. дает М. О. Бич [2].

Исследование деятельности карательных структур по осуждению участников восстания 1863–1864 г. в отечественной историографии было предпринято О. В. Горбачевой [3]. В своих статьях автор исследует виды наказаний, которым подвергались представители разных социальных слоев за участие в восстании.

Деятельность военно-уездных начальников Минской губернии в период 1863–1864 гг. стала предметом исследования гродненского историка А. Радюка [19]. А. Смоленчук отмечает, что местная администрация белорусско-литовских губерний получила широкие полномочия в реализации карательных мероприятий, что привело к применению внесудебной практики ссылки крестьян католического вероисповедания [22].

В польской историографии второй половины XIX – начала XX в. основное внимание авторов было сосредоточено на представлении конкретно-исторического материала по проблеме и субъективно-эмоциональной оценке системы ссылки.

Среди польских исследований, которые посвящены проблеме пребывания и деятельности ссыльных повстанцев 1863–1864 гг. в Сибири необходимо в первую очередь выделить

работу З. Либровича [33]. Широкие временные и географические рамки работы позволили автору в комплексе представить образ жизни ссыльных в Сибири, в отличие от А. Гиллера, который описал лишь забайкальскую ссылку. В меньшей степени З. Либрович уделил внимание западносибирской ссылке, представив лишь краткий обзор тобольской, томской, курганской и омской колоний ссыльных.

Современные польские исследователи В. Сливовская, Б. Ендрыховская обратили внимание на разноплановый характер деятельности ссыльных за Уралом в период с 1830 по 1883 г. [34; 30]. Богатый фактологический материал дает возможность проследить динамику занятости ссыльных, проанализировать процесс организации образовательных и благотворительных учреждений, библиотечного дела. Достаточно широк спектр интересов польской исследовательницы Э. Качинской [31]. Автором затрагиваются вопросы возвращения и оседлости, адаптации и ассимиляции ссыльных в Сибири.

Монографическая работа А. Кучинского охватывает период 400-летней истории польской диаспоры в Сибири, в которой ссылка показана в различных ее аспектах [32]. При этом основное внимание сосредоточено автором на исследовании способов и результатов адаптации ссыльных и добровольно прибывших поляков – участников восстания 1863–1864 гг.

Проведенный анализ отечественной и зарубежной историографии по теме указывает на мозаичность и фрагментарность в ее исследовании на протяжении XIX–XX вв. Социокультурная адаптация в ссылке участников восстания 1863–1864 гг. из Беларуси не стала объектом отдельного исторического исследования в отечественной историографии. Белорусские исследователи акцентируют внимание преимущественно на репрессивной политике российского правительства. В современной историографии наблюдается постановка новых проблемных вопросов, а документальный резерв исследований характеризуется качественным и количественным ростом источников. В российской и польской историографии история социокультурной адаптации сосланных в Сибирь участников восстания 1863–1864 гг. стала

важным аспектом при изучении карательной политики царского правительства. Научные интересы авторов сосредоточены на отображении внутреннего мира ссыльных, в первую очередь их интересует социально-психологическая адаптация, степень занятости, нравственный климат польских колоний в Сибири.

Литература

1. *Билунов, Д. Б.* Правительственная политика в отношении римско-католической церкви (60-е годы XIX в.) / Д. Б. Билунов // Вестн. МГУ. – Сер. 8. – 1996. – № 4. – С. 19–43.

2. *Біч, М. В.* Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі і Літве / М. В. Біч // Энцыкл. гіст. Беларусі: у 6 т.– Мінск: Беларус. энцыкл., 1999. – Т. 5. – С. 448–450.

3. *Горбачева, О. В.* Восстание 1863–1864 гг. и репрессивные мероприятия царизма в Беларуси // О. В. Горбачева / Powstanie styczniowe 1863–1864. Walka i uczęstnicy. Represje i wygnanie. Historiografia i tradycja. Kielce, 2005. – S. 111–118.

4. *Горизонтов, Л. Е.* Парадоксы имперской политики: поляки в Росии и русские в Польше (XIX – начало XX в.) / Л. Е. Горизонтов. – М.: Индрик, 1999. – 272 с.

5. *Дергачев, А. Ю.* Научные общества и вопрос о координации научных исследований в Сибири (конец XIX начало XX в.) / А. Ю. Дергачев // Социально-культурное развитие Сибири: Бахрушинские чтения, 1991: межвуз. сб. науч. тр. / Новосибир. гос. ун-т; редкол.: Л. М. Горюшкин (отв. ред.) [и др.]. – Новосибирск, 1991. – С. 45–55.

6. *Ігнатоўскі, У.* 1863 год на Беларусі: нарыс падзей / У. Ігнатоўскі // Запіскі адд. гуманіт. навук, Пр. ін-ту гіст. навук. – Менск, 1930. – Т. 5. – Кн. 13. – 276 с.

7. *Крапоткин, П. А.* Тюрьмы, ссылка, каторга в России / П. А. Крапоткин. – СПб.: Тип. В. Мильштейна, 1906. – 59 с.

8. *Круссер, Р. Г.* Народные массы Сибири в исследованиях политических ссыльных 70 – начала 90-х гг. XIX в.: учеб. пособие / Р. Г. Круссер. – Кемерово: КГУ, 1989. – 80 с.

9. *Латыпова, В.* Польские ссыльные на Южном Урале после восстания 1863–1864 годов и их взаимоотношения с местным населением / В. Латыпова // Поляки и русские: материалы конференции «Польша – Россия. Роль национальных восстаний в формировании представления друг о друге». – Варшава, 1999. – С. 271–281.

10. *Луппов, П. Н.* Политическая ссылка в Вятский край / П. Н. Луппов. – М.: Изд-во Всес. об-ва политкаторжан и ссыльнопоселенцев, 1933. – 207 с.

12. *Максимов, С.* Сибирь и каторга / С. Максимов. – СПб.: Тип. Траншеля, 1871. – Ч. 3. – 388 с.

13. *Марголис, А. Д.* О численности и размещении ссыльных в Сибири в конце XIX в. / А. Д. Марголис // Ссылка и каторга в Сибири (XVIII – начало XX в.) / АН СССР, Сиб. отд-е, Ин-т истории, филологии и философии; под ред. Л. М. Горюшкина. – Новосибирск: Наука, 1975. – С. 223–237.

14. *Мендрина, Г. И.* Медицинская деятельность политических ссыльных в Сибири / Г. И. Мендрина. – Томск, 1962. – С. 19–57.

15. *Мосина, И. Г.* Политическая ссылка и интеллигенция в Сибири (конец XIX – начало XX в.) // Ссыльные революционеры в Сибири (XIX в. – февр. 1917 г.): сб. науч. тр. / Иркут. гос. ун-т.; редкол.: Н. Н. Щербаков (отв. ред.) [и др.]. – Иркутск, 1985. – Вып. 9. – С. 112–119.

16. *Мулина, С. А.* Участники польского восстания 1863 г. в Сибири: проблемы адаптации / С. А. Мулина // Азиатская Россия: люди и структуры империи: сб. науч. ст. к 50-летию со дня рождения профессора А. В. Ремнева / Федер. агентство по образованию, Омский гос. ун-т; под ред. Н. Г. Суворовой. – Омск, 2005. – С. 496–509

17. *Николаев, В. И.* Сибирская политическая ссылка в изучении местного края / В. И. Николаев // Каторга и ссылка историко-революционный вестник. – М.: Изд-во Всесоюз. об-ва политкаторжан и ссыльнопоселенцев, 1927. – № 5 (34). – С. 87–116.

18. *Никулина, И. Н.* Религия и политические ссыльные Западной Сибири в XIX в. (20-е – первая половина 70-х гг.) / И. Н. Никулина. – Иркутск: Оттиск, 2011. – 254 с.

19. *Обушенкова, Л. А.* Архивные материалы судебно-следственных учреждений 1863–1866 гг. по делам участников восстания / Л. А. Обушенкова // К столетию героической борьбы «за нашу и вашу свободу»: сб. ст. и материалов о восстании 1863 г. / Акад. наук СССР, Ин-т славяноведения; под ред. В. А. Дьякова [и др.]. – М.: Наука, 1964. – С. 211–280.

20. *Радзюк, А. Р.* Фонды ваенна-павятовых начальнікаў як крыніца па гісторыі развіцця і падаўлення нацыянальна-вызваленчага руху падчас паўстання 1863–1864 гг. (па матэрыялах Гродзенскай губерні) / А. Р. Радзюк // Архівары́ус. – 2010. – Вып. 8. – С. 177–182.

21. *Самбук, С. М.* Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века / С. М. Самбук. – Минск: Наука и техника, 1980. – 221 с.

22. *Сесюнина, М. Г.* Вопросы развития просвещения и культуры Сибири в программе сибирских областников / М. Г. Сесюнина // Из истории Сибири: сб. науч. ст. / Томский гос. ун-т; редкол.: Л. И. Боженко (отв. ред.) [и др.]. – Томск, 1972. – Вып. 4. – С. 269–289.

23. *Смалянчук, А. Ф.* Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 / А. Ф. Смалянчук. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2004. – 406 с.

24. *Смирнов, А. Ф.* Проявление революционной солидарности народов России и Польши в восстании 1863 г. / А. Ф. Смирнов // Революционные связи народов России и Польши: 30–60 годы XIX века. – М.: Изд-во социально-эконом. лит., 1962. – С. 264–332.

25. *Соловьева, Е. И.* Расселение и положение ссыльных в Сибири во второй половине XIX века / Е. И. Соловьева // Политические ссыльные в Сибири (XVIII – начало XX в.) / АН СССР, Сиб. отд., Ин-т истории, филологии и философии; под. ред. Л. М. Горюшкина. – Новосибирск: Наука, 1983. – С. 214–226.

26. *Ушакова, Л. А.* Культурно-просветительская роль политических ссыльных народников в Сибири (70-е – середина 90-х гг. XIX в.) / Л. А. Ушакова. – Новосибирск, 1986. – 72 с.

27. *Ханевич, В. А.* Участники Январского восстания и их потомки в истории г. Томска / В. А. Ханевич // Powstanie styczniowe 1863–1864. Walka i uczestnicy. Represje i wygnanie. Historiografia i tradycja. – Kielce, 2005. – S. 133–144.

28. *Цытовіч, С. Г.* 1863 год у Горы-Горках быўшай Магілёўскай губерні (падзеі паўстаньня) / С. Г. Цытовіч. – Менск: Друк. Бел. акад. навук, 1929. – 124 с.

29. *Швецов, С. П.* Культурное значение политической ссылки в Западной Сибири / С. П. Швецов // Каторга и ссылка историко-революционный вестник. – М.: Изд-во Всесоюз. об-ва политкаторжан и ссыльнопоселенцев, 1928. – № 3(40). – С. 57–87.

30. *Ядринцев, Н. М.* Сибирь как колония в географическом, этнографическом и историческом отношении / Н. М. Ядринцев. – СПб.: Изд. И. М. Сибирякова, 1892. – 720 с.

31. *Jędrychowska, B.* Polscy zesłańcy na Syberii (1830–1883). Działalność pedagogiczna, oświatowa i kulturalna / B. Jędrychowska. – Wrocław: Wydawnictwo Uniwersytetu Wrocławskiego, 2000. – 240 s.

32. *Kaczyńska, E.* Zesłanie i katorga na Syberii w dziejach polaków 1815–1914 / E. Kaczyńska – Warszawa, 1992. – 213 s.

33. *Kuczyński, A.* Syberia. 400 lat polskiej diaspory. Zesłania, martyrologia i sukces cywilizacyjny polaków / A. Kuczyński. – Wydawnictwo: Kabajak. – 2007. – 544 s.

34. *Librowicz, Z.* Polacy w Syberji / Z. Librowicz. – Kraków: Druk Wł. L. Anczyca, 1884. – S. 160–380.

35. *Śliwowska, W.* Syberia w życiu i pamięci Giejsztorów – zesłańców postyczniowych. Wilno – Sybir – Wiatka – Warszawa / W. Śliwowska. – Warszawa, 2000. – 399 s.

Рэзюмэ

А. У. СЕРАК

САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ АДАПТАЦЫЯ САСЛАНЫХ УДЗЕЛЬНІКАЎ ПАЎСТАННЯ 1863–1864 гг. У СІБІРЫ: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ

Праводзіцца аналіз падыходаў да вывучэння праблемы сацыяльна-культурнай адаптацыі сасланых удзельнікаў паўстання 1863–1864 гг. у Сібіры, выпрацаваных айчыннымі і замежнымі даследчыкамі XIX – пачатка XXI ст.

Адзначаецца, што ў сучаснай гістарыяграфіі назіраецца пастаноўка новых праблемных пытанняў, а дакументальны рэзерв даследаванняў характарызуецца якасным і колькасным ростам крыніц. Адзначаецца, што беларускія даследчыкі акцэнтуюць увагу пераважна на рэпрэсіўнай палітыцы расійскага ўрада. У польскай і расійскай гістарыяграфіі навуковыя інтарэсы аўтараў засяроджаны на адлюстраванні ўнутранага свету ссыльных, цікавіць ступень занятасці, маральны клімат і сацыяльна-псіхалагічная адаптацыі «польскіх калоній» у Сібіры. Робяцца папярэднія высновы, якія характарызуюць ступень даследаванасці праблемы, пазначана кола асноўных задач, вырашэнне якіх дазволіць стварыць цэласную карціну даследаванай з'явы.

Summary

A. SERAK

SOCIOCULTURAL ADAPTATION OF THE EXILED UPRISING PARTICIPANTS IN 1863–1864 IN SIBERIA: HISTORIOGRAPHY OF THE PROBLEM

The given article is devoted to the theoretical approaches analysis in the 1863–1864 years 'Siberian revolt exiled members' sociocultural adaptation research problem. These approaches were drawn in the 19th beginning of the 21 st centuries by native and foreign researches. In contemporary historiography, it is found the formulation of new problem questions. Documentary research reserve replenishes with new sources of information both qualitatively and quantitatively. Belarusian researches accentuate their attention mainly on repressive politics of Russian government. In Russian and Polish historiography, researcher's scientific interests are concentrated on private world reflection of exiled members. Authors are interested in the degree of employment, psychological adaptation and moral climate of «Polish colonies» in Siberia. Preliminary conclusions characterizing the problem studying level are based on the historiographical analysis. The main tasks circle is scheduled. These tasks solution is to make complete picture of the studying point.

Паступіў у рэдакцыю 13.12.2013

УДК [94(476)+ 929(042)(091)]«1964»

А. У. УНУЧАК

ЗНАКАВЫ ЮБІЛЕЙ: ЯК У БССР АДЗНАЧАЛАСЯ СТАГОДДЗЕ З ДНЯ СМЕРЦІ КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА

У БССР, пачынаючы з 1924 г., стала трывалай традыцыя адзначаць угодкі пакарання смерцю Кастуся Каліноўскага (1838–1864) [24]. На 1964 г. прыпаў круглы, 100-гадовы, юбілей той падзеі. Гэта быў знакавы юбілей. Знакавы, таму што асоба К. Каліноўскага важная перш за ўсё для Беларусі – ні ў Польшчы, ні ў Літве не было і да сённяшняга часу няма асобы, з якой бы настолькі моцна асацыявалася паўстанне 1863–1864 гг. Таму ў БССР пасля святкавання 100-гадовага юбілею паўстання 1863–1864 гг., былі адзначаныя таксама сотыя ўгодкі з дня смерці К. Каліноўскага.

Мэтай гэтага артыкула з'яўляецца высвятленне ідэйнага зместу юбілейных падзеяў 1964 г., звязаных са стагоддзем пакарання смерцю К. Каліноўскага.

Пра юбілей з дня смерці К. Каліноўскага, пачалі гаварыць загадзя. За год да вышэйадзначанага юбілею, у 1963 г., у прадмове да знакамітай біяграфіі К. Каліноўскага, даследчык А. Смірноў пісаў: «Варта было б да стагоддзя з дня смерці Каліноўскага апублікаваць спецыяльны зборнік дакументаў і матэрыялаў пра яго жыццё і рэвалюцыйную дзейнасць» [20, с. 10].

Трэба адзначыць, што дзень смерці К. Каліноўскага лічыўся важнай датай не толькі ў БССР. Так, напрыклад, у «Маладзёжным календары» на 1964 г., які годам раней быў надрукаваны ў Маскве, пад датай 22 сакавіка змяшчалася інфармацыя наступнага зместу: «100 гадоў таму (1864) быў пакараны смерцю К. С. Каліноўскі (Кастусь Каліноўскі), беларускі рэвалюцыянер, кіраўнік сялян-

скага паўстання ў Беларусі і Літве. Нарадзіўся ў 1838 г.» [16]. Такім чынам, на агульнасаюзным узроўні было зафіксавана, што для Беларусі юбілейным быў не толькі 1963, але і 1964 гг.

У сакавіку 1964 г. артыкулы і матэрыялы, прысвечаныя К. Каліноўскаму, з'явіліся практычна ва ўсіх цэнтральных газетах БССР. Юбілейныя матэрыялы, з аднаго боку, адлюстроўваюць афіцыйную ацэнку дзейнасці К. Каліноўскага, а з іншага – паказваюць працэс і раскрываюць механізм выпрацоўкі і замацавання гэтай ацэнкі. У гэтым і заключаецца важнасць любога гістарычнага юбілею, што ён дае магчымасць кожнаму пакаленню, умоўна кажучы, задаваць пытанні гісторыі і атрымліваць на іх актуальныя адказы.

Якія ж пытанні і адказы паўставалі ў БССР у сярэдзіне 1960-х гг.? У чым была актуальнасць постаці К. Каліноўскага для «шасцідзясятнікаў»? Каб высветліць гэта, трэба звярнуцца да зместу юбілейных артыкулаў, напісаных 50 гадоў таму.

Газета «Советская Белоруссия», орган ЦК КПБ, 22 сакавіка 1964 г. змясціла артыкул навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі АН БССР А. Грыцкевіча пад назвай «Борец за счастье народное» [7]. Ва ўступе да артыкула гісторык адзначыў, што нагодай для яго напісання была менавіта гадавіна смерці К. Каліноўскага: «22 сакавіка 1964 года спаўняецца 100 гадоў з дня гібелі кіраўніка паўстання 1863 года ў Беларусі і Літве Кастуся Каліноўскага». На думку А. Грыцкевіча, у паўстанні 1863 г. было дзве тэндэнцыі: «вызваленчая» і «нацыяналістычная». Разам з гэтым паўстанне ў цэлым ён ацэньваў як прагрэсіўнае. Выдатная роля К. Каліноўскага бачылася яму ва ўмацаванні «інтэрнацыянальных сувязяў паміж рускім, польскім, літоўскім і беларускім народамі» [7]. Самога К. Каліноўскага аўтар лічыў выхадцам «з польскага і апалячанага насельніцтва Беларусі», які звяртаўся да беларускіх сялян з мэтай падняць іх на барацьбу з агульным ворагам беларусаў, палякаў і рускіх – царскім самадзяржаўем.

Заўважна адрозная танальнасць характарыстыкі К. Каліноўскага зафіксавана ў іншым друкаваным органе ЦК КПБ – часопісе «Коммунист Белоруссии» [5]. Артыкул, прысвечаны

кіраўніку паўстання, быў змешчаны ў дадзеным выданні без подпісу. Трэба думаць, што гэтым падкрэслівалася пазіцыя рэдакцыі часопіса, а значыць, і яго заснавальніка. Вельмі характэрны ўступ да артыкула: «У гераічным летапісе барацьбы беларускага народа за сваю свабоду і нацыянальную незалежнасць значнае месца належыць выдатнаму беларускаму рэвалюцыянеру-дэмакрату Канстанціну (Кастусю) Каліноўскаму» [5, с. 76]. Адразу два моманты звяртаюць на сябе ўвагу: па-першае, вызначэнне К. Каліноўскага як «беларускага рэвалюцыянера-дэмакрата», а па-другое – тое, што ён змагаўся «за нацыянальную незалежнасць беларускага народа». Яшчэ адзін момант – рэдакцыя «Коммуниста Белоруссии», у адрозненне ад «Советской Белорусии», выразна акрэсліла сваю пазіцыю ў дачыненні да зместу тэрміна «польскае паўстанне» адносна тэрыторыі Беларусі: «...рух Каліноўскага не быў простым складнікам польскага паўстання, ён рашаў ... уласныя задачы» [5, с. 76], – адзначаў «Коммунист Белоруссии». Іншымі словамі, «польскім» паўстанне было толькі на тэрыторыі Польшчы, у Беларусі паўстанцы вырашалі «ўласныя задачы», якія маглі адрозніваццa ад польскіх. Таксама як сінонім тэрміна «паўстанне» рэдакцыя «Коммуниста Белоруссии» выкарыстоўвала азначэнне «беларускі рэвалюцыйна-дэмакратычны рух», які быў «патоплены ў крыві», у выніку чаго загінуў яго «кіраўнік і ідэолаг» К. Каліноўскі.

У тым жа духу, але яшчэ больш выразна выказаўся старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ А. Мацко ў «Сельской газете», якая таксама з'яўлялася органам ЦК КПБ. Ён назваў К. Каліноўскага «нацыянальным героем беларускага народа» [14]. Увогуле, трэба адзначыць, што нацыянальны аспект у артыкуле А. Мацко прысутнічае вельмі акрэслена. Так ён пісаў, што «пераслед, здзекі памешчыкаў перапляліся з прыгнётам народу з боку царскага ўрада, які не прызнаваў за насельніцтвам краю ніякіх правоў». На думку гісторыка, удзельнікі арганізацыі, створанай К. Каліноўскім «ставілі сабе за мэту падрыхтаваць народ да паўстання, да заваявання нацыянальнай незалежнасці...». Беларускіх паў-

станцаў А. Мацко называў «партызанамі», а царскія войскі «карнікамі», што нагадвала кантэкст Другой сусветнай вайны. Завяршаецца артыкул словамі: «Працоўныя Беларусі, шырокая грамадскасць нашай краіны свята шануюць памяць свайго вялікага сына» [14].

Прафесар БДУ І. Лушчыцкі ў «Звяздзе» назваў К. Каліноўскага «выдатным сынам Беларусі». Юбілейны артыкул вядомага даследчыка грамадска-палітычных поглядаў К. Каліноўскага даволі вялікі паводле аб'ёму і напісаны жывой літаратурнай мовай. Так, І. Лушчыцкі апісваў гісторыю арышту К. Каліноўскага нібыта з генерал-губернатарскага палацу М. Мураўёва: «Увечары 28 студзеня 1864 года ўзрушылася логава карнікаў у Вільні. З Мінска яны атрымалі шыфравальную тэлеграму Лосева: Каліноўскі жыве пад імем Вітажэнца ў памяшканні Віленскага ўніверсітэта. <...> Пачаўся вобыск. Стук у дзверы. На лесвічную пляцоўку выйшаў малады, прыемны, спакойны чалавек. На пытанне жандараў, як яго прозвішча, ён адказаў: «Вітажэнец». Яго тут жа арыштавалі...» І. Лушчыцкі падрабязна спыніўся на апошніх днях К. Каліноўскага, асабліва на апісанні «суда». Даследчык пісаў: «Каліноўскі лічыў агідным апраўдвацца перад сваімі карнікамі і тым больш што-небудзь у іх прасіць». На думку І. Лушчыцкага, абвінавачванні, якія выставіла К. Каліноўскаму следчая камісія, выглядалі злачынствам толькі ў вачах самой гэтай камісіі і мураўёўскай адміністрацыі. З пункту погляду кіраўніка паўстання, грамадства Беларусі і Літвы і гісторыі яго дзейнасць не патрабавала апраўданняў, паколькі К. Каліноўскі быў патрыётам сваёй Радзімы, прадстаўніком ваюючага з Расійскай імперыяй боку. У адпаведнасці з гэтым І. Лушчыцкі рабіў выснову: «Роўна 100 гадоў назад 10(22) сакавіка 1864 года ў 10.30 раніцы на Лукішскай плошчы ў Вільні быў павешаны беларускі нацыянальны герой» [13].

Студэнт філалагічнага факультэта БДУ Р. Семашкевіч назваў свой юбілейны артыкул «Змагар, палкаводзец, трыбун», тым самым падкрэсліваючы ўласнае бачанне асобы К. Каліноўскага і яго ролі ў гісторыі Беларусі [18]. У якасці эпіграфа Р. Семаш-

кевіч абраў радкі з верша Алеся Гурло «К. Каліноўскі», які быў апублікаваны ў «Полымі» ў 1924 г. на 60-годдзе з дня смерці К. Каліноўскага [8]. У 1924 г. А. Гурло назваў К. Каліноўскага «прарокам». Р. Семашкевіч пісаў пра сімвалічнасць таго моманту, што магіла К. Каліноўскага заставалася невядомай, гэта яшчэ больш узмацняла легенду кіраўніка паўстання. Імя К. Каліноўскага, на думку студэнта БДУ, выконвала кансалідацыйную функцыю для беларусаў, як доказ прыводзіліся радкі з верша Петруся Броўкі 1943 г.: «Па Беларусі пайшлі пагалоскі, // Кажуць, з'явіўся Кастусь Каліноўскі». Р. Семашкевіч упэўнена даказваў, што Беларусь на той час не мела ніякіх прыкметаў аўтаноміі ў Расійскай імперыі, а беларусаў царскі ўрад не лічыў асобным народам. Гэта і было адной з галоўных прычынаў паўстання. Паўстанцаў 1863 г. Р. Семашкевіч назваў «каліноўцамі», а само паўстанне характарызаваў як «усенародную вайну», якая ставіла сабе за мэту «знішчэнне памешчыцкага землеўладання і нацыянальнае разняволенне Беларусі і Літвы» [18]. Напрыканцы артыкула Р. Семашкевіч згадаў цікавы факт, што ў 1936 г. у Іспаніі адна з інтэрнацыянальных брыгад насіла імя К. Каліноўскага.

У 1964 г. з імем Р. Семашкевіча звязаны таксама вельмі неардынарны факт – адкрыты ліст 5 студэнтаў беларускага аддзялення філалагічнага факультэта БДУ ў газету «Літаратура і мастацтва» з крытыкай стану справы з выданнем класічных твораў беларускай літаратуры. Студэнты пісалі, што, з аднаго боку: «Пры вывучэнні публіцыстыкі Кастуся Каліноўскага даводзіцца гартаць старыя кнігі, каб знайсці тэксты ягонай «Мужыцкай праўды»; а з іншага – «крыўдна, што выдавецтва часам знаходзіць час і сродкі на выпуск нізкамастацкіх кніг, а на папулярныя выданні лепшых здабыткаў нашай літаратуры не звяртае ўвагі» [19]. Гэта была адкрытая крытыка выдавецкай палітыкі ў БССР, пры гэтым студэнты спасылаліся на рашэнні XX і XXII з'ездаў КПСС. Варта адзначыць таксама, што гэты допіс з'явіўся на палосах перыядычнага друку, што само па сабе сведчыла пра актуальнасць перавыдання тэкстаў «Мужыцкай праўды» ў 1964 г., якую прызнавала і рэдакцыя «Літаратуры і мастацтва».

У газеце «Знамя юности» юбілейны артыкул да дня смерці К. Каліноўскага напісаў навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР Г. Мельянкоў. Ён пісаў, што імя К. Каліноўскага «і сёння дарагое народу, сынам якога ён быў», што роднай мовай К. Каліноўскага была беларуская, таму і «Мужыцкая праўда» выходзіла на ёй. Тое, што К. Каліноўскага ўдалося арыштаваць толькі ў студзені 1864 г. Г. Мельянкоў тлумачыў тым, што «народ ахоўваў і бярог свайго правадыра» ад перасследу «Мураўёва-вешальніка». Аўтар падкрэсліў, што «Лісты з-пад шыбеніцы» К. Каліноўскі пісаў, «звяртаючыся да беларускага народу» [15].

Адначасова з рэспубліканскімі газетамі, юбілейныя артыкулы, прысвечаныя К. Каліноўскаму, друкаваліся ў «Гродненской правде». Аўтар рэдакцыйнага матэрыялу ў гэтай газеце, змешчанага пад рубрыкай «Наш календарь», пісаў, што К. Каліноўскі «барацьбу за сацыяльнае вызваленне ... спалучаў з барацьбой за нацыянальную свабоду беларускага народа, выступаў у абарону яго правоў, за развіццё сваёй нацыянальнай культуры і асветы. Ён быў найвыдатнейшым змагаром за беларускую нацыянальную культуру, адным з заснавальнікаў беларускай літаратурнай мовы». Разам з гэтым, на думку рэдакцыі газеты, К. Каліноўскі бачыў дзяржаўную будучыню Беларусі ў шчыльнай сувязі з «рэвалюцыйнай Расіяй». Зыходзячы з ўсяго вышэйсказанага, падсумоўвала рэдакцыя «Гродненской правды», К. Каліноўскі «займае асабліва важнае месца ў гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі беларускага народу» [11].

На пачатку чэрвеня 1964 г. у «Гродненской правде» быў надрукаваны артыкул настаўніка гісторыі Альберцінскай сярэдняй школы Слонімскага раёна Шундрыка. На пачатку артыкула настаўнік гісторыі адзначаў, што ён прысвячае сваю публікацыю 100-годдзю пакарання смерцю К. Каліноўскага. Дадзены матэрыял адметны тым, што ў цэнтры ўвагі аўтара – паказ ролі К. Каліноўскага ў бітве пад Мілавідамі. Аўтар маляўніча апісваў агляд паўстанцкіх войскаў, які праводзіў К. Каліноўскі, паведамляў, што пасля пераможнай бітвы «моладзь спявала беларускія песні». Паводле Шундрыка, паўстанцы

К. Каліноўскага кантралявалі большую частку Слонімскага павета, і ўвогуле «...падчас паўстання 1863 года Слонімшчына была той зямлёй, якая гарэла пад нагамі ў ворагаў» [26].

У архіве рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» захоўваецца рукапіс ненадрукаванага артыкула С. Кліманскага, прысвечанага стогадоваму юбілею смерці К. Каліноўскага. У рукапісе ёсць адна адметнасць – аўтар пісаў, што на светапогляд кіраўніка паўстання аказалі ўплыў не толькі рускія, але і польскія «дэмакраты»: «Светапогляд К. Каліноўскага як рэвалюцыянера-дэмакрата фарміраваўся галоўным чынам у гады вучобы ў Пецярбургу. Фарміраваўся ён пад двума ўплывамі: з аднаго боку – рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў Чарнышэўскага, Герцэна, Дабралюбава, Бялінскага, з другога – польскіх дэмакратаў Лялевеля, Ворцаля, Канарскага, Серакоўскага. Аднак галоўны ўплыў мелі рускія рэвалюцыйныя дэмакраты» [4, арк. 45]. У іншых юбілейных матэрыялах, якія тады ствараліся ў БССР, звычайна пра «польскі» ўплыў не згадвалася.

Юбілейныя артыкулы пісалі не толькі навукоўцы, настаўнікі і студэнты, але таксама і пісьменнікі. Класічным прыкладам тут з'яўляецца У. Караткевіч, які змясціў свой артыкул да дня смерці К. Каліноўскага ў часопісе «Беларусь» [10]. Артыкул для «Беларусі» яго прасіў напісаць паэт Р. Барадулін. Пра гэта ўзгадваў сам У. Караткевіч 13 студзеня 1964 г. у лісце да Л. і Я. Геніюшаў: «Заўтра яшчэ буду адказваць на лісты, напішу і ў "Беларусь" па заказу Барадуліна тры старонкі да дня смерці вялікага Кастуся, а потым засяду за "Каласы пад сярпом" [9, с. 633]. З гэтага вынікае, што калі У. Караткевіч сапраўды напісаў «тры старонкі», то ў «Беларусі» выйшла скарочаная версія яго допісу, бо артыкул заняў усяго 1/3 друкаванай старонкі, і гэта пры вядомай уборыстасці і шчыльнасці почырку пісьменніка. На старонках «Беларусі» У. Караткевіч назваў К. Каліноўскага постаццю «самай трагічнай і велічнай у гісторыі Беларусі, яе нацыянальным героем» [10]. Паводле пісьменніка, К. Каліноўскі ішоў на эшафот, трымаючы кулак левай рукі блізка ад сэрца, гэта быў умоўны знак паўстанцаў, які азначаў частку паўстанцкага пароля і для пасвечаных чытаўся двума словамі: «Люблю Беларусь!».

У той час У. Караткевіч завяршаў працу над раманам «Каласы пад сярпом тваім». Раман быў скончаны 18 мая 1964 г. [25, с. 245]. У лістах да Л. Геніюш ён называў працу над раманам працай над «Кастусём»: «Трэба рухаць наперад свайго "Кастуся". Даволі ён быў ужо ў нашых сэрцах нямы і безгалосы, нібы выкраслены з поступу краіны. Няхай хаця для некаторых аджыве» [9, с. 632]. Такім чынам, раман «Каласы пад сярпом тваім» У. Караткевіч прысвячаў перш за ўсё К. Каліноўскаму, да якога ён ставіўся з асаблівай цеплынёй: «Што ж, Кастусь, Кастусь, канешне, з кахання. Бо калі не любіць бязмежна нешта, то табе тое амаль абыякава. Ну, можа, пабіцца за тое яшчэ можна, калі не кахаеш, проста ад пачуцця справядлівасці. А ўжо сваёй галавою налажыць за каханае – гэта толькі ад кахання. І яшчэ ад усведамлення таго, што яго крыўдзяць, тваё каханне. Толькі і справы, усё вельмі проста. На словах. Але не ў жыцці» [9, с. 633].

Для У. Караткевіча К. Каліноўскі перш за ўсё патрыёт Беларусі, сімвал народу, які пачаў тытанічную працу па адраджэнні краіны. Вобраз К. Каліноўскага настолькі захапіў У. Караткевіча, што ў канцы сакавіка 1964 г. ён адмыслова наведаў у Вільні мясціны, звязаныя з пакараннем смерцю свайго героя. 13 красавіка 1964 г. У. Караткевіч пісаў у лісце да Л. і Я. Геніюшаў: «Праседзеў нават некалькі гадзінаў на Гедымінавай гары, назіраючы, як сядае сонца ў канцы сакавіка, нешта каля дваццаць другога, дня страты» [9, с. 635].

Пішучы мастацкія творы на тэму паўстання 1863–1864 гг., У. Караткевіч карыстаўся кансультацыйнай дапамогай свайго блізкага сябра і аднадумца Г. Кісялёва, які зрабіў надзвычай шмат у справе выяўлення дакументаў і матэрыялаў, датычных біяграфіі кіраўніка паўстання ў Беларусі і Літве. Выдаўшы ў 1963 г. манаграфію, прысвечаную паўстанцам 1863–1864 гг., Г. Кісялёў у 1964 г. падрыхтаваў даволі падрабязны «Летапіс» жыцця і дзейнасці К. Каліноўскага, які пабачыў свет у «Полымі» [12]. На думку Г. Кісялёва, К. Каліноўскі – «вялікі беларускі рэвалюцыйны дэмакрат», які «загінуў як герой і навекі астаўся

ў памяці народаў». Таксама Г. Кісялёў адзначаў, што К. Каліноўскі «любіў» беларускую мову – і «нават у турме, калі над ім навісла пятля ката, ён піша пісьмы і вершы на мове беларускіх сялян» [12, с. 158]. У гэтым артыкуле даследчык раскрыў сваё разуменне тэрміна «рэвалюцыйна-дэмакратычная праграма» кіраўніцтва «чырвоных». Паводле яго, «праграма» складалася з дзвюх частак: «права Беларусі і Літвы на самавызначэнне і поўная ліквідацыя памешчыцкага землеўладання» [12, с. 163]. Менавіта за такую праграму змагаўся К. Каліноўскі.

Рыхтуючы «Летапіс» жыцця К. Каліноўскага, Г. Кісялёў некалькі разоў падрабязна апісаў яго змаганне за самастойнасць паўстання ў Беларусі і Літве ад паўстання польскага. Як прыклад можна прывесці апісанне дэмаршу К. Каліноўскага, і Літоўскага правінцыйнага камітэта (ЛПК) у цэлым, у ліста-падзе 1862 г., калі Беластоцкая паўстанцкая арганізацыя рашэннем Цэнтральнага нацыянальнага камітэта (ЦНК) была «далучана да Варшавы». Паводле Г. Кісялёва, калі пра гэта даведаўся К. Каліноўскі, то «прадстаўнік ЦНК у Вільні Нестар Дзюлеран быў выгнаны Каліноўскім з пасяджэння Літоўскага камітэта». Больш за тое, калі член ЛПК Э. Вярыга, вылучаны для перамоваў з Варшавай па гэтым пытанні, пайшоў на пэўныя саступкі польскаму камітэту, то «Каліноўскі не зацвердзіў справаздачы Вярыгі» [12, с. 164]. Ужо ў ходзе паўстання, у сярэдзіне ліпеня 1863 г. «Каліноўскі і Малахоўскі прапаноўваюць праект новага статута аб узаемаадносінах паўстанцкіх улад Вільні і Варшавы – на аснове поўнай роўнасці – і паказваюць Гейштару новую пячатку з надпісам «Літоўскі Камітэт» [12, с. 167].

Г. Кісялёў пісаў, што ў жніўні 1863 г. К. Каліноўскі карыстаўся тэрмінам «літоўскае паўстанне» і вёў барацьбу супраць «далучэння ваяводстваў Ковенскага і Гродзенскага да ўпраўлення Царства» [12, с. 168]. Падобныя прыклады можна было б працягваць. У цэлым са старонак «Летапісу» К. Каліноўскі паўстае, карыстаючыся сённяшняй мовай, моцным і паслядоўным беларускім дзяржаўнікам, які не можа здрадзіць сваім прынцыпам нават перад абліччам пагрозы для жыцця.

У 1964 г. кніга Г. Кісялёва «Сейбіты вечнага», якая пабачыла свет годам раней, была вылучана на літаратурную прэмію імя Якуба Коласа. У сувязі з гэтым вылучэннем, у канцы 1964 г. у друку зноў з'явілася імя К. Каліноўскага. У «Літаратуры і мастацтве» былі надрукаваны дзве рэцэнзіі на кнігу Г. Кісялёва аўтарства С. Александровіча [1] і В. Рагойшы [17].

Абодва рэцэнзенты ў друкаваных варыянтах рэцэнзій рабілі акцэнт на «рэвалюцыйнай» ролі К. Каліноўскага ў паўстанні 1863–1864 гг. Так, С. Александровіч пісаў: «Кастусь Каліноўскі адным з першых высока ўзняў сцяг інтэрнацыяналізму ў барацьбе за свабоду і шчасце працоўнага чалавека». Тут варта адзначыць, што ў рукапісе рэцэнзіі С. Александровіч рабіў прыкметна іншыя акцэнты. Ён пісаў пра «слаўных сыноў беларускага народа, якія ў суровыя і цяжкія дні 1863 года выйшлі на барацьбу з рускім царызмам пад баявым сцягам "За нашу і вашу свабоду" [2, арк. 9]. У рукапісе С. Александровіча К. Каліноўскі характарызуецца як «вялікі патрыёт зямлі беларускай», «беларускі сялянскі дэмакрат» [2, арк. 10]. На палосы ж «ЛіМа» патрапіла азначэнне «беларускі рэвалюцыйны дэмакрат» [1], і ні слова не было надрукавана пра яго беларускі патрыятызм.

Што тычыцца рэцэнзіі В. Рагойшы, які на той час быў аспірантам БДУ, то яна пайшла ў друк фактычна без зменаў. В. Рагойша пісаў: «1863 год... Калі мы называем гэтую дату, у нашым уяўленні абавязкова паўстае вобраз Кастуся Каліноўскага. Палымяны патрыёт, барацьбіт з сацыяльным і нацыянальным прыгнётам, таленавіты ваеначальнік, умелы канспіратар» [3, арк. 41; 16]. У высновах, зробленых у канцы рэцэнзій, абодва рэцэнзенты, безумоўна, падтрымалі вылучэнне «Сейбітаў вечнага» на прэмію імя Якуба Коласа.

Трэцяя рэцэнзія (першая па часе з'яўлення ў друку) на кнігу Г. Кісялёва аўтарства А. Траяноўскага была надрукавана ў «Чырвонай змене». Аўтар рэцэнзіі пісаў, што адна з галоўных вартасцяў кнігі «Сейбіты вечнага» ў тым, што ў ёй «пераканаўча паказаны адносіны Кастуся Каліноўскага і ўзначальваемага ім Літоўскага правінцыяльнага камітэта – гэтага Часовага ўрада

Літвы і Беларусі, да шляхецкага рэакцыйнага Цэнтральнага нацыянальнага камітэта ў Варшаве, да той нацыяналістычнай вузка класавай палітыкі ў паўстанні, якую праводзіў гэты камітэт, разглядаючы Літву і Беларусь як састаўныя часткі Польшчы. Кастусь Каліноўскі не мог пагадзіцца з гэтым, адстойваючы прынцып самавызначэння народаў» [21].

Аднак, нягледзячы на гэтыя рэцэнзіі, кніга Г. Кісялёва «Сейбіты вечнага» прэміі так і не атрымала. У 1964 г. літаратурную прэмію імя Якуба Коласа атрымала аповесць Васіля Быкава «Трэцяя ракета».

Важны юбілейны матэрыял быў апублікаваны ў часопісе «Маладосць». Гэта допіс В. Говара, «жыхара дома па вуліцы Кастуся Каліноўскага ў Мінску» [6]. Допіс вельмі натхнёны, напоўнены эмоцыямі. Аўтар нібы вядзе размову з К. Каліноўскім: «Камень, ператвораны ва ўтульныя дамы, напоўненыя смехам дзяцей, чалавечай радасцю. Гэта помнік табе, Кастусь Каліноўскі» [6, с. 146]. В. Говар супрацьпастаўляе стаўленне да асобы і дзейнасці К. Каліноўскага ў часы Расійскай імперыі і ў часы БССР: «Мураўёва-вешацеля аб'явілі сябрам народа, а цябе, Кастусь, тым чалавекам, які нібыта памагаў польскім панам вярнуць адмененае прыгоннае права. Выходзілі тоўстыя навуковыя тамы, якія цябе забывалі. А ты жывы, Кастусь, ты – наш! Мара твая, праўда твая прабіліся праз плынь часу, праз хітрую «навуковую» ману афіцыйных гісторыкаў» [6, с. 147]. Паводле В. Говара, калі ў царскія часы ўсяляк увекавечвалася памяць пра М. Мураўёва, то факт названня вуліцы Мінска імем К. Каліноўскага сведчыць, што сітуацыя кардынальна змянілася, і вуліца Кастуся Каліноўскага – гэта помнік яму.

Вельмі цікавая для нашай тэмы інфармацыя змяшчаецца ў лісце М. Улашчыка да Ніла Гілевіча (сам ліст пазначаны 1966 г.). У гэтым лісце М. Улашчык апісваў наведванне ім Кобрынскага музея А. Суворава ўлетку 1964 г. і адразу пасля гэтага апісання змясціў наступныя радкі: «На грамадскіх умовах ствараецца ў Мінску музей Каліноўскага (стварае нейкі Маслаў у раёне Зялёны Луг). Паслаў яму сваю кнігу (ён напісаў мне ліст) і ліст, у якім

пісаў, што музей Каліноўскага павінен быць у Ваўкавыску (дзе па невядомых прычынах створаны музей Баграціёна) і што гэта павінен быць музей беларускі, але не атрымаў адказу. Так і не ведаю, што там робіцца, бо быў у Мінску вельмі кароткі час» [22, с. 483].

Такім чынам, той факт, што ў Мінску з'явілася вуліца К. Каліноўскага паслужыў штуршком да спробы стварэння прыватнага музея К. Каліноўскага. І хоць дадзенае пытанне патрабуе яшчэ дадатковага даследавання, але сам факт з'яўлення такой ініцыятывы, з нашага пункту погляду, дастаткова красамоўна сведчыць, што юбілеі 1963 і 1964 гг. аказвалі ўплыў на грамадскую актыўнасць у БССР у справе ўшанавання памяці К. Каліноўскага.

У канцы 1964 г. у Інстытуце гісторыі АН БССР ішло абмеркаванне планавых тэкстаў. 25 лістапада 1964 г. на пасяджэнні сектара гісторыі БССР дасавецкага грамадства абмяркоўваўся тэкст С. Самбук «Восстание 1863 г. в Белоруссии», які адначасова з'яўляўся раздзелам для будучага выдання «История БССР». Падчас абмеркавання загадчык сектара К. Шабуня параіў аўтару скарэктаваць структуру раздзела. Першы параграф меў назву «Программа восстания». К. Шабуня прапанаваў яго пакінуць, але даць 2 падзагалоўкі «Программа Центрального национального комитета» і «Программа К. Калиновского и других революционных демократов». Пры гэтым загадчык сектара зазначыў: «Праграму К. Каліноўскага трэба паставіць шырокім радком. Трэба ўказаць яе змест, паказаць, што яна была шырэйшая і паўнейшая, чым праграма ЦНК. Трэба абавязкова даць дзве праграмы – афіцыйную, шляхецкую, і рэвалюцыйна-дэмакратычную (К. Каліноўскага)» [23, арк. 109].

З гэтага вынікае, што навукоўцы Інстытута гісторыі ў працэсе навуковага даследавання гісторыі паўстання 1863–1864 гг. прыйшлі да высновы пра самастойнасць палітычнай лініі К. Каліноўскага ў адносінах да пазіцыі Варшавы.

Такім чынам, можна зрабіць некаторыя высновы. Па-першае, у БССР у 1964 г. стагоддзе з дня гібелі К. Каліноўскага было адзначана даволі маштабна.

Па-другое, падчас гэтага святкавання агульнапрынятай з'яўлялася адназначная ацэнка жыцця і дзейнасці кіраўніка паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі і Літве як «нацыянальнага героя беларускага народа», які змагаўся і аддаў жыццё за «нацыянальную незалежнасць» Беларусі.

Па-трэцяе, можна смела канстатаваць, што юбілейная дата з дня смерці К. Каліноўскага ў 1964 г., з аднаго боку, фактычна на цэлы год «працягнула» адзначэнне стагоддзя паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі, а з іншага – падкрэсліла ўласнабеларускую спецыфіку гэтага святкавання, паколькі ніякая іншая краіна ці рэспубліка СССР не мела падобных аналагаў. Іншымі словамі кажучы, нідзе больш К. Каліноўскі не быў уганараваны такой колькасцю афіцыйных і неафіцыйных успамінаў. У гэтым назіраецца пэўнае падабенства Беларусі з Чэхіяй, у якой дзень памяці Яна Гуса, што быў спалены на вогнішчы 6 ліпеня 1415 г., з'яўляецца важнай датай нацыянальнага календара. Пры гэтым шырокамаштабнае адзначэнне гэтага дня пачалося з часу адраджэння ў 1918 г. чэшскай дзяржаўнасці і не перапыняецца да гэтага часу незалежна ад таго, хто знаходзіўся і знаходзіцца пры ўладзе.

Па-чацвёртае, важнай характарыстыкай юбілею з дня смерці К. Каліноўскага было тое, што практычна ўсе аўтары, хто пісаў пра яго, называлі К. Каліноўскага «кіраўніком паўстання 1863 г. у Беларусі і Літве», ускосна ўпісваючы, такім чынам, памяць пра Вялікае Княства Літоўскае ў кантэкст беларускай гісторыі.

Па-пятае, у многіх юбілейных публікацыях 1964 г. адзначалася, што К. Каліноўскі адначасова з'яўляўся кіраўніком «падпольнага ўрада, Літоўска-Беларускага чырвонага жонда». З гэтага вынікае, што ў афіцыйным друку БССР дэ-факта канстатавалася выключная роля К. Каліноўскага ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці. Што, вобразна кажучы, надавала яму статус не толькі рэвалюцыянера, але і «дзяржаўніка», прадвесніка БССР.

Літаратура

1. *Александровіч, С.* На ўвесь голас / С. Александровіч // Літаратура і мастацтва. – 1964. – 8 снеж. – № 98. – С. 2.

2. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (далей – БДАМЛМ). – Фонд 12. – Воп. 1. – Спр. 960.

3. БДАМЛМ. – Фонд 12. – Воп. 1. – Спр. 966.

4. БДАМЛМ. – Фонд 12. – Воп. 1. – Спр. 1023.

5. Выдающийся революционер-демократ // Коммунист Белоруссии. – 1964. – № 3. – С. 76 – 77.

6. *Говар, В.* Бессмяротны Кастусь / В. Говар // Маладосць. – 1964. – № 3. – С. 146–147.

7. *Грицкевич, А.* Борец за счастье народное / А. Грицкевич // Сов. Белоруссия. – 1964. – 22 марта. – № 69. – С. 3.

8. *Гурло, А.* К. Каліноўскі / А. Гурло // Полымя. – 1924. – № 2. – С. 19–20.

9. *Караткевіч, У.* Выбраныя творы / У. Караткевіч. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2005. – 672 с.

10. *Караткевіч, У.* Гэта было 10-га сакавіка 1864 года... (Да стагоддзя з дня смерці Кастуся Каліноўскага) / У. Караткевіч // Беларусь. – 1964. – № 3. – С. 25.

11. Кастусь Калиновский // Гродн. правда. – 1964. – 22 марта. – № 59. – С. 3.

12. *Кісялёў, Г.* Летапіс незабыўнага жыцця / Г. Кісялёў // Полымя. – 1964. – № 4. – С. 158–171.

13. *Лушчыцкі, І.* Выдатны сын Беларусі. Да 100-годдзя з дня смерці Кастуся Каліноўскага / І. Лушчыцкі // Звязда. – 1964. – 22 сак. – № 69. – С. 3.

14. *Мацко, А.* Великий сын белорусского народа (К 100-летию со дня казни К. С. Калиновского) / А. Мацко // Сельская газета. – 1964. – 22 марта. – № 69. – С. 3.

15. *Мельянков, Г.* Вся жизнь – легенда / Г. Мельянков // Знамя юности. – 1964. – 22 марта. – № 58. – С. 3.

16. Молодежный календарь на 1964 год. – М.: Госполитиздат, 1963. – Март.

17. *Рагойша, В.* І заззялі новымі фарбамі... / В. Рагойша // Літаратура і мастацтва. – 1964. – 25 снеж. – № 103. – С. 3.

18. *Семашкевіч, Р.* Змагар, палкаводзец, трыбун / Р. Семашкевіч // Чырв. змена. – 1964. – 22 сак. – № 58. – С. 3.

19. *Семашкевіч, Р., Камашэнкава, Л., Шапялевіч, В., Палуян, Н., Мірончык, А.* / Р. Семашкевіч, Л. Камашэнкава, В. Шапялевіч, Н. Палуян, А. Мірончык // Літаратура і мастацтва. – 1964. – 25 верас. – № 77. – С. 3.

20. *Смирнов, А.* Кастусь Калиновский / А. Смирнов. – Минск: Госиздат БССР, 1963. – 199 с.

21. *Траяноўскі, А.* Ажываюць падзеі, імёны / А. Траяноўскі // Чырв. змена. – 1964. – 2 снеж. – № 238. – С. 3.

22. *Улашчык, М.* Выбранае / М. Улашчык. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2001. – 608 с.

23. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНА НАНБ). – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр 500.

24. *Цьвікевіч, І.* Кастусь Каліноўскі. Біографічна-гістарычны нарыс (К 60-ці годзьдзю яго сьмерці) / І. Цьвікевіч // Полымя. – 1924. – № 2. – С. 3–18; *Зімёнка, А.* Заходняму брату. Памяці К. Каліноўскага / А. Зімёнка // Полымя. – 1924. – № 2. – С. 20–21 і інш.

25. *Шапран, С.* Уладзімір Караткевіч: «Прыміце мяне такім, які ёсьць». Да гісторыі выданьня «Каласоў пад сярпом тваім» / С. Шапран // Дзеяслоў. – 2006. – № 4. – С. 244–270.

26. *Шундрик, В.* Кастусь Калиновский на Слонимщине / В. Шундрик // Гродн. правда. – 1964. – 2 июня. – № 108. – С. 3.

Резюме

А. В. УНУЧЕК

ЗНАКОВЫЙ ЮБИЛЕЙ: КАК В БССР ОТМЕЧАЛОСЬ СТОЛЕТИЕ СО ДНЯ СМЕРТИ КАСТУСЯ КАЛИНОВСКОГО

Анализируется идейное содержание юбилейных публикаций и делаются выводы, что в БССР довольно масштабно отмечался столетний юбилей со дня смерти К. Калиновского. На официальном уровне он признавался национальным героем. Чествование памяти К. Калиновского в Беларуси подчеркивало белорусскую специфику памяти о восстании 1863–1864 гг., в которой личность его руководителя имеет огромную роль, что не является характерным для Польши и Литвы. В белорусской историографии К. Калиновского называли руководителем восстания в Беларуси и Литве, что косвенно возрождало память о Великом Княжестве Литовском (ВКЛ) в историческом контексте БССР, где на официальном уровне утверждалось, что ВКЛ – это сугубо «литовское» государство и белорусы в нем находились в угнетенном положении. Авторы юбилейных публикаций рассматривали К. Калиновского не только как революционера, чего требовала тогдашняя идеология, но и как идеолога и борца за белорусскую государственность, который отдал жизнь за национальную независимость Беларуси.

Summary

A. UNUCHAK

KEY ANNIVERSARY: HOW BELARUSIAN SOVIET SOCIALIST REPUBLIC MARKED THE CENTENARY OF THE DEATH OF KASTUS KALINOUSKI

In this paper, an analysis of the ideological content of commemorative publications is carried out. The author of the article came to the conclusion that the centenary of Kastuś Kalinoŭski's death was widely remembered in BSSR. On the official level,

he was recognized as national hero. Honoring the memory of Kastuś Kalinoŭski emphasized Belarusian specific of memory of the 1863 – 1864 uprising, in which the identity of its leader had a huge role, which is not typical for Poland and Lithuania. In the Belarusian historiography everywhere called Kastuś Kalinoŭski "the leader of the uprising in Belarus and Lithuania" which indirectly revived the memory of the Grand Duchy of Lithuania (GDL) in the historical context of the Belarusian SSR, in which it was officially stated that this had been a purely "Lithuanian" state and Belarusians in it were in a depressed position. The authors of the jubilee publication dedicated to Kastuś Kalinoŭski considered him not only as a revolutionary, which was demanded by communistic ideology, but as the ideologist and fighter for the Belarusian statehood who had struggled and given his life for national independence of Belarus.

Паступіў у рэдакцыю 30.12.2013

УДК 94(476–89)«1863/1864»:930(474.5)

Е. Н. ФИЛАТОВА, Н. В. СМЕХОВИЧ

ВОССТАНИЕ 1863–1864 гг.: ОТ ПЕРВЫХ ВИЛЕНСКИХ ИЗДАНИЙ К СОВРЕМЕННОЙ ЛИТОВСКОЙ ИСТОРИОГРАФИИ

С 1863 по 2013 г. работы по изучению истории этого восстания на территории Литвы публиковались не только на литовском, но и на русском, польском и белорусском языках [23]. Под литовской историографией в данном случае имеются в виду издания, которые опубликованы на территории современной Литвы – в Вильнюсе, Каунасе, Шауляе, Паневежисе и других городах. Выделить национальный аспект в этих публикациях достаточно сложно, так как дореволюционная литература печаталась в основном на русском языке, а в 20–30-х гг. XX в., когда территория Виленщины входила в состав II Речи Посполитой – на польском [12, 15], а в Литве – на литовском языке [10, 18, 19].

В полной мере осветить литовскую историографию возможности нет, так как литовские издания поступали в библиотеки Минска не часто, особенно в конце XX – начале XXI в., да и изучение книг на литовском, для большинства наших историков, невозможно из-за незнания языка. Спасают, в ряде случаев, резюме в конце отдельных книг на русском, английском, польском и других языках [21], а кроме того ряд современных литовских исследований стали переводится с литовского на польский, английский и другие языки [9] или издаваться за пределами Литвы [20], что дает возможность историкам из других стран поближе с ними познакомиться.

Сразу после подавления восстания 1863–1864 гг. начали публиковаться небольшие по объему работы на русском языке, в основном, основанные на показаниях арестованных повстан-

цев на допросах в следственных комиссиях, личных впечатлениях людей, которые были свидетелями восстания. Работы публиковались в типографиях губернского правления, Р. М. Ромма, А. Г. Сыркина, А. Киркора. Польский историк Д. Файнхауз писал, что именно в типографии А. Киркора (открытой в 1859 г.), планировалось издавать, среди других, и книги на литовском языке, но в связи с восстанием эти планы не осуществились [13, с. 310–311]. Работы были написаны на русском языке и публиковались в Вильно [2–8]. Основная их цель – поддержать политику властей по подавлению восстания, показать отрицательные стороны как самого восстания, так и людей, которые в нем участвовали. Хотя, конечно, они дают возможность представить политику правительства в этот период и на этой территории более полно, потому что документы в виде указов, распоряжений, объявлений достаточно суховаты, а воспоминания, несмотря на субъективность, дополняют их. В основном эти работы рассматривают биографии отдельных повстанцев и боевые действия, которые происходили на территории белорусско-литовских губерний. События 1863–1864 гг. характеризуются авторами по-разному: «польский мятеж», «восстание поляков», «революционное движение поляков» [1, с. 131, 143, 145]. В. Ратч считал, что «все меры, принятые М. Н. Муравьевым, истекали от одного основного побуждения – русскую землю очистить от всякого польского наноса, истребить, искоренить все, что интеллигенция польская, русской жизни враждебная, исподволь успела вдавить крамольностью в русскую почву и которая в течение пяти веков терзала русскую землю» [6, с. 239]. Характеризуя К. Калиновского, автор отмечал, что «в женщинах и ксендзах Калиновский находил помощников, а в евреях личности, готовые продавать свои услуги» [6, с. 244].

Позднее П. Брянцев продолжил в связи с восстанием обвинять поляков. Он писал, что «поляки, как известно, вследствие природного отсутствия у них политического ума, такта и умения сдерживать в границах свои чувства, никогда не умели пользоваться тем, что им давали» [1, с. 23]. Даже основание по инициативе Е. Тышкевича в 1855 г. археологического музея в Вильно, он относил «к числу признаков революционного дви-

жения поляков в Литве и Беларуси» [1, с. 145]. Что касается «мятежного движения» в Могилевской губернии, его значение, по мнению автора в том, что «без треска, шумных экспедиций, без возмущающих сцен террора, почти без кровопролитий, осязательно проявились типические стороны мятежников в северо-западной России, и многознаменательные слова мне сказанные могилевским ямщиком: "пан хитер, да не разумен"» [4, с. 28].

В. Ратч видел в И. Огрызко представителя «вековой борьбы шляхетско-ксендзовской Речи Посполитой против самодержавной и православной России» [5, с. 50]. А. Стороженко рассмотрел деятельность ксендза А. Мацкевича. Он отмечал, что на допросах в следственной комиссии ксендз А. Мацкевич «выставлял себя как человека, взявшегося за оружие для защиты угнетенного литовского народа» [7, с. 4]. По его мнению, «жалок тот народ, который имеет пастырей, подобных Мацкевичу; затруднительно положение того государства, где под фирмою христианской религии гнездится латино-польская пропаганда, вырабатывающая с избытком личности, подобные Мацкевичу» [7, с. 24].

Историография 20–30-е гг. XX в., как в Польше, так и в Литве продолжала дальнейшее изучение подробностей боевых действий на территории Литвы и обращала внимание на биографии отдельных ярких личностей среди повстанцев. А. Янулайтис сосредоточил свое внимание на боевых действиях [15], а, например, Э. Эхренкреутжувна рассмотрела и уточнила некоторые аспекты историографии, посвященной И. Здановичу, который был во время восстания 1863 г. вначале кассиром при начальнике Вильно В. Малаховском, а после его отъезда «занял его место» [12, с. 23]. А. Станкевич писал о К. Калиновском, что он «первый наш великий борец» за свободу и народно-политическую самостоятельность белорусского народа, а также частично и за свободу народов, заселяющих бывшее Великое Княжество Литовское» [23].

В советской историографии также был опубликован ряд работ, посвященных истории восстания 1863–1864 гг. [10; 16]. В то время восстания XIX в. рассматривались как выступления народа против царского самодержавия. В 90-х гг. XX в., подводя итоги, Е. Александрявичус и А. Кулакаускас (их работа была

опубликована впервые на литовском языке в Вильнюсе в 1996 г.) писали, что в литовской историографии было высказано несколько концепций по вопросу государственности литовских земель в период восстания 1863–1864 гг.: 1. Литва, как провинция Польши («белые» во главе с Я. Гейштором); 2. Литва как равнозначный партнер в федеративном с Польшей государстве (А. Мацкевич); 3. Литва, как независимое государство (К. Калиновский, Я. Даукша) [9, с. 165].

Среди современных литовских исследователей внимание уделяется не только боевым действиям повстанцев, отдельным личностям, политике царского правительства, участию католического духовенства в восстании [11; 14; 17; 24], но и теоретическим аспектам проблемы: русификации, государственности литовского народа, его отношениям с польским и белорусским народами, о национальном наследии восстания и его месте в памяти литовцев [20–22], что, конечно, связано с существованием независимого литовского государства и поисками корней этой государственности во время неординарных событий – таких, как восстания на этой территории.

За полтора века исследований по истории восстания 1863–1864 гг. сложилась довольно большая историография по данной проблеме, но нужно отметить, что литовская историография уступает польской, а белорусская – литовской. В какой-то степени эти издания связаны и с историей Беларуси, особенно дореволюционные, потому что Вильно в то время традиционно оставался центром края и эта территория не делилась на литовскую и белорусскую, а большая часть Виленской и часть Ковенской губерний сейчас находятся в составе современного белорусского государства.

Литература

1. *Брянцев, П. Д.* Польский мятеж 1863 г. / П. Д. Брянцев. – Вильна: тип. А. Г. Сыркина, 1892. – 263 с.

2. Документы к польскому заговору. – Вильна: тип. губ. правления, 1866. – 19 с.

3. Иосафат Огрызко и Петербургский революционный ржонд в деле последнего мятежа. Составил член Виленской особой следственной по полити-

ческим делам комиссии штабс-капитан Н. В. Гогель / Н. В. Гогель. – Вильна: тип. Р. М. Ромма, 1866. – 79 с.

4. Очерки мятежного движения в Могилевской губернии в 1863 г. (оттиск из «Вестника Западной России»). – Ч. 1. – Вильна: тип. А. К. Киркора, 1865. – 28 с.

5. *Ратч, В. Ф.* Иосафат Огрызко (оттиск из «Виленского Вестника») / В. Ф. Ратч. – Вильна: тип. Р. М. Ромма, 1866. – 50 с.

6. *Ратч, В. Ф.* Сведения о польском мятеже 1863 г. в Северо-Западной России. Т. 1 / В. Ф. Ратч. – Вильна: тип. губерн. правления, 1867. – 260 с.

7. *Стороженко, А. П.* Ксендз Мацкевич, предводитель шайки мятежников / А. П. Стороженко. – Вильна: тип. губ. правления, 1866. – 24 с.

8. *Цылов, Н.* Сигизмунд Сераковский и его казнь, с предшествовавшими польскими манифестациями в Вильне в 1861–1863 годах (Из дел Виленской следственной комиссии по политическим делам) / Н. Цылов. – Вильна: 1867. – 60 с.

9. *Aleksandravičius, E., Kulakauskas, A.* Pod władzą carów. Litwa w XIX wieku / E. Aleksandravičius, A. Kulakauskas. – Kraków: Universitas, 2003. – 414 s.

10. *Bičkauskas-Gentvila, L.* 1863 metų sukilimas Lietuvoj / L. Bičkauskas-Gentvila. – Vilnius: VPiMLL, 1958. – 350 s.

11. Dvasininkija ir 1863 m. Sukilimas buvusios abiejųtautų respublikos žemėse. – Vilnius: Lejdykla, 2009. – 382 s.

12. *Ehrenkreutzówna, E.* Ignacy Zdanowicz kasjer i naczelnik powstańczy Wilna (rok 1863) (odbitka z «Ateneum Wileński») / E. Ehrenkreutzówna. – Wilno: «Znicz», 1933. – 24 s.

13. *Fajnhaus, D.* 1863. Litwa i Białorus / D. Fajnhaus. – Warszawa: Neriton, 1999. – 355 s.

14. *Ilgūnas, G.* Antanas Mackevičius. Sukilimo žygiai ir kovos / G. Ilgūnas. – Vilnius, 2007.

15. *Janułajtis, A.* Powstanie w Litwie. 1863–1864 / A. Janułajtis. – Wilno: druk. «Motus», 1923. – 111 s.

16. *Maksimaitienė, O.* Lietuvos sukilelių kovos 1863–1864 m. / O. Maksimaitienė. –Vilnius: Mintis, 1969. – 294 s.

17. *Mažylis, V.* 1863 metų sukilimo atgarsiai Pajstrio apylinkėse / V. Mažylis. – Panevėžys: 1998. – 19 s.

18. Ružancovas, A. Kaunas 1831 ir 1863–1864 m. Sukilimuose / A. Ružancovas. – Kaunas: 1937.

19. Šležas, P. Muravjovjo veikimas Lietuvoj 1863–1864 / P. Šležas // Athenaeum. – T. IV. – 1933. – S. 46–86.

20. *Staliūnas, D.* Making Russians. Meaning and Practice of Russifications in Lithuania and Belarus after 1863 / D. Staliūnas. – Amsterdam; New York: Rodopi, 2007. – 465 s.

21. *Staliūnas, D.* Savas ar svetimas paveldas? 1863–1864 m. sukilimas kaip lietuvių atminties vieta / D. Staliūnas. – Vilnius: Mints, 2008. – 143 s.

22. *Staliūnas, D.* W jaki sposób «okres Polski» stał się szmbolem walki o wolność. – Pamięć powstania 1863 roku na Litwie // Mowia wieki. Powstanie styczniowe. – N. 1. – Wilna, 2013. – S. 82–89.

23. *Stankiewič, A.* Kastuś Kalinoūski «Muzyckaja Prauda». Ideja Niezależnaści Białarusi / A. Stankiewič. – Wilnia: druk. F. Skarzynzy, 1933. – 52 s.

24. 1863 m. sukilimo medziaga štaulių «Aušros» muziejuje katalog. – Siauliai, sp. «Titnagas», 1999. – 87 s.

Рэзюмэ

А. М. ФІЛАТАВА, М. У. СМЯХОВІЧ

ПАЎСТАННЕ 1863–1864 гг.: АД ПЕРШЫХ ВІЛЕНСКІХ ВЫДАННЯЎ ДА СУЧАСНАЙ ЛІТОЎСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Прысвячаецца гісторыі паўстання 1863–1864 гг. у літоўскай гістарыяграфіі, якая даволі цесна звязана і з гісторыяй Беларусі. За 150 гадоў у літоўскай гістарыяграфіі вылучыўся шэраг аспектаў паўстання, якія былі закрануты рознымі аўтарамі. Сярод іх: вывучэнне баявых дзеянняў, біяграфій вядомых удзельнікаў-літоўцаў у паўстанні, палітыка царскага ўраду і ў прыватнасці віленскага генерал-губернатара М. Мураўёва па падаўленні паўстання, праекты літоўскай дзяржаўнасці з боку паўстанцаў, месца і роля паўстання для Літвы. У пэўнай ступені гэтыя выданні звязаны і з гісторыяй Беларусі, асабліва дарэвалюцыйныя, таму што Вільня ў той час традыцыйна заставалася цэнтрам краю і гэтая тэрыторыя не падзялялася на літоўскую і беларускую, а большая частка Віленскай і частка Ковенскай губерняў у наш час знаходзяцца ў складзе сучаснай беларускай дзяржавы.

Summary

A. FILATAVA, M. SMIACHOVICH

THE UPRISING OF 1863–1864: FROM THE FIRST VILNA PUBLICATIONS TO MODERN LITHUANIAN HISTORIOGRAPHY

The authors discusses Lithuanian historiography of 1863–1864 uprising. Writings and views of Lithuanian historians are often connected to events on Belarusian lands. During 150 years Lithuanian historians have been studying various aspects of uprising, including battles, biographies of famous Lithuanian insurgents, policies of the imperial government, and, in particular, of general Murav'ev, the Vilna governor, as well as Lithuanian statehood projects and meaning and importance of uprising for Lithuania. To some extent, these publications are also connected with the history of Belarus, especially pre-revolutionary, because Vilna while traditionally remained a center of the region and this territory is not divided into Lithuanian and Belarusian, and most of the Vilna, and part of Kovno provinces now are part of the modern Belarusian state.

Паступіў у рэдакцыю 23.12.2013

УДК 821.161.3

І. Ч. ЧАСНОК

АЦЭНКА ІДЭІ ПАЎСТАННЯ Ў РАМАНЕ АЛЕСЯ НАВАРЫЧА «ЛІТОЎСКІ ВОЎК»

Раман А. Наварыча (А. Трушко) «Літоўскі воўк» (асобнай кнігай выйшаў у 2005 г.) стаўся знакавай падзеяй і для беларускай літаратуры, і для грамадскага жыцця краіны ў цэлым. Многія крытыкі адразу адчулі, што твор, у якім, на першы погляд, асвятляюцца падзеі паўстання К. Каліноўскага, насамрэч з'яўляецца парабалічным: размова ў ім ідзе не столькі пра 1863–1864 гг., колькі пра сучаснасць.

У рамане А. Наварыча «Літоўскі воўк», бясспрэчна, вылучаецца палітычны аспект. Пісьменнік пасля публікацыі ў часопісе «Маладосць» атрымаў у 2003 г. спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь: пэўныя ідэі рамана адпавядаюць сучаснай ідэалогіі. Аўтар нібы заклікае прымірыцца з тым, што ёсць. Праўда, адразу заўважым, што раманны дыскурс цалкам неадназначны: А. Наварыча ні ў якім разе нельга назваць кан'юнктуршчыкам (пра што сведчыць хоць бы нядаўні выхад пісьменніка з СПБ).

У многіх крытыкаў выклікала абурэнне сцвярджэнне бесперспектыўнасці любога паўстання ў творы. У «Літоўскім ваўку» прачытваюцца немагчымасць ды і непатрэбнасць любога супраціву.

Аўтар з іроніяй малюе герояў, што падштурхоўваюць народ да змагання. Цэнтральныя персанажы рамана – Артур Буевіч, Аксана Урбановіч – гэта апантаныя маладыя людзі, для якіх паўстанне ў вялікай ступені робіцца гульнёй.

Аксана, жонка манкевіцкага аканома, пайшла на спатканне з Артурам, дзе абмяркоўваўся лёс Радзімы, у белай сукенцы і чырвонай жакетцы – у колерах нашай краіны. Гераіня піша

цыдулкі па-беларуску, добра ведае розніцу паміж сваёй краінай і Польшчай, а тым больш Расіяй. І вось гэты чалавек, які прадстаўляе нацыянальнае, паказваецца ў творы далёка не ў гераічным святле, а хутчэй як асоба, якая нават не ўсведамляе, на што штурхае іншых.

На ролю рэвалюцыянера-агітатара прэтэндуе Стась Буевіч – Стасік: ён увогуле фразёр, для якога галоўнае – прыгожа выглядаць у вачах маладых дзяўчат. Яшчэ ўчора Стасік параскідаў сялянскія стагі, бо проста дурэў, а ўжо сёння ператварыўся ў палымянага змагара за незалежнасць і заклікае дзеда-селяніна да таго, чаго і сам добра не разумее. Для яго гэта як усунуць руку ў клетку з ваўком (пра што ішла размова ў пачатку твора) – абы прыцягнуць увагу да сваёй асобы.

У рамане падымаецца важнае пытанне – адказнасць правадыроў за лёс тых, каго яны вядуць за сабой. Адна справа – гаварыць прыгожыя словы ды заклікаць да барацьбы. І іншая – несці адказнасць за наступствы, усведамляць, чым рызыкуюць людзі.

Напрыклад, Аксана Урбановіч, якая асуджае ўцекачоў-інсургентаў, сама нават не ўяўляе ўсяго драматызму ўзброеных сутычак. Селянін жа ёй гаворыць, што забіваць яшчэ трэба навучыцца, не так усё проста.

Непасрэдна самому К. Каліноўскаму амаль не адводзіцца месца ў творы. Персанаж прысутнічае толькі ў такіх эпізодах, як, напрыклад, сцэна заляцання да яго пані Валеўскай (якая ці то польская патрыётка, ці то шпіёнка). Або ў эпізодах дэтэктыўнага характару, калі ў Каліноўскага атрымліваецца ўратавацца ад жандараў.

У творы цікава паказаны працэс «уцягнення» ў паўстанне абываценяў – шараговых, далёкіх ад палітыкі людзей. Тых самых «народных мас», рэальнае аблічча якіх звычайна губляецца за публічнай фразай. Напрыклад, з такіх – Ежы Урбановіч. Гэта чалавек, які адышоў ад сваіх каранёў (пра што сведчыць хоць бы той факт, што ён стараўся хаваць сваё сапраўднае паходжанне). Урбановіч у імя кахання да маладой жонкі, Аксаны, спачатку нібы стаў спачуваць інсурэкцыі. Аднак як гераізм у творы трактуецца менавіта той учынак, калі ў Ежы хапае духу адмовіцца

ад пасады павятовага камісара і ... перастаць гуляць у героя. Такім чынам сцвярджаецца права чалавека на тое, каб быць проста сабой, няхай сабе і не змагаром.

Беларусы пазнаюцца ў эпізодзе з птушкамі, якіх бацька параненага паўстанца, Бароўскі, падараваў капітану Фогелю і спраўніку. Як толькі адчынілі клетку, адна птушка вылецела на волю, аднак не проста паляцела, а «падалася на поўдзень» [2, с. 259], што ўспрымаецца як намёк на эміграцыю. А вобраз дру-гой птушкі выяўляе аўтарскае бачанне псіхалогіі пэўнай (ці значнай) часткі прадстаўнікоў нашай нацыі: «Вучоны шчыгол не хацеў вылазіць з кінутай клеткі. Жаўнер засунуў руку ўсярэдзіну і спрабаваў злавіць птушку. Шчыгол балюча ўшчыкнуў жаўнера за палец» [2, с. 259]. Як птушка прывыкае да клеткі, так і чалавек прывыкае да сваёй няволі. Ці трэба адчыняць гэтую клетку – ставіцца пытанне ў рамане.

Таксама яскрава адлюстраваны нацыянальны менталітэт у вобразе ваўка, з якім звязаны асобны дыскурс рамана. Гэты вобраз увасабляе прыроджаную, невынішчальную прагу да волі, хоць яна і вядзе раз за разам ваўчаня з мянушкай Інсургент да крывавых боек і зняволення за кратамі на пацеху публіцы курортных Друскенікаў.

У творы паўстае вечнае для Беларусі пытанне: як беларусам жыць і будаваць сваю будучыню, сваю дзяржаву, саміх сябе «паміж усходам і захадам». Яно гучала і ў эсэ «Адвечным шляхам» І. Абдзіраловіча, і ў «Тутэйшых» Я. Купалы.

Безумоўна, на працягу стагоддзяў у нашай краіны былі (і ёсць) няпростыя адносіны з Расіяй. Гэта адлюстравана ў рамане. Напрыклад, спраўнік адкрыта імкнецца прымусіць змоўкнуць беларускую мову... Аўтар не падзяляе такія жаданні свайго персанажа. Аднак пры гэтым у «Літоўскім ваўку» падкрэсліваецца відавочны імператыў: нам усё роўна з Расіяй жыць, маўляў, нікуды не ўцячэш.

Якой жа паўстае Еўропа ў рамане? Як спонсар паўстанцаў. Варта прыгадаць хоць бы тое, што, калі паляўнічы Ясь Кавалец, апалітычны малады чалавек, задумваецца, адкуль у Артура столькі грошай, адказ даецца наступны: з Еўропы. У паўстанцаў

увесь час толькі тое і ёсць, што надзея на чыюсьці дапамогу. Еўропа нам дапаможа, Варшава нам дапаможа... Відавочна, што аўтар іранізуе з сучаснай палітычнай сітуацыі, з «паўстанцаў» сучасных (тое, што гэты выраз алюзійны, з адсылкай да Ільфа і Пятрова, адзначаў М. Тычына ў рэцэнзіі на раман) [4].

У выніку інтэнсіўнага вывучэння праблематыкі паўстання ў 1960-я гг., стымуляванага стагоддзем гэтай падзеі, у беларускай гістарыяграфіі склалася ўяўленне аб значным удзеле сялян у паўстанні – каля 18 % ад агульнай колькасці паўстанцаў. Прыводзіліся і абсалютныя лічбы сялян-паўстанцаў, хоць і няпоўныя, выведзеныя на аснове аналізу дакументаў следства – ад 640 чалавек па саслоўным крытэрыі да 828 па класавым. Пры гэтым на дзве заходнія губерні – Гродзенскую і Віленскую – прыйшлося 61 % усіх сялян – удзельнікаў паўстання [1, с. 432–433; 2, с. 236, 240]. Пазнейшыя даследаванні даюць больш высокія агульныя лічбы ўдзельнікаў паўстання, але звесткі аб удзеле сялян у ім істотна не змяніліся.

У апошнія гады цікавасць беларускіх гісторыкаў да вывучэння ўдзелу сялян у паўстанні знізілася [гл., напр., 9]. У літаратуры пачынае пераважаць фармальны падыход да праблемы, які выяўляецца ў тым, што лічбы ўдзелу сялян у паўстанні ацэньваюцца павярхоўна, у адрыве ад гістарычнага кантэксту. «Асноўная маса сялянства не падтрымала паўстанне», – канстатуюць аўтары капітальнага даследавання гісторыі сялянства Беларусі [4, с. 78]. Беларускія даследчыкі з Польшчы А. Латышонак і Я. Мірановіч заяўляюць, што «сяляне паўсюдна выступілі на баку ўладаў», хоць тут жа прызнаюць значны ўдзел сялян Гарадзеншчыны ў паўстанні [12, с. 85].

У такой сітуацыі асобныя аўтары, насуперак прыведзеным у навуковай літаратуры фактам, пашыраюць сцвярджэнне аб адсутнасці падтрымкі паўстання і на «гарадскія нізы, інтэлі-

генцыю» – на ўсіх, каго адпаведна з марксісцкай традыцыяй неабходна адносіць да народу. Гэта выдумка спатрэбілася для абгрунтавання высновы, што паўстанне 1863 г., як і папярэднія, не мела для Беларусі вызваленчага характару і не абвяргае выказанага гэтымі ж аўтарамі тэзіса аб тым, што «ўваходжанне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі было адзіным выратаваннем беларускай народнасці ад знішчэння яе палякамі...» [15, с. 214].

Нават гэты кароткі агляд існуючых у гістарыяграфіі ацэнак паўстання дазваляе зразумець неабходнасць вярнуцца да асэнсавання ўдзелу ў ім беларускага сялянства – у той час найбольш масавай і значнай часткі беларускага народа. Гэта неабходна як дзеля таго, каб лепш зразумець характар паўстання, так і для рашэння іншай навуковай задачы, першаснай у адносінах да толькі што названай. Ёю з'яўляецца фарміраванне больш дакладных навуковых уяўленняў аб той стадыі, на якой знаходзіўся беларускі этнас у працэсе пераходу ад традыцыйнай да мадэрнізаванай супольнасці, а значыць, і ў працэсе свайго нацыятварэння. Такім чынам, каб садзейнічаць рашэнню першай задачы, неабходна, на нашу думку, падпарадкаваць яе рашэнню другой, што патрабуе змены акцэнтаў у пытанні аб удзеле сялян у паўстанні. Менавіта, чаму вядомая даследчыкам ужо на працягу каля паловы стагоддзя абсалютная і працэнтная колькасць сялян-паўстанцаў лічыцца сёння невялікай, нязначнай? Адпаведна з якімі крытэрыямі ўстаноўленыя лічбы невялікія? Напомнім, яны выведзены шляхам параўнання колькасці сялян – удзельнікаў паўстання з агульнай колькасцю сялянскага насельніцтва мужчынскага пола. Толькі прафесар Латышонак прымяняе іншы крытэрый – параўноўвае масавасць усіх трох паўстанняў, што адбыліся з часу Касцюшкі, і заключае, што ў паўстанні 1863 г. яна была найменшай [12, с. 85].

Адносна абодвух прыведзеных параўнанняў заўважым, што іх аўтары недастаткова ўлічваюць канкрэтна-гістарычную сітуацыю, у якой сялянам даводзілася рабіць свой выбар на карысць удзелу або няўдзелу ў паўстанні. Пры гэтым параўнанне з сітуацыяй 1830 г. наогул некарэктнае, паколькі тая сітуацыя была прынцыпова іншай. Тады патэнцыяльныя ўдзельнікі паўстання

ў гістарычнай Літве маглі разлічваць на дапамогу *рэгулярнага войска* астаткавай польскай дзяржавы – Царства (Каралеўства) Польскага, што дадавала ім сілаў для барацьбы. Яны і атрымалі такую дапамогу, хоць і запозненую [12, с. 71; 23, s. 168–169]. Галоўная ж розніца, якую неабходна ўлічваць, аналізуючы масавую базу паўстанняў 1830–1831 і 1863–1864 гг., заключаецца ў прынцыпова іншым прававым становішчы сялянства ў гэтыя дзве эпохі. У 1831 г. прыгонныя сяляне мелі вельмі абмежаваныя магчымасці для самастойнага выбару і часта траплялі ў паўстанцкія атрады следам за сваімі памешчыкамі, па іх волі [6, с. 67, 87]. А ў 1863 г. перад вельмі рызыкоўным выбарам паўсталі сяляне, толькі што вызваленыя ад прыгону, юрыдычна незалежныя ад сваіх памешчыкаў. Прычым гэтую волю яны атрымалі як бы з ласкі рускага цара. Цяпер яны мелі на выбар: чакаць справядлівага надзялення іх зямлёй за плату па волі таго ж цара або брацца за зброю, каб здабываць зямлю без выкупу адпаведна з праграмай рэвалюцыйнага ўрада. Выбар адпаведна з першым варыянтам нічым не пагражаў селяніну, адпаведна з другім быў надзвычай небяспечны, паколькі азначаў канфрантацыю не толькі з памешчыкамі, якая ўжо вялася ў розных формах з часу абвяшчэння рэформы, але і з усёй сілай Расійскай дзяржавы, што чакала ад сялян падтрымкі ўзамен на сваё «дабрадзейства». Акрамя касы і сякеры і ўласнага духу, сяляне не мелі што супрацьпаставіць гэтай сіле, бо прысутнасць польскага ўрада, ад імя якога выступалі кіраўнікі паўстання, на тэрыторыі Беларусі была мала заўважальнай. Дадаткова ў працэсе гэтага выбару селяніну неабходна было пераадолець спакусу подкупу яго ўладамі ў выглядзе платы за пошук і затрыманні паўстанцаў – ад 3 да 5 рублёў за душу [4, с. 80].

Для сялян з усходу Беларусі выбар на карысць актыўнай барацьбы з расійскай дзяржавай за зямлю і волю звыш таго ўскладняўся спецыфічнымі для рэгіёна фактарамі. Шэраг з іх назвала С. М. Байкова (Самбук) яшчэ ў 1961 г., але варта назваць і іншыя. Перш за ўсё, неабходна ўлічваць панаваўшыя тут абшчынныя адносіны з іх адвечнымі традыцыямі лакальных залежнасцяў і абмежаванняў, разарваць якія селяніну было няпроста. Акрамя

таго, геаграфічная і цывілізацыйная блізкасць рэгіёна да Маскоўскай дзяржавы здаўна пераўтварыла яго ў геапалітычнае поле барацьбы паміж Літвой, а пазней Рэччу Паспалітай і Расіяй. Пасля завяршэння гэтай барацьбы перамогай Расіі яе працягласць не спрыяла складванню ў свядомасці насельніцтва рэгіёна ўяўлення аб сваім краі як «забраным», у адрозненне ад Міншчыны, Гарадзеншчыны. Гэты край у мінулым успрымаўся хутчэй як спрэчны, край нязгоды. А на захад ад Дзвіны і Дняпра ў гістарычнай памяці народа выразна адклалася ўсведамленне свайго краю як «забранага» [гл. 18, с. 123, 137; 11, с. 176]. Забранага кім? – Расіяй.

Такім чынам, вялікае мноства фактараў (намі названая толькі частка іх) штурхала сялян не проста на пасіўныя пазіцыі, але і ў антыпаўстанцкі лагер. Нягледзячы на гэта, сотні сялян Беларусі *свабодна* зрабілі свой небяспечны выбар на карысць удзелу ў паўстанні. Гэта былі тыя, што ўжо адчувалі сябе *гаспадарамі*, як і «Яська-гаспадар з-пад Вільні», ці хто прагнуў такім стаць. З улікам канкрэтных гістарычных акалічнасцей іх аказалася нямала. Удзел соцень сялян Беларусі, а разам з імі рамеснікаў, разначынцаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі ў паўстанні сведчыць аб тым, што працэс фарміравання мадэрновага грамадства ў Беларусі пачаўся, і пачаўся ён ва ўмовах барацьбы дэмакратычных слаёў краю супраць дэспатычнай расійскай дзяржавы.

Лепш зразумець бясплённасць і памылковасць прыніжаючых ацэнак удзелу беларускіх сялян у паўстанні 1863 г. дазваляе параўнанне іх паводзін у той гістарычнай сітуацыі з паводзінамі сялянства іншых краін у падобных акалічнасцях. Прыдатнымі для такога параўнання з'яўляюцца падзеі, звязаныя з барацьбой за аб'яднанне Італіі ў 1860 г., і падчас таго самага паўстання ў суседняй Польшчы. Герой барацьбы за аб'яднанне Італіі Дж. Гарыбальдзі, правадыр знакамітай «тысячы» патрыётаў, што прыйшлі з П'емонта і Ламбардыі на Сіцылію, каб далучыць Поўдзень да Італьянскага каралеўства, спадзяваўся на падтрымку мясцовых сялян, якія паўсталі супраць сваіх памешчыкаў. Паўстанцы радасна віталі героя. Маючы дыктатарскую ўладу, Гарыбальдзі аб'явіў набор у народ-

нае апалчэнне, каб, абапіраючыся на яго, ачысціць ад улады Бурбонаў усё Неапалітанскае каралеўства. Але сіцылійцы не пайшлі за ім, народнае апалчэнне сабраць не ўдалося. Больш за тое, праз некаторы час Гарыбальдзі давялося частку сваіх сіл пераарыентаваць на барацьбу з сялянскімі атрадамі, якія ваявалі з памешчыкамі за зямлю. Гэта была трагедыя, якую балюча перажываў Гарыбальдзі. Чаму яна адбылася? Асноўныя прычыны дзве. Па-першае, сяляне Поўдня Італіі не маглі зразумець, навошта ім трэба рызыкаваць жыццём дзеля такой даволі абстрактнай мэты, як стварэнне адзінай італьянскай дзяржавы, у той час, калі іх хвалявала праблема беззямелля. З другога боку, у гэтай сітуацыі Гарыбальдзі-патрыёт перамог Гарыбальдзі-дэмакрата і, не жадаючы спрыяць расколу краіны па сацыяльнай мяжы, не падтрымаў карэннага патрабавання сялянства аб падзеле памешчыцкай зямлі. Таму далей увесь цяжар барацьбы за аб'яднанне краіны вынеслі на сваіх плячах студэнты, разначынцы і рамеснікі з Поўначы Італіі [8, с. 492; 14, с. 268–269].

Вывучэнне паводзін сялянства суседняга Царства Польскага падчас паўстання 1863 г. яшчэ больш праясняе нашу праблему. Тут яго ўдзел у паўстанні быў больш актыўны, чым у Беларусі, пра што гаворыць удзельная вага сялян сярод рэпрэсіраваных па гэтай прычыне – каля траціны ад агульнай колькасці, а ў асобных мясцовасцях і болей [21, s. 250–251]. Але гэты паказчык вытлумачальны ў святле тых асаблівасцей становішча польскіх сялян, якія адрознівалі іх ад становішча сялян Беларусі. Польскія сяляне былі асабіста вольныя яшчэ з часу Княства Варшаўскага, належалі да той жа этнічнай супольнасці, што і землеўласнікі, і да таго самага каталіцкага веравызнання. На гэтай аснове ў Польшчы з большым поспехам ішоў працэс кансалідацыі розных слаёў народа вакол ідэі барацьбы супраць чужога панавання. Аднак і тут сацыяльны канфлікт развёў значную частку сялян і магнацтва, буйную шляхту па супрацьлеглых варагуючых лагерах. Справа ў тым, што ў свой час сяляне Княства Варшаўскага былі вызвалены без зямлі, яе можна было толькі купіць у дзедзіча, уладальніка маёнтка, калі на тое была яго воля, а ў сялян неабходныя сродкі. За палову стагоддзя гэты

канфлікт зусім не супыніўся. Таму падчас паўстання нярэдка здаралася, што землеўласнікі звярталіся да царскіх уладаў, да войска, каб утаймаваць стыхійную барацьбу сялян за зямлю [19, s. 306]. Але не адзінкавымі былі і супрацьлеглыя выпадкі, калі сяляне дапамагалі ўладам у барацьбе з паўстанцамі.

Парадаксальным чынам працэсу інтэграцыі польскага сялянства ў склад польскай нацыі паспрыяў царскі ўрад, правёўшы вясной 1864 г. буржуазную па духу аграрную рэформу, якая замацоўвала за сялянамі ва ўласнасць зямлю, якой яны да гэтага часу карысталіся. Але нават і праз палову стагоддзя працэс нацыянальнай кансалідацыі не завяршыўся, аб чым сведчылі выказванні польскіх сялян у сувязі з адыходам расійскага войска з Царства Польскага пад націскам нямецкіх войск. «Nasz wrócі» – меркавалі яны, што значыла – вернецца «наш» гаспадар, расійскі цар з яго ўладай [22, s. 74].

Праведзеныя намі паралелі дазваляюць зразумець, што ва ўсіх краінах сялянства на парозе індустрыяльнай эпохі паводзіць сябе аднолькава – як атамізаваная лакальнымі інтарэсамі супольнасць, зарыентаваная пераважна на забеспячэнне свайго матэрыяльнага выжывання. Вялікая залежнасць ад умоў матэрыяльнага існавання, інерцыя набытага за стагоддзі вопыту, неразвітасць сацыяльнай камунікацыі ў пачатку новай эпохі, не спрыялі засваенню сялянамі ідэі аб уласнай дзяржаве як інструменце задавальнення інтарэсаў усяго грамадства. У святле гэтай заканамернасці звесткі аб колькасці сялян, якія прынялі ўдзел у паўстанні, – большай на захадзе Беларусі, меншай на ўсходзе – прыдатныя перш за ўсё для ацэнкі ўзроўню мадэрнізаванасці гэтых рэгіёнаў краіны, а ўжо ў выніку гэтай ацэнкі і на яе аснове – для выяўлення набытай іх насельніцтвам здольнасці дзейнічаць адпаведна з новымі каштоўнасцямі. На Гарадзеншчыне, Віленшчыне гэты ўзровень быў вышэйшы, чым на Віцебшчыне, Магілёўшчыне. Тут сялянства праявіла значна большую здольнасць, чым сялянства ўсходу Беларусі, са зброяй у руках змагацца за рэалізацыю такой *абстрактнай для яго ідэі*, як аднаўленне дзяржавы, якая вырашыць ужо *канкрэтную, жыццёвую задачу* – справядліва забяспечыць яго зямлёй.

У Беларусі мабілізацыя сялянскіх мас для барацьбы за гэту двухузроўневую ідэю дадаткова ўскладнялася адсутнасцю бездакорнага, прыцягальнага для розных слаёў насельніцтва краю гістарычнага арыенціра, узору дзяржаўнасці. Самі кіраўнікі паўстання, як вядома, былі прыхільнікамі ўваходжання Літвы і Беларусі ў адроджаную Рэч Паспалітую на ўмовах федэрацыі яе народаў з польскай дзяржавай, аднак па шэрагу прычын у зваротах да сялян не маглі акцэнтаваць сваё бачанне дзяржавы, за адраджэнне якой змагаліся. Адну з гэтых прычын можна назваць без сумненняў: яна заключалася ў неабходнасці падтрымліваць салідарнасць з варшаўскім кіруючым цэнтрам, нягледзячы на існуючыя з ім разыходжанні па пытанні аб будучыні Літвы і Беларусі і аграрным пытанні [3, с. 40–41; 10, с. 265, 269–270]. Іншыя прычыны, у сувязі з недахопам матэрыялу для іх вывучэння, магчыма назваць толькі ў гіпатэтычным плане. Можна меркаваць, што Каліноўскі і яго паплечнікі былі вымушаны ўлічваць розны ўзровень прывязанасці да дзяржаўнай традыцыі Вялікага Княства Літоўскага на захадзе і ўсходзе Беларусі. Гэта традыцыя на ўсходзе, відавочна, ужо не была актуальнай [гл. 5, с. 423–424]. А дзеячы з Літоўскага правінцыяльнага камітэта на чале з Каліноўскім жадалі прамаўляць да ўсяго беларускага народа, ужываючы знаёмыя яму паняцці. Такімі былі «Польшча», «польскі ронд» (урад) і «пранцуз», які яму дапаможа. Ва ўсякім разе, беларускі селянін быў пастаўлены перад альтэрнатывай: змагацца за вяртанне «польскіх рондаў», якія лепш абыдуцца з сялянствам, чым «маскаль», або чакаць міласці ад расійскага цара. Самі ж кіраўнікі Літоўскага правінцыяльнага камітэта стаялі перад уласным і не лягчэйшым выбарам. Для іх далучэнне да паўстання ў сітуацыі недастатковай узгодненасці яго праграмы з варшаўскім Цэнтральным нацыянальным камітэтам у час, не імі абраны, было вымушаным палітычным ходам. Але іншы магчымы ход – ухіленне ад паўстання, – быў проста катастрофай, бо аблягчаў царызму ўдушэнне рэвалюцыйных сіл спачатку ў Каралеўстве Польскім, а затым і ў гістарычнай Літве. Такім чынам, для Беларусі паўстанне стала трагедыяй ужо ў момант, як яно пачалося.

Аднак гістарычны вопыт сведчыць, што здараюцца і аптымістычныя трагедыі, – тыя, што акупляюцца сваімі не заўсёды відавочнымі і нярэдка аддаленымі вынікамі. Ці было такой трагедыяй паўстанне 1863 г. у Беларусі і, у прыватнасці, актыўны ўдзел у ім сялянства Гарадзеншчыны і Віленшчыны? Несумненна. Першае, на што неабходна звярнуць увагу, адказваючы на гэта пытанне, – гэта вымушаныя саступкі з боку царызму беларускаму сялянству ў ходзе правядзення аграрнай рэформы 1861 г. Без націску з боку паўстанцаў былі б немагчымыя царскія ўказы ад 1 сакавіка і ад 2 лістапада 1863 г., якія ліквідавалі часова абавязаны стан сялян у адносінах да памешчыкаў, уводзілі абавязковы і паніжаны на 20 % у параўнанні з устаўнымі граматамі выкуп сялянамі павіннасцей за зямлю, якую яны меліся атрымаць. Ствараліся і камісіі для праверкі павіннасцей, ускладзеных на сялян устаўнымі граматамі. Звернем увагу на тое, што першы з названых указаў быў прыняты праз месяц пасля пачатку паўстання ў Літве і Беларусі, у адказ на маніфест Часовага ўрада Літвы і Беларусі ад 1 лютага 1863 г., які абвяшчаў пераход ва ўласнасць сялян «на вечныя часы <...> без чыншаў і выкупаў» той зямлі, якую яны мелі [7, с. 95]. Як справядліва заўважыла беларуская даследчыца, гэты ўказ «датычыў толькі тых рэгіёнаў, дзе на гэты час існавала пагроза злучэння нацыянальна-вызваленчага руху з сялянскай барацьбой за зямлю» [4, с. 80–81] – Ковенскай, Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў, паўночных паветаў Віцебскай губерні. І толькі больш чым праз паўгода аналагічныя саступкі былі зроблены царызмам сялянам Усходняй Беларусі. Такім чынам, паўстанцы з Захаду Беларусі заваявалі не толькі для сябе, але і для сялян Усходняй Беларусі лепшыя ўмовы вызвалення ад паншчыны – лепшыя не толькі ў параўнанні з першапачатковымі планамі царызму, але і ў параўнанні з карэннай Расіяй, дзе сялянства не адважылася на рашучую барацьбу.

Паглыбленая ў 1863 г. аграрная рэформа, разам з іншымі рэформамі гэтага часу, паскорыла мадэрнізацыйныя працэсы ў Беларусі, стварыла ўмовы для фарміравання грамадзянскай супольнасці. Устаўшы на адваяваны грунт – у прамым і пера-

носным сэнсе – сяляне атрымалі і выкарысталі магчымасці для паляпшэння гаспадарання на зямлі, забяспечылі паляпшэнне свайго дабрабыту і рост насельніцтва ў краі, знізілі сваю залежнасць ад прыроднага асяроддзя. У іх з'явіліся лепшыя магчымасці для набыцця адукацыі, якая адкрывала перад імі перспектывы сацыяльнага поспеху. Характэрна, што на пачатку XX ст. удзельная вага сялянскіх дзяцей сярод навучэнцаў усіх устаноў перавышала ўдзельную вагу сялян сярод насельніцтва краю [гл.: 4, с. 132–133; 18, с. 74].

Абапіраючыся на растучы ўзровень матэрыяльнай і духоўнай свабоды, пазбавіўшыся ў выніку рэформ пасрэдніцтва памешчыкаў у зносінах з дзяржавай, селянін пачаў вучыцца паважаць у сабе чалавека, роўнага іншым, які мае адносна дзяржавы не толькі абавязкі, але і правы. «Не народ для ўлады, а ўлада для народа» – упершыню гэты выпрацаваны ў рэчышчы еўрапейскай гісторыі ідэал беларускі селянін пачуў ад «Яські-гаспадара з-пад Вільні» [7, с. 32]. Зразумела, яго засваенне адбывалася няпроста, не механічна, яно ўскладнялася новымі гістарычнымі навальніцамі, якія праносіліся над беларускай зямлёй, і зноў зводзілі селяніна на ўзровень барацьбы за фізічнае выжыванне. Але падчас паўстання 1863 г. гэты працэс быў пачаты і далей не спыняўся. У яго рэчышчы натуральным было з'яўленне ідэі дзяржаўнай самастойнасці Беларусі ў федэрацыі з іншымі народамі дэмакратычна пераўтворанай Расіі. Яна нарадзілася праз 20 год пасля паўстання 1863 г. ў асяроддзі беларускіх народнікаў, што паходзілі з розных рэгіёнаў краіны і з розных сацыяльных слаёў. Варта падкрэсліць, што заўважную частку гэтай палітычнай плыні, якая ставіла антыманархічныя мэты, – каля 8 % – складалі выхадцы з сялян [падлічана па: 13, с. 194]. Група беларускіх народнікаў, якія паспела паміж арыштамі выдаць у Пецярбургу два нумары часопіса «Гоман», на старонках якога абгрунтавала ідэю беларускай дзяржаўнасці, трымалася пераканання, што менавіта сяляне стануць сацыяльнай апорай у барацьбе за яе рэалізацыю. Па гэтай прычыне ўдзельнікі групы, пераважна студэнты пецярбургскіх вышэйшых навучальных устаноў,

уважліва назіралі за працэсам пазбаўлення сялян ад ілюзій адносна царызму, і наколькі гэта было магчыма, садзейнічалі яго развіццю. «Гоман» пісаў, што пасля правядзення аграрнай рэформы 1863 г. «адносіны народа да ўрада ў Беларусі ўсё болей і болей абвастраюцца», бо сяляне пачалі ўсведамляць, што чакаць ад уладаў болей няма чаго [16, с. 194]. Часопіс называў шэраг прыкмет гэтай з'явы і, у прыватнасці, фіксаваў фарміраванне надлакальнай салідарнасці сялянства ў барацьбе супраць урада і памешчыкаў.

Як вядома, на працягу наступных некалькіх дзесяцігоддзяў царызму ўдавалася з пераменным поспехам стрымліваць працэс засваення сялянствам ідэі аб неабходнасці нацыянальнай дзяржавы, хоць бы ў форме аўтаноміі (прыклады дае дзейнасць Дзяржаўнай думы). Дзеля гэтага названая ідэя абвяшчалася «польскай інтрыгай». Гэтай жа тактыкай некаторы час карысталіся і бальшавікі ў Беларусі. Тым не менш неўзабаве пасля таго, як рухнуў царызм, беларуская дзяржаўнасць была абвешчана. Змушаны гістарычнымі падзеямі, зрабіў свой выбар і беларускі селянін. І гэты выбар быў відавочны. Ён выяўляўся ў складзе дэлегатаў Усебеларускага з'езда, на якім адбылося абвяшчэнне беларускай дзяржавы. Звыш трох чвэрцяў іх з'яўляліся прадстаўнікамі сацыяльных нізоў [17, с. 178], і можна без перабольшвання сцвярджаць, што сярод дэлегатаў пераважалі сяляне і вайскоўцы, якія паходзілі з сялян. Значным было і прадстаўніцтва сялян (па паходжанні) сярод палітычнай эліты Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) – 40 % [20, s. 35–40]. Наступіў час, калі сяляне з аб'екта сваёй гісторыі ператвараліся ў яе суб'ект. Пачатак гэтаму працэсу быў пакладзены ў 1863 г., калі група беларускіх рэвалюцыйных народнікаў на чале з Кастусём Каліноўскім упершыню звярнулася да сялянства з палітычнай праграмай, у якой сацыяльнае пытанне ставілася ў сувязь з пытаннем аб будучыні Літвы-Беларусі. Сапраўдны, моцны і эфектыўны водгук на гэты заклік прыйшоў больш чым праз палову стагоддзя, і ён засведчыў, што гісторыя апраўдала тую меншасць беларускага сялянства, якая пайшла за Каліноўскім.

Літаратура

1. *Байкова, С. М.* К вопросу об участии крестьян Белоруссии в восстании 1863 г. / С. М. Байкова // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1961. – Рига: Изд-во АН Латв. ССР, 1963. – С. 422–434.

2. *Байкова, С. М.* О движущих силах восстания 1863 г. на территории Белоруссии / С. М Байкова // Историко-социологические исследования (на материале славянских стран). – М.: Наука, 1970. – С. 222–253.

3. *Біч, М. В.* Нацыянальнае і аграрнае пытанні ў час паўстання 1863–1864 гг. / М. В. Біч // Беларус. гіст. часоп. – 1993. – № 3. – С. 36–45.

4. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён: у 3 т. – Т. 2. Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г.; пад рэд. В. П. Панюціча. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – 551 с.

5. *Дунін-Марцінкевіч, В.* Да пачцівых беларусаў / В. Дунін-Марцінкевіч // Творы. – Мінск: Маст. літ., 1984. – С. 423–424.

6. *Дьяков, В. А., Зайцев, В. М., Обушенкова, Л. А.* Социальный состав участников польского восстания 1830–1831 гг. (по материалам западных губерний Российской империи) / В. А. Дьяков, В. М. Зайцев, Л. А. Обушенкова // Историко-социологические исследования. – М.: Наука, 1970. – С. 19–168.

7. *Каліноўскі, К.* За нашую вольнасць: тв., дак. / К. Каліноўскі – Мінск: Бел. кнігазбор, 1999. – 464 с.

8. *Канделоро, Дж.* История современной Италии. – М.: Прогресс, 1966. – Т. 4. – Дж. Канделоро. – 615 с.

9. Кастусь Каліноўскі і яго эпоха ў дакументах і культурнай традыцыі: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Менск, 25 верас. 2009 г. – Менск: Бел. навук. т-ва, 2011. – 222 с.

10. *Кісялёў, Г.* Кастусь Каліноўскі, яго час і спадчына / Г. Кісялёў // Кастусь Каліноўскі. За нашую вольнасць: тв., дак.– Мінск: Бел. кнігазбор, 1999. – С. 7–24.

11. *Купала, Я.* Жыве Беларусь / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1993. – 476 с.

12. *Латышонак, А.* Гісторыя Беларусі ад сярэдзіны XVIII ст. да пачатку XXI ст. / А. Латышонак, Я. Мірановіч – Вільня: Ін-т беларусістыкі; Беласток: Бел. гіст. т-ва, 2010. – 368 с.

13. *Лосинский, Н. Б.* Революционно-народническое движение в Белоруссии. 1870–1884 гг. / Н. Б. Лосинский – Минск: Наука и техника, 1983. – 221 с.

14. *Невлер (Вилин), В. Е.* Демократические силы в борьбе за объединение Италии. 1831–1860 / В. Е. Невлер (Вилин) – М.: Наука, 1982. – 374 с.

15. *Новік, Я. К.* Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў па 2010 г.: вучэб. дапам. / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік; пад рэд. Я. К. Новіка, – Мінск: Выш. школа, 2011. – 512 с.

16. Публицистика белорусских народников. – Минск: Изд-во БГУ, 1983. – 134 с.

17. *Рудовіч, С.* Час выбару. Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе / С. Рудовіч. – Мінск: Тэхналогія, 2001. – 201 с.

18. *Токць, С.* Беларуская вёска ў эпоху зьменаў: другая палова XIX – першая траціна XX ст. / С. Токць – Менск: Тэхналогія, 2007. – 306 с.

19. *Gierowski, J. A.* Historia Polski. 1764–1864 / J. A. Gierowski – Warszawa: PWN, 1986. – 348 s.

20. *Gomółka, K.* Białoruska elita polityczna w latach 1917 – 1921 / K. Gomółka // Dzieje najnowsze. – R. 1989. – № 2. – S. 35–41. – Безумоўна, прааналізаваны даследчыцай матэрыял няпоўны і стварае толькі агульны вобраз беларускай палітычнай эліты таго часу.

21. *Kieniewicz, S.* Historia Polski. 1795–1918 / S. Kieniewicz. – Warszawa: Wyd. naukowe PWN, 1997. – 597 s.

22. *Lisiak, H.* Społeczeństwo polskie wobec inwazji Rosji Radzieckiej na Polską w 1920 r. / H. Lisiak. // Zycie i myśl. – 1990. – № 7/8. – S. 67–78.

23. *Wandycz, P.* Pod zaborami / P. Wandycz. – Warszawa: Państwowy In-t wyd., 1994. – 551 s.

Резюме

Г. Г. ЛАЗЬКО

УЧАСТИЕ БЕЛОРУССКОГО КРЕСТЬЯНСТВА В ВОССТАНИИ 1863 г. КАК НАЧАЛО ЕГО ПОЛИТИЧЕСКОЙ МОДЕРНИЗАЦИИ

Предлагается отойти от бесплодного формального подхода к оценке участия крестьян Беларуси в восстании 1863–1864 гг. и рассматривать его в контексте модернизационных процессов, в ходе которых меняется психология и политическое поведение крестьянства. Уступки царизма белорусскому крестьянству, вызванные активным участием в восстании его наиболее модернизированного слоя «гаспадароў» (хозяев) из-под Вильни, Гродно, способствовали усвоению крестьянством в ходе длительной и сложной эволюции идеи «не народ для власти, а власть для народа». Направление и результаты этой эволюции позволяют утверждать, что история оправдала позицию того меньшинства белорусского крестьянства, которое откликнулось на призывы Калиновского об участии в восстании.

Summary

G. LAZKO

PARTICIPATION OF BELARUSIAN PEASANTRY IN THE UPRISING OF 1863 AS THE BEGINNING OF ITS POLITICAL MODERNIZATION

The author proposes to withdraw from a fruitless formal approach to the assessment of the participation of peasants of Belarus in the uprising of 1863–1864 and to consider it in terms of the modernization processes, in the course of which

the psychology and political behavior of the peasantry changes. Tsarism's concessions to Belarusian peasantry, which were forced by active participation of its most modernized layer «haspadary» (owners) from near Vilnya, Grodno in the uprising, promoted understanding by the peasantry of the idea «not the people are for power, but the power is for the people» in the course of the long and difficult evolution. The direction and results of this evolution allow to state that the history justified the position of that minority of the Belarusian peasantry which responded to appeals of Kalinovsky for participation in revolt.

Паступіў у рэдакцыю 18.12.2013

УДК 94(476)«1863/1864»+ 37.014.5(476)(091)«18»

Л. М. ЛЫЧ

АНТЫНАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА ЦАРЫЗМУ Ў ГАЛІНЕ НАРОДНАЙ АСВЕТЫ ЯК АДНА З ПРЫЧЫН ПАЎСТАННЯ 1863–1864 ГАДОЎ

У канцы XVIII ст. з часу інкарпарацыі беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі і да яе скону ў 1917 г. на іх не існавала дзяржаўнай нацыянальнай сістэмы адукацыі, што не з'яўлялася якойсьці выпадковасцю, недаглядам. Такая палітыка свядома чынілася царызмам дзеля таго, каб да канца зруйнаваць этнакультурны лад жыцця беларусаў, зрусіфікаваць іх з тым, каб яны не маглі сфарміравацца ў нацыю, лічылі сябе рускімі.

Пытанні народнай адукацыі, як ніякія іншыя, моцна прыкоўвалі да сябе ўвагу створаных на Беларусі мясцовых адміністрацыйных органаў улады. Яны рабілі ўсё залежнае ад іх, каб дадзеная сфера як мага лепш спрыяла пранікненню рускага духу ў гэты не так даўно далучаны край. Уся сутнасць антынацыянальнага курсу да ўзгадавання яго маладых пакаленняў вельмі добра прасочваецца пры чытанні пасланай у 1824 г. генерал-губернатарам Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў Мікалаем Хаванскім у Пецярбург дакладной запіскі. Ім прапаноўвалася сістэма выкладання навукі ў гімназіях гэтай адміністрацыйнай адзінкі імперыі «павярнуць да чыста рускай сістэмы <...> пастанавіць абавязковым правілам, каб усе прадметы выкладаліся на рускай мове (у суверэннай Рэспубліцы Беларусь ужо не першы год, як такая мэта дасягнута. – *Л. Л.*) <...> каб навучэнцы не паступалі на цывільную службу... без пасведчання аб добрых поспехах у рускай славеснасці» [4]. Узмацненню рускага пачатку ў галіне адукацыі належным чынам паспрыяла прынятае ў маі 1830 г.

міністрам народнай асветы Расіі рашэнне аб рэарганізацыі польскіх рымска-каталіцкіх школ у прыходскія, павятовыя вучылішчы і гімназіі з рускай мовай навучання. Да гэтага ў рымска-каталіцкіх школах Беларусі педагагічны працэс вёўся на польскай мове пры поўным ігнараванні беларускай. У іх навучэнцы атрымлівалі багатыя веды па лацінскай мове.

Што ж датычыць беларускамоўнай адукацыі, дык яна на сваёй гістарычнай тэрыторыі толькі ледзь-ледзь тлела ва ўніяцкіх школах, хаця да іх з вялікай пашанай ставіўся народ, давяраў ім навучаць сваіх дзяцей. Такія школы яшчэ называліся базыльянскімі, бо сваім узнікненнем былі абавязаныя манаскаму ордэну базыльян. Улічваючы даволі высокі аўтарытэт такіх школ, царызм доўга не асмельваўся на адкрытую барацьбу з апошнімі, але затое ўвёў абавязковае вывучэнне ў іх рускай мовы і гісторыі Расійскай імперыі. У 1824 г. у трох правінцыях ордэна базыльян было 13 школ, у якіх вучылася каля 4400 вучняў. У далейшым улады пайшлі на скарачэнне іх ліку, на пераўтварэнне такіх навучальных устаноў у семінарыі і духоўныя школы па падрыхтоўцы духавенства для рускай праваслаўнай царквы. У Жыровічах і Лядах такую рэарганізацыю правялі ў 1828 г., у Беразвечы – у 1830 г. [3].

Уся школьная сетка Беларусі напачатку XIX ст. падпарадкоўвалася створанай у 1803 г. Віленскай навучальнай акрузе. Яе вучэбна-метадычным і адміністрацыйным цэнтрам з'яўляўся заснаваны ў тым жа годзе ў выніку рэарганізацыі Галоўнай віленскай школы Віленскі ўніверсітэт. І ў акрузе, і ва ўніверсітэце панаваў магутны польскі дух, што вельмі абцяжарвала правядзенне русіфікацыі народнай асветы Беларусі. Дзеля дасягнення жаданага для царызму поспеху нават давялося ў 1824 г. вывесці з падначалення Віленскай навучальнай акругі школы Віцебскай і Магілёўскай губерняў і перадаць іх Пецярбургскай навучальнай акрузе. Праз пяць гадоў (у 1829 г.) для школ гэтых губерняў стварылі самастойную Беларускую навучальную акругу. У 1831 г. у яе склад перадалі Мінскую, а праз год – Віленскую і Гродзенскую губерні, а таксама Беластоцкую вобласць.

Толькі перакананыя прыхільнікі русіфікатарскага курсу ў сферы адукацыі маглі разлічваць быць прызначанымі на пасаду папячыцеля Віленскай ці Беларускай навучальнай акруг. Цяжкасцяў з падборам такіх кіраўнікоў у Міністэрстве асветы Расіі не было, бо, за рэдкім выключэннем, яе педагагічная інтэлегенцыя пагаджалася з такім курсам. Міне не так шмат часу, калі з'явяцца прыхільнікі такога курсу і сярод саміх беларусаў, асабліва праваслаўнага веравызнання. Многія гісторыкі педагогікі звычайна даюць станоўчую адзнаку дзейнасці на пасадзе куратара Беларускай навучальнай акругі Рыгора Карташэўскага (выхадзец з сям'і палтаўскага шляхціца; 1777–1840). Узначаліў яе ў год стварэння (1829), а звольніўся ў 1835 г. І сапраўды, у яго дзейнасці нямала было карыснага для пашырэння асветы ў нашым краі, у тым ліку і сярод простага люду, але ў ёй адсутнічаў нацыянальны пачатак, без якога нават самая дасканалая сістэма адукацыі не дапаможа беларусу ўзгадоўвацца беларусам. Іншай, апроч рускай, Р. Карташэўскі не ўяўляў сабе асветы на Беларусі. Ён ставіў сабе ў вялікую заслугу, што ў выніку рэарганізацыі школ у Беларускай навучальнай акрузе «найгалоўныя вучылішчы, якія ўтрымліваліся манаскімі ордэнамі для свецкага юнацтва ў Беларусі, зачынены і заменены свецкімі <...> застаецца толькі адна дамініканская гімназія Дрысенскага павета». Пры гэтым кіраўніку акругі ў Беларусі засталося «адно толькі прыходскае вучылішча ў валоданні рымска-каталіцкага духавенства <...> у горадзе Сянно ў тамтэйшым францысканскім кляштары», дзе не навучалася нават і дзесяці дзяцей [1, с. 178]. Для праваднікоў русіфікатарскага курсу ў сферы адукацыі гэта, натуральна, вялікае дасягненне. Затое яно не магло не выклікаць пратэсту з боку жыхароў каталіцкага веравызнання, сярод якіх былі не толькі палякі, але і беларусы. Пазбаўленне іх права вучыць сваіх дзяцей у традыцыях рымска-каталіцкай адукацыі не магло не паспрыяць пазней да далучэння вялікай колькасці вернікаў гэтай канфесіі ў шэрагі ўдзельнікаў паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага.

У вядомага даследчыка гісторыі асветы Беларусі першай паловы XIX ст. Уладзіміра Пасэ знаходзім такую, лічу, аб'ектыўную, ацэнку дзейнасці Р. Карташэўскага: «Як папячыцель акругі, закліканы ажыццяўляць палітыку русіфікацыі, ён быў заклапочаны нізкім узроўнем выкладання рускай мовы» [5, с. 155]. А каб такі ўзровень павысіць, прыклаў нямала выніковых намаганняў. Нават сам рассылаў «у некаторыя школы Беларусі пісьмы з метадычнымі парадамі, якія датычыліся выкладання рускай мовы». Пра родную мову дзяцей Беларусі ён нідзе не згадваў.

Актыўным праваднікам прарускай адукацыі ў Беларусі паказаў сябе прызначаны ў жніўні 1861 г. на пасаду папячыцеля Віленскай вучэбнай акругі А. П. Шырынскі-Шыхматаў. Нягледзячы на хранічна востры дэфіцыт фінансавых сродкаў яму ўдалося ў 1862 г. адкрыць у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях 34 народныя вучылішчы з рускай мовай навучання [2, с. 228]. Як і ва ўсе папярэднія гады, выкарыстоўваць беларускую мову ў гэтых школах катэгарычна забаранялася. «Для школьнай дзейнасці запрашаліся выхаванцы Мінскай і іншых духоўных семінарый (вядома, праваслаўных. – *Л. Л.*), а таксама царкоўнаслужыцелі <...> іх навучалі "дзейнічаць у школьнай справе ў згодзе з праваслаўнымі свяшчэннікамі" [2, с. 228]. Апошнія ж, як вядома, і ў Беларусі з'яўляліся самымі шчырымі носьбітамі рускага духу і таму рабілі ўсё дзеля замацавання яго ў народных вучылішчах. Такой дзейнасцю апошнія выклікалі самую адмоўную рэакцыю ў беларускіх нацыянальных патрыётаў. Натуральна, на іх баку стаялі зарыентаваныя на польскі інтарэс асобы, якіх з гадамі асабліва не ўбывала ў нашым краі, што стварала спрыяльную глебу для росту ў Беларусі незадаволеных царскай палітыкаў увогуле і ў сферы асветы ў прыватнасці. Многія з такіх незадаволеных, як толькі ў 1863 г. пачалося паўстанне пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага, ахвотна далучыліся да змагароў за вызваленне Беларусі з-пад прыгнёту расійскага самаўляддзя.

Аддана служылі рускаму інтарэсу ў сферы асветы і многія з тых, хто на некалькі парадкаў стаяў ніжэй за Р. Карташэўскага і А. П. Шырынскага-Шыхматава паводле табеля аб рангах.

Выпадковыя людзі не траплялі ў школы. Зразумела, найбольшую энергію дзеля ўмацавання рускага духу ў іх укладвалі прысланыя з цэнтральных губерняў імперыі педагогі. І калі ў першую чвэрць XIX ст. не ўзнікала асабліва вострых канфліктаў з-за ўкаранення чужой Беларусі сістэмы народнай адукацыі, дык толькі таму, што гэты працэс не вызначаўся маштабнасцю. І ўсё ж ён паслужыў адной з прычын нацыянальна-вызвольнага паўстання 1830–1831 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі. Царскі ўрад яшчэ ніколі не праводзіў такога агрэсіўнага курсу ў галіне адукацыі, як пасля задушэння паўстання. Пераканаўчым доказам гэтаму можа служыць закрыццё ў 1832 г. Віленскага ўніверсітэта, які сядзеў нібыта косткаю ў горле расійскага царызму. Спробы скіроўваць навучальна-выхаваўчы працэс прэстыжнай і па-за Літвой-Беларуссю ўстановы на імперскі інтарэс не давалі жаданага выніку: лаціна-польскі дух працягваў моцна трываць у ёй. У мясцовых студэнтаў даволі вялікай была цяга да вывучэння гісторыі, культуры і побыту роднага краю, што рана ці позна магло б выліцца ў розныя формы нацыянальна-культурнага руху. Сказанае вышэй тлумачыць, чаму значная частка і выкладчыкаў, і студэнтаў падзяляла нацыянальна-вызваленчыя ідэі, далучылася да паўстанцаў, за што давялося заплаціць такую дарагую цану. Каб такое больш не паўтарылася, царскія ўлады, нягледзячы на рэзкае асуджэнне іх дзеянняў прагрэсіўнымі сіламі Еўропы, закрылі Віленскі ўніверсітэт.

Гэтыя ўлады не збіраліся абмяжоўваць свае дзеянні па русіфікацыі асветы толькі закрыццём гэтага ўніверсітэта. Яны павялі шырокім фронтам мэтанакіраванае, рашучае змаганне з польскім уплывам ва ўсіх тыпах навучальных устаноў. Што датычыць такога беларускага ўплыву, дык ён выяўляў сябе надзвычай слаба, на што былі свае прычыны. Не без удзелу польскіх палітыкаў, спаланізаванай багатай шляхты мясцовага паходжання, моцна адданай сваім культурным традыцыям інтэлегенцыі Беларусі як і на момант гвалтоўнага далучэння да Расійскай імперыі, так і за паўстагоддзя жыцця ў яе складзе, не вызначалася нават самымі мінімальнымі дасягненнямі ў галіне нацыянальнай асветы, несучы па гэтай прычыне вялікія

этнічныя страты. Міналі гады за гадамі, а ва ўладаў царскай Расіі не з'яўлялася аніякага жадання хоць штосьці зрабіць на карысць беларускай адукацыі. Больш за тое, пасля скасавання ў 1839 г. уніяцкай царквы яны ліквідавалі і ўсе прыналежныя ёй школы. Ад гэтага часу і да восені 1915 г. у Беларусі не існавала нават неафіцыйнай нацыянальнай сістэмы адукацыі.

Прынята лічыць, што пасля таго як у другой чвэрці XIX ст. у Беларусі былі ліквідаваныя манастырскія каталіцкія вучылішчы, базыльянскія (уніяцкія) школы, і ў гэтай частцы царскай імперыі амаль цалкам запанавала агульнаадукацыйная руская школа. Як і колішняя польская сістэма адукацыі, яна ніколькі не адпавядала беларускаму нацыянальнаму інтарэсу, таму не магла не мець праціўнікаў у асяроддзі сапраўдных патрыётаў нашага краю. Праўда, у значна меншай колькасці, чым такіх праціўнікаў было сярод мясцовых палякаў. Асабліва вялікі – і трэба сказаць справядлівы – гнеў у іх выклікала ўвядзенне ў 1836 г. забароны выкладаць школьныя прадметы на польскай мове. Такі гнеў цалкам апраўданы, бо калі дзеці таго ці іншага народа вучацца на чужой мове, школа пераўтвараецца замест яго нацыянальнага апірышча ў магільшчыка. Нават незвычайна таленавітыя, з сусветным іменем педагогі не змогуць сфармаваць паўнавартасных носьбітаў нацыянальнага духу сваёй зямлі з тых яе маладых пакаленняў, якія навучаюць на чужой мове, прычым самай развітой, распаўсюджанай на планеце.

З бібліятэк усіх тыпаў навучальных устаноў Беларусі выкідаліся польскамоўныя падручнікі і дапаможнікі, творы мастацкай літаратуры. Вызваленыя ад іх паліцы тэрмінова запаўняліся аналагічнымі кнігамі на рускай мове. Цэнтральныя і мясцовыя органы ўлады насуперак хранічнаму недахопу грашовых сродкаў не шкадавалі іх для набыцця бібліятэкам навучальных устаноў Беларусі не толькі рускамоўных падручнікаў, дапаможнікаў, але і твораў рускіх пісьменнікаў. Па наяўнасці кніг такія бібліятэкі зусім не саступалі тым, што функцыянавалі ў цэнтральных губернях імперыі. І гэта цалкам апраўдана з пазіцый русіфікатарскай палітыкі, бо з дапамогай кнігі на

чужой мове вельмі лёгка адрываць маладыя пакаленні ад прыродных нацыянальна-культурных традыцый і ўзамен апошніх навязваць чужыя. У такіх выпадках не прынята лічыць грошы.

Як ніколі раней, мэтам русіфікацыі сістэмы асветы ўсяляк імкнуліся падпарадкаваць сваю кадравую палітыку ў гэтай сферы цэнтральныя і мясцовыя органы ўлады. Як і раней, перавагу аддавалі настаўнікам, прысланым з цэнтральных губерняў Расіі ў Беларусь. І яны апраўдвалі такі давер. Кіраўнікам органаў асветы і навучальных устаноў удавалася фармаваць прыхільнікаў рускай сістэмы адукацыі і з настаўнікаў мясцовага паходжання. Уклад многіх з іх у русіфікацыю педагагічнага працэсу цалкам задавальняў яе ідэолагаў і праваднікоў.

І ўсё ж і ў гэты час у русіфікацыі народнай асветы нашага краю не абыходзілася без праблем. Сур'ёзна перашкаджала наяўнасць у ім даволі значнай колькасці прыхільнікаў польскіх школ. Яны ж стагоддзямі функцыянавалі на гэтай зямлі, хоць і чужой для іх. Польская шляхта, каталіцкае духавенства, самі беларусы каталіцкай веры ўсяляк імкнуліся дапамагаць сваім дзецям не стаць ахвярай рускай культурна-моўнай стыхіі.

Змаганне з агульным для беларусаў і носьбітаў польскага духу на іх зямлі злом – русіфікацыяй народнай асветы – магло б мець куды лепшыя вынікі, калі б у адных і другіх поўнасцю супадалі погляды на яго. Такога пакуль што не назіралася, у тым ліку і сярод саміх настаўнікаў. Тыя з іх, што спавядалі каталіцтва, больш за ўсё былі заклапочаны тым, як захаваць на беларускіх землях сістэму польскай адукацыі, ад чаго, натуральна, не было ніякай карысці для карэннага насельніцтва. Прыхільнікамі такой адукацыі найчасцей за ўсё з'яўляліся выпускнікі Варшаўскага ўніверсітэта, хаця іншым разам здаралася і нешта процілеглае. Будучы добра дасведчанымі, як у краінах Цэнтральнай і Заходняй Еўропы праз пабудаваны на народных культурна-моўных традыцыях педагагічны працэс узгадоўваюць моцна адданыя свайму народу маладыя пакаленні, такой практыкай па прыбыцці на Беларусь жадала займацца нямала каго з тых, хто вучыўся ў Варшаве. І займаліся не без поспеху, на што не маглі не рэагаваць усіх рангаў прарабы русіфікацыі.

Тым, хто жыў, усяляк адстойваў нацыянальны інтарэс беларускага народа, не магла падабацца няспынная барацьба паміж сабой прыхільнікаў польскага і рускага пачаткаў у сферы адукацыі, бо пры панаванні любога з іх выхаванне, навучанне дзяцей карэннага насельніцтва не прыносіла б ім сапраўднай карысці, а вяло б да паланізацыі ці русіфікацыі. Тагачасная сітуацыя з іх адукацыяй вельмі трапна пададзеная ў адной з самых сур'ёзных навуковых публікацый савецкага часу па дадзенай праблеме: «У Беларусі вялася барацьба за ўплыў на беларускае насельніцтва. Польскія памешчыкі выступалі супраць адкрыцця дзяржаўных рускіх школ. Правячыя колы царскай Расіі лічылі адным з "добранадзейных сродкаў супрацьдзеяння польскаму нацыянальнаму элементу" неадкладнае заснаванне сельскіх школ з рускай мовай навучання. Прапаноўвалася весці справу «ў шырокіх памерах, энергічна, па загадзя вызначанаму плану» [2, с. 227].

Нягледзячы на сістэмны характар русіфікатарскай дзейнасці свецкіх і духоўных уладаў беларуская зямля вельмі маруднымі тэмпамі вызвалялася ад польскага ўплыву. У цэнтры, а таксама многія прыбылыя сюды чыноўнікі працягвалі бачыць у ёй нешта добра замешанае на пальшчызне.

Бясспрэчна, адсутнасць у афіцыйных поглядах на асвету ўсялякага беларускага пачатку ў пэўнай ступені магло быць выклікана памылковымі ўяўленнямі: раз у грамадскім жыцці нашага краю не выкарыстоўваецца беларуская мова, значыцца, і яго мясцовае насельніцтва зносіцца паміж сабой па-польску. Дарэчы, так думаў і малады, пазней вядомы рускі літаратурны крытык Вісарыён Бялінскі, які меў жаданне працаўладкавацца ў Беларусі настаўнікам рускай мовы і ў сваёй методыцы яе выкладання ні разу не згадаў беларускай мовы, а пісаў толькі пра польскую мову мясцовых дзяцей, што пярэчыла рэчаіснасці.

У нейкай ступені можа падацца парадаксальным, але лепш зразумець шкоду русіфікацыі навучальнага працэсу і хоць штосьці на грамадскіх асновах рабіць па яе ўтаймаванні дапамагаў нашым патрыётам сам рух прагрэсіўных рускіх педагогаў за абмежаванне чужаземнага ўплыву на выхаванне і навучанне

дзяцей. У форме іх анямечвання і афранцужвання ён адчуваўся як у сем'ях, так і школах. Па заканчэнні іх многія дзеці больш пісьменнымі былі ў нямецкай, французскай мовах, чым у рускай. Чакаць ад такіх дзяцей вялікай карысці для рускага грамадства не даводзілася, таму яго перадавыя, нацыянальнай арыентацыі асобы вялі рашучае змаганне з такім непажаданым чужаземным уплывам на фарміраванне маладых пакаленняў рускага народа і вялі досыць паспяхова, бо мелі неабходную падтрымку ад свецкіх і духоўных уладаў. Экстрапаліруючы рускі досвед у галіне асветы на гэтую занядбаную сферу нашага краю, яго нацыянальнай арыентацыі, педагогі, культурныя дзеячы ўсяляк імкнуліся абмежаваць пранікненню ў яе (сферу) рускага пачатку. Якіх-небудзь хоць самых мінімальных зрухаў не мелася, бо ўсё гэта рабілася амтарскімі метадамі і да таго ж яшчэ сустракаючы моцнае супрацьдзеянне з боку ўладаў царскай Расіі, кіраўніцтва Свяцейшага сінода, якім бездакорна служыла мясцовая адміністрацыя. Больш за ўсё іх непакоілі спробы ўвядзення беларускай мовы ў навучальных установах, бо ў такіх варунках яны былі б не ў стане выконваць сваю галоўную функцыю па русіфікацыі маладой змены беларусаў.

І русіфікатарам, і праціўнікам русіфікацыі было ў каго вучыцца разуменню выключнай ролі роднай мовы ў жыцці чалавека. Пра гэта пісалі многія добра вядомыя ў свеце навукоўцы, а іншым разам нават і высокаэрудзіраваныя палітыкі. Крылатых выразаў пра значэнне роднай мовы хапала. А за колькі гадоў да паўстання 1863–1864 гг. іх плённа пачаў папаўняць заснавальнік рускай педагагічнай навукі і народнай школы ў Расіі Канстанцін Ушынскі (1824–1870). У пятым нумары «Журнала народного просвещения» за 1861 г. з'явіўся яго найвыдатны артыкул «Родное слово». Пазней ён каля 150 разоў перавыдаваўся паасобнай брашурай. Несумненна, з ім ужо і напачатку 1860-х гадоў былі знаёмы многія ў Беларусі, і асабліва працаўнікі асветы. Яны не маглі не звярнуць увагі на такія праўдзівыя словы гэтага таленавітага педагога-навукоўца: «Калі знікае народная мова, народа няма болей!»; «Пакуль жыве мова народная ў вуснах народа, да тае пары жыве і народ»; «Забярыце ў народа ўсё, і ён усё

можа вярнуць, але забярыце мову, і ён ніколі больш ужо не створыць яе; новую радзіму нават можа стварыць народ, але мовы – ніколі» [6, с. 110]. Прачытаўшы такое, не маглі не задумацца беларусы, бо родную мову гвалтам вырывалі з яго душы царскія сатрапы. Забыцца на яе ўсяляк дапамагалі сваім вернікам прысланыя з цэнтра рускія папы і іх аднадумцы з ліку мясцовых святароў. Ні разу не закінулі слова за беларускую мову і тутэйшыя палякі. І калі сфармаваная ў Беларусі за колькі гадоў да паўстання 1863–1864 гг. руская сістэма адукацыі не змагла істотным чынам здэнацыяналізаваць яе насельніцтва, дык гэта толькі дзякуючы сваёй слабаразвітасці. Паводле даных на 1860 г. на кожныя 10 тыс. сялян даводзілася толькі 19 вучняў [1, с. 172]. Да таго ж яшчэ за час вучобы іх нельга было як след напоўніць рускім духам. Вёска па-ранейшаму ладзіла свой быт паводле спрадвечных народных традыцый. Затое ў перспектыве руская школа магла прынесці сапраўдную катастрофу беларускаму народу, калі б ён спрэс стаў высокаадукаваным не ў сваёй мове і культуры, быў спаўна задураны сфальсіфікаванымі ведамі па гісторыі. Гэтага не маглі не разумець прагрэсіўныя, нацыянальнай арыентацыі колы беларускага грамадства і таму, рыхтуючы людзей да ўдзелу ў змаганні супраць царызму, стараліся патлумачыць ім пра вялікую шкоду для нашай Бацькаўшчыны дзяржаўнай русіфікатарскай палітыкі ў сферы адукацыі.

Нашаму народу, і найперш інтэлігенцыі, робіць вялікі гонар, што і ва ўмовах жорсткай палітыкі русіфікацыі, няспыннага змагання мясцовых палякаў за нацыянальную адукацыю, якія заўжды мелі ў гэтым неабходную падтрымку ад сваіх суродзічаў з этнічных польскіх земляў, з'яўляліся разумныя, смелыя асобы самых прагрэсіўных у той час поглядаў на праблему выхавання і навучання дзяцей. У поўнай меры такія погляды былі характэрныя грамадскаму дзеячу, педагогу з Навагрудчыны Ігнату Кулакоўскаму (1800–1870). У пасланай у 1834 г. у Санкт-Пецярбург на імя міністра асветы Расіі падрабязнай запісцы ён, справядліва даўшы суровую ацэнку злачынным дзеянням польскай шляхты і каталіцкага духавенства, накіраваным на паланізацыю беларускага народа, не збаяўся

заявіць, што ў складзе Расіі пагроза дэнацыяналізацыі яго яшчэ не адпала. Каб не дапусціць такой трагедыі, прапаноўваў «карэнным чынам змяніць змест выкладання гісторыі, літаратуры і мовы ў школах Беларусі». Жыхароў свайго краю ён назваў народнасцю, якая памірае, і, зразумела, меў на гэта рацыю, бо яе маладыя пакаленні навучаліся на чужой мове, не ведалі гісторыі роднага краю. Шмат чужога навязвалі дарослым людзям. У праваслаўнай царкве яны нават не мелі магчымасці да Бога звярнуцца на роднай мове. Самымі вялікімі праціўнікамі яе былі прысланыя з цэнтру папы. У час казанняў беларускую мову можна было пачуць толькі з вуснаў святароў, што перайшлі (найчасцей не па сваёй волі) з уніяцкай царквы ў праваслаўную.

Дапытлівыя людзі нашай зямлі бачылі і добра разумелі, што расійскія свецкія і духоўныя ўлады робяць на ёй усё, каб толькі адарваць беларусаў ад роднай мовы. Дасягнуць такой злачыннай мэты імкнуліся найперш праз усталяваную тут рускую сістэму асветы, што не магло не весці да росту праціўнікаў такой палітыкі. Акрамя катэгарычнага непрызнання самабытнасці роднай мовы карэннага насельніцтва заходніх губерняў, афіцыйнай палітыцы русіфікацыі ў сферы асветы было характэрна яшчэ і амаль поўнае адмаўленне наяўнасці ў беларусаў уласнай гісторыі. Дзецям пра яе стараліся зусім не згадваць, а калі і згадвалі, дык толькі штосьці другараднае. Іх прывучалі глядзець на рускую гісторыю як на сваё мінулае. Прагрэсіўных поглядаў настаўнікаў беларускага паходжання такое стаўленне да нацыянальнай гісторыі вельмі непакоіла, бо яны выдатна разумелі, што без ведання яе маладыя пакаленні ніколі па-сапраўднаму не палюбяць родны край, будуць абыякавымі да яго лёсу. Мо ніхто так смела не выказваў свайго клопату пра сур'ёзныя прагалы ў веданні айчыннай гісторыі, як Ігнат Кулакоўскі. У згаданым вышэй лісце да міністра асветы ён не збаяўся адзначыць, што ў літаратуры, падручніках мінулае беларускага народа «звычайна паглынута <...> гісторыяй палякаў *альбо ледзь упамінаецца ў гісторыі Расіі* (вылучана мною. – *Л. Л.*)» [5, с. 157].

Нанесеныя за 30–50-я гады XIX ст. дзяржаўнай русіфікатарскай палітыкай удары па польскім пачатку ў галіне асветы ўвесь час выклікалі незадавальненне такім курсам. Асабліва ўзмоцнілася яно ў сувязі з заменай настаўнікаў польскага паходжання каталіцкага веравызнання прысланымі з іншых раёнаў Расіі педагагічнымі кадрамі. У гэтай яўна пройгрышнай для прыхільнікаў польскай адукацыі ў Беларусі сітуацыі некаторыя з іх усё ж пачалі шукаць шляхі збліжэння з тымі, хто яшчэ не адмовіўся ад думкі мець нацыянальную сістэму ўзгадавання дзяцей карэннага, г. зн. беларускага насельніцтва. Да іх, несумненна, не мог не належаць чалавек, які моцна любіў свой край, сапраўдны беларускі патрыёт Кастусь Каліноўскі. Нягледзячы на малады ўзрост, у яго хапіла розуму ўбачыць усю шкоду зрусіфікаванай сістэмы народнай асветы для лёсу беларускага народа. Як высокаэрудзіраваная для свайго часу асоба, К. Каліноўскі не мог не чытаць часопіса «Журнал народного просвещения». Выдаваўся ён вялікім накладам, карыстаўся шырокім попытам сярод адукаваных людзей. Змешчаны ў ім артыкул К. Ушынскага «Роднае слова» абавязкова павінен быў прыцягнуць да сябе ўвагу К. Каліноўскага. Такое маем права сказаць і пра многіх яго паплечнікаў. І хаця яны і без прачытання названага артыкула мелі глыбокія ўяўленні пра ролю роднай мовы ў развіцці дзяцей, азнаямленне з ім яшчэ больш пераканала, што руская сістэма адукацыі з яе адмаўленнем усяго беларускага нясе толькі адну бяду ў наш край.

Будучы кіраўнік паўстання не мог не разумець, што гэтаму краю зусім не патрэбна і польская адукацыя. Аднак будучы цалкам залежным ад кіраўнікоў паўстання ў Варшаве, ён ні да, ні ў час яго адкрыта не выступаў супраць новых спробаў паланізацыі народнай асветы ў Беларусі, а толькі ўсяляк крытыкаваў намеры царскіх уладаў замацаваць тут рускі пачатак, каб не даць яе маладым пакаленням адчуць сябе прадстаўнікамі самабытнага народа, не падобнага да рускіх, да чаго так настойліва імкнуліся свецкія і духоўныя ўлады імперыі.

У непрызнанні аніякай каштоўнасці школ у чужой мове пераконваюць нас не такія ўжо і рэдкія факты выступлення, крытычных выказванняў прагрэсіўна настроеных людзей нашага

краю датычна навязанай яму царызмам сістэмы адукацыі. Яе непрызнанне ўтрымліваецца і ў такіх афарыстычных словах самога К. Каліноўскага: «Нельга есці хлеб народа і грэбаваць ягонай мовай». А ў той час хлеба беларускага – дый не толькі – нямала перападала царскай Расіі. Яе ўлады не стрымлівалі сябе ў жорсткай эксплуатацыі не гэтак даўно далучанага да імперыі насельніцтва.

Звязанае з рускамоўным навучаннем у школе зло так глыбока разумелася К. Каліноўскім, што нават у сваім перадсмяротным пасланні да беларускага народа «Лісты з-пад шыбеніцы» выказаў гнеўны пратэст, што і ў яго родным краі царызм засноўвае маскоўскія школы, у якіх вучаць па-маскальску і ў іх «з другога канца свету маскалёў пасылаюць». Як і астатнія змагары за школу на роднай мове, правадыр нацыянальна-вызвольнага паўстання добра разумеў, што толькі ў такім выпадку яна будзе працаваць на карысць народа. У гэтым нас пераконваюць наступныя словы: «Но як дзень з ноччу не ходзяць разам, так не ідзе разам навука (маюцца на ўвазе асвета, адукацыя. – *Л. Л.*) праўдзіва з няволяй маскоўскай (ужыта ў значэнні рускай. – *Л. Л.*). Дапокуль яна ў нас будзе, у нас нічога не будзе, не будзе праўды, багацця і ніякай навукі, – адно намі як скацінай варочаць будуць не для дабра, но на пагібель нашу».

Па-добраму здзіўляе празорлівасць К. Каліноўскага. Панаванне навязанай царызмам беларускаму народу рускамоўнай адукацыі і сапраўды нічога добрага не прынесла яму. Да канца існавання Расійскай імперыі ў нас так і не сфармавалася такая важная для кожнага грамадства катэгорыя людзей, як інтэлігенцыя. Каб належаць да яе, трэба было абавязкова пакінуць родны край і падацца на вучобу за яго межы, найчасцей у Санкт-Пецярбург, Маскву, Варшаву, Кіеў і іншыя гарады. Пасля заканчэння вучобы, як правіла, выхадцаў з Беларусі пасылалі не на Радзіму, а ў розныя гарады імперыі. Таму, калі ў Беларусі ўсё ж і складвалася інтэлігенцыя, яе ў этнічным плане ніяк нельга было назваць нацыянальнай.

З прагрэсіўнымі думкамі датычна ролі нацыянальнай школы многія маглі пазнаёміцца з публікацыяй выдаванай К. Каліноўскім супольна са сваімі паплечнікамі газеты «Мужыцкая

праўда». У яе чацвёртым нумары сустракаем такія словы: «У нас Дзяцюкі адно учаць у школах каб ты знаў чытаці па-маскоўску, а то для таго каб цябе зусім перэрабілі на маскаля». Стаць маскалём не было жадання не толькі ў беларусаў, але і ў мясцовых палякаў. Такой этнічнай трансфармацыі не жадалі для сябе яўрэі, татары, літоўцы і іншыя, акрамя рускіх, прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў нашага краю. Насуперак задумам русіфікатараў гвалтоўнае навязванне рускага духу праз адукацыю стала вяло да памнажэння ліку прыхільнікаў усяго нацыянальнага ў ёй. Неабходна адзначыць, што ўжо і ў той час у Беларусі мелася нямала высокаадукаваных людзей, для якіх не з'яўлялася сакрэтам, што толькі пабудаваная на ўласнай культурна-моўнай аснове школа можа забяспечыць сапраўдны духоўны росквіт народа, надзейна захаваць яго ад усіх формаў асіміляцыі. Належным чынам зразумець усё гэта ў многім дапамагаў сусветны досвед. Пра вырашальную ролю нацыянальнай адукацыі ў лёсе народа пісалася нямала ў навуковай і найперш у педагагічнай літаратуры, што не з'яўлялася сакрэтам і для многіх адукаваных людзей нашага краю, цесна знітаваных з яго культурай, звычаямі. Такія людзі ніяк не маглі змірыцца з русіфікацыяй асветы, чым так актыўна займаўся царскі чыноўніцкі апарат, прысланыя настаўнікі, праваслаўныя папы. Яны, дарэчы, зусім не памыляліся, што дзеля дасягнення пастаўленай перад сабой злачыннай мэты русіфікацыі карэннага насельніцтва нашага краю выбралі адукацыю. Лепшага за яе сродку культурна-моўнай асіміляцыі беларусаў на той час не існавала. Не існуе яго і сёння, што вельмі добра разумеюць сучасныя палітыкі, кіраўнічае ядро сферы адукацыі Рэспублікі Беларусь. Тут яскрава прасочваецца паралель паміж дзвюма досыць аддаленымі эпохамі: Каліноўскага і сучаснай. Прынцыповая розніца заключаецца ў тым, што тады шкоду зрусіфікаванай сістэмы адукацыі не толькі разумелі, але і ў меру сваіх сіл і магчымасцяў змагаліся з гэтым вялікім злом, а сёння разумеюць і спрэс бяздзейнічаюць, а то і ўхваляюць, апраўдваюць яе.

Удзел даволі значнай колькасці людзей у паўстанні 1863–1864 гг. быў выкліканы многімі прычынамі. Не баюся памыліцца, сказаўшы, што адной з іх, несумненна, з'яўлялася і анты-

нацыянальная палітыка царызму ў сферы адукацыі. Супрацьстаяць такой палітыцы было б зусім безвынікова праз пасланне петыцый на імя цара. Цалкам справядліва, што многія прыхільнікі, непасрэдныя ўдзельнікі паўстання 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі і Літве глядзелі на яго ў выніку перамогі як на адзіны надзейны сродак аднаўлення, пабудовы сапраўднай нацыянальнай сістэмы адукацыі. Гэтая высакародная мэта, на вялікае няшчасце беларускага народа, тады не спраўдзілася. Не стала яна рэальнасцю і ў нашыя дні. Радуе толькі, што ў нас не да канца перавяліся людзі, якія ў стварэнні нацыянальнай сістэмы адукацыі бачаць шчаслівую будучыню беларускага народа і самааддана працуюць над дасягненнем гэтай мэты.

Літаратура

1. Антология педагогической мысли Белорусской ССР. – М.: Педагогика, 1986. – 486 с.
2. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г. – Мінск: Народ. асвета, 1985. – 463 с.
3. *Кірэеў, В. Р.* Базыльянскія школы / В. Р. Кірэеў // Энцыкл. гіст. Беларусі. – Т. 1. – Мінск: Беларус. энцыкл., 1993. – С. 280–281.
4. Навіны Беларускай акадэміі. – 1992. – 7 лют.
5. Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. – Мінск: Народ. асвета, 1968. – 624 с.
6. *Ушинский, К. Д.* Педагогические сочинения: в 6 т. – М.: Педагогика, 1988. – Т. 2. – 492 с.

Резюме

Л. М. ЛЫЧ

АНТИНАЦИОНАЛЬНАЯ ПОЛИТИКА ЦАРИЗМА В ОБЛАСТИ НАРОДНОГО ОБРАЗОВАНИЯ КАК ОДНА ИЗ ПРИЧИН ВОССТАНИЯ 1863–1864 ГОДОВ

Участие большого количества людей в восстании 1863–1864 гг. в Польше, Беларуси и Литве было вызвано многими причинами. Одной из них, несомненно, являлась антинациональная политика в области народного образования. Противостоять ей через пассивные формы борьбы было бы совершенно безрезультатно. Понимая это, многие участники восстания 1863–1864 гг. видели в нем единственно действенное и надежное средство построения

по-настоящему национальной системы образования. В своем предсмертном послании к белорусскому народу «Лісты з-пад шыбеніцы» Кастусь Калиновский высказал гневный протест, что в его родном крае царизм основывает русские школы, в которых детей учат только по-русски. К сожалению, эта высокородная цель, на беду белорусского народа, так и не была осуществлена.

Summary

L. LYCH

ANTINATIONAL TSARIST POLICY IN THE FIELD OF PUBLIC EDUCATION AS ONE OF THE CAUSES OF THE REVOLT 1863–1864

Participation of a large number of people in revolt 1863–1864 in Poland, Belarus and Lithuania was due to many reasons. One of them was undoubtedly the antinational policy in the field of public education. Confront her through passive forms of struggle would be completely ineffectual. Realizing it, many participants in the revolt 1863–1864 saw it as the only effective and reliable means of building a truly national system of education. In his dying message to the Belarusian people «Letters from under the gallows» Castus Kalinowski expressed outcry that in his native land tsarism bases russian schools, in which children are taught only in russian. Unfortunately, this high-born goal, unfortunately the Belarusian people, was not implemented.

Паступіў у рэдакцыю 24.12.2013

УДК 344.3:93/94 (476.6)

А. Р. РАДЗЮК

ДЗЕЙНАСЦЬ СЛЕДЧЫХ І СУДОВЫХ КАМІСІЙ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1863–1867 гг. (НА ПРЫКЛАДЗЕ ГРОДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ)

Матэрыялы следчых спраў да сённяшняга дня з'яўляюцца асноўнай крыніцай па гісторыі паўстання 1863 г. на тэрыторыі Беларусі. Разам з тым да гэтага часу дзейнасць саміх следчых камісій не з'яўлялася прадметам адмысловага даследавання з боку айчынных ці замежных гісторыкаў. Дадзеным артыкулам мы паспрабуем запоўніць існуючы прабел.

Узнікненне падобных органаў папярэдняга следства над паўстанцамі было выклікана пачаткам узброенай барацьбы на тэрыторыі суседняга Каралеўства Польскага. Напужаны магчымасцю распаўсюджвання паўстання на беларуска-літоўскіх землях, царызм распачаў шэраг прывентыўных захадаў. Згодна з рэскрыптам Аляксандра II ад 14 студзеня 1863 г. віленскі генерал-губернатар атрымаў права «для выкрыцця ступені віны іншых асоб <...> заснаваць па прызначэнні Вашым камісіі» [39, арк. 3]. Літаральна праз некалькі дзён распараджэннем У. Назімава ад 18 студзеня першыя падобныя калегіяльныя органы былі ўтвораныя ў Гродне і Беластоку [21, арк. 3].

Досыць складана вызначыць дакладны час і асабісты склад большасці ваенна-следчых камісій. Справа ў тым, што гэтыя органы ўтвараліся пры пэўных вайсковых фарміраваннях царскай арміі. Перадыслакацыя войскаў звычайна прыводзіла да закрыцця старога складу камісіі і адкрыцця новага. Напрыклад, заснаваны ў Слоніме 30 ліпеня 1863 г. падобны орган быў адкрыты пры стараінгерманландскім палку, а вясной 1864 г. дзейнічала ўжо камісія пры пензенскім пяхотным палку [26, арк. 106; 42, арк. 18].

Ваенна-следчыя органы былі заснаваны ва ўсіх павятовых гарадах губерні. Асноўнай іх задачай было «поўнае выкрыццё затрыманых зламыснікаў» [20, арк. 123]. Прававая падстава дзейнасці камісій была вызначана інструкцыяй М. Мураўёва ад 11 мая 1863 г. У адпаведнасці з ёй усе асобы, у залежнасці ад ступені свайго ўдзелу ці аказання дапамогі паўстанню, падзяляліся на пяць асноўных катэгорый. Інструкцыя вызначала ступень адказнасці абвінавачанага з улікам яго сацыяльнага статусу ці ўзроставай прыналежнасці [5, с. 211–214]. Такім чынам, да галоўных прэрагатываў камісій адносілася правядзенне папярэдняга следства з мэтай вызначэння вінаватасці/невінаватасці таго ці іншага чалавека, кваліфікацыя яго дзеянняў шляхам аднясення да аднаго з пяці разрадаў.

Ваенна-следчыя камісіі складаліся пераважна з афіцэраў і ўнтэр-афіцэраў дзеючай арміі. Старшыня (у дакументах таксама сустракаецца тэрмін «прэзус») звычайна меў званне маёра альбо штабс-капітана. З гэтага правіла былі свае выключэнні. Напрыклад, у Гродне пэўны час падобныя абавязкі выконвалі жандарскі штаб-афіцэр Лялякаў і саветнік мясцовай казённай палаты Злобін.

Акрамя вайсковых чыноў, у складзе некаторых камісій сустракаюцца цывільныя асобы, якія маглі з'яўляцца як іх сябрамі, так і выконваць іншыя функцыі, напрыклад, справавода альбо аўдытара. У абавязкі апошняга ўваходзіла зняцце паказанняў з абвінавачаных. Можна меркаваць, што частка гэтых чыноўнікаў, якія не адносіліся да вайсковага ведамства, таксама выкарыстоўвалася ў якасці перакладчыкаў. Так, у адной з гродзенскіх камісій гэтую функцыю выконваў справавод Ляцэвіч (ветэрынар па адукацыі), а пасля настаўнік гродзенскага духоўнага вучылішча Гіжэўскі. Да працы ў іншай актыўна прыцягваўся мясцовы казённы равін Гілель Рываш. Як вынікае з афіцыйных дакументаў і ўспамінаў удзельнікаў тых падзей, яго роля не абмяжоўвалася выключна прадпісанымі яму абавязкамі. Ён вельмі актыўна ўмешваўся і ўплываў на ход следства [7, р. 156; 29, арк. 15; 30].

Падобныя камісіі падпарадкоўваліся мясцовым ваенна-павятовым начальнікам. Як падкрэслівалася ў адным з прадпісанняў М. Мураўёва, «заснаваныя ў паветах Камісіі, як прызначаныя ў дапамогу Ваенным Начальнікам <...> павінны знаходзіцца ў непасрэдным падпарадкаванні Ваенных Начальнікаў» [5, с. 338; 46, арк. 346]. Гэты залежны стан выяўляўся ўжо ў тым, што ваенны начальнік прызначаў старшыню следчага органа, па сваім жаданні фарміраваў яго асабісты склад. У якасці ілюстрацыі можна прывесці прыклад бельскага ваеннага камандзіра І. Барэйшы, які замяніў старшыню камісіі на «чалавека з рускай душой і глыбокай адданасцю ўраду», ці яго калегі Беклямішава, які цалкам змяніў склад камісіі ў Беластоку [35, арк. 18, 39, 52].

Акрамя таго, многія павятовыя ваенныя начальнікі здзяйснялі папярэдні допыт падазроных асоб. Некаторыя з іх прымалі непасрэдны ўдзел у працы камісій. Напрыклад, пружанскі павятовы начальнік Эліс скардзіўся, што «затрыманы ў горадзе намножанымі справамі (камісіі. – *А. Р.*), я не магу бываць у павеце» [20, арк. 154]. Ад той пазіцыі, якую займаў вайсковы камандзір у адносінах да падследчага, шмат у чым залежыў далейшы лёс апошняга. Гэта было выклікана тым, што ўсе справы пасля завяршэння іх вытворчасці прадстаўлялі на меркаванне гэтых асоб. Акрамя таго, ён мог падчас заканчэння следства і перадачы яго ў іншыя, вышэйшыя органы, прадставіць сваю асабістую думку з прапановай, напрыклад, улічыць некаторыя абставіны пры вынясенні канчатковага вердыкту. У яго кампетэнцыі знаходзілася і такая далікатная справа, як вызначэнне «паўнаты пакаяння», з якой паўстанец звяртаўся да расійскіх уладаў [16, арк. 22, 28; 45, арк. 60].

Звычайна следчы працэс пачынаўся з папярэдняга допыту. У некаторых выпадках, калі арыштаваная асоба была пісьменнай, ёй давалася магчымасць выкласці свае сведчанні на паперы самастойна, у камеры. Прыкладна з ліпеня 1863 г. апытанне затрыманых незалежна ад месца іх знаходжання вялося па адной універсальнай форме, што была зацверджана віленскім генерал-губернатарам. У першую чаргу цікавілі такія пытанні, як: хто быў кіраўніком партызанскага фарма-

вання, хто з ліку ксяндзоў, памешчыкаў і шляхты пастаўляў правіянт і іншыя рэчы, выконваў функцыі праваднікоў, дзе схавана зброя [3; 5, с. 122].

Следства звяртала ўвагу на ўсе акалічнасці, непасрэдна звязаныя з удзелам падследчага ў паўстанні. Менавіта гэтыя сведчанні на сённяшні дзень з'яўляюцца асноўнай крыніцай па гісторыі паўстанцкага руху на землях Беларусі. Хацелася б звярнуць увагу на неабходнасць крытычнага стаўлення да падобнага тыпу дакументаў. Справа ў тым, што паўстанцы на допытах імкнуліся любымі сродкамі пазбегнуць пакарання, а таксама абгаворвання знаёмых ці блізкіх ім асоб, і таму прыведзеныя імі звесткі ў большасці выпадкаў былі, мякка кажучы, няшчырымі і няпоўнымі. Чаго варты хаця б той факт, што ледзь не 99 % з іх сцвярджала, што трапілі ў паўстанцкія атрады прымусова, супраць сваёй волі, пад пагрозай уласнаму жыццю. Падобныя паведамленні былі характэрны нават для камандзіраў гэтых фармаванняў, іх памочнікаў, кіраўнікоў мясцовых рэвалюцыйных арганізацый. Аб тым, што такая запіральніцкая тактыка паводзінаў на допытах была досыць шырока распаўсюджана, пацвярджае і мемуарная літаратура. Напрыклад, былы паўстанец А. Ягмін узгадвае, што як толькі ён трапіў у гродзенскі астрог, то сустрэў тут шмат сваіх знаёмых, якія параілі яму на ўсе пытанні адносна яго ўдзелу ў паўстанні адказваць «не ведаю» і «звальваць віну на памерлых і тых, хто ўцёк за мяжу» [6, с. 720]. Аналіз адпаведных спраў розных камісій пацвярджае той факт, што пераважная большасць паўстанцаў прытрымлівалася менавіта падобнай тактыкі.

Калі-нікалі матэрыялы следства даюць рэдкую магчымасць прасачыць эвалюцыю паводзінаў той ці іншай асобы на следстве. Яскравым прыкладам у гэтым выпадку з'яўляецца справа доктара Аляксандра Акінчыца, вядомага сваімі смелымі ўцёкамі з сібірскай ссылкі разам з Зыгмундам Мінейкам. На сваім першым допыце Аляксандр зазначыў, што адправіўся ў паўстанцкі атрад па прадпісанні рэвалюцыйнага камітэта, матывуючы свой учынак тым, што «была ідэя, такая распаўсюджаная і такая даўняя вызвалення сваёй айчыны <...>, і я, як чалавек, на якога

больш чым на каго іншага маглі быць скіраваны позіркі іншых, палічыў неабходным прыняць удзел у падобных дзеяннях». Але ў далейшым, пэўна пад уплывам «прафілактычнай» апрацоўкі калег па няшчасці, Акінчыц кардынальна мяняе сваю пазіцыю. Раптам яму прыгадалася, што ліст варшаўскага камітэта «быў напоўнены мацнейшымі пагрозамі» ў яго адрас, а свае ранейшыя сведчанні ён нібыта даваў «не па перакананні, а ў (стане) нейкай ашалеласці і амаль што несвядомым стане духу» [22, арк. 3, 7, 25].

Пасля зняцця папярэдняга допыту прымалася рашэнне аб пачатку фармальнага следства супраць абвінавачанага. У рэчаіснасці да пачатку следчых мерапрыемстваў мінаў пэўны адрэзак часу. Гэта было звязана з тым, што ў 1863–1864 гг. падобныя органы былі надзвычай перагружаны. Паводле афіцыйных крыніцах, колькасць «падсудных палітычных арыштантаў» у гэты час дасягала: у Бельску 500–800 чал., Беластоку – больш за 600, Пружанах – каля 200, Гродне – 500–600 [14, арк. 22, 64; 19, арк. 23; 35, арк. 2, 9]. У падобнай сітуацыі ўлады бачылі выйсце ў павелічэнні колькаснага складу або ва ўтварэнні дадатковых следчых органаў. Так, у першай палове 1863 г. была ўтворана другая камісія ў Гродне, пазней іх колькасць падвоілася ў Бельску і Беластоку [44, арк. 57, 58].

Увесь час пасля свайго арышту абвінавачаныя ў большасці выпадкаў праводзілі за кратамі. Недахоп месцаў у турмах прыводзіў да таго, што падследчых пасля зняцця з іх папярэдняга допыту адпускалі на парукі. Такая з'ява была характэрна для Бельска, дзе яна набыла сапраўды масавы характар. Падобная практыка мела месца і ў іншых мясцовасцях, у тым ліку ў Гродне [9, арк. 169; 20, арк. 155; 40, арк. 234].

Парушэнні і памылкі ў арганізацыі следства над паўстанцамі былі распаўсюджаны на ўсіх яго этапах. Гэта тычылася і тэрмінаў яго вядзення. Даволі распаўсюджанымі былі выпадкі, калі справа таго ці іншага падследчага недзе гублялася, а на людзей па просту забываліся [9, арк. 224; 33, арк. 131–132; 35, арк. 19]. Падобная праблема працяглага справаводства была ўласціва не толькі Гродзенскай губерні. У рапарце палкоўніка корпуса

жандараў Лосева на падставе аналізу работы следчых камісій Мінскай губерні адзначалася, што «некаторыя справы знаходзяцца ў вытворчасці больш за год і не завяршаюцца» [38, арк. 4].

Яшчэ адной праблемай з'яўлялася адсутнасць у пэўнай часткі арыштантаў дакладных ведаў ці нават здагадак аб тым, за што яны трапілі за краты. Як сведчаць успаміны правялебнага Андарсана, не давалі адказу на гэтыя пытанні нават першыя выклікі на следства [7, р. 143]. Ды і самі ўлады ў некаторых выпадках не маглі разабрацца, за што тыя ці іншыя людзі трапілі пад арышт. У Беластоку, напрыклад, пры адкрыцці камісіі новага складу выявілася значная колькасць асоб арыштаваных у сакавіку і красавіку месяцы без усялякіх абвінаваўчых звестак (да 70 чалавек). Падчас наведвання гэтага горада ў снежні 1863 г. гродзенскі губернатар І. Скварцоў «знайшоў» яшчэ 15 падобных небарак, якія былі, з іх слоў, схоплены казакамі ў розных мясцовасцях яшчэ ў красавіку–маі і дастаўлены ў Беласток без аніякіх пісьмовых пасведчанняў» [35, арк. 14, 15].

Непасрэдна само следства распачыналася праз некалькі дзён (ці месяцаў) пасля арышту. Абвінавачаны выклікаўся ў камісію, дзе яму прапаноўвалі адказаць на апытальныя пункты ці пісьмова пацвердзіць тыя сведчанні, якія ён даваў раней, пры сваім затрыманні. Калі асоба была непісьменнай, то замест свайго імя яна ставіла на паперы тры крыжыкі, а за яе распісваўся нехта з прысутных на допыце вайскоўцаў. Праз некаторы час падследчага маглі зноў выклікаць да суддзяў дзеля ўдакладнення тых ці іншых момантаў, што найбольш цікавілі ўлады.

Паколькі большасць з апытаных адмаўлялася ад супрацоўніцтва са следствам, камісіі выкарыстоўвалі цэлы арсенал разнастайных прыёмаў і метадаў. Найбольш распаўсюджаным і эфектыўным спосабам праверкі сведчанняў была вочная стаўка. Вось як, напрыклад, выглядала падобная працэдура ў адносінах да паўстанца Сцяпана Твароўскага: «Васілеўскі і Дамажэцкі, Каралаў і Крацюк гледзячы ў вочы Твароўскаму выкрывалі, што ён запісваў людзей, што прыходзілі ў банду. <...> Твароўскі на гэты доказ пагадзіўся» [3, с. 32]. Тут, праўда,

можа ўзнікнуць пытанне наконт інфармаванасці саміх улад: адкуль яны ведалі, якіх сведак выклікаць у кожным канкрэтным выпадку? Справа ў тым, што па загадзе М. Мураўёва ў следчых органах былі заведзены «Алфавітныя кнігі», куды ўпісваліся імёны ўсіх тых, каго абвінавачаныя абгаворвалі падчас іх допытаў. Такім чынам улады атрымалі магчымасць верыфікацыі звестак падследчых, пашырэння абвінавачвальных матэрыялаў супраць іх, ініцыянавання новых спраў у адносінах да тых асоб, чые прозвішчы найбольш часта сустракаліся падчас допытаў. Пры гэтым факт адмовы называць імёны тых, хто знаходзіўся ў атрадзе ці пастаўляў туды нейкія прыпасы, лічыўся прыкметай упартай зацятасці абвінавачанага і прыводзіў да абцяжарвання ступені яго віны [24, арк. 25–26].

У арсенале камісій былі і іншыя метады, напрыклад, пераструсы па месцы жыхарства падследчага, якія давалі дадатковы кампраметуючы матэрыял. Класічным прыкладам з'яўляецца выпадак Напалеона Орды, калі пасля правядзення пільнага агляду яго сядзібы ў Варацэвічах да першапачатковых абвінавачанняў дадаліся яшчэ тры: захоўванне пораху, папер «крамольнага» характару, а таксама дазвол на далучэнне да паўстання свайму сыну Вітольду, які быў знойдзены пільнымі шпікамі ў змесце аднаго з лістоў [12, арк. 98]. Выкарыстоўваліся ў следчым працэсе і дасягненні тагачаснага тэхнічнага прагрэсу, калі ідэнтыфікацыя асоб праводзілася па фатаграфічных здымках [18, арк. 194 а, 194 б; 40, арк. 174].

Следчы працэс у камісіях ажыццяўляўся ў рамках разгляду асобных спраў, але ў большасці выпадкаў яны не былі індывідуальныя. Гэта азначае, што ў межах адной справы следства магло весціся адначасова супраць некалькіх асоб. Паводле статыстычных звестак камісій Гродзенскай губерні ў 1863 г., адна справа ў сярэднім аб'ядноўвала 2–3 асобы [41, арк. 32–35]. Сустракаюцца выпадкі, калі «адным махам» следства праводзілася па 7–8 і болей абвінавачаных. Часцей за ўсё справы падследчых змяшчаліся разам у рамках аднаго разбіральніцтва адвольна ці па храналагічным прынцыпе. Вось што на гэты конт зазначаў М. Мураўёў у сваёй вымове двум беластоцкім следчым

органам: «... гэтыя камісіі часта злучаюць для вытворчасці ў адную справу розныя абвінавачанні на розных асоб, якія толькі арыштаваны ў адзін час ці па сведчаннях аднаго начальніка...» [35, арк. 3]. Дадатковай нагрузкай на работу гэтых органаў у г. Гродне лёг абавязак па вырашэнні лёсаў паўстанцаў з суседняй Аўгустоўскай губерні (Ломжынскага павета), колькасць якіх у адным з гродзенскіх астрогаў у пэўны час дасягала амаль што 200 чалавек [40, арк. 255].

Што тычыцца эфектыўнасці работы следчых органаў, то яна таксама не была аднолькавай на працягу ўсяго часу іх існавання і залежыла ад мноства аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў. Напрыклад, у рабоце адной з гродзенскіх камісій гэты паказчык вагаўся ад 1 да 19 вырашаных спраў за тыдзень. Адначасова ў справаводстве тут магло знаходзіцца да 70 і болей следчых разбіральніцтваў [43, арк. 2–84]. Інакш складваліся справы ў ваўкавыскай камісіі: за перыяд з ліпеня 1863 па чэрвень 1864 г. ім штомесяц прадстаўлялася да 12 спраў [19, арк. 142].

Дзейнасць следчых органаў не абмяжоўвалася выключна разглядам спраў супраць былых паўстанцаў і іх памагатых. У некаторых выпадках яны праводзілі разбіральніцтва па нейкім эпізодзе з мэтай выяўлення і далейшага пакарання датычных да яго людзей. Гэта магло быць звязана са знаходжаннем зброі ці боепрыпасаў, нелегальнай літаратуры, друкарскіх шрыфтоў. Асобнае месца займалі вышукныя мерапрыемствы, звязаныя з раскрыццём мясцовых рэвалюцыйных арганізацый. Аб той ролі, якую надавалі царскія ўлады выкрыццю тайных паўстанцкіх структур, сведчыць факт камандзіроўкі старшыні адной з гродзенскіх камісій палкоўніка Устругава ў Брэст з мэтай правядзення мясцовага дазнання па гэтым пытанні [40, арк. 319]. На падставе падобнай вышукной дзейнасці Устругавым складаліся падрабязныя аналітычныя нататкі, якімі па сённяшні дзень карыстаюцца даследчыкі.

Аб якасным крытэрыі работы следчых камісій сведчыць той факт, што многія справы пасля іх завяршэння і прадстаўлення далей па інстанцыях вярталіся адпаведнымі органамі на дапрацоўку. У рапартах і прадпісаннях губернатара, генерал-

губернатара і розных рэвізораў неаднаразова сустракаюцца заўвагі, што справаводства ў камісіях вядзецца неахайна, не згодна з прынятымі формамі. Часцяком у гэтых дакументах робіцца акцэнт на непрафесіяналізм і бяздзейнасць суддзяў: «...камісія пры маім папярэдніку была да такой ступені неахайная і негрунтоўна вяла справы <...> што я па прыбыцці ў г. Беласток вымушаны быў закрыць камісію», – скардзіўся мясцовы ваенны начальнік. І далей: «... дзесяць спраў знітаваных у адзін сшытак былі знойдзены закінутымі на печцы <...> арыштанты трымаюцца па некалькі месяцаў без усялякіх абвінавачвальных актаў» [35, арк. 18, 19].

Хацелася б звярнуць увагу на тыя метады, якімі здабываліся звесткі ад абвінавачаных. Нават афіцыйнае справаводства не здолела схаваць той факт, што некаторых падследчых у г. Бельску збівалі бізуном, прымушаючы падпісваць чысты аркуш паперы, які пасля запаўняўся вайскоўцамі [46, арк. 894]. Аб тым, што катаванні вязняў адбываліся не толькі ў Бельску, сведчаць успаміны розных асоб. Доктар Аляксандр Акінчыц узгадвае аб следчых маёры Крамнёве і яго памочніку Дамажыраве, якія выбівалі прызнанні пры дапамозе нагайкі [8]. Друкуючы свае нататкі ў афіцыйным «Историческом вестнике», А. Ягмін нават у пытанні, што задаў яму старшыня следчай камісіі, адчуў пагрозу «выпытвання прызнання з дапамогай пугі, аб чым я чуў ад іншых» [6, с. 720]. Людвік Акінчыц, стрыечны брат Аляксандра, пасля некалькіх выклікаў у гродзенскую следчую камісію зрабіў спробу атруціцца. Пасля свой учынак ён тлумачыў такім чынам: «Атруту я прыняў, жадаючы пазбавіцца пагроз, лаянкі і біцця, якія я дазнаў і на якія я спадзяваўся» [34, арк. 5].

Разглядаючы дзейнасць следчых камісій, нельга не закрануць такую далікатную тэму, як праблема даносаў. Асабліва востра яна паўстала ў 1864 г., калі асноўная маса непасрэдных удзельнікаў паўстання была ўжо ўзорна пакарана, а ў краі запанавалі новыя парадкі. І калі ў справаводстве саміх следчых органаў падобныя факты адсачыць досыць складана, то некаторае святло на гэтае пытанне праліваюць рапарты правяраючых асоб. Характарызуючы становішча, што склалася на тэрыторыі

Гродзенскай губерні, маёр фон Брадке ў кастрычніку 1864 г. адзначаў: «... праехаўшы гарады Ваўкавыск, Пружаны, Кобрын і знаходзячыся зараз у Брэсце, заўважаў, што *даносы з боку сялян ператварыліся ў прафесію* (вылучана мной. – *А. Р.*)» [10, арк. 48].

З лета 1864 г. асноўнымі ініцыятарамі новых спраў выступалі жандарскія ніжэйшыя чыны, заснаваныя па ініцыятыве М. Мураўёва ў студзені 1864 г. дзеля «ўзмацнення сродкаў адміністрацыі і для назірання ў паветах». Яны не толькі тэрарызавалі маёмасны клас пагрозамі, але насуперак існуючым правілам спрабавалі актыўна ўмешвацца ў следчы працэс камісій [9, арк. 119, 167; 23, арк. 2, 3; 27, арк. 1]. Адчуўшы змены ў той сацыяльнай палітыцы, якую праводзіла адміністрацыя віленскага генерал-губернатара, некаторыя сяляне вырашылі скарыстаць момант для расправы са сваімі былымі панамі і эксплуатарамі. Падобнае засведчылі рэвізоры адносна памешчыка Целяцінскага, які трапіў у турму «з ласкі» сваіх былых прыгонных па даносе сялян, за тое, што не саступіў ім частку лугавой зямлі, якую яны ў яго прасілі [9, арк. 47].

Не стаялі ў баку ад гэтага працэсу і яўрэі. Павятовы начальнік Эліс зазначаў, што ў Пружанах «многія асобы арыштаваны з прычыны толькі даноса яўрэяў, часта нічым не пацверджанага» [20, арк. 155]. Факты высылкі асоб з краю па сведчаннях выключна яўрэйскага насельніцтва пацвярджаюць ваенна-судовыя справы.

Вяртаючыся непасрэдна да дзейнасці ваенна-следчых камісій, хацелася б нагадаць, што гэта былі органы папярэдняга судова-следчага працэсу. Асноўнай іх задачай было на падставе наяўнай доказнай і існуючай заканадаўчай базы прыняць рашэння аб вінаватасці ці невінаватасці той або іншай асобы. Незалежна ад таго, якая пастанова прымалася на гэтым этапе, справа ў далейшым паступала на разгляд мясцовага ваеннага начальніка ці губернатара (які таксама з'яўляўся вайсковым начальнікам губерні). Зыходзячы з заключэння камісіі, вайсковыя камандзіры прымалі рашэнне аб вызваленні абвінавачанага і спыненні следчага працэсу супраць яго [40, арк. 24, 28, 30], або справа накіроўвалася далей па інстанцыях. Але і пры гэтым

сцэнарыі ваенна-следчыя органы маглі істотна паўплываць на далейшы лёс падсуднага, указаўшы ў заключным акце прапанову перадаць такую асобу ваеннаму суду або прыняць супраць яго іншыя меры [24, арк. 27; 34, арк. 9].

Больш за тое, у адпаведнасці з тым жа дакументам і яго дапаўненнямі, падсудныя непрывілеяваных станаў, аднесеныя следчымі камісіямі да 3-й і 4-й катэгорый «віны», вызваляліся ад далейшага разгляду іх спраў ваенным судом і тым самым яшчэ ад адной магчымасці давесці сваю невінаватасць. Падобных асоб прадпісвалася высылаць адразу, у адміністратыўным парадку ў Пскоў ці Маскву для далейшага размеркавання іх па прызначэнні Міністэрства ўнутраных спраў [21, арк. 7]. Так, толькі па канфірмацыях гродзенскага губернатара ў перыяд з 1 мая 1863 да 1 студзеня 1865 г. з тэрыторыі Гродзенскай губ. падобным чынам было выслана 1 152 чалавекі ніжэйшага стану (з іх сялян – 447, шляхты – 447) [42, арк. 543].

Але нават адсутнасць віны, якая была засведчана камісіяй, не заўсёды вызваляла падследчых ад адказнасці. У некаторых выпадках такія справы маглі быць накіраваны назад на дапрацоўку. У справах таго часу можна знайсці мноства прыкладаў, калі камісіі «з-за недахопу юрыдычных падстаў» выносілі вердыкт аб невінаватасці падследчых, аднак канфірмацыяй вышэйшых асоб тыя прызнаваліся шкоднымі для знаходжання ў краі і высылаліся альбо аддаваліся ў арыштанцкія роты ў адміністрацыйным парадку [15, арк. 14, 24; 25, арк. 2; 32, арк. 22, 23; 36, арк. 11, 16, 20; 37, арк. 339–342; 47, арк. 665]. Аб якой законнасці тут можна весці размову далей?

Работа следчых камісій была важным, але ў большасці выпадкаў толькі першым звяном у далейшым ланцужку пакарання абвінавачанага. Пасля заканчэння следства, справа накіроўвалася ваеннаму начальніку, які на падставе прадстаўленага ў ёй заключэння, прымаў рашэнне аб перадачы падследчага ваенна-суднай камісіі. Ваенна-судныя камісіі – гэта органы, якія, абапіраючыся на сабраныя на папярэднім этапе доказы і праведзенае следства, павінны былі вызначыць ступень віны і адказнасці асобаў, што прымалі ўдзел у паўстанні.

У сваёй дзейнасці яны кіраваліся кнігамі ваенна-крымінальнага статута 1859 г. выдання, а таксама інструкцыяй віленскага генерал-губернатара ад 14 студзеня 1863 г. і яе дапаўненнем ад 11 мая 1863 г. Як і ў выпадку са следчымі камісіямі, дзейнаць судовых аналагічных устаноў на тэрыторыі Беларусі мела часовы характар. Таксама яны фарміраваліся з ліку афіцэраў і унтэр-афіцэраў асобных часцей расійскай арміі. Але тут была адна досыць істотная адметнасць. Справа ў тым, што ў абсалютнай большасці выпадкаў асабовы склад утвораных напрыканцы вясны 1863 г. павятовых ваенна-судных камісій у значнай ступені супадаў з тым, што дзейнічаў у аналагічных тэрытарыяльных следчых органах. Найбольш рэльефна гэтая праблема, мусіць, выявілася ў Беластоку, дзе «як старшыня так і сябры адныя і тыя ж, што ў следчай, то ў суднай камісіі» [20, арк. 170]. Гэта супярэчыла ўсім нормам і практыцы тагачаснай юрыспрудэнцыі. Можа менавіта з гэтых прычын падобныя павятовыя судовыя органы былі ліквідаваны ўжо ўлетку 1863 г. Працягвала сваю дзейнасць толькі губернская следчая для разбору спраў паўстанцаў камісія ў Гродне. Патрабуе ўдакладнення факт існавання ці адсутнасці падобнага органа ў Брэсце.

Судовы працэс меў закрыты характар. Згодна з інструкцыяй, прысутнасць на ім старонніх асоб, пракурора ці адвакатаў катэгарычна забаранялася. Фармальнасцю была норма ў працэдуры пасяджэнняў суда, якая тычылася права абвінавачанага выказаць недавер каму-небудзь з яго складу. Больш за тое, як сведчыць ваенна-судная справа Напалеона Орды, яго спроба замяніць асобу аўдытара ў складзе камісіі не толькі не прывяла да пажаданага выніку, але абярнулася асабістай помстай гэтага чалавека падчас вынясення канчатковага вердыкту [12, арк. 264].

Нельга не падкрэсліць, што ваенна-палявыя законы, на падставе якіх выносіўся прысуд, утрымлівалі пункт, згодна з якім «калі доказаў недастаткова для абсалютнай упэўненасці ў вінаватасці падсуднага, то не асуджаць яго да таго пакарання <...> па тым агульным правіле, што лепш вызваліць ад пакарання дзесяць вінаватых, чым асудзіць аднаго невінаватага»

(348 арт. II-й кнігі ваенна-крымінальнага статута) [11, арк. 57]. Практыка пасляпаўстанцкіх рэпрэсій сведчыць, што ваенна-судныя органы ў сваёй дзейнасці кіраваліся хутчэй абсалютна супрацьлеглым прынцыпам і прысуджалі да ссылкі не тое што дзясяткі, а сотні і тысячы асоб, чыя віна была сумнеўнай не толькі з пункту гледжання логікі, але і тагачаснага права. Па законах ваеннага часу судзілі нават і тых, каго па вызначэнні не павінны былі: людзей за здзяйсненне супрацьпраўных актаў, што падлягалі адказнасці па цывільным крымінальным або адміністратыўным, а не вайсковым праве [17, арк. 49].

Частку спраў камісіі разбіралі завочна. Гэта азначае, што пастанова прымалася адносна тых асоб, якіх на момант пасяджэння суда не было ў наяўнасці, а яны знаходзіліся ў «невядомай адлучцы» [28; 31].

Пасля завяршэння работы камісіі ваенна-палявога суда па ўсіх існуючых нормах справа павінна была паступаць на паверку ў палявы аўдытарыят. Аднак зноў жа для «карысці» падсудных і скарачэння іх часу знаходжання за кратамі, М. Мураўёў са снежня 1863 г. прадставіў права мясцовым губернатарам на канчатковае зацвярджэнне прысудаў. Падобная практыка праіснавала да жніўня 1864 г., калі была вернута ранейшая форма завяршэння судовых распраў [17, арк. 19, 32]. Згодна з ёй губернатар меў права толькі на выказванне сваёй думкі адносна прынятага судовым органам рашэння, а затым справа накіроўвалася ў вышэйшы рэвізійны орган – ваенны палявы аўдытарыят, што знаходзіўся ў Вільні. Той яшчэ раз правяраў усе яе акалічнасці і адпаведнасць прысуду дзейным прававым нормам. У заключэнні ён прымаў сваю пастанову аб ступені віны і спосабах пакарання гэтай асобы. І, нарэшце, рашэнне аўдытарыята паступала на канфірмацыю віленскага генерал-губернатара ці яго памочніка. Увесь гэты час, пасля выкліку ў судовую камісію, на працягу некалькі тыдняў, а то і месяцаў, падследчы знаходзіўся ў поўным няведанні адносна свайго лёсу і тых рашэнняў, што прымаліся рознымі інстанцыямі. Па успамінах расійскага вайсковага лекара, што служыў у Гродне ў 1864–1865 гг., не ўсе вытрымлівалі выпрабаванне турмой, следствам і судом. Некаторыя вар'яцелі [1, арк. 148, 149].

Такім чынам, ваенна-следчыя і ваенна-судныя камісіі былі важным элементам рэпрэсіўнай палітыкі на беларускіх землях падчас паўстання і пасля яго. Іх галоўнай мэтай было садзейнічанне віленскай адміністрацыі ў ачышчэнні краю ад «шкоднага элемента». Дзейнасць падобных органаў у Гродзенскай губерні мела шэраг тэрытарыяльных і часавых асаблівасцей. Заснаваныя на падставе загадаў віленскага генерал-губернатара, яны ў сваёй практыцы ў асноўным абапіраліся на інструкцыі і распараджэнні надзвычайнага характару. Звяртае на сябе таксама ўвагу неапраўданая жорсткасць тых прысудаў, якія выносіліся ваеннымі судамі ў той час. Напрыклад, А. Акінчыц быў асуджаны да 12 гадоў катаргі ў рудніках за сваё тыднёвае знаходжанне ў паўстанчым атрадзе без зброі, а толькі ў якасці лекара. Акрамя таго, ваенна-следчыя справы з'яўляюцца каштоўнай крыніцай па гісторыі паўстанцкага руху на ўсіх тэрыторыях, што былі ахоплены гэтай падзеяй.

Літаратура

1. *Митропольский, И.* Повстанье в Гродно в 1863–1864 годах. Из воспоминаний врача / И. Митропольский // Русский архив. – 1895. – Кн. 1. – С. 129–151.

2. Отчет графа М. Н. Муравьева по управлению Северо-Западным краем с 1 мая 1863 г. по 17 апреля 1865 г. / Муравьев М. – 22 с.

3. Повстанческое движение в Гродненской губернии 1863–1864 гг. / Т. Афанасьева, Р. Горячева, А. Радюк, М. Сачек. – Брест: Академия, 2006. – 404 с.

4. *Радзюк, А.* Паўстанне 1863–1864 гг. у лёсе жыхароў пяці ваколіц / А. Радзюк // Homo historicus 2012. Гадавік антрапалагічнай гісторыі. – Вільня, 2012. – С. 41–68.

5. *Цылов, Н.* Сборник распоряжений графа Михаила Николаевича Муравьева по усмирению польского мятежа в северо-западных губерниях 1863–1864 / Н. Цылов – Вильна, 1866. – 383 с.

6. *Ягмин, А.* Воспоминания польского повстанца 1863 г. / А. Ягмін // Исторический вестник. – 1892. – Т. 50. – № 12. – С. 717–732.

7. *Anderson, B.* Seven month' residence in Russian Poland in 1863 / B. Anderson. – London and Cambrige: Macmillan & CO, 1864. – 214 p.

8. Memoires by Doctor Alexander Okinczyc. Vol. I [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http:// pages. interlog. com/~mineykok/Okin1. html#Insurection – Дата доступу: 8. 07. 2013.

9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродне (далей – НГАБ у г. Гродна). – Фонд 1. – Воп. 13. – Спр. 1400.
10. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 13. – Спр. 1401.
11. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 31. – Спр. 108.
12. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 31. – Спр. 113.
13. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 31. – Спр. 170.
14. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 1030.
15. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 1062.
16. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 1068.
17. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 1408.
18. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 1478.
19. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 1527.
20. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 170.
21. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 176.
22. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 1979.
23. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 2167.
24. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 2244.
25. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 2425.
26. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 262.
27. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 2849.
28. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 2876.
29. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 2889.
30. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 3119.
31. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 3420.
32. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 3431.
33. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 456.
34. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 509.
35. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 893.
36. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 994.
37. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 6. – Спр. 2025.
38. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 6. – Спр. 407.
39. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1713. – Воп. 1. – Спр. 7.
40. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 21.
41. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 32.
42. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 35.
43. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 37.
44. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 41.
45. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 970. – Воп. 2. – Спр. 7.
46. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 974. – Воп. 1. – Спр. 13.
47. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 974. – Воп. 1. – Спр. 5.

Резюме

А. Г. РАДЮК

ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ СЛЕДСТВЕННЫХ И СУДЕБНЫХ КОМИССИЙ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В 1863–1867 гг. (НА ПРИМЕРЕ ГРОДНЕНСКОЙ ГУБЕРНИИ)

Анализируется деятельности военно-следственных и судебных комиссий на территории Гродненщины во время и после восстания 1863–1864 гг. На основе архивного материала впервые в белорусской историографии сделан анализ территориального размещения данных органов и его личного состава. К основным задачам военно-следственных комиссий относились снятие предварительных допросов с обвиняемых в участии в восстании, а также заключение об их виновности или невиновности. Для уличения повстанцев они пользовались целым рядом приемов, главное место среди которых занимала очная ставка. В целом ведение следственных дел было на очень низком профессиональном уровне. Во многих случаях при вынесении решений комиссии опирались не на объективные результаты следствия, а на субъективное желание виленской администрации очистить край от «вредных» элементов.

В заключении дается оценка всей системы наказания участников восстания на белорусско-литовских землях, делается вывод о том, что данные органы были важными элементами муравьевской репрессивной системы на этих землях.

Summary

A. RADZIUK

INQUIRY AND JUDICIAL COMMISSIONS ACTIVITY AT THE TERRITORY OF BELARUS IN 1863–1867 (ON THE EXAMPLE OF GRODNO PROVINCE)

The article analyzes activities of Inquiry (Board of Commissioners) and Judicial Commissions in Grodno region during and after the uprising 1863–1864. The papers of these bodies are still the main source on the history of this event. That's why their studies are of great importance. Using unknown archival materials the author examines the main stages of the inquiry and trial processes under the rebels of 1863. The main task of this inquiry bodies were: questioning, investigation of every particular case and making final conclusion concerning guilt or innocence of every person under the trial. Every commission has its own features thus influencing all this process which was conduct at a very low professional level. In many cases the sentences were passed not on the bases of the objective results of the investigation, but on the Vilna government administration «to clear this region from Polish element».

Summing up, the author makes the conclusion that these commissions were the essential part of M. Muravyev's repressive system at the territory of Belarusian lands.

Паступіў у рэдакцыю 20.12.2013

УДК 94(476)«1863/1864»

С. М. ТОКЦЬ

ПАЎСТАННЕ 1863–1864 гг. НА ТЭРЫТОРЫІ ГРОДЗЕНСКАГА ПАВЕТА: САЦЫЯЛЬНЫЯ АСПЕКТЫ

Гродзенскі павет знаходзіўся ў паўночна-заходняй частцы аднайменнай губерні і межаваў з Віленскай і Аўгустоўскай губернямі. Паўночную яго частку займала Гродзенская пушча, абшары якой уяўлялі сабой выдатныя прыродныя ўмовы для вядзення партызанскай вайны. Менавіта ў гэтай паўночнай частцы павета і пачалі вясной 1863 г. сваю дзейнасць паўстанцы. Першапачаткова гэта былі групы партызан з паўстанцкага аддзела Лідскага павета пад кіраўніцтвам Людвіка Нарбута. Але, з другога боку, высокая канцэнтрацыя ўрадавых войскаў у губернскім горадзе і яго ваколіцах вельмі ўскладняла любыя дзеянні паўстанцаў. Гэтыя фактары вызначалі характар падзей 1863–1864 гг. у Гродзенскім павеце.

У сакавіку прыхільнікі паўстання ў Гродне распрацавалі вельмі дзёрзкі план. Каля сотні чалавек (пераважна моладзь) на чале з начальнікам станцыі Лявонам Кульчыцкім паспрабавалі 14 сакавіка захапіць на гарадской чыгуначнай станцыі цягнік і выехаць на ім на поўнач да станцыі Парэчча, адкуль павінны былі рухацца насустрач аддзелу Нарбута. Але гэты план удаўся толькі часткова, і выехаць з Гродна змаглі ўсяго каля 10 асобаў.

Актыўнасць паўстанцаў на тэрыторыі Гродзенскай пушчы напачатку праяўлялася ў рэйдах па лясных вёсках і ўрочышчах. Так, берштаўскае валасное праўленне паведаміла губернскім уладам, што 18 сакавіка ў вёсцы Шумы, якая знаходзілася на самым поўначы Гродзенскай губерні (цяпер гэта тэрыторыя

Рэспублікі Літва), пабываў атрад паўстанцаў колькасцю каля 30 чалавек (службовыя асобы сялянскага самакіравання пад страхам жорсткага пакарання павінны былі паведамляць царскім уладам пра кожнае з'яўленне паўстанцаў у іх мясцовасці) [12, арк. 3]. Да паўстанцаў у Шумах далучыліся некалькі мясцовых жыхароў. А 4 красавіка, паводле звестак чыноўнікаў палаты дзяржаўных маёмасцей, «інсургенты» пасеклі драўляныя масты праз рэчку Котру каля вёскі Бершты і праз рэчку Нявішу каля вёскі Якубавічы [12, арк. 8]. Наўрад ці гэтая акцыя магла павысіць аўтарытэт паўстанцаў у вачах мясцовых сялян, для якіх дадзеныя масты былі вельмі патрэбнымі перад пачаткам веснавых палявых работ.

Адной з самых вострых праблем у арганізацыі паўстанцкіх аддзелаў з'яўляўся катастрафічны недахоп зброі. Таму, напрыклад, 5 красавіка паўстанцы пазабіралі стрэльбы ў стральцоў (палясоўшчыкаў) Гродзенскага казённага лясніцтва [12, арк. 8]. Урадавыя войскі таксама актыўна перамяшчаліся па пушчы ў пошуках паўстанцаў. Так, паводле скаргі Берштаўскага валаснога праўлення, салдаты, якія заначавалі ў Берштах у ноч з 4 на 5 красавіка, разабралі хлеў ля мясцовай карчмы і «употребили его на разведение огня» [12, арк. 52]. А 21 красавіка 1863 г. адносна вялікі аддзел паўстанцаў (ва ўрадавых крыніцах называюцца лічбы да трохсот чалавек, паўстанец Ігнат Арамовіч у сваіх успамінах піша пра 36 добраахвотнікаў) пад камандаваннем адстаўнога падпалкоўніка Аляксандра Лянкевіча (псеўд. Ляндэр), прызначанага вайсковым начальнікам Гродзенскага павета, увайшоў у мястэчка Азёры, якое знаходзілася на адлегласці ўсяго каля 20 км ад губернскага горада. Паўстанцы спалілі ўсе паперы ў канцылярыі казённага лясніцтва, забралі 316 рублёў, атрыманых за продаж лесу, і 134 рублі, прыгатаваныя на пабудову дома пад лясніцтва, а таксама 55 ружжаў, 2 састарэлыя пісталеты і перадавы для таго часу рэвальвер. Праўда, Ігнат Арамовіч у сваіх успамінах піша, што ўдалося знайсці ўсяго 25 стрэльбаў. Да паўстанцаў далучыліся каля 20 жыхароў мястэчка [12, арк. 16]. Паводле Арамовіча, у гэты аддзел уступілі каля сотні бяззбройных сялян з блізкіх вёсак. Напрыклад, паводле

інфармацыі мясцовых уладаў, 20 красавіка група паўстанцаў увайшла ў вёску Талочкі, дзе да іх далучыліся 4 шляхцічы, 6 аднадворцаў і 6 сялян [12, арк. 9].

Гэтых добраахвотнікаў Аляксандр Лянкевіч павёў у цяжкадаступнае Святое балота для фарміравання ў баяздольную вайсковую адзінку. Там 1 мая аддзел быў атакаваны ўрадавымі войскамі і расцярушаны [1, с. 27]. З яго рэшткамі (каля 25 чалавек) Ляндэр вырушыў у Ваўкавыскі павет для аб'яднання з тамтэйшым партызанскім аддзелам Густава Стравінскага (Млотка). Пасля шэрагу сутычак з урадавымі войскамі аддзел Аляксандра Лянкевіча ў другой палове чэрвеня вярнуўся ў Гродзенскую пушчу, а на пачатку жніўня Ляндэр з большасцю сваіх байцоў перайшоў у Аўгустоўскую губерню. Пасля гэтага сур'ёзных баявых дзеянняў у Гродзенскім павеце паўстанцы ўжо не ажыццяўлялі.

Большасць байцоў у партызанскія аддзелы ў Гродзенскім павеце, як і ў цэлым па ўсёй Беларусі, пастаўляла дробная засцянковая шляхта. Многія з іх паказалі сябе выдатнымі, мужнымі жаўнерамі. Паказальным тут можа быць лёс аднадворца з ваколіцы Жукі каля мястэчка Скідзель Адама Багатырэвіча, які спачатку змагаўся ў аддзеле Аляксандра Лянкевіча, а потым пад камандай ужо Юзафа Раматоўскага (Ваўра) у Аўгустоўскай губерні. Там у баі пад вёскай Грушкі Багатырэвіч быў моцна паранены (куля закранула хрыбет) і патрапіў у палон. Яго змясцілі ў шпіталь у Сувалках, дзе Багатарэвіч быў дапытаны. На допытах ён трымаўся мужна і нікога не выдаў, гаварыў следчаму, што «после пасхи незнакомый человек склонил его и дворного писаря в повстанцы, писаря не знаю» [11, арк. 9]. Ваенны начальнік Аўгустоўскага павета нават прапанаваў вызваліць Багатырэвіча з увагі на стан яго здароўя. Але 27 жніўня 1864 г. гродзенскі губернатар прапанаваў неадкладна адправіць яго па этапе ў Вільню, а адтуль у Маскву. Багатырэвічу тады было ўсяго 24 гады, ён нават не быў пісьменным. Далейшы лёс гэтага паўстанца нам невядомы [11, арк. 14].

Рэпрэсіі ўладаў у Гродзенскім павеце ў першую чаргу былі скіраваныя менавіта супраць засцянковай шляхты. Самым яскравым прыкладам сталі падзеі, звязаныя са спаленнем

расійскімі войскамі шляхецкай ваколіцы Шчукі ў Гродзенскім павеце і высяленні ў Сібір яе жыхароў. Усё пачалося са звычайнай спрэчкі паміж селянінам суседняй вёскі Сарокі Івана Макарэвічам і шляхціцам Ясем (Янам) Шчукам. Іван Макарэвіч заявіў, што калі расійскі ўрад раздасць сялянам ружжы, дык тыя самі справяцца з паўстанцамі. Падобныя погляды на падзеі паўстання падзяляла ў той час значная колькасць сялян Гродзеншчыны, якія бачылі ў паўстанні жаданне шляхты вярнуць ненавісную паншчыну і сваю ўладу над вяскоўцамі. Свой вынік прыносіла і прапаганда ўладаў, якую падтрымлівала праваслаўнае прыходскае духавенства. У выніку такой спрэчкі паміж маладымі людзьмі Ясь Шчука хутчэй за ўсё паведаміў пра погляды Макарэвіча паўстанцам пад камандай Аляксандра Лянкевіча, якія тады якраз вярталіся са Слонімскага павета ў Гродзенскую пушчу і праходзілі каля ваколіцы Шчукі. 3 ліпеня 1863 г. паўстанцы прыйшлі да хаты Макарэвічаў і забралі Івана пад нагодай паказаць ім дарогу. Пазней ён быў імі павешаны. Бацькі Івана Макарэвіча адразу пабеглі ў мястэчка Скідзель, дзе размясціліся расійскія войскі, і паскардзіліся палкоўніку Шчарбатаву. Сяляне Сарокаў дапамаглі вайскоўцам спачатку знайсці схаваны ў бульбяной яме сярод перагаранага палетку труп Івана Макарэвіча, а пазней у суседнім лесе і жыхароў ваколіцы Шчукі, якія там пахаваліся разам са сваімі пажыткамі і хатняй жывёлай [6]. У выніку ўсе 15 сем'яў гэтай ваколіцы ўлады выслалі ў розныя аддаленыя расійскія губерні [14, с. 169–173], іх хаты і гаспадарчыя пабудовы былі спаленыя, а зямля аддадзеная сялянам. Такім чынам, непрыязнасць паміж суседзямі, спароджаная сацыяльнымі і рэлігійнымі адрозненнямі, няўменне навучыцца жыць на адной зямлі без пагрозаў і гвалту паслужылі прычынай гэтай трагедыі. У гэтым лакальным канфлікце, адным з многіх, што адбываліся ў часы паўстання, яскрава адлюстравалася, на наш погляд, адна з важных прычын яго паражэння.

Улады таксама пастанавілі выслаць у Астраханскую губерню 9 сямей з ваколіцы Эйсманты Надтабольскія. Гэтая ваколіца была размешчаная на самім ускрайку Гродзенскай пушчы, і яе жыхары актыўна падтрымлівалі паўстанне. Уладамі была сабра-

ная інфармацыя пра маёмасны стан шляхецкіх сямей, якія яны збіраліся выслаць з краю. Гэтыя даныя сведчаць, што мясцовая шляхта мала чым па сутнасці адрознівалася паводле сваёй заможнасці ад суседніх сялян [7].

Частка сялянства на Гродзеншчыне таксама актыўна падтрымала паўстанне. Вельмі важным фактарам прыцягнення на свой бок мясцовага насельніцтва выступала вусная агітацыя паўстанцаў. Многія рэйды паўстанцкіх групаў мелі сваёй мэтай якраз правядзенне такой агітацыі сярод мясцовых жыхароў. Напрыклад, 5 мая 1863 г. аддзел паўстанцаў зайшоў у мястэчка Крынкі, якое знаходзілася ў паўднёва-заходняй частцы Гродзенскага павета. Жыхароў мястэчка заклікалі на плошчу, дзе «объявили им свой манифест, заключающийся в том, что с нынешнего времени временно-обязанные крестьяне от всех повинностей свободны и земля, которою они владели, есть их собственностью, рекрутский набор им дарован на 15 лет, в прочем все равны без зависимости, а кто только может должен с ними идти в бой для скорейшего возврата Старо-Польски» [12, арк. 54 адв.]. Пра гэтую падзею ўладам паведаміў іх канфідэнт местачковы яўрэй Хацкель Зуц. 16 мая паўстанцы ізноў былі ў Крынках, патрабавалі ў местачкоўцаў даць ім коней, а таксама шукалі таго самага Хацкеля Зуца, каб павесіць за яго данасіцельства, але апошняму ўдалося схавацца.

Вусная агітацыя паўстанцаў часта давала добры вынік таму, што многія беларускія сяляне ўпершыню ў сваім жыцці чулі ад паўстанцаў словы пра сацыяльную роўнасць і справядлівасць, пра тое, што яны такія ж грамадзяне сваёй краіны, як і шляхта. Гэтыя ідэі маглі быць вельмі прываблівымі для часткі мясцовага насельніцтва. Праўда, у хуткім часе нават прысутнасць сялян пры абвяшчэнні паўстанцкага маніфеста пачала разглядацца ўладамі як дапамога паўстанцам, што магло пацягнуць за сабой самыя драматычныя наступствы. Напрыклад, калі 24 чэрвеня 1863 г. паўстанцы зайшлі ў вёску Лакно на ўскрайку Гродзенскай пушчы, дзе «стали читать возмутительные прокламации, но жители разошлись, а слушали только дети» [12, арк. 77]. Менавіта такім чынам вяскоўцы імкнуліся пазбегнуць абвіна-

вачання ў супрацоўніцтве з «мятежниками». У мясцовага селяніна Адама Карэлы паўстанцы ўзялі хлеб і квас, а гаспадыня кінула пад ногі грошы, «которых она не принимала» [12, арк. 77].

Вайскоўцы зусім не цырымоніліся з мясцовымі жыхарамі, калі падазравалі іх у сувязях з паўстанцамі. Чыноўнікі палаты дзяржаўных маёмасцяў нават паскардзіліся гродзенскаму губернатару ў ліпені 1863 г. на здзекі царскіх салдат над сям'ёй палясоўшчыка Івана Ушкевіча з лясного ўрочышча Пагарэнда ў Гродзенскім казённым лясніцтве: «Капитан <...> приказал вешать двукратно хозяина этого семейства 67-летнего старика, допытываясь, куда он спрятал какого-то Гудачевского, о котором хозяин Ушкевич вовсе не знал. Затем велел привязать его к дереву и после долгого мучения и страшных угроз наконец отпустил <...> остальных членов семейства <...> приказал бить сперва нагайками, из которых две после нескольких ударов перешиблись, а потом розгами» [12, арк. 86]. Нават 70-гадовая Разалія Ушкевіч атрымала 4 удары нагайкай «из уважения, что более не выдержит», а жонка стральца Мар'яна атрымала 20 удараў. Праз два тыдні той жа капітан загадаў сваяку палясоўшчыка Хрыстафору Ушкевічу весці салдат у лес і паказаць, дзе хаваюцца паўстанцы. Калі апошні адмовіўся, дык атрымаў 350 удараў нагайкай.

Расійскія ўлады загадалі сялянам ствараць так званыя сельскія каравулы, задачай якіх было змаганне з паўстанцамі, але адначасова жандары адабралі ў вяскоўцаў усю зброю, у тым ліку і ў казённых палясоўшчыкаў, якія мелі казённыя і свае ўласныя ружжы. Канфіскацыя зброі стварала сур'ёзныя праблемы для пушчанскіх сялян. У кастрычніку 1863 г. палата дзяржаўных маёмасцяў пісала гродзенскаму губернатару Скварцову, што сяляне Гродзенскай пушчы «жаловались, что за отнятием у них ружей размножились в казённом лесу хищных зверей до той степени, что волки почти всякую ночь приходят в деревню, подкапываются под сараи и вытаскивают по несколько штук разного скота, а днем нападают на стада пасущегося рогатого скота, свиней, овец и лошадей, хватают добычу и уносят в лес» [5, арк. 1]. 10 лютага 1864 г. дзяржаўны ляснічы Бах паведаміў, што «в Гродненской даче появилось значительно число хищных

зверей, которые кроме причиняемого вреда домашним животным окрестных жителей нападают не только ночью, но даже и днем на проходящих по дороге стрелков и других лиц, делая им препятствия и остановку в следовании» [10, арк. 1 – 1 адв.]. Кіраўніцтва палаты прасіла начальніка губерні выдаць сялянам ружжы «для истребления волков».

На Гродзеншчыне, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Беларусі, сяляне найбольш актыўна падтрымалі паўстанне. С. М. Байкова падлічыла, што з ліку ўсіх паўстанцаў сялянскага паходжання ў Беларусі, на Гродзенскую губерню (без уліку Беластоцкага, Бельскага і Сакольскага паветаў) прыходзіліся 33 % ці прыкладна кожны трэці [2, с. 236, 251; 3, с. 78]. Паводле падлікаў В. Зайцава, сярод рэпрэсаваных уладамі паўстанцаў Гродзенскага павета сяляне складалі 19, 96 %, а адзін рэпрэсаваны селянін прыходзіўся на 1706 душ сялянскага насельніцтва мужчынскага пола [4, с. 117].

Менавіта з дапамогай рэпрэсій улады спрабавалі запалохаць вясковае насельніцтва. Камандуючы расійскім войскамі ў Віленскай губерні А. Р. Дрэнтэльн пісаў гродзенскаму губернатару Скварцову ў верасні 1863 г.: «Военный начальник Лидского уезда полковник Алхазов донес мне, что находящиеся в Гродненской губернии деревни Зуброва и Шумма служат постоянным пристанищем для скитающихся по окрестным лесам мятежников. <...> Полковник Алхазов, хорошо знакомый с местными обстоятельствами, утверждает, что если бы деревни эти были Лидского уезда, то он вошел бы с представлением о разрешении их истребить, как в наказание, так и для примера другим» [5, арк. 1]. Па загадзе губернатара ваенны начальнік Гродзенскага павета палкоўнік Братке падрыхтаваў рапарт у гэтай справе: «... я лично отправился в поименованныя <...> деревни: Зуброво и Шума, лежащие в Гродненской пуще. По самым тщательным разспросам и исследованиям, а также на основании удостоверения командира роты 1 Гв. Гатчинского полка, стоящего в м. Новы Двор и весьма часто бывавшаго с отрядом в д. Зуброве, оказывается, что жители той деревни, из которых значительная часть Православного исповедания, не принимают участия в укрывательстве и про-

довольствии мятежников» [5, арк. 3]. Хаця дакладных доказаў дапамогі паўстанцам з боку жыхароў вёскі Зубрава не было, але ўлады пастанавілі высяліць іх з родных хатаў, а ўсе пабудовы знішчыць. Прычым паліцэйскага дзясяцкага Якуба Сакалоўскага, аднаго з самых бедных гаспадароў вёскі, разам з сям'ёй выслалі ў Сібір, а астатніх рассялілі па суседніх вёсках. Праўда, трэба прызнаць, што перасяленцам выдавалася 150 руб. грошай дапамогі, здымаліся падаткі на 3 гады і давалася падатковая зніжка ў памеры 30 % на 70 гадоў, а таксама з казённага лесу выдавалася па 50 бярвенняў на пабудову [9, арк. 26 адв.]. З вёскі Шумы былі высланыя ў Астраханскую губерню за ўдзел у паўстанні Іван Юр'евіч Сяргейчык і яго сын Марцін, Іван Міхайлавіч Сяргейчык і яго брат Дамінік, Аўгусцін Малевіч, яго сын Міхал і брат Бенедыкт, Казімір Саковіч, бабыль Казімір Андрэевіч Гудачэўскі [13].

Мы амаль нічога не ведаем пра матывы, якімі кіраваліся сяляне, калі ішлі ў паўстанцкія аддзелы. Ніхто з іх не напісаў пазней мемуараў, а да матэрыялаў расійскага следства трэба падыходзіць крытычна. Напрыклад, у мястэчку Азёры пад Гроднам да паўстанцкага атрада далучыліся маладыя сялянскія хлопцы Габрыэль Сухініч і Лявон Жук. Яны былі так званымі дваровымі людзьмі на мызе Задуб'е маёнтка Азёры пана Валіцкага. У гэтую мызу зайшла група паўстанцаў з аддзела палкоўніка Лянкевіча. Прычым паўстанцы спрабавалі павесіць садоўніка Валіцкага Аляксея Жука, за тое, што ён нібыта адмаўляўся ісці ў паўстанцы. Пры гэтым абарвалася вяроўка, і Аляксей Жук выратаваў сваё жыццё. Цікава, што гэты эпізод захаваўся ў вуснай памяці мясцовых жыхароў. А Габрыэль Сухініч і Лявон Жук пайшлі ў паўстанцы і былі захопленыя расійскімі вайскоўцамі толькі праз паўгода пад мястэчкам Поразава. Як было запісана ў матэрыялах следчай камісіі: «... хотя и показывают, что были насильно взяты шайкою Ленкевича, но за долгое нахождение в шайке именно с апреля месяца по сентябрь подлежат строгой ответственности, тем более, что шайка была два раза разсеяна, и они, если бы желали, могли убежать, и тогда даже, когда шайка Ленкевича была окончательно распущена, они отправились в шайку Млотка (Стравинского), и когда сей

последний их не принял, то они решились идти уже домой, но все-таки не с целию принять раскаяние и просить пощады» [8, арк. 26]. Абодва хлопцы былі прыгавораныя да 5 гадоў арыштанцкіх рот. Магчыма, што толькі ў паўстанцкім аддзеле сялянскія хлопцы сапраўды адчулі сябе вольнымі людзьмі, роўнымі сярод роўных, адчулі сваю прыналежнасць да вялікай справы.

Таксама і большасць беларускіх сялян, якія пайшлі ў паўстанне і заплацілі за гэта дарагую цану, паверылі ў ідэю вольнасці, ідэю справядлівай польскай дзяржавы, у якой, як пісалася ў паўстанцкіх улётках, усе грамадзяне будуць роўнымі і вольнымі. Хаця паўстанне і было жорстка задушана, а паўстанцы сурова пакараныя, гэтая ідэя вольнай і справядлівай дзяржавы ўжо не магла быць вынішчаная, яна трывала замацавалася ў свядомасці беларусаў.

Літаратура

1. *Арамовіч, Ігнат.* Мары. Успаміны аб партызанскім руху ў Гарадзенскім ваяводстве ў 1863 і 1864 гг. / І. Арамовіч // Arche. – 2010. № 12. – С. 18–72.

2. *Байкова, С. М.* О движущих силах восстания 1863 г. на территории Белоруссии / С. М. Байкова // Историко-социологические исследования (на материалах славянских стран). – М.: Наука, 1970. – С. 222–253.

3. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. – 2005. – 519 с.

4. *Зайцев, В. М.* Социально-сословный состав участников восстания (Опыт статистического анализа) / В. М. Зайцев. – М.: Наука, 1873. – 232 с.

5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ у г. Гродна). – Фонд 1. – Воп. 6. – Спр. 361.

6. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 456.

7. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 613.

8. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 1341.

9. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 1424.

10.НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 1728

11. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 34. – Спр. 1864.

12. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 15.

13. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 43.

14. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 31. – Воп. 2. – Спр. 2409.

15. *Радзюк, Аляксандр.* Знішчэнне шляхецкіх ваколіцаў на Гарадзеншчыне ў 1863–1864 гг. / А. Радзюк // ARCHE. – 2010. – № 12. – С. 151–174.

Резюме

С. М. ТОКТЬ

ВОССТАНИЕ 1863–1864 гг. НА ТЕРРИТОРИИ ГРОДНЕНСКОГО УЕЗДА: СОЦИАЛЬНЫЕ АСПЕКТЫ

Территория Гродненского уезда представляла собой благоприятные условия для ведения партизанской войны. Активные действия повстанцев начинаются здесь в марте 1863 г. Большую часть добровольцев в ряды повстанцев поставляло мелкое дворянство (околичная шляхта). Именно против этой социальной группы и были направлены репрессии российских властей. В отдаленные земли империи были высланы жители нескольких поселений мелких дворян, а их имущество конфисковано. Крестьянское население было разделено. Часть поддерживала повстанцев, часть склонялась на сторону правительства, а большинство пыталось придерживаться нейтральной позиции. Правительство жестоко репрессировало крестьян, которых подозревало в симпатиях к повстанцам. Была, например, сожжена деревня Зуброво, а ее жители расселены по другим деревням Гродненского уезда. Но в целом восстание имело позитивные последствия для большинства населения Гродненщины, условия реализации аграрной реформы значительно улучшились в пользу крестьянства.

Summary

S. TOKTS

REBELLION OF 1863–1864 ON THE TERRITORY OF THE GRODNO DISTRICT: SOCIAL ASPECTS

The territory of the Grodno district represented favorable conditions for guerrilla warfare. Active insurgency starts here in March in the 1863. Most of the volunteers in the ranks of the rebels supplied gentry. Against this social group were directed repressions of the Russian authorities. The residents of several small noble's settlements were sent to the distant lands of the empire, and their property was confiscated. Peasant population was divided. One part supported rebels, other are often inclined to the side of the government, and most tried to take a neutral position. Government brutally repressed peasants who were suspected of sympathizing with the rebels. For example, village Zubrava was burned and its inhabitants were settled in other villages of the Grodno district. But in general, insurrection had positive consequences for the majority of the Grodno region; conditions for the implementation of agrarian reform improved dramatically in favor of the peasantry.

Паступіў у рэдакцыю 11.12.2013

УДК 94(477): 316.343.642

Н. Р. ТЕМІРОВА

ВЕЛИКЕ ЗЕМЛЕВОЛОДІННЯ В ПРАВОБЕРЕЖНІЙ УКРАЇНІ В КОНТЕКСТІ ПОВСТАННЯ 1863–1864 рр.

Друга половина XIX ст. позначилася складною соціально-економічною еволюцією великих землевласників внаслідок офіційного скасування кріпацтва в Російській імперії, що надало імпульсу розвитку капіталістичних відносин. Безпосереднім наслідком скасування кріпацтва стала активна мобілізація землі, передусім, належної дворянам. Правобережна Україна відрізнялася від решти українських земель максимальною стійкістю великого землеволодіння. Причина полягала в тому, що в регіоні сформувалося найдавніше серед українських губерній велике поміщицьке землеволодіння. Ще в ранньомодерну добу тут утворилися обширні маєтності Потоцьких, Любомирських, Браницьких, Ржевуських та інших. З поділом Польщі з'явилася нова сила – російська бюрократія, котра особливо зміцнилася після повстання 1830 р., коли російський уряд провів масштабну конфіскацію польських маєтків і передав їх слухнянішим підданим з росіян. Маючи міцні економічні позиції, землевласники польського походження претендували на відповідну роль у політичному житті імперії. Відносно Правобережжя можна говорити про польський сепаратизм, який намагалася обмежити російська влада. Тому до економічних чинників еволюції великого землеволодіння додалися суто політичні заходи, які були прийняті в контексті придушення польського повстання 1863–1864 рр., коли російський уряд узяв курс на обрусение Юго-Западного края».

Відповідно до затвердженого 5 березня 1864 р. положення особи польського походження не допускалися до торгів на купівлю маєтків у «західному краї», призначених для продажу

з метою утворення капіталу для видачі позик на купівлю казенних і приватних маєтків уродженцями непольського походження з інших губерній (окрім євреїв). Придбання цими особами маєтків в інших регіонах дозволялося. Також встановлювалося, що покупцям таких маєтків заборонялося продавати, заставляти чи іншим способом передавати ці маєтки особам польського походження та євреям, не дозволялось їм віддавати ці маєтки в оренду чи управління особам польського походження і євреям. Таким чином, цими заходами переслідувалася мета «посилення в Західному Краї між землевласниками російського елементу» [8, с. 81].

Уряд сподівався спонукати переселення російських землевласників до «Західного краю», що суперечило загальній тенденції до поширення міграції з заходу на схід, з більш населеної місцевості у менш населену, з більш культурної в сільськогосподарському сенсі до менш культурної. Оскільки Правобережжя виступало таким розвиненішим регіоном, марно було сподіватися, що лише через обмеження позицій поляків тут розгорнеться переселення росіян. Тому уряд з 1864 р. став шукати засоби, щоб викликати рух російських землеробів у «західний край» і насадити тут «російський елемент». Для його заохочення передбачалося надати переселенцям певні пільги. З цією метою в 1864 р. був запроваджений фонд для видачі позик росіянам, який формувався з сум, виручених від продажу казенних земель. Оскільки цих коштів виявилось недостатньо, створили Особливе товариство з покупців польських маєтків. Але з огляду на недієвість воно 1867 р. припинило існування, його кошти були передані Товариству взаємного поземельного кредиту, яке 1890 р. перейшло під егіду Дворянського банку [4, с. 81].

У 1865 р. київський генерал-губернатор О. Безак повелів конфіскувати майно польських землевласників, які взяли участь у повстанні. Таких знайшли 144 особи. Очолюючи в Петербурзі «Комісію про пошуки коштів для запровадження російського елемента в Західних губерніях», він підготував текст указу «Про заборону особам польського походження знову здобу-

вати нові землі в Західних губерніях». Комісія дійшла висновку, що в дев'яти західних губерніях на 10-мільйонне населення, «переважно Малоросійське, Білоруське і частково Литовсько-Жмудське», припадало досить незначне за чисельністю населення польського походження, яке складалося здебільшого з поміщиків і міщан. Воно «дає всьому краю характер польський і заважає решті, ніскільки не польському населенню, правильно розвиватися». Сила цього стану, на думку членів комісії, полягала в корпоративній замкненості володіння нерухомою власністю, яка не допускала проникнення до свого середовища представників інших національностей і особливо російської. За таких обставин, на думку комісії, уряд мав удатися до такого заходу, «який через усунення осіб польського походження від права отримувати заново маєтки в Західному краї, не обмежуючи законні права володіння нинішніх польських поміщиків, остаточно перешкодив би посиленню цього класу». З огляду на це 10 грудня 1865 р. імператор підписав указ про заборону особам польського походження купувати поміщицькі маєтки в «західних губерніях» [12, арк. 1 зв.]. Документ, вперше зафіксувавши поділ за національною ознакою, став наріжним каменем подальших обмежень у правах осіб польського походження. Ці заходи були визнані самими членами комісії такими, що «хоча не узгоджуються з загальними юридичними засадами, але цілком виправдовуються вищими інтересами державного ладу, спокою і самозбереження» [12, арк. 1, 3 зв.]. Особи польського походження позбавлялися права купувати поміщицькі маєтки в «західному краї» будь-яким іншим шляхом, окрім наслідування за законом. Особи ж російського походження, навпаки, набули певних пільг і переваг. Але оскільки значна частина осіб польського походження не мала ніякого відношення до повстання 1863 р., зразу після прийняття закону 1865 р. почали надходити звернення з проханням переглянути його відносно конкретних осіб. Перше таке звернення надійшло від генерал-ад'ютанта графа Ржевуського, після чого були розглянуті подання князів Любомирського, Понятовського та інших [4, с. 46–47].

Законом від 10 грудня 1865 р. також запроваджувався обов'язковий продаж секвестрованих маєтків власників, висланих за межі західного регіону за сприяння польському повстанню, протягом двох років особам російського походження. Допускався також обмін таких маєтків на розташовані в інших місцевостях. Для полегшення операцій їхні учасники звільнялися від мита. Якщо ж протягом двох років маєтки не продавалися, то вони повинні були оцінюватися тим же способом, як і казенні, і потім продані на користь власників. У разі неуспіху вільної торгівлі передбачалося купувати маєтки по оціночній сумі з призначенням з неї на користь колишніх власників щорічних 5 %. Полякам заборонялося купувати нові землі, чим створювалася ситуація, яка змушувала їх продавати землю росіянам. Проте вона спричиняла й інші наслідки: фіктивні й фактичні оренди та заставні акти, продаж землі іноземцям, довічні заповіти або, врешті, хабарі.

Одночасно на сплату державних видатків, спричинених польським повстанням, запроваджувався спеціальний податок, що дорівнював 10 % чистого прибутку кожного польського маєтку. Ці кошти необхідно було внести за надзвичайно короткий термін. В іншому випадку загрожував опис майна. Зокрема, на Білоцерківський маєток Браницьких було накладено близько 50 тис. руб. названого податку. Управитель маєтку писав про те, що це невиправдано велика сума, оскільки до неї зараховані і суміжні селянські землі. Крім того, нереальною виглядала можливість внесення вказаної суми за короткий строк. Виставлення ж маєтку на аукціон, на думку управителя, лише зруйнувало б господарство, а сама операція буде невигідною через надзвичайно високу його вартість. У свою чергу, управитель прохав про допомогу: або дозволити позику в державному банку, або розкласти борг на три місяці [9, с. 217]. Пряме втручання царського уряду в процес перерозподілу земельної власності зумовлювалося його зацікавленістю з політичних мотивів у зміцненні на Правобережжі землеволодінь російського дворянства.

Закон 1865 р. був економічно шкідливим, оскільки тутешнім польським власникам заборонялася купівля землі, а за короткий термін виникнути нове російське землеволодіння не могло. Великі землевласники з центральних російських губерній практично не переселялись у Правобережжя. Більшість нових господарів з'являлися з числа чиновників або ж осіб, які мали віддалене уявлення про способи господарювання. Знову ж таки цьому сприяла урядова політика. Зокрема визначалося, що купувати ділянки площею понад 600 дес. могли чиновники, від яких очікували користі; особи, удостоєні права придбати землю в нагороду (їм дозволялося купувати ділянки без внеску задатку і з розстрочкою платежу на 20 років без сплати відсотків); представники усіх чинів із внеском 1/5 оціночної суми з надбавкою 10 % і розстрочкою решти грошей на 37 років і погашенням щорічно 6 %. внеском. Згідно з законом від 23 березня 1867 р. продаж ділянок площею 50–300 дес. дозволявся винятково чиновникам, які служили в «західному регіоні». Ще через рік документ доповнили положенням про роздачу землі у Правобережжі чиновникам, які служили в цьому регіоні [7, арк. 11–11 зв].

Єдиною метою всіх цих законодавчих актів було утвердження в Правобережжі російського землеволодіння. Причому задля досягнення її нехтувались економічні інтереси. У 1860–1880 рр. прийняття обмежувальних законів співпало з кризовим становищем поміщицьких господарств. Тому протягом другої половини XIX ст. близько третини польських маєтків перейшли у власність російських поміщиків. Але із зникненням секвестрованих маєтків із поступовим виходом з кризи земельна власність на Правобережжі зосереджувалась переважно у великих землевласників польського походження, які, уміло ведучи своє господарство, скорочували можливість подібного переходу.

Про інтенсивність переходу землі до російських землевласників свідчать дані про липневі торги 1869 р. З виставлених 120 правобережних маєтків було придбано лише 43: по 7 – у Київській та Подільській губерніях і 29 – у Волинській. З грудня 1867 по липень 1869 рр. у трьох правобережних губерніях було

продано 271 маєток [2, с. 167–168]. Наприкінці 1860-х рр. у трьох правобережних губерніях домінувало польське землеволодіння, питома вага якого становила 82,6 %. Найміцніші позиції воно мало у Волинській губернії (90,7 %), слабші – у Київській (69,5 %), що можна пояснити відмінностями в розташуванні цих губерній. У Київській губернії середній розмір непольського землеволодіння дещо перевищував польське (1590,2 та 1362,1 дес.). У Подільській і Волинській губерніях, навпаки, більшим було польське землеволодіння (1078,1 проти 899,3 дес. та 1395,0 проти 778,4 дес.) [2, с. 168].

З боку польських землевласників російським покупцям на Правобережжі чинилося чимало штучних перепон на шляху придбання ними маєтків. Передусім, це звичайна необізнаність відносно маєтків, що продавалися. Пошук таких маєтків здійснювався власноруч, ознайомлення з маєтком проводив власник чи управитель, не надто зацікавлені в реалізації маєтку. У губернському правлінні також немало було людей, які прагнули затруднити купівлю маєтку росіянами. Досягали цього залякуванням потенційних покупців неминучим руйнуванням маєтків, небажанням інформувати про борги, накладені на маєток тощо. Особливий опір чинився покупцям, які планували займатися господарством особисто: непомірно підвищувалася ціна або влаштовувалися перешкоди адміністративного характеру. Якщо ж покупець виявляв бажання придбаний маєток віддати в оренду, він міг розраховувати навіть на протекцію з боку поляків та євреїв. Найменше утруднень надавала купівля великих маєтків. Вони, як правило, мали достатній кредит, тому власники їхні виступали без посередників, і ціни на землю в таких маєтках були дещо нижчими. Ще однією обставиною, яка відвертала потенційних покупців, було черезсмужжя. В окремих господарствах до 30 ділянок поміщицької землі врізалися в селянські. Наприклад, маєток Кухарі Радомишльського повіту Київської губернії площею 3 тис. дес. складався зі 174 ділянок по 0,25–130 дес. кожна [10, с. 10]. У маєтках зберігалися сервітути, які проявлявся в спільному з селянами користуванні певними ділянками для випасу худоби.

У 1884 р. генерал-губернатор О. Ігнатьєв у записці міністру внутрішніх справ Росії повідомляв, що через 20 років після прийняття вказаних законів землевласники польського походження «не втратили свого шкідливого й пануючого в краї значення», оскільки були знайдені способи оминання цього закону. До їх числа відносилась передача полякам нерухомості через здійснення різних довгострокових угод [12, арк. 2]. У такому вигляді обмежувальні закони щодо землеволодіння на Правобережжі проіснували до кінця 1884 р., коли були затверджені правила відносно придбання у власність, застави й оренди в регіоні земельних маєтностей, які підтвердили положення закону двадцятирічної давності. Проте надавалося право орендувати маєтки особам польського походження в разі облаштування ними промислового закладу. Причому, якщо протягом найближчих 12 років фабрика чи завод не були облаштовані, угода про оренду втрачала сенс. Маєтки ж, продані, заставлені чи віддані в оренду або управління особам польського походження чи євреям, відбиралися на користь казни [12, арк. 2 зв.].

Кожен з наведених законів, обмежуючи в землеволодінні певну категорію, заохочували іншу. У доповіді Миколі II з приводу селянських заворушень на Правобережжі відзначалося: «Вжиті у цих виглядах заходи були спрямовані, з одного боку, на послаблення у Західних губерніях чисельного спадкового класу, який складався з польських землевласників, а з іншого, – на залучення у край російських уродженців і до утворення з них міцно укоріненого, благонадійного в політичному відношенні землевласницького стану» [13, арк. 4 зв.]. Таким чином, для польських землевласників залишився лише один спосіб придбання нерухомих маєтків – шляхом наслідування. За таких умов поляки намагалися зосередити великі земельні ділянки в одних руках шляхом поступок на користь одного з кількох спадкоємців, що в перспективі призводило до посилення ролі великого польського землеволодіння.

Наполегливі зусилля царизму проти польського землеволодіння завершились не надто значними результатами. Згідно з підсумковою відомістю про польське землеволодіння в Україні

станом на 1890 р., складеною трьома правобережними губернаторами, на Київщині нараховувалося 837 польських маєтки (24,72 %), на Поділлі – 1257 (37,13 %), на Волині – 1292 (38,15 %). Разом – 3386 маєтків [11]. О. Ігнатьєв показував, що неофіційне застосування обмеження успадкування дало росіянам змогу скупити за три роки (1890–1893 рр.) майже стільки, скільки протягом 13 попередніх років, а саме 367,1 тис. дес.

Наприкінці 1860-х рр., як показує діаграма 1, у трьох правобережних губерніях домінувало польське землеволодіння, питома вага якого становила 82,6 %. Через 30 років після початку обмеження польського землеволодіння, незважаючи на істотне



Діаграма 1. Співвідношення польського та російського землеволодіння в Правобережній Україні наприкінці 1860-х рр., тис. дес.



Діаграма 2. Співвідношення польського та російського землеволодіння в Правобережній Україні наприкінці 1890-х рр., тис. дес.

зростання російського землеволодіння (у 3,7 рази), як засвідчує діаграма 2, росіяни володіли 51,1 % приватних земель регіону. Помітніші результати дала ця політика в Київській губернії (55,5 %). У Подільській губернії зберігалася перевага поляків (51,9 %) [1, с. 73]. Вважаючи, що продаж маєтків поляками збігався з кривою аналогічних продажів на внутрішніх теренах Росії, цар Микола II 1 січня 1896 р. схвалив нове зниження спеціального податку, накладеного на поляків. Віднині його мало сплачувати і польське, і російське дворянство, а одержані кошти призначалися на потреби дворянських інституцій: шкіл, канцелярій, платню службовцям тощо. Розміри податку становили 2–3 % прибутку з земель та лісів [14; 15].

Землеволодіння не може успішно розвиватися без дешевого кредиту, джерелом якого були земельні банки. Однак особи польського походження обмежувалися в користуванні кредитами. Відповідно до закону 1865 р. польські землевласники не мали права кредиту в державному Дворянському банку. Тому зверталися до приватних кредитних установ, сплачуючи 1,5–2,5 % річних. Лише указ 1 травня 1905 р. дозволив особам польського походження орендувати на загальних підставах землю, купувати її у власність, брати в заставу [6, с. 285].

1909 р. подільський губернатор О. Ейлер інформував генерал-губернатора Ф. Трепова про тривожне падіння частки російського дворянства: «Польське землеволодіння знову стало пропорційно посилюватися в губернії на шкоду російському землеволодінню, тим самим паралізована мета попереднього закону, яка мала державне значення, – поступове обрусіння Подільської губернії через перехід польських маєтків до російських рук». Протягом 1904–1909 рр. російське землеволодіння в регіоні скоротилося в 6 разів і жодне польське володіння не перейшло до рук росіян. Відзначалися випадки, коли польські землі продавалися навіть за нижчу ціну, але особі польського походження [16].

Незважаючи на різні перешкоди, польське дворянство достатньо неохоче продавало свої маєтки. Так, у цілому з 1862 по 1909 рр. по Україні дворяни реалізували 44,5 % землі, на

Правобережжі – лише 25 % своїх земель. Це значною мірою пояснювалося прагненням поляків зберегти політичний вплив у краї і перешкоджати його обрусінню. Опір польських поміщиків Правобережжя політиці царського уряду зумовив обмежений характер мобілізації дворянського землеволодіння Правобережжя на початку XX ст. Протягом 1901–1915 рр. воно скоротилося з 3030,2 тис. дес. до 2537,9 тис., тобто на 16,2 % [5, с. 124–125]. На початку XX ст. на Правобережжі питома вага поміщицького землеволодіння була найбільшою і по відношенню до приватного, і до загального землеволодіння – відповідно 81,9 та 38,1 %. Це були найвищі показники по Україні.

Отже, польська аристократія чинила шалений опір заходам самодержавства. Хоча росіянам і перейшла протягом сорока років майже половина польської поміщицької землі, загальне багатство поляків збільшилося, оскільки ціна землі на початку XX ст. в цілому по імперії підвищилася більше як у 6 разів у порівнянні з 1860 р. Як наслідок, ті, хто зберегли свої володіння, збагатіли напередодні Першої світової війни.

На тлі специфічної обмежувальної політики російського уряду за національною ознакою велике землеволодіння правобережних губерній піддавалося загальній соціально-економічній еволюції. На зламі XIX–XX ст. розгортався процес переходу земель від дворян до представників інших соціальних груп, передусім купців, міщан, селян, які у своїй більшості були носіями підприємницької психології. Попри це на початку XX ст. домінувало дворянське землеволодіння. Аналогічна тенденція виразно позначилася і на великому землеволодінні правобережних губерній. На відміну від інших регіонів України на Правобережжі абсолютні розміри (4843,2 тис. дес.) й відсоток його (87,6 %) були значно вищими. Поміщики-дворяни Правобережжя зазнали найменших втрат порівняно з іншими регіонами України: в Київській губернії його скорочення склало 16,1; Подільській – 11,9; Волинській – 15,5 %. Це пояснюється наявністю тут великих поміщицьких латифундій, власники яких, зосереджуючи в своїх руках значні капітали, мали можливість перейти до нового, підприємницького землеробства з елементами переробної промисловості.

Штучні заходи російського уряду, спрямовані на вибиття ґрунту з-під ніг польської аристократії як реакцію на повстання 1863–1864 рр., продемонстрували тимчасовий характер їхнього впливу. Значно більший вплив на землеволодіння справили економічні процеси, які виявилися незворотними через свій об'єктивний характер. Незважаючи на обмеження, польські землевласники шляхетського походження в українських губерніях, зміцнені капіталом в той час, коли земельна аристократія у власне російських губерніях доволі відчутно переживала процес обезземелення, переживали розквіт. Як зазначив Ю. Земський, шляхта, за переконанням її представників, була станом, створеним, щоб володіти правобережним краєм і людьми. Усі інші стани вважалися негідними рівнятися в чому-небудь зі шляхтичами [3]. Такі кастові принципи виховувалися щоденним життям протягом не десятиліть – століттями. В умовах деполітизації польських аристократів у Російській імперії їхні маєтки служили виправданням існування: у своєму маєтку поляк виступав охоронцем частки польської землі. Для більшості польських землевласників маєток був «маленькою батьківщиною», де панувало специфічне сприйняття землі. Це їх відрізняло від решти поміщиків – українців і росіян. Зведення в культ спадкової поземельної власності поміщиків з України багато чим завдячувало тиску, якого вона постійно зазнавала від росіян. Поляки, усунуті від політики царською системою, мали обмежене поле діяльності для прояву свого економічного потенціалу в громадському житті, що допомогло б їм зберегти себе на тлі неймовірних утисків. Отже, маєтки служили для них і притулком, і місцем реалізації життєвої енергії, і, певною мірою, сенсом життя.

Література

1. *Бовуа, Д.* Битва за землю в Україні 1863–1914. Поляки в соціо-етнічних конфліктах / Д. Бовуа. – Київ: Критика, 1998. – 334 с.

2. *Воейков, Д.* Киевская губерния. Статистические сведения о распределении землевладения, о ценности имения и о крестьянском деле / Д. Воейков, В. Загоскин. – СПб., 1867. – С. 155–156.

3. *Земський, Ю.* Українсько-польське непорозуміння в ході повстання 1863 року / Ю. Земський [Електронний ресурс]. – Режим доступу: www. myslenedrevo. com. ua

4. *Мещерский, В. П.* Очерки нынешней общественной жизни в России / В. П. Мещерский. – Вып. 2. – СПб., 1870. – 450 с.

5. *Опря, А. В.* Покупные операции Крестьянского банка на Украине в годы столыпинской аграрной реформы / А. В. Опря // Актуальные проблемы аграрной истории Украинской ССР. – Днепропетровск: ДГУ, 1981. – С. 121–129.

6. ПСЗ. Собрание III. Т. XXV. 1905. Отделение I. – СПб., 1908.

7. Російський державний історичний архів (далі – РДІА). – Фонд 1283. – Оп. 1. – Спр. 181.

8. РДІА. – Фонд 1283. – Оп. 1. – Спр. 181а.

9. *Степанишина, О.* Господарство Браницьких на Київщині і реформа 1861 р. / О. Степанишина // Студії з історії України науково-дослідчої кафедри історії України в Київі. – Т. 3. – 1930. – С. 117–132.

10. Труды комиссии по описанию имений, состоящих при Киевском обществе сельского хозяйства и сельскохозяйственной промышленности. – Киев, 1893. – 231 с.

11. Центральний державний історичний архів України в Києві (далі – ЦДІАК України). – Фонд 442. – Оп. 611. – Спр. 217.

12. ЦДІАК України. – Фонд 442. – Оп. 613. – Спр. 81.

13. ЦДІАК України. – Фонд 442. – Оп. 613. – Спр. 463.

14. ЦДІАК України. – Фонд 442. – Оп. 657. – Спр. 13.

15. ЦДІАК України. – Фонд 442. – Оп. 663. – Спр. 9.

16. ЦДІАК України. – Фонд 848. – Оп. 1. – Спр. 37.

Резюме

Н. Р. ТЕМИРОВА

КРУПНОЕ ЗЕМЛЕВЛАДЕНИЕ В ПРАВОБЕРЕЖНОЙ УКРАИНЕ В КОНТЕКСТЕ ВОССТАНИЯ 1863–1864 гг.

В центре внимания – политика российского правительства, направленная на ограничение польского землевладения после восстания 1863–1864 гг., известная как «обрусение Юго-Западного края». Принятие ограничительных законов совпало с кризисом помещичьих хозяйств. В результате на протяжении второй половины XIX в. около трети польских имений перешли в собственность российских помещиков. Со стороны польских землевладельцев российским покупателям оказывались искусственные преграды на пути покупки имений. В силу этого полностью подорвать экономические позиции польских землевладельцев не удалось. Сопротивление польских помещиков Правобережья политике царского правительства обусловило ограниченный

характер мобилизации дворянского землевладения Правобережья в начале XX в. Для большинства польских землевладельцев имение выступало «малой родиной», где господствовало специфическое восприятие земли.

Рэзюмэ

Н. Р. ЦЕМІРАВА

БУЙНОЕ ЗЕМЛЕЎЛАДАННЕ Ў ПРАВАБЯРЭЖНАЙ УКРАІНЕ Ў КАНТЭКСЦЕ ПАЎСТАННЯ 1863–1864 гг.

У цэнтры ўвагі – палітыка расійскага ўраду, накіраваная на абмежаванне польскага землеўладання пасля паўстання 1863–1864 гг., вядомая як «абрусенне Паўднёва-Заходняга краю». Прыняцце абмежавальных законаў супала з крызісам памешчыцкіх гаспадарак. У выніку на працягу другой паловы XIX ст. каля траціны польскіх маёнткаў перайшлі ў прыватнасць расійскіх памешчыкаў. З боку польскіх землеўласнікаў расійскім пакупнікам аказваліся штучныя перашкоды на шляху прыдбання маёнткаў. Па гэтай прычыне цалкам падарваць эканамічныя пазіцыі польскіх землеўласнікаў не ўдалося. Супраціў польскіх памешчыкаў Правабярэжжа палітыцы ўрада абумовіў абмежаваны характар мабілізацыі шляхецкага землеўладання ў пачатку XX ст. Для большасці полькіх землеўласнікаў маёнтак выступаў «малай радзімай», дзе панавала спецыфічнае ўспрыняцце зямлі.

Summary

N. TEMIROVA

LARGE ESTATE OWNERSHIP IN THE RIGHT-BANK UKRAINE IN THE CONTEXT OF THE 1863–1864 REBELLION

The present paper sheds light at the Russian government's policy on limiting land ownership, known as «Russification of the Southwestern Region», after the Polish uprising of 1863–1864. Adoption of restrictive laws coincided with crisis of the landed estates. As a result, during the second half of the XIX century about a third of Polish estates became the property of Russian landowners. In turn, Polish landlords obstructed buying estates by purchasers from Russia. Because of this, their economic wellbeing could not be completely undermined. The Right Bank Polish landlords' opposition to the tsarist government's policies caused a limited mobilization of the Right Bank nobles in the early XX century. For the majority of the Polish landowners estate played a role of the «little homeland» with its specific perception about land.

Паступіў у рэдакцыю 12.12.2013

УДК 94 (476.6) «1861–1864»

В. В. ШВЕД

ГРОДЗЕНСКАЯ ВАЯВОДСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ 1861–1864 ГАДОЎ

Стварэнне гродзенскай ваяводскай рэвалюцыйнай арганізацыі трэба звязваць з расійскім і польскім рэвалюцыйным рухам. Да лета 1861 г. у Расійскай імперыі пад уплывам М. Чарнышэўскага і М. Дабралюбава завяршылася станаўленне патаемнага таварыства «Зямля і воля». Ідэйныя сувязі яно мела з выдаўцамі «Колокола» А. Герцэнам і М. Агаровым. Варта прывесці словы апошняга: «Патаемныя таварыствы, маючыя мэтай ператварэння імперыі рабства ў саюз самакіравання, натуральна з'явяцца па вобласцям і стануць імкнуцца да аб'яднання» [9, с. 539]. Другая рэвалюцыйная арганізацыя ўзнікла ў Пецярбургу пад кіраўніцтвам З. Серакоўскага і Я. Дамброўскага (у яе ўваходзілі браты Каліноўскія). Яна была звязана з першай і таксама прапагандавала ідэю рэвалюцыйнага саюзу прыгнечаных народаў.

Гродзенская ваяводская рэвалюцыйная арганізацыя стваралася ва ўмовах узмацнення на Гродзеншчыне сялянскага руху пасля палавінчатай і рабаўніцкай адмены прыгоннага права. Лютаўскія падзеі 1861 г. у Варшаве таксама звязаны з рэформай 1861 г. Яна не тычылася Каралеўства Польскага (там ужо не было прыгонных), але тут сялянскае пытанне не было вырашана канчаткова – патрэбна было адмяніць феадальныя павіннасці і надзяліць сялян зямлёй. 27 лютага варшаўскія рэвалюцыйныя гурткі правялі дэманстрацыю з мэтаю аказання ціску на сяброў Земляробчага таварыства (пасяджэнні якога адбываліся з 21.02), якія не збіраліся адмаўляцца ад прыгонніцкіх метадаў эксплуатацыі.

Менавіта пасля растрэла варшаўскіх дэманстрантаў (забіта 5 чал. і некалькі дзесяткаў паранена) у Сакулцы, у доме В. Урублеўскага, сустрэліся В. Урублеўскі, Э. Заблоцкі, К. Каліноўскі,

С. Сангін, ксёндз Я.-І. Казлоўскі. Пазней Заблоцкі на следстве паказаў, што размова ішла пра варшаўскія падзеі. Каліноўскі і Урублеўскі паведамілі аб тым, што хутка павінна быць створана «арганізацыі народнага польскага ўрада па ўсёй Літве» і прапанавалі яму прыняць у ёй удзел. Сільвястровіч у сваіх паказаннях называў іншую дату – другая палова 1862 г. [5, арк. 304; 6, арк. 28 адв.].

Тэрытарыяльна-адміністрацыйная структура і кіраўніцтва падпольнай арганізацыі ў Польшчы, Літве і Беларусі ўтваралася згодна са Статутам Агатона Гілера (ліпень 1862 г.): ваяводства – ваявода, павет – павятовы, акруга – акруговы, сотня – сотнік, дзесятка – дзесяцкі. У Літве і Беларусі, як пісаў Оскар Авейдэ, «усе свае намаганні звярталі выключна на ўсталяванне галоўных ваяводскіх органаў», не стваралі дзясяткі, а для ўзмацнення прапаганды сярод сялян арганізоўвалі «начальнікаў прыходаў» [1, с. 451, 487; 8, арк. 10 адв.]. Свае начальнікі былі ў мястэчках (неабавязкова), ваяводскіх гарадах (Гродна, Вільні, Мінску, Коўна) і ў паветах.

Спачатку (верагодна, з канца лютага 1861 г.) Гродзенскае ваяводства было падзелена на 2 часткі. Ваявода быў адзін, ён меў 2 памочнікаў [12, с. 3]. Рассылалі паперы з ваяводскага бюро Геніўша па ўсіх паветах. З пачатку паўстання, прыкладна, з сакавіка 1863 г., Гродзенскае ваяводства падзялілі на 3 часткі: Гродзенскі, Ваўкавыскі і Слонімскі паветы ўзначаліў нам. ваяводскага камісара Э. Заблоцкі; Сакольскі, Беластоцкі і Бельскі падпарадкавалі В. Урублеўскаму; Брэсцкі, Кобрынскі і Пружанскі падначалілі цывільнаму ваяводзе Гафмайстру. Верагодна, з адыходам Урублеўскага з паўстанцкім атрадам у лясы (жнівень 1863 г.) адбыліся чарговыя змены: Гродзенскі, Ваўкавыскі, Слонімскі, Сакольскі і Беластоцкі паветы склалі Паўночнае ваяводства (яго ўзначальваў Заблоцкі, затым Сільвестровіч); Брэсцкі, Кобрынскі, Пружанскі і Бельскі паветы склалі Паўднёвае ваяводства (тут ваяводаю быў Гафмайстар з месцам знаходжання ў Брэсце) [4, с. 158–159; 7, арк. 103].

Чыноўнікі-кіраўнікі розных структур ваяводскай арганізацыі мелі адпаведныя функцыі. Цывільны ваявода спачатку быў адзіны на Гродзенскую губерню, а потым да яго дабавілі 2 памочнікаў, бо адбыўся падзел губерні на 2 часткі. Па сутнасці яны ўсе дзейнічалі самастойна і падпарадкоўваліся толькі ўрадаваму камісару. Пры ваяводзе існавала ваяводскае бюро (начальнікам яго быў І. Геніўш). Ваявода ажыццяўляў рэвізію паўстанцкіх атрадаў, распараджаўся іх дзеяннямі, назіраў за дзейнасцю чыноўнікаў падпольнай арганізацыі, рабіў распараджэнні па ваяводстве ў выкананні загадаў органаў кіравання паўстаннем і сваіх асабістых, прызначаў на пасады павятовых, начальнікаў прыходаў і патрабаваў ад іх справаздачы. Ваяводскімі былі А. Гафмайстар, Э. Заблоцкі, Л. Пенькоўскі, С. Сільвястровіч.

Начальнікі гарадоў займаліся зборам сродкаў на паўстанне, шукалі годных людзей і адпраўлялі іх у партызанскія атрады, сачылі за паводзінамі насельніцтва, уладаў і ўрадавых войск. Ім былі падпарадкаваны жаночыя гарадскія камітэты апекі паўстанцаў, якія мелі мэтаю далучыць да паўстання жанчын. Вядомы наступныя начальнікі гарадоў: Гродна (У. Жалкоўскі, Ю. Руткоўскі), Беластока (А. Белакоз), Кобрына (Р. Траўгут), Саколкі (А. Лебядзінскі), Слоніма (В. Вільчэўскі), Ваўкавыска (Ю. Мушынскі).

Дзейнасць павятовых (было тады ў Гродзенскай губерні дзевяць) рэгулявалася інструкцыяй Літоўскага правінцыяльнага камітэта (Інструкцыя для павятовых). Паводле яе, павятовыя выконвалі загады ваяводскага і падавалі яму рапарт аб стане павета. Яны павінны былі ўтрымліваць павятовую касу і ўзмацняць сродкамі галоўную касу Камітэта, збіраць праз акруговых падатак з асоб, належачых да арганізацыі, збіраць асобную складку на зброю, падтрымоўваць сувязь з акруговымі не менш аднаго разу ў тыдзень, арганізоўваць тайную паліцыю ў павеце, шукаць сабе здольных памочнікаў [3, с. 91–93]. Пасады павятовых займалі: Н. Алдакоўскі, У. Міхайлоўскі (Беластоцкі павет), М. Гліндзіч, С. В. дэ Сандон Пансэт (Ваўкавыскі),

К. Дашкевіч (Крынскі), М. Жукоўскі (Пружанскі), Я. Каменскі (Гродзенскі), Я. Канаткевіч (Брэсцкі), Л. Пенькоўскі (Бельскі), У. Сімановіч, Ю. Стравінскі (Слонімскі), В. Урублеўскі (Сакольскі).

Павятовыя мелі наступных памочнікаў – акруговых начальнікаў і 3–5 рэферэнтаў, які займаліся даручанымі справамі. Інструкцыя для акруговых начальнікаў утрымлівала 21 пункт, у якіх пералічваліся іх абавязкі. Акруговы кіраваў парафіяльнымі і гміннымі начальнікамі, прымаў ад іх прысягу на поўнае падпарадкаванне і захаванне таямніцы, сачыў за выкананнем імі абавязкаў (весці рэвалюцыйную прапаганду, рыхтаваць і вывучаць зброю, збіраць падаткі), атрымоўваў ад іх падатковыя грошы, падтрымоўваў сувязь з падначаленымі не менш аднаго разу на тыдзень [3, с. 93–94]. Акруговых, напрыклад, у Гродзенскім павеце было пяць, адпаведна 5 станам: Азёрскі (П. Пакубята), Індурскі (Е. Рэдых), Луненскі, Крынскі, Скідзельскі. У Пружанскім павеце адным з акруговых быў А. Акінчыц, у Сакольскім – Ю. Алендскі, І. Астраменскі. Парафіяльныя начальнікі былі падпарадкаваны павятовым і займаліся тым самым, што і яны, але толькі ў межах сваёй парафіі. Вядомы ваўкавыскі парафіяльны начальнік І. Ляскоўскі.

Вайсковы рэферэнт (вядомы прозвішчы некаторых з іх – Я. Грынявіцкі, Ю. Вайсятыч, Ч. Калупайла) вербаваў людзей у атрады, збіраў зброю, харчаванне, вопратку і іншае патрэбнае паўстанцам. Касір займаўся прыёмам сабраных грошаў на паўстанцкую справу, рабіў фінансавыя справаздачы. Сярод іх можна назваць Ф. Бартноўскага (Брэсцкі павет), У. Церпілоўскага, Ю. Сержпутоўскага (Сакольскі павет), І. Маркевіча (Гродзенскі павет), С. Ромера (Гродна). Рэферэнт апекі (напрыклад, гродзенцы Ф. Багатка і Л. Абрэмскі, у Пружанскім павеце – А. Глухоўскі, у Ваўкавыскім – У. Тарасовіч) турбаваўся пра параненых, збіраў бялізну для партызанскіх атрадаў, апекаваў сем'і бедных паўстанцаў або ўдоў. Рэферэнт камунікацыі ўладкоўваў зносіны па павеце і станцыі перадачы рэвалюцыйнай карэспандэнцыі. Такія станцыі, напрык-лад, існавалі ў маёнтку Калбасіна, адкуль карэспандэнцыя ішла ў Ваўкавыскі і Сакольскі паветы; а таксама ў Навасёлках памешчыка У. Спірыдовіча.

Урадавы ваяводскі камісар павінен быў пастаянна сачыць за мясцовай рэвалюцыйнай адміністрацыяй, за выкананнем яе рашэнняў, дакладаць аб яе дзеяннях у ЛПК і ЦНК [8, арк. 10 адв. – 13 адв., 42 адв., 43 адв]. Тры чалавекі займалі гэтую пасаду: В.-К. Каліноўскі, Э. Заблоцкі і яго брат Б. Заблоцкі.

Каля 20 студзеня (5.02) 1863 г. ЛПК выдаў «Інструкцыю для ваенных начальнікаў, ваяводскіх і павятовых» і «Паўстанцкую інструкцыю». Камітэт заклікаў падняць узровень паўстанцкай агітацыі, заклікаць у атрады сялян і неадкладна праводзіць аграрную рэформу. Камандзіры партызанскіх атрадаў абавязваліся караць смерцю «найбольш злосных прыгнятальнікаў сялян». У абавязкі начальніка Гродна і Гродзенскага цывільнага ваяводы ўваходзіла:

– даводзіць да ведама партызанскіх атрадаў аб руху расійскіх войскаў і пра ўсё, што робіцца ў горадзе і губерні;

– выдаваць атэстаты (характарыстыкі) аб паводзінах і здольнасцях асоб, якіх адпраўлялі ў атрад;

– распараджацца фінансавымі сродкамі;

– аддаваць загады асобам, якія належалі рэвалюцыйнай арганізацыі;

– ва ўсім садзейнічаць паўстанцам [7, арк. 7].

Каля 28 кастрычніка 1862 г. ЛПК выдаў дзве інструкцыі: «Для павятовых начальнікаў» і «Для акруговых начальнікаў». У іх былі вызначаны абавязкі гэтых чыноўнікаў. Начальнік павета (павятовы) павінен быў:

– атрымліваць загады ад ваяводскага ці яго памочніка і ім жа падаваць рапарты пра стан павета (пра колькасць чальцоў арганізацыі, іх дзейнасць, стан павятовай касы, нацыянальны настрой і баявы дух усіх саслоўяў, колькасць і якасць зброі, урадавыя распараджэнні, пераследаванні і рух войска, дзейнасць асоб, якія не належалі да арганізацыі, пра сувязь з арміяй);

– утрымліваць павятовую касу, узмацняць сродкамі (збіраць праз акруговых падаткі ад асоб, якія належаць да арганізацыі, а таксама складкі ад тых, хто не належыць да арганізацыі), збіраць асобныя складкі на пакупку зброі і весці дакладны рахунак;

– прызначаць акруговых і падтрымоўваць з імі сувязь не менш за адзін раз на тыдзень, прымаць ад іх рапарты;

– адшукваць здольных людзей для адпраўкі ў партызанскія атрады, сабе памочнікаў, памочнікаў для выканання паліцэйскіх абавязкаў;

– збіраць ці купляць вопратку, абутак, харчаванне, зброю і інш.; патрабаваць таго ж ад сваіх падначаленых па арганізацыі [3, с. 91–93; 7, арк. 8].

Важную ролю надавалі чыноўнікі падпольнай арганізацыі канспірацыі. У Інструкцыях ЛПК для павятовых і акруговых начальнікаў (каля 28 кастрычніка 1862 г.), у пункце II гаварылася, што павятовыя ад акруговых, а акруговыя ад парафіяльных і гмінных начальнікаў, дзясятнікаў і сотнікаў павінны прыняць прысягу «на поўнае падпарадкаванне і захаванне таямніцы як на свабодзе, так і ў турме» [3, с. 91]. Дзейнічала правіла – першы не ведае трэцяга. Многія чальцы арганізацыі, калі іх на допытах у следчых камісіях прасілі назваць іншых, адгаворваліся няведаннем менавіта па гэтай прычыне. Напрыклад, І. І. Геніўш казаў на следстве: «Хто быў Начальнікамі ўездаў і іншых местаў рэвалюцыйнай партыі мне невядома, таму што прынята было, каб аб гэтым не ведалі падначаленныя». Не ведалі ўсіх чальцоў і кіраўнікі. Напрыклад, Ражанскі на следстве назваў некаторыя імёны, а потым адзначыў, што іншых не ведае па прозвішчу, бо асабіста не знаёмы ці навогул ніколі не бачыў [7, арк. 101 адв.; 11, с. 396].

Улады гродзенскай ваяводскай рэвалюцыйнай арганізацыі падпарадкоўваліся з восені 1861 г. да лета 1862 г. Камітэту руху, які затым рэарганізаваўся ў Літоўскі правінцыяльны камітэт у Вільні (ЛПК, па Авейдэ «не раней жніўня месяца 1862 г.»). 13.02.1863 г. ЛПК аб'явіў сябе Часовым правінцыяльным урадам Літвы і Беларусі. З прыходам да ўлады «белых» 11 сакавіка 1863 г. ЛПК пераўтвораны ў Літоўскае выканаўчае Аддзяленне, якое кіравала правінцыямі Літвы.

З першай паловы лістапада 1862 г. да пачатку сакавіка 1863 г. чальцамі ЛПК былі: Эдмунд Вярыга, Сігізмунд Чаховіч, Канстанцін Каліноўскі, Ахілес Банольдзі, Якаў Казэла, Баляслаў Длускі. З пачаткам паўстання чальцамі выканаўчага Аддзялення

сталі: Якаў Гейштар, Аляксандр Аскерка, Францішак Далеўскі, Антон Яленскі, Уладзімір Малахоўскі. Пасля значных арыштаў у маі 1863 г. (у Вільна з'явіўся Мураўёў) кіруючае ядро папоўнілі: А. О. Авейдэ, Юзэф Каліноўскі, К. Каліноўскі, сакратаром стаў Фелікс Зянковіч, са старых засталіся Малахоўскі і Гейштар [1, с. 487, 522, 542, 616].

Віленскае кіраўніцтва ўзгадняла сваю дзейнасць з Цэнтральным нацыянальным камітэтам (ЦНК) у Варшаве, які кіраваў паўстаннем у Польшчы, Літве і Беларусі. Прадстаўнік ЦНК быў у складзе віленскага кіраўніцтва (Нестар Дзюлеран). Але ў час, калі пры ўладзе былі «чырвоныя» на чале з Каліноўскім, яны праяўлялі сепаратызм у адносінах да ЦНК: пра гэта гаварыла сама назва органа («літоўскі»), грошы, якія збіраліся ў Літве і Беларусі, заставаліся на месцы і выкарыстоўваліся на свае патрэбы. ЦНК вымушаны быў прызнаць самастойнасць ЛПК. Вось, што пісаў Станіслаў Ажэшка, начальнік рэвалюцыйнай паліцыі ў Вільні: «З дня беспарадкаў у краі стварыўся Літоўскі камітэт, які, спачатку мала залежыў ад Варшаўскага. Пазней, набыўшы большую сувязь з Варшаўскім камітэтам, ён быў перайменаваны ў «Аддзел, кіруючы Літвой» («Wydzial zarzadzajacy prowicjami Litwy»), а затым, падпаўшы ў большую залежнасць, атрымаў назву «Аддзел выканаўчы на Літве» («Wydzial wukonawczy na Litwie»), пад якім і існаваў апошні час [3, с. 188].

Зімой 1864 г. гродзенская ваяводская рэвалюцыйная арганізацыя перастала існаваць. Паводле даных даследчыка Ежы Краскоўскага, яна налічвала каля 300 чалавек [2, арк. 4]. Для дазнання арыштаваных паўстанцаў (звыш 100 чал.) былі створаны дзве гродзенскія губернскія ваенна-следчыя камісіі па палітычных справах. Яны шчыльна супрацоўнічалі з падобнымі камісіямі іншых губерняў. Ад іх дзейнасці засталіся ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі дакументы і матэрыялы, на аснове якіх мы склалі свае біяграмы чальцоў гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі. Падобнага да гэтага часу зроблена не было.

Звернем увагу на сацыяльны склад гродзенскай ваяводскай рэвалюцыйнай арганізацыі. Каліноўскі і яго паплечнікі папаўнялі свае шэрагі перш за ўсё за кошт разначыннай інтэлі-

генцыі (вясковыя настаўнікі, валасныя пісары, студэнты, чыноўнікі і інш.). Каліноўскі гаварыў Э. Заблоцкаму, што хацеў бы, каб у арганізацыі «было болей людзей аднаго з ім стану, гэта значыць не належачых да классу памешчыкаў, інакш апошнія забяруць уладу ў свае рукі» [6, арк. 48; 10, с. 491]. Адпаведна і погляды чальцоў былі рэвалюцыйна-дэмакратычныя («чырвоныя»): падрыхтоўка мас да народнай рэвалюцыі з мэтаю звяржэння самадзяржаўя, дасягненне нацыянальнай самастойнасці і ліквідацыя прыгонніцтва [9, с. 396].

Такім чынам, Гродзенская ваяводская арганізацыя, створаная пад уплывам расійскага і польскага рэвалюцыйных рухаў і ў агульных умовах паслярэформеннага развіцця, мела свае асаблівасці ў тэрытарыяльна-адміністрацыйнай структуры, дзейнасці чыноўнікаў-кіраўнікоў структурных падраздзяленняў, арганізацыйнай падпарадкаванасці і сацыяльным складзе чальцоў.

Літаратура

1. *Авейде, О.* Показания и записки о польском восстании 1863 года / О. Авейде – М.; Вроцлав: Изд-во АН СССР, 1961 г. – 663 с.

2. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. – Фонд 104. – Спр. 77.

3. *Каліноўскі, К.* За нашую вольнасць: тв., дак. / уклад., прадм., пасл. і камент. Г. Кісялёва. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 1999. – 464 с.

4. *Ковкель, И. И.* Гродненская революционно-демократическая организация / И. И. Ковкель // Гродно: энцикл. справ.: Беларус. энцикл., 1989. – С. 158–159.

5. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 21.

6. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 40.

7. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 3. – Воп. 3. – Спр. 1.

8. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 3. – Воп. 3. – Спр. 4

9. *Огарев, Н. П.* Избранные социально-политические и философские произведения. – Т. 1. – М.: Госполитиздат, 1952. – 862 с.

10. Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861–1862 гг. – М.: Наука, 1964. – 707 с.

11. *Rozanski, F.* Z wojewodstwa grodzienskiego: czterdziesta rocznice powstania styczniowego. 1863–1864. – Lwow, 1903. – S. 396–400.

12. *Jodkowski.* Notatki i uzupelnienia selwetek z r. 1863 / Jodkowski // Echo Grodzienski. – 1923. – № 17. – S. 3.

Резюме

В. В. ШВЕД

ГРОДНЕНСКАЯ ВОЕВОДСКАЯ РЕВОЛЮЦИОННАЯ ОРГАНИЗАЦИЯ 1861–1864 ГОДОВ

Утверждается, что Гродненская воеводская организация была создана под влиянием российского и польского революционных движений – братья Калиновские имели связи с организаторами российских тайных общества «Земля и воля» и кружка Сераковского-Домбровского; а сразу после демонстрации революционных кружков 27 февраля в Варшаве состоялось организационное собрание гродненских повстанцев в Сокулке. Гродненская организация, по мнению автора, складывалась в условиях усиления на Гродненщине крестьянского движения после половинчатой и грабительской отмены крепостнога права.

Делается вывод, что Гродненская организация имела свои особенности в территориально-административной структуре – не создавались десятки, а для усиления пропаганды среди крестьян организовывались приходы. Калиновский и его соратники пополняли ряды чиновников организации в первую очередь за счет разночинной интелигенции (сельских учителей, волостных писарей, студентов, чиновников и т. п.). В организационной подчиненности особенность гродненской организации проявилась во время правления «красных» под руководством Калиновского: сепаратизм по отношению к ЦНК.

Summary

V. SHVED

GRODNO PROVINCIAL REVOLUTIONARY ORGANIZATION 1861–1864 PERIOD

This article argues that the Grodno Provincial organization was created under the influence of Russian and Polish revolutionary movements – Kalinovskys brothers had ties to Russian organized secret society «Land and Freedom» and mug Serakovski-Dombrowski, and immediately after the demonstration of revolutionary circles in Warsaw on February 27 held an organizational Grodno meeting rebels in Sokółka. Grodno organization, according to the author, was formed in the face of increasing peasant movement in region Grodno after predatory reform 1861 year.

The author concludes that the Grodno organization had its own peculiarities in the administrative-territorial structure – not created dozens, and to strengthen the propaganda among the peasants organized parishes. Kalinowski and his companions joined the ranks of officials in the organization primarily due raznochintsy inteligentsii (rural teachers volastnyh clerks, students, officials, etc.). In the organizational subordination feature Grodno organization emerged during the reign of the «red» under the leadership of Kalinowski: separatism towards CNK.

Паступіў у рэдакцыю 16.12.2013

УДК 272–725–9 + 94](476–89 + 474.5–89)«1863/1864»

В. В. ЯНОЎСКАЯ

КАТАЛІЦКАЕ ДУХАВЕНСТВА Ў ПРАТЭСТНЫХ АКЦЫЯХ НАПЯРЭДАДНІ ПАЎСТАННЯ 1863–1864 гг.

Да гэтага часу спецыяльных прац па праблеме ўдзелу рымска-каталіцкага духавенства ў студзеньскім паўстанні так і не з'явілася. Тым не менш менавіта гэты аспект агульнай праблемы – удзел духавенства розных канфесій Беларусі ў паўстанні – атрымаў значна больш увагі ў параўнанні з астатнімі. Прычым як у айчыннай, так і ў замежнай гістарыяграфіі.

У расійскай гістарыяграфіі XIX – пачатку XX ст. панавала канцэпцыя пра тое, што рымска-каталіцкія ксяндзы і манахі былі галоўнай ідэйнай сілай гэтага паўстання. Хаця ўжо ў тыя часы з прац асобных расійскіх аўтараў вымалёўвалася, што характарызаваць удзел рымска-каталіцкага духавенства ў паўстанні так адназначна неправамоцна.

Новы метадалагічны падыход да ацэнкі паўстання 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі пачаў распрацоўвацца ў 1920-я гг. у звязку са станаўленнем беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі. Але што тычылася вызначэння ролі духавенства ў паўстанні, дык гэты аспект цалкам выпаў з поля зроку даследчыкаў. Змена ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў СССР і БССР (у першую чаргу палітычныя рэпрэсіі супраць дзеячаў «Другога беларускага адраджэння» напрыканцы 1920-х гг.) паўплывала на ўзнікненне іншага канцэптуальнага падыходу ў беларускай гістарыяграфіі ў адносінах да асвятлення студзеньскага паўстання. Па сутнасці гэта было не столькі стварэнне новай, колькі адраджэнне старой расійскай дарэвалюцыйнай канцэпцыі аб тым, што паўстанне 1863 г. было арганізавана памешчыкамі і духавенствам і праходзіла яно пад выключна шавіністычнымі

лозунгамі [1, с. 15]. З агульнага канцэптуальнага кантэксту выпадала праца С. Цітовіча «1863 год у Горы-Горках быўшай Магілёўскай губерні», у якой аўтар сцвярджаў, што паўстанне ў Горках было падрыхтавана галоўным чынам гадаванцамі горацкіх навучальных устаноў [2, с. 309].

Матэрыялістычны падыход дыктаваў гісторыкам неабходнасць выпрацоўкі новай канцэпцыі, сутнасць якой заключалася ў ацэнцы паўстання як праявы барацьбы класаў. Што тычылася рэлігійнага аспекту, то ён практычна адсутнічае і ў працах гэтага перыяду.

Новы віток даследаванняў па праблеме назіраецца з 1990-х гг. І адносіцца гэта як да беларускай, так да польскай і расійскай гістарыяграфій. Прычым у польскай гістарыяграфіі цікавасць у адносінах да беларускай тэрыторыі па-ранейшаму выклікае, галоўным чынам, папярэдні (маніфестацыйны) перыяд паўстання і рэпрэсіўныя меры пасля яго [3]. У расійскай – рэпрэсіі і высылка духавенства ў Сібір [4]. Дарэчы, гэта пацвярджае і тэматыка артыкулаў дадзенага зборніка з боку расійскіх аўтараў.

Што датычыць прац расійскай гістарыяграфіі, якія прэтэндуюць на выпрацоўку агульна канцэптуальнага падыходу падачы паўстання, то ў іх, як і раней, звычайна абыходзіцца тэрыторыя Беларусі ў цэлым, і канфесійны складнік у прыватнасці. Але імперская традыцыя, няхай сабе і ў новым кантэксце, відавочна, дамінуе ў такіх працах. Так, у кнізе У. Вароніна характарыстыка дзеянняў мясцовых уладаў, у тым ліку і асабіста Мураўёва, атрымала наступную ацэнку: «Какой богатый, поистине бесценный опыт ***этнокультурного диалога*** (падкрэслена мною. – *В. Я.*) был накоплен этими самоотверженными, добросовестными и деятельными выразителями государственной воли!» [5, с. 7]. Такім чынам, аказваецца, што дзеянні мясцовых уладаў супраць удзельнікаў паўстання, і ў прыватнасці супраць каталіцкага духавенства – гэта этнакультурны дыялог. У ацэнцы ж беларускай гістарыяграфіі (у большасці сваёй) гэтыя моманты атрымалі іншую назву – увядзенне абмежавальных законаў, або рэпрэсіўныя дзеянні супраць каталіцкага касцёла.

Паўстанне 1863–1864 гг. у першую чаргу закранула дзве асноўныя хрысціянскія канфесіі Беларусі – праваслаўную і каталіцкую. Ацэнка ролі каталіцкага духавенства, хоць яна і разыходзіцца ў катэгарычнасці асноўных высноў і асэнсаванні асобных аспектаў, больш-менш адназначная па сваёй сутнасці: значная частка духавенства была на баку паўстанцаў. Асэнсаванне ж канкрэтнага праяўлення гэтай пазіцыі, яе грамадзянскага і канфесійнага складнікаў, патрабуе, на нашу думку, больш дэталёвага разгляду шэрагу аспектаў, сярод якіх вылучаецца і аспект удзелу каталіцкіх святароў у акцыях пратэсту насельніцтва напярэдадні паўстання.

Пратэстныя антыўрадавыя акцыі ў папярэдні (маніфестацыйны, згодна з польскай гістарыяграфіяй) перыяд паўстання пачаліся ў касцёлах беларуска-літоўскіх губерняў пад уплывам падзей, што адбыліся ў Варшаве 27 лютага 1861 г. Тады, у час разгону дэманстрацыі, загінула некалькі чалавек, пахаванне якіх адбылося 2 сакавіка 1861 г. [6]. Гэты дзень і стаў пачаткам касцёльных дэмаршаў, у якіх вельмі шчыльна перапляліся рэлігійныя і палітычныя матывы і якія з Варшавы паступова распаўсюдзіліся на ўсход, у накірунку беларуска-літоўскіх губерняў.

У касцёлах Беларусі, як і ў іншых месцах Расійскай імперыі, служылі паніхіды па забітых у Варшаве, многія католікі насілі жалобнае адзенне са спецыяльнымі знакамі. І хоць нашэнне жалобнага адзення па памерлых ці загінуўшых справа звычайная, масавае выкарыстанне гэтага звычаю на пачатку 1860-х гг. успрымалася як дэманстрацыя негатыўных адносін да расійскіх улад, жалоба па Айчыне – Рэчы Паспалітай, надзея на яе адраджэнне. Звесткі аб паніхідах і нашэнні жалобнага адзення паступалі з усіх куткоў Беларусі. Улады забаранялі нашэнне сімвалаў жалобы і іншых «рэвалюцыйных» адзнак. Але жаданых вынікаў гэтыя забароны не прыносілі [7, с. 116, 117].

Прычына палягала ў тым, што жалобныя набажэнствы адбываліся ў рамках рэлігійных канонаў рымска-каталіцкай царквы і выкрыць сакрытую сутнасць падзеі, яе пратэстны падтэкст, было даволі цяжка паліцэйскім чыноўнікам праваслаўнага

веравызнання. Тыя ж, хто належыў да каталіцкай веры, як правіла, знаходзілі розныя падставы для адмаўлення чакаемага ад іх сведчання.

Касцёльныя дэмаршы мелі сваё праяўленне і праз іншыя, яўна накіраваныя на пратэст, формы: сцэнічныя набажэнствы (прымеркаваныя да якой-небудзь падзеі і зладжаныя ў форме маленькай тэатральнай пастаноўкі), спевы патрыятычных гімнаў. Часцей за ўсё ў касцёлах Беларусі гучаў гімн «Божа, які Польшчу!». Адзін з членаў следчай камісіі, створанай у Мінску, назваў яго гімнам «о возвращении вольности Польше, всему народу Литовскому». «Гимн этот, – падкрэсліваў ён, – имеет замечательное выражение: *дай всем равенство и одно название*. Уже приняты все меры, чтобы гимн этот был разучен всем народом во время предстоящих 6 недель рождественского поста <...> и чтобы, ежели не во всех Православных, то по крайне мере во всех бывших Униатских Церквях на первый день Рождества народ, называемый Россию православной и древлерусской, грянул этот гимн дружно, повсеместно» [8, с. 380].

Захавалася даволі шмат узгадкаў пра тое, у якіх касцёлах Беларусі і калі адбываліся спевы патрыятычных гімнаў. Але нават па судовых дакументах цяжка высветліць у кожным канкрэтным выпадку тую непасрэдную ролю, што адыгрывалі ў гэтых акцыях ксяндзы. Так, у фондзе мінскага павятовага суда Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі з 13 спраў аб касцёльных спевах за верасень–лістапад 1861 г. толькі адна ўтрымлівае звесткі аб непасрэдным удзеле ксяндза [9–21].

Архіўныя звесткі дазваляюць устанавіць два асноўныя сцэнарыі (імправізаваны і спецыяльна падрыхтаваны), па якіх развіваліся падзеі. Мяркуючы па архіўных дакументах, у беларускіх касцёлах пераважала першая (імправізаваная) мадэль арганізацыі спеваў. Звычайна пасля літургіі хтосьці з прысутных пачынаў спяваць патрыятычны гімн, а прысутныя на набажэнстве без папярэдняй дамовы падтрымлівалі гэтую ініцыятыву. У іншым выпадку спевы рыхтаваліся загадзя, маглі суправаджацца вулічным шэсцем групы людзей у нацыянальных касцюмах па дарозе да касцёла. Для актуалізацыі перманентных

спеваў існавалі нават вандроўныя «групы запявалаў» («записные певцы»), мэтай якіх было перамяшчэнне па павеце і правакацыя касцёльных акцый [8, с. 381].

Выкрыць, ці былі ініцыятарамі такіх спеваў менавіта ксяндзы, было немагчыма па прычыне таго, што ўдзельнікі спеваў практычна ніколі не сведчылі супраць іх. У сваю чаргу і каталіцкія святары, як правіла, пацвярджалі «алібі» тых, каго ўлады абвінавачвалі ў спевах, свярджаючы, што гэтыя людзі былі менавіта ў той час у другім касцёле на службе. Іншае пытанне, ці маглі падобныя акцыі адбывацца ў касцёлах без ведама / падтрымкі ксяндзоў, няхай сабе нават і маўклівай?

Разумеючы, што спевы ў касцёлах не маглі адбывацца без ведама ксяндзоў, уладныя структуры таксама выпрацоўвалі сваю мадэль паводзінаў, дакладней выкрыцця ролі ксяндзоў у пратэстных акцыях насельніцтва. Спевы ў некаторых касцёлах паўтараліся неаднаразова. Вось тады і ўзнікала на ўзроўні ўладных структур пытанне аб ролі ксяндза. Ды толькі высветліць гэта і па «свежых слядах» было зусім ня проста. Механізм, як тое адбывалася, можна прасачыць па падобных акцыях у Навагрудскім касцёле. Захаваліся архіўныя дакументы аб акцыях, што адбыліся тут 3, 7 і 8 верасня 1861 г. І хаця ў ліку асноўных завадатараў называліся прозвішчы свецкіх асобаў, а ксёндз нават і не ўзгадваўся, было прынята рашэнне на губернскім узроўні прыцягнуць вікарнага ксяндза да «должностной ответственности <...> яко главного руководителя и подстрекателя». Але сведкі – надзірацель Навагрудскай паліцыі Лаппа і паліцэйскія служкі Асіпоўскі і Анісенка – пад прысягай паказалі, што ксёндз удзел у спевах не прымаў, а самі яны наогул не ведаюць слоў забароненага гімна [12, арк. 33].

Тое ж самае адбылося і ў Рэчыцкім фарным касцёле, спяванне патрыятычных гімнаў у якім было зафіксавана 1, 25 лістапада, а таксама 8 снежня 1861 г. Прычым у спевах бралі ўдзел не толькі мясцовыя вернікі, але і тыя, што прыязджалі з Гомельскага, Бабруйскага і іншых паветаў. Акрамя таго, згодна з даносам Рэчыцкага гараднічага, на службе 8 снежня прысутнічалі: павятовы прадвадзіцель дваранства Прозар, павятовы суддзя

Гумінскі, сталаначальнік земскага суда, чыноўнік казначэйства. Цікава, што ў суд ніхто з іх не з'явіўся, назваўшы розныя на тое прычыны, па большасці сказаўшыся хворымі і прадставіўшы медыцынскія даведкі. Пры апытанні ж на месцы жыхарства яны паказалі як адзін, што самі не пелі, а занятыя малітвамі не чулі, ці пеў хтосьці наогул. Што і гатовыя былі паказаць пад прысягай. Усе іншыя сведкі пад прысягай паказалі, што названых асобаў не бачылі і не ведаюць, ці ўдзельнічалі яны ў спевах. Рашэнне паліцэйскага суда, што быў створаны пры мінскім павятовым судзе, было апраўдальным, у ім сцвярджалася, што данае данасіцельства: «не имеет никаких доказательств, ибо свидетели не подтвердили» [21, арк. 2, 85].

У адказ на забараняльныя меры ўдзельнікі пратэстных акцый ужывалі розныя ахоўныя метады (іншыя мелодыі, выкарыстанне асобных патрыятычных радкоў у рэлігійных песнях, выкананне ў цемры і г. д.). Стандартнай з'яўлялася сітуацыя, калі «взамен запрещенного гимна, поются на тот же голос другие условные песни или молитвы. <...> При том случается, что когда одни на голос запрещенного гимна, поют песнь к Богородице, другие на тот же голос поют запрещенный гимн» [8, с. 382]. А гэта ўжо сведчыла аб іншай, больш высокай ступені правядзення пратэстных акцый, бо патрабавала гуртавання людзей, папярэдняй падрыхтоўкі і дамоўленасці паміж дзеючымі асобамі. Праўда, і на гэтым этапе аб ролі каталіцкіх святароў можна толькі здагадвацца.

Яшчэ цяжэй устанавіць ролю каталіцкіх святароў у тых акцыях рымска-каталіцкіх вернікаў, што адбываліся па-за сценамі касцёла: усталяванне крыжоў з патрыятычнай сімволікай, распаўсюджванне «рэлігійна-рэвалюцыйных знакаў» і інш. Несумненна адно, 1863 г. паставіў перад усім каталіцкім духавенствам Беларусі і Літвы пытанне: чый бок падтрымаць, урада ці паўстанцаў. І, лічу, ёсць падставы сцвярджаць, што большасць прадстаўнікоў каталіцкага кліра выбірала бок паўстанцаў. Іншая справа ў якіх формах праяўляўся гэты выбар. І яшчэ – якія звесткі засталіся пра гэта, каб сучасныя аўтары мелі магчымасць аб'ектыўна яго ацаніць.

Няма падставаў, на нашу думку, для катэгарычнай ацэнкі паводзінаў вышэйшага рымска-каталіцкага духавенства, як памагатых царскіх уладаў у падаўленні рэвалюцыйнага руху ў беларуска-літоўскіх епархіях. Бо яны знаходзіліся ў вельмі складаных умовах з прычыны таго, што адказвалі не толькі самі за сябе, а за ўвесь епархіяльны клір. За падтрымку рымска-каталіцкім духавенствам паўстання віленскі біскуп Адам-Станіслаў Красінскі «волею императора» перастаў быць епіскапам і быў высланы ў Вятку без права вяртання ў Вільню. Паводле даных дэпартамента духоўных спраў замежных веравызнанняў, у Віленскай епархіі 17 ксяндзоў прынялі актыўны ўдзел у паўстанні (у паўстанцкіх атрадах), 71 – мелі непасрэднае да яго дачыненне. Наколькі гэта дакладная лічба, цяжка сказаць, бо толькі зборнік дакументаў «Повстанческое движение в Гродненской губернии 1863–1864 гг.» дае больш за 10 згадак удзелу ксяндзоў паўстанцкіх атрадах [22, с. 32, 39, 46, 50, 75, 81, 85, 94, 108, 118, 128].

Што тычылася пазіцыі самога епіскапа Красінскага, то ён, як сведчаць архіўныя дакументы, пераконваў генерал-губернатараў не звяртаць увагі на дэманстрацыі, спяванне рэвалюцыйных гімнаў, нашэнне траурнага адзення як напярэдадні, так і пад час паўстання. Пасля высылкі Красінскі больш ніколі не вяртаўся ў Вільню. Але да 1883 г. працягваў лічыцца «властью Папы» віленскім епіскапам [23, арк. 3, 4 – 4 адв.]. Таму з адозвай (а не пастырскім пасланнем) «Do rzymsko-katolickego Duchowenstwa i Ludu wiernego po Dyecezyi Wilenskej» выступаў не епіскап віленскі, а заступіўшы на яго месца прэлат-прэпазіт Іосіф Баўкевіч.

Даючы ацэнку ўдзелу/няўдзелу каталіцкага, асабліва вышэйшага, духавенства ў паўстанні, трэба ўлічваць і пазіцыю Ватыкана ў той ці іншы канкрэтны момант. У канцы 1850 – пачатку 1860-х гг. нацыянальна-вызваленчыя матывы ў Каралеўстве Польскім, разглядаючыся ў русле адзінага агульнаеўрапейскага руху, адзначна характарызаваліся Ватыканам як «святатацкія замахі на свецкую ўладу царквы», што знайшло адлюстраванне ў такім дакуменце, як «Encyklika Nullis certe verbis papeża Piusa IX z dnia 19 stycznia 1860 roku» [24, s. 189].

Калі ж з 1861 г. пратэстныя акцыі пачалі распаўсюджвацца з Варшавы ў накірунку беларуска-літоўскіх зямель, іх пачынаюць разглядаць як магчымы фактар ціску на расійскі ўрад для паслаблення становішча касцёла і ўстанаўлення жаданай нунцыятуры ў Санкт-Пецярбургу. Хаця і напрыканцы паўстання, і пасля яго падаўлення выступленне супраць дзяржаўнай улады разглядалася як несумяшчальнае з канонамі каталіцкай царквы. Што і было адзначана ў энцыкліцы Пія IX «Urbi Urbaniano» ад 30 ліпеня 1864 г. І толькі праз два гады рэпрэсіі супраць каталіцкага касцёла ў цэлым вымусілі Рым даць жорсткую ацэн-ку дзеянням расійскай улады, якая прагучала на тайнай кансісторыі 29 кастрычніка 1866 г.: «Дай Бог, каб ні адна асоба, асабліва з ліку духавенства не была датычная да такіх пагібельных бунтаў. Ва ўсякім разе Мы цяпер як і заўсёды <...> асуджаем усіх вернікаў і асабліва святароў. У той жа час <...> выконваючы Наш абавязак апостальскі <...> *усе дэкрэты і акты расійскага ўрада, выдадзеныя і накіраваныя не на карысць рэлігіі, каталіцкай царквы і правоў Апостальскай сталіцы, абвяшчаем несапраўднымі* (вылучана мною. – *В. Я.*)» [24, s. 265].

У адказ расійскі ўрад разарваў канкардат 1847 г. і працягваў праводзіць у адносінах да каталіцкай царквы на тэрыторыі Беларусі і Літвы мэтанакіраваную і жорсткую лінію. Галоўнай яе мэтай стала змяншэнне ўплыву каталіцкага духавенства на мясцовае насельніцтва.

Такім чынам, паўстанне 1863–1864 гг. стала каталізатарам для праяўлення грамадзянскай пазіцыі з боку рымска-каталіцкага духавенства ўсіх узроўняў. Але наяўныя дакументы не даюць магчымасці дакладна ўстанавіць формы праяўлення гэтай пазіцыі асабліва ў папярэдні (маніфестацыйны) перыяд як па прычыне канспіратыўнасці іх дзейнасці, так і адмаўлення насельніцтва засведчыць удзел святароў. Апошняе ўжо само па сабе сведчыць аб аўтарытэце і вялікім ідэйным уплыве святароў на вернікаў, што садзейнічала паскарэнню адраджэння нацыянальна-вызваленчых тэндэнцый сярод насельніцтва.

Літаратура

1. *Агурский, С. Х.* Очерки по истории революционнаго движения в Белоруссии (1863–1917) / С. Х. Агурский. – Минск: Белорус. гос. изд-во, 1928. – 348 с.

2. *Цітовіч, С. Р.* 1863 год у Горы-Горках быўшай Магілёўскай губерні / С. Р. Цітовіч. – Мінск: Друк. Бел. Акадэміі навук, 1929. – 124 с.

3. Аналіз польскай гістарыяграфіі па праблеме гл.: *Ганчар, А. И.* Польская историография римско-католического костела в Беларуси (последняя треть XIX – начало XX вв.) / А. И. Ганчар // Весн. Гродзен. дзярж. ун-та імя Янкі Купалы. – 2008. – № 1 (63). – С. 26–31; *Григорьева, В. В., Филатова, Е. Н.* Католическая церковь в Беларуси: историография проблемы (конец XVIII – начало XX в.) / В. В. Григорьева, Е. Н. Филатова // Наш Радавод. – Гродна, 1994. – Кн. 6. – Ч. 3. – С. 652–661.

4. *Ханевич, В.* Участники Январского восстания и их потомки в истории Томска / В. Ханевич // Powstanie styczniowe 1863–1864. Walka i uczestnicy. Represje i wygnanie. Historiografia i tradycja. – Kielce: Wydawnictwo Akademii Swietokrsyskiej, 2005. – S. 133–144; *Кононова, Л.* Участники Январского восстания в архангельской ссылке / Л. Кононова // Powstanie styczniowe 1863–1864. Walka i uczestnicy. – S. 145–154; *Голикова, Н.* Польские ссыльные в Вологодской губернии в 60-е годы XIX в. / Н. Голикова // Powstanie styczniowe 1863–1864. Walka i uczestnicy. – S. 169–175; *Береговая, Е. П.* Польская политическая ссылка в Енисейской губернии во второй половине XIX – начале XX вв.: автореф. дисс. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Е. П. Береговая. – Красноярск, 2007. – 16 с.; *Никулина, И.* О ссыльных участниках восстания 1863–1864 гг. на Алтае / И. Никулина // Кастусь Каліноўскі і яго эпоха ў дакументах і культурнай традыцыі. – Менск, Беларус. гіст. тав-ва, 2011. – С. 71–85.

5. *Воронин, В. Е.* Польское восстание 1863 года: опыт «примирительной политики» русского правительства / В. Е. Воронин. – М.: МПГУ, 2008. – 432 с.

6. Kurier Warszawski. – № 58. – 19 lutego – 3 marca 1861 g.

7. *Яноўская, В. В.* Хрысціянская царква ў Беларусі. 1863–1914 гг. / В. В. Яноўская. – Мінск: БДУ, 2002. – 199 с.

8. Цыт. па: *Фірыновіч, А.* На стыку веры і палітыкі: касцёльныя дэмаршы 1861–1862 гг. у Расійскай імперыі / А. Фірыновіч // Історія релігій в Україні. Книга 1. – Львів: Логос, 2013. – с. 378–387.

9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Фонд 159. – Воп. 1. – Спр. 6673.

10. НГАБ. – Фонд. 159. – Воп. 1. – Спр. 6674.

11. НГАБ. – Фонд. 159. – Воп. 1. – Спр. 6676.

12. НГАБ. – Фонд. 159. – Воп. 1. – Спр. 6677.

13. НГАБ. – Фонд. 159. – Воп. 1. – Спр. 6678.

14. НГАБ. – Фонд. 159. – Воп. 1. – Спр. 6679.

15. НГАБ. – Фонд. 159. – Воп. 1. – Спр. 6680.

16. НГАБ. – Фонд. 159. – Воп. 1. – Спр. 6681.

17. НГАБ. – Фонд. 159. – Воп. 1. – Спр. 6682.

18. НГАБ. – Фонд. 159. – Воп. 1. – Спр. 6683.

19. НГАБ. – Фонд. 159. – Воп. 1. – Спр. 6684.
20. НГАБ. – Фонд. 159. – Воп. 1. – Спр. 6685.
21. НГАБ. – Фонд. 159. – Воп. 1. – Спр. 6686.
22. Повстанческое движение в Гродненской губернии 1863–1864 гг. – Брест: Академия, 2006. – 404 с.
23. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. – Фонд. 821. – Воп. 10. – Спр. 201. – Арк. 3, 4, 4 адв.
24. Papiestwo wobec sprawy polskiej w latach 1772–1864. Wybór źrodel. – Wroclaw, 1960.

Резюме

В. В. ЯНОВСКАЯ

КАТОЛИЧЕСКОЕ ДУХОВЕНСТВО В ПРОТЕСТНЫХ АКЦИЯХ НАКАНУНЕ ВОССТАНИЯ 1863–1864 гг.

Отмечается, что протестные антигосударственные акции начались под влиянием событий, что произошли в Варшаве 27 февраля 1861 г., когда во время разгона демонстрации погибло несколько человек. День похорон жертв и стал началом костельных демаршей, которые из Варшавы постепенно распространились на восток, в направлении белорусско-литовских губерний. Показаны наиболее выраженные формы протестной активности римско-католических верующих: панихиды по погибшим в Варшаве; ношение траурной одежды и особых знаков; сценические богослужения, приуроченные к определенному знаковому историческому событию и другие. Апогеем костельных демаршей стало пение в костелах патриотических гимнов. Делается вывод, что наявные архивные документы не позволяют четко выявить роль католических священников во всех протестных акциях верующих, как по причине конспирации, так и отказа населения доносить на них. Последнее уже само по себе свидетельствовало об авторитете и большом идейном влиянии ксендзов на верующих, что содействовало ускорению национально-освободительных тенденций среди населения.

Summary

V. YANOUSKAJA

CATHOLIC CLERGY IN PROTESTS ON THE EVE OF THE UPRISING 1863–1864

It is noted that the anti-government protest action started under the influence of the events that took place in Warsaw on February 27, 1861, when, during a crackdown several people died. The victims funeral day was the beginning

of church demarches, which gradually spread from Warsaw to the east, in the direction of the Belarusian-Lithuanian provinces. The most prominent forms of protest activity of Roman Catholic believers are shown: requiem for the dead in Warsaw; wearing mourning clothes and special characters; scenic worship confined to a particular landmark historical event and others. Apogee of church demarches was singing patriotic hymns in church. The conclusion is made that given archival documents does not clearly identify the role of Catholic priests in all believers protest rallies, both because of the conspiracy and population rejection to inform on them. Last in itself is an evidence of the authority and the big ideological influence of priests on the faithful, which helped accelerate the national liberation trends in the population.

Паступіў у рэдакцыю 17.12.2013

Вынікі і наступствы паўстання 1863–1864 гг.

УДК 94(476)«1871/1914»:930.1(= 16)

А. І. ДЗЯРНОВІЧ

ШТО ПАСЛЯ ПАЎСТАННЯ? «ПАЗІТЫВІЗМ ВАРШАЎСКІ» І «ПАЗІТЫВІЗМ ЛІТОЎСКІ»

Пазітывізм варшаўскі

У 1871 г. журналіст Аляксандр Свентахоўскі апублікаваў у варшаўскім выданні «Przegląd Tygodniowy» артыкул-маніфест «Мы і вы» [10, s. 54–62]. Гэта быў гімн нават не нейкаму новаму грамадскаму кірунку, а зусім іншаму грамадскаму светаўспрыманню. Аўтар прапаноўваў адысці ад «асабістых раздражненняў» ды «вызначыць мэты барацьбы». «Вы» ў Свентахоўскага – гэта «вялікія, высакародныя, вучоныя, паважаныя, пакрыўджаныя і пераследаваныя», якія «знітаваныя паміж сабою тысячамі нябачных ніцяў, падкрадваецеся са сваімі прынцыпамі нясмела, жадаеце ў літаратуры спакою, нерухомасці, кажаце ўсім углядацца ў мінуўшчыну, шанаваць нават яе памылкі». «Вось ваша заслуга!» Свентахоўскі дапускаў, што «вы», як і «мы», прагнуць усеагульнага дабра і хочуць яму служыць, але іхны «розум страціў пачуццё новых патрэбаў, думка лянівая, пазбаўленая жыцця, круціцца толькі ў коле даўніх мэтаў, а свежых распазнаць не ўмее».

У сучаснікаў не было ваганняў адносна аб'екта крытыкі Свентахоўскага – гэта былі ідэі рамантызму і шляхецкіх паўстанняў. Тое, што ў многім вызначыла этас і вобраз палякаў ставілася пад сумнеў?! І якое меў права Свентахоўскі, які толькі год перад тым скончыў расійскі Варшаўскі ўніверсітэт, так інтэлектуальна зневажаць сваіх папярэднікаў, што прайшлі праз казацкія нагайкі і «гасцінную Сібір»?

«Натуральна, калі маем на ўвазе сваё грамадства, кожны павінен увогуле старацца найперш дзеля ўзросту інтэлектуальных сілаў, дзеля паскарэння яго [грамадства] спеласці, дзеля пабуджэння яго

да працы, ведаў, зразумення свайго становішча і сваіх жаданняў». Вось гэтае разуменне «становішча і жаданняў» тут прынцыповае: «Пытаюся, чаго найбольш у той меры зрабілі Вы, апекуны сентыментальнага рамана і палітыкі, якая зацвікоўвае мазгі?»

Такім чынам, артыкул Свентахоўскага быў маніфестам *Варшаўскага пазітывізму*, гэткага «бунту мадэрнізацыі». Безумоўна, Свентахоўскі рэпрэзентаваў радыкальную плынь гэтага кірунку. Але новапаўсталы пазітывізм змяняў увогуле разуменне грамадства – яно разглядалася як цэльны арганізм, розныя часткі якога мусяць гарманічна супрацоўнічаць. Першапачаткова найбольшае абурэнне крытыкаў выклікала тое, што пазітывізм увогуле прапаноўваў адмовіцца ад ідэі незалежнасці краю як актуальнай палітычнай мэты.

Для польскай думкі пазітывізм – гэта не проста накірунак у філасофіі і нават не эпоха, а прынцыповая чалавечая пазіцыя [6, с. 343–350]. Пра *рэалізм* жа гаворыцца без энтузіязму, бо гэтае вызначэнне замацавалася за тымі, хто ў XIX і XX стст. «прымірыліся з рэчаіснасцю», імкнуліся «не нарывацца», сталі лаяльнымі грамадзянамі Імперыі. Для пазітывістаў расійскае панаванне заставалася чужым і глыбока варожым. Але прыхільнікі пазітывісцкай плыні былі праціўнікамі не толькі ўзброеных паўстанняў, але і любой рамантычнай адмовы «працаваць на роднай глебе» толькі таму, што палітычным гаспадаром гэтай «глебы» быў расійскі цар ці нямецкі кайзер. Пазітывісты прапагандавалі ідэі «арганічнай працы», пачынаючы з «першаасноваў», настойвалі на неабходнасці развіцця нацыянальнай гаспадаркі, культурных інстытутаў, асветных установаў – насуперак і чужынскаму панаванню, і рамантычнаму «ўсё альбо нічога». Такім чынам, пазітывізм быў праграмай «малых спраў», накіраваных на захаванне і развіццё нацыянальнага эканамічнага патэнцыялу і нацыянальнай культуры. Шматгадовая ўпартая праца пазітывістаў па памнажэнні нацыянальнага багацця адбывалася ў няроўнай барацьбе з магутнай стыхіяй русіфікацыі. І гэтая барацьба не выключала падпольных варыянтаў дзейнасці, але пазітывісты рашуча адкідалі метады ўзброенага змагання ды з недаверам ставіліся да праяваў храбрасці толькі дзеля яе самой.

Безумоўна, у дэкларараваных першасных пастулатах пазітывізму мы бачым пэўны механіцызм і разумеем, што рана ці позна ён, як грамадскі рух, павінен будзе сысці з сацыяльнай практыкі. Але застаюцца пытанні: Наколькі пазітывізм у свой час меў поспех? Якія супольнасці і як з яго скарысталіся? А якія так яго і не перажылі, не ўвабралі ў свой сацыяльны досвед?

Ці існаваў «пазітывізм літоўскі»?

Выкладзеныя вышэй характарыстыкі датычаць гісторыі пазітывізму ў яго метраполіі – Каралеўстве (ці, паводле расійскай тэрміналогіі, Царстве) Польскім, якое знаходзілася пад кіраваннем Расіі, але нават і пасля паўстанняў яшчэ захоўвала пэўныя прыкметы палітычнай аўтаноміі. Як жа было на нашых тэрыторыях, землях Вялікага Княства Літоўскага, складовай частцы былой Рэчы Паспалітай? Ці меліся тут рэгіянальныя адрозненні альбо дадатковыя матывацыі?

Так знаёмую нам шматзначнасць гэтых тэрмінаў тлумачыць чытачам Анджэй Раманоўскі – у значэнні, у якім пішацца пра пазітывізм варшаўскі альбо нават галіцыйскі, пазітывізм у Літве (якую мы разумеем у гістарычным, а не ў сучасным палітычна-дзяржаўным сэнсе) у 1864–1904 гг. не існаваў «і існаваць не мог» [11, s. 15, 451]. Папросту не было для гэтага варункаў: не выходзіла тут польская прэса, не дзейнічаў польскі тэатр, польскія выдавецтвы былі нешматлікімі і звычайна толькі ледзьве выжывалі. Такім чынам, за малым выключэннем, не было тут дзе выдаваць кніжак, публікаваць тэкстаў, разгортваць палеміку, ствараць праграмы. І калі пазітывісцкая праграма даводзілася ў Варшаве «праўдай і працай», то ў Вільні і Мінску рабілася гэта толькі «працай», альбо – чынам.

Гаспадаранне ў сваіх маёнтках у пасляпаўстанцкі перыяд разглядалася мясцовай шляхтай як арганічнае супрацьстаянне наступу расіянаў на абшары Вялікага Княства. А як адзначаюць даследчыкі, у спалучэнні са спецыфічна ліцвінскім стаўленнем да зямлі, гэтае гаспадаранне і было для шляхты рэалізацыяй яе місіі, выкананнем грамадзянскага абавязку перад Краем [9, s. 82]. Але ў адрозненне ад Каралеўства Польскага, багатыя

ліцвінскія землеўласнікі толькі ў малой ступені ўспрынялі лозунгі пазітывізму варшаўскага аб актыўнасці сярод ніжэйшых станаў грамадскага арганізма.

Феномен Караля Чапскага

Але ёсць у гісторыі гаспадарчых і адміністрацыйных практык у Беларусі канца XIX – пачатку XX ст. некаторыя прыклады, які сведчаць пра рэалізацыю праграм пазітывізму нават у маштабах цэлага гораду. Найбольш яркім тут будзе прыклад мінскага гарадскога галавы графа Караля Гутэн-Чапскага, сына вядомага калекцыянера са Станькава і даволі паспяховага расійскага адміністратара Эмерыка Гутэн-Чапскага – былога наўгародскага губернатара і дырэктара Лясного дэпартамента імперыі.

Постаць Караля Чапскага сама па сабе выбітная – чатыры разы абіраўся галавою Мінскага самакіравання (з 1890 па 1901 – апошняя кадэнцыя няпоўная). І гэта нягледзячы на складаныя адносіны з Мінскім губернатарам князем Мікалаем Трубяцкім [5, с. 29–39]. Перамога графа Чапскага, нашчадка былога палітычнага народа Рэчы Паспалітай была магчымая таму, што ў другой палове XIX ст. у буйных беларускіх гарадах, і асабліва ў Мінску, узмацнілася сацыяльная і эканамічная значнасць землеўладальнікаў-каталікоў. Гэты сацыяльны слой, які быў дыскрыдытаваны пасля падаўлення паўстання 1863 г. у аграрнай сферы, стаў укладваць свае сродкі ў набыццё гарадской нерухомасці. Валодаючы адпаведным маёмасным цэнзам, выбаршчыкі-каталікі і забяспечвалі перамогу на выбарах у самакіраванне маладога графа, які ўпершыню стаў гарадскім галавою ў трыццацігадовым узросце.

Пэўны збег абставінаў спрыяў гэтаму, але, як высветлілася, Караль Чапскі меў сваю праграму дзеяння. З яго імем у Мінску звязаныя ўвядзенне электрычнага асвятлення, будаўніцтва конкі, умацаванне берагоў Свіслачы, узвядзенне новых мастоў, павелічэнне магутнасці водаправода, значнае паляпшэнне санітарнага стану горада, ажыўленне фінансавых інстытутаў, адкрыццё гімназій, шпіталяў, публічнай бібліятэкі, забру-

коўка вуліц... Фактычна пад кіраўніцтвам Чапскага Мінск пераўтвараўся ў новаеўрапейскі горад. Абраны першы раз гарадскім галавою ва ўзросце 30 гадоў, Караль Чапскі яшчэ пры жыцці быў празваны «пераўтваральнікам Мінска».

Цяпер пра Літву

Што ж тады, на рубяжы стагоддзяў, разумелася пад Літвой? Тут, здаецца, не павінна ўзнікаць вялікіх пытанняў, прынамсі, для жыхароў нашага гісторыка-культурнага рэгіёну. «Літва» тады азначала Літву гістарычную, альбо Вялікае Княства Літоўскае перад падзеламі Рэчы Паспалітай – тое, што за расійскімі часамі называлася «Северо-Западный край». Але ж у сферу даследавання пазітывізму ў нашым рэгіёне трапляюць таксама прылеглыя і павязаныя з былым Вялікім Княствам тэрыторыі Інфлянтаў (Лівоніі) і Курляндыі, гэта значыць тэрыторыя Латвіі і часткова Эстоніі. Больш за тое, да тэмы належаць нават «абрэзкі» Польшчы і Расіі – Беласточчына і Смаленшчына.

Затое досыць нечаканым можа апынуцца тут паняцце «крэсаў», якое не супадае са стэрэатыпнымі поглядамі беларусаў і літоўцаў, паўсталымі на працягу XX ст. І сапраўды, Віленшчына не была і не магла быць для Чэслава Мілаша «зямлёй крэсовай». У XIX ст. таксама не былі крэсамі ні Гродна, ні Мінск. Тое, што мы цяпер успрымаем як нейкую адзнаку другаснасці, першапачаткова мела цалкам канкрэтны палітыка-геаграфічны сэнс. А менавіта, паняцце «крэсы» ахопліваў памежныя тэрыторыі шляхецкай Рэчы Паспалітай, гэта значыць: Віцебшчыну, Магілёўшчыну, Інфлянты, Курляндыю [11, s. 19]. Як люстраны адбітак тэрміну «крэсы» ўзнікла вызначэнне «паза крэсамі» – тэрыторыі, якія перад падзеламі Рэчы Паспалітай ужо не ўваходзілі ў склад дзяржавы, але на якіх адчуваўся яе культурна-гаспадарчы ўплыў і дзе існавалі сталыя групы жыхароў-выхадцаў з Рэчы Паспалітай: Рыга, Дорпат (Тарту), Смаленск. Вельмі цікава, што падобную ж генеалогію мае паходжанне назвы Украіны – зямлі «ў края» Рэчы Паспалітай, тэрыторыі на яе Паўднёвым Усходзе. Паступова гэтая назва стала пазначаць цэлую краіну [7, с. 20–23].

Але нашыя гісторыка-геаграфічныя падарожжы мы мусім працягнуць, бо існуе яшчэ адзін вельмі важны тэрмін – «землі забраныя». Калі ўхіліцца ад эмацыйнага ўспрыняцця тэрміна, то стане зразумелым, што вядзецца пра землі, які адміністрацыйна-тэрытарыяльна былі адлучаныя ад рэштава-аўтаномнай часткі Рэчы Паспалітай, вядомай як Каралеўства (Царства) Польскае. Такім чынам, даўнейшае Вялікае Княства Літоўскае было «землямі забранымі» і дэ-факта расійскімі.

Вось тут прыхаваная часцінка разумення адрозненняў паміж «пазітывізмамі». Пазітывізм літоўскі, падобна, як і пазітывізм варшаўскі, вучыў жыццю ў няволі. «З той толькі розніцай, што навука гэтая адбывалася ў сітуацыі пазбаўлення ўсялякай спадчыны, нават мовы» [11, s. 451]. Што яшчэ можна сказаць пра тыя тысячы людзей – мужчынаў, а найперш нават жанчынаў, – якія з мужнасцю і рашучасцю пагаджаліся заставацца грамадзянамі другой катэгорыі...

Дык што ж здолеў захаваць пазітывізм літоўскі? Напэўна, землеўласнікаў – гэта значыць не проста мясцовую шляхту, а шляхту маёмасную, якая мела фальваркі і сядзібы, што былі асяродкамі гаспадарчага і культурніцкага жыцця ў правінцыі. А захоўваючы землеўласнікаў, пазітывізм літоўскі захоўваў традыцыі былой Рэчы Паспалітай, ***захоўваў гістарычную Літву***. Хоць, вядома, гэтая традыцыя падважвалася народжаным літоўскім нацыянальным рухам, з боку якога ўжо прагучалі прэтэнзіі да былой Кароны за ўцягванне ў паўстанне 1863 г., а таксама будучым беларускім. Але супольнасць гістарычнай Літвы ўсё яшчэ існавала, што выяўлялася і ў шматколькаснай у прэсе варшаўскай перыяду пазітывізму карэспандэнцыі «з-над Нёмана» і «з-за Нёмана» (Эліза Ажэшка, Ян Карловіч), у віленска-мінскіх канцэртах Ігнацыя Яна Падэрэўскага. Урэшце, без пазітывізму літоўскага не паўстаў бы феномен Чэслава Мілаша.

Пра храналогію і вынікі

Храналогія тут – сапраўды важная рэч. Бо яна дапамагае вызначыць, ці былі гады 1864–1904 самастойным перыядам у гісторыі культуры, ці толькі пераходным? Абедзве крайнія

даты маркіруюцца палітычна. 1864 – гэта год заканчэння эпохі паўстанняў, гераічных высілкаў і паразаў. Пасля 1904 г. таксама наступіў новы перыяд – лібералізацыі і эканамічнага ўздыму Расійскай імперыі. Сёння не да канца могуць быць зразумелымі маштабы пераўтварэнняў, таму варта зрабіць некалькі рэмарак – тагачасная Дзяржаўная Дума Расіі сапраўды фарміравалася на канкурэнцыйным аснове і дамаглася ў вызначэнні ўрадавай палітыкі няхай абмежаваных, але пэўных паўнамоцтваў. Сацыяльнае ж жыццё мела ўстойлівую тэндэнцыю да павышэння стандартаў. Вось у гэтых адносна камфортных варунках пачатку XX ст. і здолеў развіцца беларускі праект.

Але ж і краёвая ліцвінская культура, лацінская цывілізацыя і польскі асяродак дасягнулі ў названы перыяд сапраўдных поспехаў: «У Заходняй Беларусі, каталіцкай Латгаліі, а асабліва ў Аўкштоце і Жамойці, расійская культура страціла пасля 1905 году дамінантныя пазіцыі (хоць, звычайна, захавала і тут сваю прыцягальную сілу)» [11, s. 453].

У сутычцы з расійскай культурай бітва адбывалася за само існаванне – гэткай ступені пагрозы не ведаў ані рамантызм, ані пазітывізм варшаўскі. За канчатковае ўратаванне была заплачаная найвышэйшая цана. Пазітывізм літоўскі, выратоўваючы тагачасную мясцовую культуру, што выяўлялася ў польскай мове, мусіў яе разам з тым далучыць да кансерватызму. Але яшчэ болей – польскамоўная культура гістарычнай Літвы была асуджаная да правінцыялізацыі. У XX ст. на месцы рамантычных «цэнтру пальшчызны» і сэрца Рэчы Паспалітай з'явяцца «польскія крэсы».

З гэтага стану рэчаў, зразумела, будуць рабіцца спробы выйсця. Узнікне «краёвая» ідэалогія, якая пасля стане маргіналіяй. З'явіцца бальшавіцкая ідэалогія (паддасца ёй ліцвінскі шляхціч Фелікс Дзяржынскі), але яна будзе чарговым расійскім імпартам.

Для польскай супольнасці Літвы і Беларусі гэты перыяд быў надзвычай важным ва ўласным вызначэнні. Існуе досыць багатая літаратура, у якой разглядаюцца праблемы колькасці польскай грамады Літвы і Беларусі на рубяжы XIX–XX ст. [4, с. 37–47]. І калі масавыя міграцыі ставяцца пад сумнеў, то сацыяльна-

маёмасная значнасць палякаў у рэгіёне была вельмі адчувальнай: прыблізна палова (50–55 %) зямель, якія знаходзіліся ў прыватнай уласнасці, належыла беларускім і літоўскім землеўласнікам-палякам. Таксама прадстаўнікам польскай грамадскасці, паводле даных перапісу 1909 г., належыла 19,5 % нерухомасці, якая давала магчымасць удзельнічаць у праектаваных земствах. У выніку, палякі складалі 43,5 % усіх поўнацэнзавых выбаршчыкаў у земствы.

Што ж гэта была за супольнасць? Палякі Літвы і Беларусі ўяўлялі з сябе гістарычна ўтвораную сацыяльную групу, прадстаўнікі якой усведамлялі сябе палякамі, айчына якіх – гістарычная Літва. Напачатку, на працягу амаль усяго XIX ст., ліцвінская шляхта яшчэ не лічыла мову вызначальнікам нацыянальнай прыналежнасці [8, s. 257–258]. Важнейшай была гістарычная традыцыя. У апошняй жа трэці XIX ст. у выніку актывізацыі нацыятворчых працэсаў мясцовая польская грамадскасць пачала ахопліваць таксама частку ніжэйшых сацыяльных пластоў. Адбывалася сапраўды сацыяльная і нацыянальная трансфармацыя. Паняцце «паляк» менавіта ў гэты перыяд стала набываць уласна нацыянальны змест, што грунтавалася, пераважна, на пачуцці прыналежнасці да польскай культуры. Хоць, безумоўна, адчуванне прыналежнасці да гістарычнай Літвы сярод мясцовых палякаў заставалася [4, с. 8–9].

Практыкі ж варшаўскага пазітывізму прыцягвалі сапраўдную ўвагу прадстаўнікоў народжанага беларускага нацыянальнага руху. Магчыма такая ўвага сярод беларускага грамадства была больш моцная па-за межамі Беларусі. Дзейнасць Беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта цалкам можа быць залічаная да рэалізацыі пазітывісцкай праграмы. Самімі студэнтамі дэкларавалася, што яны «сардэчна жадаюць дапамагчы свайму народу ва ўсіх адносінах, адсюль прага пазнання ўсяго, што належыць да Беларусі, прага практычнай працы на карысць і славу славянскага племя» [1, с. 10–11]. Безумоўна, тут мы бачым трактоўку мэтаў гуртка ў выкладанні афіцыйных уладаў універсітэта.

Вядомы беларускі этнограф і археолаг Еўдакім Раманаў, які належаў да «русафільскага» лагера ў беларускім руху, у 1912 г. у адказ на прывітанні гуртка, адказваючы на пытанне, як распачаць вывучэнне Беларусі, апроч вызначэння чыста культурніцкіх акцый, зрабіў простую апеляцыю да досведу варшаўскага пазітывізму: «Работайте и в экономической области. Спасая народ от экономической зависимости, от его врагов, вы спасете его и от духовного порабощения. Следуйте примеру польских масс Привислянского края, устраивайте кооперативы, склады, товарищества, кассы и т. д. И учреждения мелкого кредита. Но вот у забитого, загнанного народа нет инициативы. Ваша прямая обязанность стать здесь инициаторами. Ведь сколько предстоит работы для людей, любящих свою родину!» [1, с. 13–14; 3, с. 6].

Вось жа ў тым і быў патэнцыял нацыянальных літоўскага і беларускага рухаў, што свой край яны разглядалі як уласную культурную метраполію. Але якую спадчыну мог ім пакінуць «пазітывізм літоўскі»? Анджэй Раманоўскі мяркуе, гэты рух не меў поспеху: «Бо дзе сёння там тая польская культура?!» [2, с. 78].

Магчыма такі адказ можа быць сапраўды справядлівым з пазіцый сучасных польскіх рэалій. Калі ж азірнуцца на актуальны культурна-гістарычны ландшафт Беларусі, то павінны прызнаць – на ўзроўні вобразаў, а то і канкрэтных ведаў, памяць пра гістарычную Літву, перададзеную нам праз эпоху пазітывізму, якая не дазволіла ў часы пасляпаўстанцкага заняпаду зусім здэградаваць думцы ды адмовіцца ад усялякіх жаданняў.

Літаратура

1. Белорусский научно-литературный кружок студентов Санкт-Петербургского университета. Оттиск из отчета о состоянии и деятельности Императорского Санкт-Петербургского университета за 1912 г. – СПб.: Типография Б. М. Вольфа, 1913. – 31 с.

2. *Дзярновіч, А.* Наўздагон. Заўвагі на палёх кнігі Анджэя Раманоўскага «Пазытывізм у Літве: польскае культурніцкае жыцьцё на літоўска-беларуска-інфлянцкіх землях у 1864–1904 гадах» / *А.* Дзярновіч // Arche. – 2008. – № 7–8. – С. 73–78.

3. *Раманаў, Е. Р.* З гісторыка-археалагічнай спадчыны / Е. Р. Раманаў / падрых. да публікацыі і навук. рэд. І. А. Марзалюка. – Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2006. – 276 с.

4. *Смалянчук, А.* Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. / А. Смалянчук. – СПб: Неўскі прасцяг, 2004. – 322 с.

5. *Шыбека, З.* В. Минскъ сто гадоў таму / З. В. Шыбека. – Мінск: Беларусь, 2007. – 303 с.

6. *Щукин, В.* Pro et contra «честной чичиковщины» (Рец. на кн.: Romanowski A. Pozytywizm na Litwie: Polskie życie kulturalne na ziemiach litewsko-białorusko-inflanckich w latach 1864–1904.) / В. Щукин // Новое литературное обозрение. – 2006. – № 1. – С. 343–350.

7. *Яковенко, Н.* Нарис історії середньовічної та ранньомодерної України / Н. Яковенко, 2-ге вид., перероблене та розшир. – Київ: Критика, 2005. – 584 с.

8. *Aleksandravičius, E., Kulakauskas, A.* Pod władzą carów. Litwa w XIX wieku / E. Aleksandravičius, A. Kulakauskas / Przełożyła Beata Kalęba. – Kraków: Universitas, 2003. – 413 s.

9. *Jurkowski, R.* Ziemiaństwo polskie Kresów Północno-Wschodnich 1864–1904. Działalność społeczno-gospodarcza / R. Jurkowski. – Warszawa: Przegląd Wschodni, 2001. – 606 s.

10. Programy i dyskusje literackie okresu pozytywizmu / oprac. J. Kulczycka-Saloni. – Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1985. – 653 s.

11. *Romanowski, A.* Pozytywizm na Litwie: Polskie życie kulturalne na ziemiach litewsko-białorusko-inflanckich w latach 1864–1904 / A. Romanowski. – Kraków: Universitas, 2003. – 485 s.

Резюме

О. И. ДЕРНОВИЧ

ЧТО ПОСЛЕ ВОССТАНИЯ? «ПОЗИТИВИЗМ ВАРШАВСКИЙ» И «ПОЗИТИВИЗМ ЛИТОВСКИЙ»

Анализируется влияние «варшавского позитивизма» конца XIX – начала XX в. на социальные практики на территории Беларуси и Литвы. Ставится вопрос: существовал ли «позитивизм литовский»?

Хозяйствование в своих имениях в период после восстания 1863–1864 гг. рассматривалось местным дворянством (шляхтой) как органическое противостояние наступлению россиян на территорию бывшего Великого Княжества Литовского. В сочетании со специфическим «литвинским» отношением к земле, это хозяйствование и было для шляхты реализацией ее миссии, исполнением гражданского долга перед Краем. Но в отличие от Царства Польского, богатые литвинские землевладельцы лишь в малой степени восприня-

ли лозунги «позитивизма варшавского» об активности среди низших слоёв общественного организма. С другой стороны, имелись такие примеры как феномен графа Кароля Чапского, который четыре раза избирался главой самоуправления Минска и смог проводить в масштабах целого города позитивистскую программу.

Так что же сумело сохранить «позитивизм литовский»? Наверное, землевладельцы – то есть не просто местная шляхта, а дворянство имущественное, имевшее фольварки и усадьбы, которые были центрами хозяйственной и культурной жизни в провинции. А сохраняя землевладельцев, «позитивизм литовский» сохранял традиции бывшей Речи Посполитой, сохранял историческую Литву. Хотя, конечно, эта традиция ставилась под сомнение рожденным литовским национальным движением, со стороны которого уже прозвучали претензии к бывшей Короне за вовлечение в восстание 1863 г., а также будущим белорусским движением.

Summary

A. DZIARNOVICH

WHAT TO DO AFTER THE REBELLION? «WARSAW POSITIVISM» AND «LITHUANIAN POSITIVISM»

This article analyzes the influence of the «Warsaw positivism» of the late XIX – early XX centuries in the social practices in Belarus and Lithuania. We pose the question: was there the «Lithuanian positivism»?

Housekeeping on their estates in the aftermath of the 1863–1864 uprising was considered the local nobility (szlachta) as organic standoff attack Russians on the territory of the former Grand Duchy of Lithuania. In combination with a specific «Litvin» attitude toward the ground, it was for housekeeping and gentry realization of its mission, the execution of civic duty to the corner. But unlike the Kingdom of Poland, rich «Litvin» nobility only marginally accepted the slogans of «Warsaw positivism» on the activity of the lower strata of the social organism. On the other hand, there were examples such as the phenomenon of Count Karol Czapski, who was elected four times the head of the government in Minsk and was able to conduct a wide variety of positivist program.

That has managed to preserve the «Lithuanian positivism?» Probably it is «ziamianstva» – that is, not just the local gentry and nobility of property, which had farm and manor houses, which were the centers of economic and cultural life of the province. A retaining «ziamianstva», «Lithuanian positivism» maintained the traditions of the former Polish-Lithuanian Commonwealth, retained Historical Lithuania. Although this tradition has been questioned born Lithuanian national movement on the part of which has already voiced complaints about the former Crown of involvement in the 1863–1864 Uprising, and the future of the Belarusian movement.

Паступіў у рэдакцыю 18.12.2013

УДК 272–786–9 + 94(476 + 474.5)«18»

Р. У. ЗЯНЮК

БАРАЦЬБА З РЫМСКА-КАТАЛІЦКІМІ БРАЦТВАМІ ЯК ФОРМА АБМЕЖАВАННЯ ЎПЛЫВУ КАСЦЁЛА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

У канцы XVIII – пачатку XX ст. брацтвамі ў рымска-каталіцкім касцёле называліся згуртаванні альбо таварыствы вернікаў, якія аб'ядноўваліся ў рэлігійных альбо дабрачынных мэтах і былі афіцыйна зацверджаны касцёлам [2]. Мэтай брацтваў і іх членаў было пашырэнне і ўшанаванне канкрэтнай таямніцы веры альбо святых, выкананне хрысціянскіх учынкаў і хрысціянскае самаўдасканаленне.

З'яўленне і рост колькасці брацтваў на беларуска-літоўскіх землях адбываўся паралельна з развіццём парафіяльнай сеткі каталіцкіх храмаў і павелічэннем ліку каталіцкіх кляштараў. Пачатак гэтых працэсаў адносіцца да канца XIV ст., а найбольшае развіццё прыпадае на XVII–XVIII стст. Аднак заснаванне новых брацтваў было характэрна таксама для канца XVIII – першай паловы XIX ст. [12, арк. 8 адв. – 9]. Павелічэнне колькасці брацтваў назіралася ў знакавыя для каталіцкага касцёла ў Расійскай імперыі гады – напрыклад, падчас святкавання юбілейнага года (1826 г.), у год заключэння канкардату (1847 г.), прыняцце новага дагмата (1854 г.) і інш.

Найбольш распаўсюджанымі на беларуска-літоўскіх землях былі брацтвы, якія дзейнічалі пры кляштарных касцёлах. Манаскія ордэны яшчэ з сярэднявечча мелі дазвол на заснаванне ўласных брацтваў. Так, пры кляштарах і касцёлах кармелітаў традыцыйна дзейнічалі шкаплерныя брацтвы. Права на заснаванне гэтага брацтва меў выключна ордэн кармелітаў. Бернардзінскія кляштары арганізоўвалі брацтвы св. Арханёла Міхала і св. Ганны. Пры кляштарах усіх галінаў францысканскага ордэна (кан-

вентуальных францысканцаў, капуцынаў, бернардзінцаў) звычайна дзейнічалі брацтвы св. Антонія і паса св. Францыска [4; 5]. Пры кляштарах дамініканцаў – ружанцовыя. Пры парафіяльных касцёлах, у якіх працавалі дыяцэзіяльныя святары, брацтвы былі самыя розныя. Агульнымі заданнямі для членаў усіх брацтваў былі малітва і хрысціянскія ўчынкі.

Першапачаткова значная колькасць брацтваў узнікала па прафесійнай прыкмеце. Кожны гарадскі цэх з'яўляўся своеасаблівым брацтвам, і меў у касцёле сваю харугву і свайго святога-заступніка. Падчас вялікіх урачыстасцяў члены брацтваў збіраліся ў касцёле, і кожнае пад сваёй харугвай удзельнічала ў працэсіі. З цягам часу гэтая традыцыя згубілася, аднак, яе адгалоскі ў XIX ст. можна было назіраць, напрыклад, у Ракаўскім і Мазырскім касцёлах. Да XIX ст. прадстаўнікі кожнай прафесіі збіраліся ў спецыяльна вызначанае для іх свята на набажэнства і ўдзельнічалі ў працэсіях кожны пад сваёй харугвай. У Мазыры да другой паловы XIX ст. «брацкіх» харугваў захавалася 15 [14, арк. 45].

Пры некаторых касцёлах дзейнічала некалькі брацтваў. Напрыклад, пры касцёле глыбоцкіх кармелітаў босых дзейнічалі тры брацтвы: Маці Божай Шкаплернай, св. Юзафа і св. Барбары [6, s. 464], а пры мядзельскім кляштары гэтага ж ордэна чатыры – Маці Божай Шкаплернай, св. Юзафа, св. Юстына і брацтва добрай смерці [6, s. 560].

Адметнасць брацтваў заўважаецца ў іх усесаслоўнасці [12, арк. 6 адв. – 9]. Па вялікім рахунку, брацтвы з'яўляліся адзінымі арганізацыямі, у якіх прыналежнасць да канкрэтнага саслоўя не стварала абмежаванняў для ўступлення. Напрыклад, брацтва Св. Тройцы пры Краслаўскім касцёле налічвала 79 чалавек, з іх 78 сялян і 1 дваранка [12, арк. 6 адв. – 9], у Барысаўскім касцёле – сярод 59 чалавек, якія былі запісаныя ў брацтва сустракаліся: «солдатка, мещанка, крестьянин, гражданин, титулярный советник, однодворец, благородный» і г. д. [14, арк. 14 – 14 адв.].

Найбольш распаўсюджанымі на беларускіх землях былі ружанцовае [3, s. 154], шкаплернае і Св. Тройцы брацтвы. Па стане на 1830 г. у Мінскай дыяцэзіі дзейнічалі 34 брацтвы [1]. У сярэдзіне

60-х гг. XIX ст. колькасць брацтваў у Мінскай дыяцэзіі засталася практычна нязменнай. Сярод 30 брацтваў, якія функцыянавалі пры 29 касцёлах дыяцэзіі, было 12 ружанцовых, 4-шкаплерных, 4 Св. Тройцы, 2 св. Ганны [14, арк. 103–112] і інш. У гэты ж час па заходняй частцы Магілёўскай архідыяцэзіі налічвалася 22 брацтвы, з іх 14 ружанцовых, 2 шкаплерных, 5 Сэрца Езуса Хрыста [12, арк. 76–77] і інш. Да маларaспаўсюджаных адносіліся пахавальныя брацтвы (іх члены мелі абавязак удзельнічаць у пахаваннях) і брацтвы добрай смерці [5, s. 189]. Па стане на другую палову 60-х гг. XIX ст. толькі ў Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай губернях дзейнічала каля 400 брацтваў, з іх 110 ружанцовых, 60 шкаплерных, 37 – Св. Тройцы і інш. [16, с. 11].

Улады Расійскай імперыі былі мала знаёмыя са структурай і арганізацыямі рымска-каталіцкага касцёла, таму да брацтваў залічвалі і тэрцыярыяў, якія згодна з кананічным правам да іх не адносіліся. Тэрцыярыі, альбо «трэці ордэн», ордэн свецкіх асобаў выступалі адным з элементаў структураў касцёла, часткай жабрачых манаскіх ордэнаў францысканцаў, дамініканцаў, кармелітаў. Тэрцыярыямі маглі быць свецкія асобы, што жадалі жыць у адпаведнасці з духоўнасцю канкрэтнага ордэна, але не мелі магчымасці поўнасцю прысвяціць сябе манаству. У сваю чаргу, брацтвы з'яўляліся інтэгральнай часткай парафіі, ствараліся і дзейнічалі для больш зручнай арганізацыі працы святароў з вернікамі.

У канцы XVIII – пачатку XX ст., нягледзячы на разнароднасць брацтваў, адрозненні паміж імі былі вельмі нязначнымі. Практычна ўсе яны засноўваліся з мэтай клопату аб духоўным абліччы веруючых і яго ўдасканаленні. Арганізацыя вернікаў у групы – малітоўныя, брацкія і інш. дапамагала святарам у працы з людзьмі. Вельмі часта брацтвы адрозніваліся выключна назвай, а функцыянаванне канкрэтнага брацтва пры пэўным касцёле вызначалася толькі традыцыяй. Аднак, у дзейнасці ўсіх брацтваў можна выдзеліць 3 асноўныя накірункі: малітоўную, дапаможную і дабрачынную.

– малітоўная. Рэгулярная, прадпісаная статутам і традыцыяй брацтва, абавязковая для кожнага братчыка. У залежнасці ад

брацтва, прадугледжваўся комплекс штодзённых малітваў і іх інтэнцыя. У абавязкі братчыкаў уваходзіў таксама абавязковы ўдзел у нядзельных і святочных імшах, а таксама ў залежнасці ад брацтва – удзел у дадатковых набажэнствах (ружанцы, літаніі і г. д.). Кожнае брацтва мела вызначаны для сваіх членаў графік удзелу ў споведзі. Менавіта гэты блок абавязкаў павінен быў умацоўваць рэлігійнасць членаў брацтва і падтрымліваць іх непасрэдную сувязь з каталіцкім касцёлам.

– дапаможная заключалася ў розных відах працы на карысць касцёла. Да гэтага накірунку залічвалася і дапамога святару пры набажэнствах, якую традыцыйна ажыццяўлялі арганісты разам з членамі брацтваў. Менавіта братчыкі арганізоўвалі працэсіі са свечкамі і харугвамі. Як вынікае з дакументаў, некаторыя брацтвы ствараліся выключна для здзяйснення паслугаў падчас набажэнстваў (такім чынам, яны не былі брацтвамі ў дакладным значэнні гэтага слова). У некаторых выпадках братчыкам давяраліся ключы ад касцёла (напр., брацтва Св. Тройцы пры Докшыцкім касцёле). Там жа братчыкі адказвалі за збор грошай падчас набажэнстваў [14, арк. 11].

Дапаможнай мэце служылі таксама ўласныя касы брацтва, якія мелі большасць з іх. Складкі ў касу маглі быць добраахвотных памераў альбо дакладна вызначаныя. Так, члены ружанцовага брацтва пры Навамышскім касцёле і Маці Божай Шкаплернай пры Стваловіцкім касцёле ўносілі ў касу штогод па 10 капеек, ружанцовага пры Крошынскім касцёле – 15 капеек на год, ружанцовага пры Сваятыцкім касцёле – па 20 капеек [14, арк. 7–8]. Існавалі і бедныя брацтвы, якім, наадварот, дапамагаў святар. Так, для брацтва пры Стваловіцкім касцёле плябан выдзеліў «фунтаў 30 і харугваў 3 справіў і арнат пад тытулам братчыкаў, і цяпер свечкі дае калі не хапае, бо складкі, г. зн. ахвяра вельмі малыя. Яны збіраюцца ў скарбонку братчыкаў за двумя ключамі» (пераклад з польск. – *Р. З.*) [13, арк. 99]. Грошы з касы расходаваліся выключна для рэлігійных мэтаў: на набыццё свечак, якія выкарыстоўваліся падчас працэсій, на алтарах і для асвятлення касцёла [14, арк. 7–8], «на костельные вина, воск и лампадное сало, свечи белые, рызы и тому подобное» [14, арк. 11],

«на покупку свечей, ламп и мелкие починки» [14, арк. 54]. У некаторых выпадках брацтвы арганізоўвалі спецыяльныя мерапрыемствы па зборы ахвяраванняў на той касцёл, пры якім яны дзейнічалі. Так, члены Ракаўскага брацтва «по праздничным и торговым дням, со значками и барабанами, расхаживают по местечку и собирают с доброхотных дателей деньги, обращаемые на римско-католический костел» [14, арк. 25].

– дабрачынная. Дабрачыннасць брацтвамі і іх членамі рэалізоўвалася ў 2 накірунках: унутраным і знешнім. «Унутраная» дабрачыннасць ажыццяўлялася ў адносінах да членаў брацтва альбо іх блізкіх. Так, у выпадку смерці члена брацтва, яго сям'я магла разлічваць на ўрачыстае пахаванне і матэрыяльную дапамогу, велічыня якой залежала ад магчымасцяў брацкай касы.

Асноўным праяўленнем знешняй дабрачыннасці была раздача міласціны бедным асобам і жабракам. У статутах брацтваў адзначалася, што братчыкі павінны «исполнять по христианскому учению Богоугодныя и человеколюбивые дела, как то: давать милостыню нищим, пока есть жизнь и хоронить их тело по смерти и т. п.» [12, арк. 10].

Міласціну жабракі атрымлівалі ў нядзельныя і святочныя дні як асобна ад братчыкаў, так і ад брацтваў увогуле. Менавіта на такую мэту прызначалася частка касы брацтва пры Ракаўскім касцёле [14, арк. 48]. Акрамя дробных грашовых успамогаў, братчыкі, згодна са статутамі брацтваў, павінны былі аказваць асабістую рэгулярную дапамогу патрабуючым асобам. Таму дадаткова кожны братчык, па меры сваіх магчымасцяў, стараўся дапамагчы бедным ежай альбо вопраткай. Асаблівым чынам у дабрачынную дзейнасць – паслугу бедным людзям, вязням – уключаліся члены брацтва добрай смерці, якія дзейнічалі пры кляштарах францысканцаў у Вільні і Коўне [5]. У параўнанні з дзейнасцю праваслаўных брацтваў, асабліва тых, якія існавалі ў XVI–XVII стст., пазарэлігійная дзейнасць каталіцкіх брацтваў характарызавалася нізкай актыўнасцю.

Згодна з кананічным правам каталіцкага касцёла, дзейнасць канкрэтнага брацтва зацвярджалася Папам Рымскім. Зацвярджэнне магло быць розным: зацвярджэнне дзейнасці канкрэт-

нага брацтва пры канкрэтным касцёле, зацвярджэнне брацтва і дазвол на яго распаўсюджанне пры розных касцёлах, зацвярджэнне брацтва для канкрэтнага манаскага ордэна. З 1794 г. у Расійскай імперыі існаваў прынцып, па якім брацтвы зацвярджаліся епіскапам без узгаднення са свецкімі ўладамі.

Масавая касацыя кляштараў пасля паўстання 1830–1831 гг. прывяла да спынення дзейнасці тых брацтваў, якія дзейнічалі пры закрытых кляштарных касцёлах (ружанцовае, шкаплернае і г. д.). Аднак, самі брацтвы як арганізацыі вернікаў знаходзіліся па-за межамі ўвагі ўладаў да 1864 гг. Да таго часу яны функцыянавалі згодна з ўнутраным правам рымска-каталіцкага касцёла.

Паўстанне 1863–1864 гг. выклікала чарговую хвалю рэпрэсіўных мераў у адносінах да каталіцкага касцёла. Сярод іх у асобную групу выдзеліліся меры адносна брацтваў. У групу падазроных арганізацый брацтвы трапілі па шэрагу прычын. Па-першае, брацтвы з'яўляліся арганізацыямі, за якімі ўлады не маглі наглядаць, па-другое, яны аб'ядноўвалі людзей усіх саслоўяў, па-трэцяе, большасць брацтваў мела ўласную касу і непадкантрольныя ўладам сродкі. Па-чацвертае, урад не меў паняцця аб сутнасці, мэтах, задачах і дзейнасці брацтваў, што, у сваю чаргу, выклікала сур'ёзнае занепакоенне іх дзейнасцю.

Пытанне аб рымска-каталіцкіх брацтвах узняў М. Мураўёў у 1864 г. [12, арк. 15; 16, с. 42]. Аднак першапачатковыя мерапрыемствы тычыліся выключна збору звестак і падліку колькасці брацтваў і, па меры магчымасці, братчыкаў на беларуска-літоўскіх землях. Наступны раз пытанне аб дзейнасці брацтваў паўстала ў 1866 г. у рэвізійнай камісіі, дзе абмяркоўвалася, наколькі да брацтваў могуць прымяняцца дзяржаўныя правілы, якія ставяць іх побач з палітычнымі таварыствамі [16, с. 42]. У чарговы раз пытанне паўстала ў 1867 г., калі мінскаму, ковенскаму, віцебскаму і магілёўскаму губернатарам паступіла цыркулярная прапанова аб дастаўленні звестак пра брацтвы і аб скасаванні тых з іх, што не маюць дзяржаўнага дазволу на дзейнасць. У цыркуляры адзначалася: «1) по действующим постановлениям (св. зак. т. 15, уст. о прест. ист. 164 и 165) никакое

общество, товарищество, братство или иное подобное собрание не может существовать без ведома или согласия правительства, и не может быть терпимо даже и под предлогом какой либо благотворительной или другой будто бы полезной цели, что только те общества, товарищества и подобные собрания охраняются полициею, которые утверждены установленным порядком, всякое же неутвержденное общество немедленно закрывается, 2) основанный на означенных законоположениях циркуляр бывшего Г. Министра Внутренних дел от 6 октября 1866 г., 3) Высочайше утвержденные 8 мая 1865 г. основные правила для православных братств, в западном крае, по силе которых восстановление существующих и вновь даже этих братств допускается не иначе, как по утвержденному Епархиальным архиереем с согласия местного губернатора уставу, и 4) весь вред от безконтрольного существования костельных братств в <...> вверенном моему управлению крае, подтвержденный многими примерами во время происходивших в крае политических беспорядков, я счел безотлагательно решить вопрос <...> о римско-католических церковных братствах и сделать в отношении их распоряжения: Римско-Католической Духовной Консистории <...> те из них (братств), которые имеют законное основание к своему существованию и разрешены Правительством, оставить существовать безпрепятственно, доставив мне о них точные сведения, именые списки братчиков и самые уставы, те же брытства которые не предствят на свое существование законного разрешения и не имеют уставов, немедленно закрыть <...> и обязании их подписками об известности им настоящего распоряжения» [12, арк. 15–18].

Вышэйзгаданыя прычыны выклікалі масавыя распараджэнні губернатараў да біскупаў і паліцэйскіх спраўнікаў аб прадстаўленні звестак аб існуючых брацтвах, іх мэтах і задачах, кім і калі яны былі зацверджаны, а таксама аб палітычнай добранадзейнасці братчыкаў («при каких именно костёлах находятся означенные братства, с которого времени они существуют, с чьего разрешения каждое учреждено и для какой цели, каким уставом или инструкциею руководствуются и куда именно

обращаются деньги собираемыя жертвуемыя братчиками, равно как и все другия сведения к этому предмету относящиеся, а также какого поведения и благонадужны ли в политическом отношении самые братчики») [10; 14, арк. 1–1 адв.].

У выніку аказалася, што адзіным на той час брацтвам, якое мела імператарскі (Паўла I) дазвол на існаванне было брацтва немцаў-каталікоў Св. Марціна, заснаванае яшчэ ў XVII ст. пры касцёле св. Ганны ў Вільні. У яго ўваходзіла толькі нямецкае насельніцтва, а імператарская зацвярджэнне забяспечыла брацтва і штогадовымі датацыямі ад дзяржавы ў памеры 90 руб. [16, с. 44].

На іншыя пастаўленыя губернатарамі пытанні адказы адрозніваліся. Калі ад біскупаў губернатары атрымлівалі лісты з тлумачэннем сутнасці брацтваў, пералікам мэтаў і задачаў, а таксама абавязкамі брытчыкаў, то некаторыя паліцмайстары пачыналі шукаць у дзейнасці брацтваў палітычны падтэкст. Так, паводле азначэння ваеннага начальніка Навагрудскага павета «братства составляются из числа местных прихожан, которые хотя явно и незамечены в распространении между православными Католицизма и поддержания польской пропаганды, но как полагать нужно, устроены таковыя лишь для означенной цели. Что же касается политической благонадежности братчиков, то хотя оныя и ни в чем не замечены, но за благонадежность их ручаться нельзя, как некоторые заявили себя в подаче прошения Главному Начальнику Края об возврате упраздненного Мирского костела минуя ближайшее Начальство» [14, арк. 6–6 адв.]. Ваенны начальнік Мазырскага павета адзначаў, што «из рассказов лиц, бывших в Мозыре в 1863 году свидетельствующих о том, что в костеле пелись гимны, можно с полною вероятностью заключить, что братчицы были деятельными участницами в этих музыкальных демонстрациях» [14, арк. 6–6 адв.].

Аднак нават спадзеючыся адшукаць палітычны падтэкст у дзейнасці брацтваў, пераважная большасць спраўнікаў і ваенных начальнікаў рапартавалі аб іх выключна рэлігійным характары. Так, ваенны начальнік Дынабургскага павета ў рапарце адзначаў, што «в братствах никто из помещиков не состоит, а только одни крестьяне, что с самого начала мятежа,

как мне достоверно известно, ничего бурного не происходило <...> крестьяне всегда были верны законному правительству» [12, арк. 7]. У большасці рапартах адзначалася палітычная «добранадзейнасць братчыкаў» [14], а таксама аб тым, што «вообще в деятельности этих, так называемых, братчиков, не обнаружено до настоящего времени ничего предрассудительного. За поведением их, во всяком случае, имеется строгое наблюдение» [9, арк. 4].

Нягледзячы на пераважна станоўчыя характарыстыкі братчыкам, тлумачэнні расходаў грошай з брацкіх касаў, высвятленні мэтаў дзейнасці брацтваў, тыя, што не змаглі прадставіць доказаў зацвярджэння іх свецкімі ўладамі, было загадана ліквідаваць. 20 красавіка 1868 г. Віленскі, Ковенскі, Мінскі і Гродзенскі генерал-губернатар выдаў распараджэнне аб закрыцці ўсіх брацтваў пры касцёлах. Усе эмблематычныя знакі брацтваў і кнігі прызначаліся да спалення [7, с. 305]. Цыркуляр ад 31 мая 1868 г. абавязваў дэканаў і пробашчаў зачытаць у касцёлах распараджэнне аб закрыцці брацтваў. Пасля гэтага ў членаў брацтва бралі распіску аб азнаямленні з цыркулярам і брацтва лічылася скасаваным [12].

Забарона дзейнасці брацтваў, масавыя закрыцці прывялі да таго, што яны сталі існаваць тайна. Кантраляваць працэс ліквідацыі было дастаткова складанай справай, паколькі, як ужо адзначалася, асноўны змест дзейнасці каталіцкіх брацтваў заключаўся ў рэлігійных практыках. Размяжоўваць іх на прыватныя і брацкія было практычна немагчыма. Адсочванне калектыўнага выканання брацкіх рэлігійных абавязкаў таксама мела шэраг складанасцяў, бо праводзіліся яны ў касцёлах, а ўдзельнічаць маглі як братчыкі, так і іншыя парафіяне. Аднак пад падазрэнне траплялі асобы, якія збіраліся для малітваў у прыватных дамах, як гэта было ў м. Мсцібаў Ваўкавыскага павету [9, арк. 28]. Так, у доме сялянкі Маргарыты Галасевіч было створана «тэрцыярскае брацтва», члены якога маліліся па «кнігам секретным «не цензурным» [9, арк. 28]. У падобных выпадках братчыкі падвяргаліся пакаранням у выглядзе штрафаў.

Да канца XIX ст. пытанне аб дзейнасці брацтваў пры касцёлах паўставала некалькі разоў на губернскім узроўні [9, арк. 1–2, 12]. Тычылася яно, перадусім, збору звестак пра наяўныя арганізацыі вернікаў, і, у выпадку іх выяўлення, правядзення карных мераў і закрыцця. Так, у рапарце Гродзенскага павятовага спраўніка адзначалася, што ў 1898 г. па павеце брацтвы дзейнічалі ў Луненскім, Валпянскім і Вяліка-Эйсмантаўскім касцёлах [9, арк. 4]. Ваўкавыскі павятовы спраўнік даносіў аб адным брацтве пры Мсцібаўскім касцёле з зазначэннем, што братчыкі «никакой вредной деятельности не ведут» [9, арк. 48]. У 1899 г. Слонімскі павятовы спраўнік даносіў Гродзенскаму губернатару аб асобах, якія «могут быть отнесены к категории братчиков» [9, арк. 12]. Дзейнічалі яны, згодна з рапартам спраўніка пры Слонімскім, Ружанскім, Дварэцкім, Дзятлаўскім і Косаўскім касцёлах [9, арк. 12 адв.], прычым «брацкая» дзейнасць пералічаных асобаў абмяжоўвалася выключна дапамогай святару падчас набажэнстваў. Прадстаўленыя Гродзенскаму губернатару звесткі дазволілі яму сцвярджаць, што «в тех местах, где ксендзы более на виду, терциарские общества не встречаются, а существуют они преимущественно в центрах более глухих и главным образом при таких костелах, в которых настоятелями являются ксендзы, особенно известные своею политическою окраскою» [9, арк. 35].

У чарговы раз пытанне аб дзейнасці брацтваў паўстала ў 1905 г. у сувязі з выданнем указа аб верацярпімасці. У жніўні 1905 г. з дэпартамента духоўных спраў паступілі лісты да губернатараў з просьбай аб прадстаўленні звестак аб наяўных у губернях брацтвах [11; 15], аднак на той момант брацтваў на беларускіх землях практычна не засталося. Так, па звестках павятовых спраўнікаў Мінскай губерні, тут не было аніводнага брацтва [15]. У Віцебскай губерні брацтвы выявілі пры некаторых касцёлах (Прэльскім, Варкаўскім, Рушонскім, Біржагольскім і Аглонскім – на сённяшніх латвійскіх землях) [11]. Да брацтваў залічваліся таксама тэрцыяркі, якімі, на думку спраўнікаў, былі пабожныя жанчыны, а таксама асобы, што пражывалі ў касцёльных багадзельнях. Але гэта не заўсёды адпавядала рэчаіснасці.

У 1911 г. магілёўскі мітрапаліт В. Ключынскі ў сваім мемарандуме спрабаваў вярнуць каталіцкаму касцёлу права ў галіне заснавання брацтваў. Ён сцвярджаў аб неабходнасці іх дзейнасці, а таксама заклікаў улады не перашкаджаць існаванню наяўных пры касцёлах брацтваў, як і стварэнню новых. Сваю просьбу мітрапаліт абгрунтоўваў менавіта тым, што мэтай брацтваў з'яўляецца «внутренняя религиозная жизнь верующих. Никаких других обязанностей, кроме стремления к самоусовершенствованию, никаких других практик, кроме известных молитв, а иногда и постов, они не налагают. Ни одно из этих братств не преследует какой-либо политической цели, ибо в таком случае братство не было бы одобрено Главою Церкви» [8]. Аднак у адказе на вышэйзгаданы мемарандум, міністр унутраных спраў А. Макараў патлумачыў магчымасць функцыянавання толькі пры дазволе з боку Міністэрства ўнутраных спраў [17].

Літаратура

1. *Borejko Chodźko, I.* Diecezja Minska około 1830 r. Cz. 1 Struktury parafialne / I. Borejko Chodźko. – Lublin: In-t Europy Śródkowo-Wschodniej, 1998. – 263 s.

2. Bractwo // Encyklopedya kościelna. Tom II. – Warszawa: Skład Główny w księgarni Gebethnere i Wolffa, 1873. – S. 551–576.

3. *Brzoziecki, S.* Litewska prowincja dominikanów / S. Brzoziecki // Dominikanie Gdańsk – Polska – Europa. Materiały z konferencji międzynarodowej, 9–10 maja 2002 r. / red. D. A. Dekański, A. Golembnik, M. Grubka. – Gdańsk; Pelpin. – 2003. – S. 139–167.

4. *Makarczyk, J.* Kustodia Grodzieńska zakonu braci mniejszych konwentualnych w latach 1687–1832 / J. Makarczyk. – Гродна: Гродзенская дыяцэзія рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэсп. Беларусь, 2006. – 218 s.

5. *Makarczyk, J.* Prowincja litewsko-białoruska zakonu braci mniejszych konwentualnych w latach 1687–1845 / J. Makarczyk. – Grodno: Grodzieńska Diecezja Rzymsko-Katolicka, 2012. – 555 s.

6. *Wanat, B. J.* Zakon karmelitów bosych w Polsce / B. J. Wanat. – Kraków: Gebethner i S-ka, 1979. – 832 s.

7. *Ганчар, А. И.* Римско-католическая церковь в Беларуси (вт. пол. XIX – нач. XX вв.). Исторический очерк / А. И. Ганчар. – Гродно: ГГАУ, 2010. – 511 с.

8. Меморандум Могилевского митрополита Викентия Ключинского и католических епископов (1911–1912) // Католическая церковь накануне революции 1917 г.: сб. док. / сост. М. Радван. – Люблин: Научное общество Католического университета в Люблине, 2003. – С. 444–445.

9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ у г. Гродна). – Фонд 1. – Воп. 18. – Спр. 525.

10. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 6. – Спр. 543.

11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 46947.

12. НГАБ. – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 52543.

13. НГАБ. – Фонд 1781. – Воп. 27. – Спр. 592.

14. НГАБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 1926.

15. НГАБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 7596.

16. О костельных братствах. – Оттиск из «Вестника Западной России». – 1868. – Кн. 3–5. – 45 с.

17. Ответ министра А. А. Макарова на письмо митрополита В. Ключинского и начальников католических епархий (1912) // Католическая церковь накануне революции 1917 г.: сб. док. / сост. М. Радван. – Люблин: Научное общество Католического университета в Люблине, 2003. – С. 447.

Резюме

Р. В. ЗЕНЮК

БОРЬБА С РИМСКО-КАТОЛИЧЕСКИМИ БРАТСТВАМИ КАК ФОРМА ОГРАНИЧЕНИЯ ВЛИЯНИЯ КАТОЛИЧЕСКОЙ ЦЕРКВИ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX в.

Исследуется один из аспектов политики российских властей в период после восстания 1863–1864 гг. в отношении римско-католической церкви: борьбе с деятельностью братств, которые действовали при приходских и монастырских храмах. Опасаясь новых волнений, власти обращали пристальное внимание на любые объединения и товарищества. Не имея понятия о сущности, целях и задачах римско-католических братств, которые являлись исключительно религиозными организациями верующих, на них распространялись правила, относящиеся к политическим организациям. Деятельность братств, как организаций верующих, подвергнулась тщательной проверке и, несмотря на преимущественно положительные характеристики, как от церковных, так и от светских местных властей, была запрещена. В результате направленных действий полиции и гражданских властей существование братств до конца XIX в. прекратилось.

Summary

R. ZIANIUK

STRUGGLE WITH ROMAN-CATHOLIC COMMUNITIES AS A FORM OF LIMITING THE INFLUENCE OF THE CATHOLIC CHURCH IN THE SECOND HALF OF XIX CENTURY

The article is dedicated to researcing one of the aspects of the policy of Russian authorities during the period after the rebellion of 1863–1864 concerning the Catholic Church – it is the struggle against communities existing in parish or conventual churches. Being afraid of new troubles, the authorities paid a lot of attention to any communities and organizations. Without knowing anything about the sence, aims and purposes of Roman-Catholic communities, that were only religious organizations of the faitful, the authorities made them obey the rules concerning political organizations. The activity of the communities – religious organizations – was inspected and though the characteristics by church and local lay authorities were pretty positive, the activity of the communuities was forbidden. As a result of these purposed acts of police and civic authorities, the communities stopped to exist till the end of XIX century.

Паступіў у рэдакцыю 09.12.2013

УДК 94(438).071

А. Н. КАРПОВ

ПОЛОНЕЗ НА БЕРЕГАХ ЕНИСЕЯ. ИЗ ИСТОРИИ СИБИРСКОЙ ССЫЛКИ ПОЛЬСКИХ ПОВСТАНЦЕВ 1863 ГОДА В ЕНИСЕЙСКУЮ ГУБЕРНИЮ

Важнейшей побудительной причиной нашего обращения к этой проблематике, во многом и предопределившей выбор конкретной темы (история сибирской ссылки польских повстанцев 1863 года в Енисейскую губернию), стал юбилей Январского восстания – 150 лет этого знаменательного события.

Расправа над участниками Январского восстания была жестокой. Надо отметить, что общее количество ссыльных поляков (по разным источникам) было весьма внушительным – около 50 тысяч человек [12].

География ссылки повстанцев весьма обширна – от крайнего Севера-Запада европейской России до пресловутых Нерчинских рудников. При этом самодержавная власть предусмотрительно сокращала любую возможность объединений и даже простых контактов между ссыльными, размещая их на поселение в глухих углах Сибири, которых тогда имелось предостаточно. Император Александр II на основании донесения Виленского генерал-губернатора Назимова от 14–26 января 1863 г. издал соответствующий указ от 11–23 мая того же года «О мерах наказания польских бунтовщиков», в котором все участники «антиправительственного мятежа» делились на пять разрядов: первые два включали самых активных участников «бунта», его организаторов, третий – рядовых исполнителей, четвертый – лиц, оказывавших поддержку повстанцам или даже попросту выражавших им свое сочувствие, а пятый – всех тех, на кого упала всего лишь тень подозрения и кто вскоре после восста-

ния был амнистирован по Высочайшему повелению уже в марте 1863 г. Применительно к причисленным к первым двум разрядам предусматривалась смертная казнь или каторга с лишением всех гражданских прав и полной конфискацией всего принадлежащего лично им имущества. Для попавших в остальные разряды предполагались дифференцированные меры наказания, учитывающие не только степень их причастности к мятежникам, но и их социальный статус. Так, лиц дворянского (шляхетского) происхождения рекомендовалась ссылать в те места, о которых в России принято говорить «куда Макар телят не гонял», а к лицам простых сословий (мещане, крестьяне) применялось зачисление в арестантские роты на срок от одного года до 5 лет. При этом надо учитывать, что свою лепту в определение судеб мятежников вносили и такие институты самодержавной власти, как военно-полевые суды, генерал-аудиторы и наместник в Царстве Польском, командующий тем или иным военным округом или суды нижних инстанций (уже по прибытии к конкретному месту ссылки).

Ссыльные были в большинстве своем людьми внимательными и предупредительными по отношению друг к другу, во всем помогали каждому, кто в этом нуждался. Для местных жителей, приученных годами «золотой лихорадки» свято блюсти «табель о рангах», теплое отношение ссыльных друг к другу, невзирая на ранги, было в диковинку. Генрих Верцинский[12] (автор самого полного на польском языке повествования о судьбах повстанцев 1863 г., находившихся в ссылке в г. Енисейске и Енисейской губернии в 60–70-ые гг. XIX в.) в своих «Воспоминаниях» приводит такой пример: «...Наш коллега по ссылке, Б., бывший бургомистр, которому врач запретил зарабатывать на жизнь писанием бумаг, исполнял обязанности возницы у другого ссыльного, известного доктора Антоневича, что не мешало им пребывать

[12] Г. Верцинский – активный участник Январского восстания, 25 февраля 1863 г. был захвачен в бою под Малогощей, предан военному суду, который приговорил его к пожизненной ссылке в Сибирь, однако его несовершеннолетие на момент ареста сделало в дальнейшем возможным его досрочное возвращение из ссылки уже в 1869 г. по амнистии.

в наилучшей гармонии. <...> Какие у этих поляков странные обычаи? – говорили. – Возница с доктором сидят за одним столом и попивают чай» [1, с. 337].

Помимо пристанищ польских коллег, прибывших в Енисейск раньше, другим домом, в котором ссыльные находили много сердечности и гостеприимства был дом семьи Здановичей. Пан Зданович был асессором (заседателем) городского суда, его жена приехала в те края как домашняя учительница для детей семьи Борхов, где несмотря на то, что пан Борх был полковником губернской жандармерии, не забывали о необходимости привития детям знания родного языка и поэтому учительнице-польке многое позволялось. Генрих Верцинский пишет: «Женщина беспокойной души и большого сердца, сочувствующая несчастью изгнанников, она старалась приходить на помощь всем, невзирая на скромные средства, которыми семья Здановичей располагала» [1, с. 343].

Как явствует из поименного «Списка поляков – участников Январского восстания 1863–1864 гг.», на поселении в Енисейской губернии (ныне – Красноярский край и автономная республика Хакасия) было отправлено 3 719 человек [4], из которых 1737 человек направлялись на поселение под строгий надзор полиции, 141 человек подлежал каторжным работам, в разряд «ссыльных на житье» попадало 1841 человек. Но эти данные отражают лишь фактическое состояние дел с контингентом польских ссыльных на конец 1867 г., в целом же динамика движения количества повстанцев весьма разнится по годам (1863–1870), по административным округам, видам наказания (каторга, содержание в крепостях, жительство под надзором полиции, служба в арестантских ротах и линейных батальонах и т. п.). Статистика также не всегда точно отражает и численный состав такой категории, как «члены семей ссыльных», численность которых росла от года к году, и не только за счет образования новых семей в месте ссылки.

В Енисейском районном архиве бережно хранится папка, содержащая «Именной список политических преступников из поляков, поселенных в Анциферовской волости» [7]. Конечно, это

только «капля в море» от общего количества повстанцев, определенных в ссылку в Енисейскую губернию. Сейчас, по прошествии почти 150 лет со времени появления этого списка, просто необходимо спасти от забвения имена Январских подвижников и патриотов (в скобках указан возраст, а в ряде случаев и некоторые не общего характера данные):

Михаил Маевский (43, бывший помещик, уроженец Плоцкой губернии Царства Польского, по заключению полевого Аудиториата, утвержденному Его Императорским Высочеством, Великим Князем наместником, за участие в мятеже, сношение с предводителями мятежнической шайки, принятие мятежников в своем доме и хранение предназначавшегося для них оружия – к ссылке в Сибирь); Юлий Белоборский (26, бывший студент Варшавской Главной школы ссылается в Сибирь под строго сохраняемый надзор); Владислав Янковский (34, прусский подданный из Великого герцогства Познаньского, из шляхты); Юзеф Осташевский (32, из дворян, т. е. шляхты, за участие в вооруженном восстании); Владислав Сковинский (22, из дворянского сословия); Болеслав Дашкевич (19); Людвиг Михальский (28, из дворянского сословия, австрийский подданный); Юлиан Энгельфельд (49, из дворянского сословия), Аполлинарий Лагуна (33, из дворян, бывший отставной унтер-офицер), Антон Нюхневич (25, из дворян, бывший австрийский подданный), Максимилиан Олизарович (25); Альфред Васневский (24); Альбан Везора (24, из чиновников); Адам Янковский (20); Густав Сокольницкий (52, из дворянского сословия); Францишек Дзержинский (39); Григорий Мартынов Кучинский (49), его же сын Стефан (24); Андрей Заремба (49); Владислав Чернецкий (19); Игнатий Адамов Залесский (36); Антон Липович (24); Вицент Лизбрант(32); Иоанн Яковлевич Павлович (24); Ян Крушевский (32); Юлиан Мазовецкий (50); Мартын Капитан (31); Якуб Квятковский (24); Франц Самойло Пешко (42); Леон Продон (28, из французов, студент Варшавской главной школы), Ян Орельский (60), Христиан Нейман (61), Адам Кошко (34), Люциан Трей (26), Петр Пискарский (28), Феликс Василевский (36, из дворянского сословия).

Как видим, в этом списке, составленном земским исправником Красиковым, по состоянию на 1 января 1866 г., представлен весьма обширный возрастной диапазон ссыльных (от 19 лет до 61 года), равно как разнообразен и их социальный состав. Общим было лишь одно – спасти «живую душу», преодолеть «пустоту жизни» и безвременное бездействие. Поэтому брались за любую работу, учились сами и учили других тому, чему когда-то были обучены. Так, среди этой группы анциферовских ссыльных поляков было два бондаря, 11 помогали местным крестьянам, у которых обрели и крышу над головой, 4 столяра, 2 кузнеца, фельдшер, агроном, 2 – «без определенного занятия», 2 – «читали медицинские книги», 1 обучал грамоте, 1 работал письмоводителем у местного заседателя.

Кроме ссыльных в Пермской губернии были, так называемые военнопленные, т. е. непосредственные участники повстанческих отрядов, захваченные в боях. Их отправляли в арестантские роты гражданских ведомств. Таких было выслано в Пермскую губернию около 330 человек [12, с. 34].

Охрана, этапирование и наблюдение за ними поручалась войскам Отдельного корпуса внутренней стражи (ОКВС). В Перми дислоцировался батальон внутренней стражи, конно-этапная команда и уездная инвалидная команда, входившие в 4-й (Казанский) округ. В 1860–1863 гг. в Пермском батальоне внутренней стражи насчитывалось около 930 человек. Командовал батальоном бывший штабс-капитан гвардии, майор барон фон Тальберг Отто Германович, впоследствии переведенный в Санкт-Петербург и дослужившийся до генерал-лейтенанта.

Батальон был укомплектован рекрутами из западных губерний и Царства Польского. Судя по фамилиям и именам рекрутов Пермского батальона, среди них было значительное число евреев, поляков, возможно, белорусов. Документы того времени не выделяют национальность солдат и офицеров, но отмечают их конфессиональную принадлежность, так как воздействие на солдат через религиозное сознание считалось важным фактором в Русской армии. Ежегодно издавались приказы с перечислением христианских, иудейских, мусульманских праздников, во время которых для отправления соответствующих обрядов людей освобождали от обязанностей службы.

В 1840-е гг. в Пермском гарнизонном батальоне был свой капеллан, кандидат богословия, ксендз Зелинский. Служили в батальоне солдаты-католики. Католиком был и военно-судебный чин – аудитор [8, л. 2, 4].

Согласно букве закона, Устав 1827 г. позволял нижним чинам из евреев посещать синагоги, расположенные в местах дислокации войск, а также пользоваться услугами раввинов. Там, где не было ни синагог, ни раввинов, устав позволял еврейским солдатам устраивать молельный кворум (миньян), особенно по праздникам, в местах, специально дозволенных для совместной молитвы старшим офицером. Если число солдат из числа евреев в данной части, соединении превышало триста человек, к тому же они отличались примерным поведением, Устав предполагал назначать к ним – с разрешения командования войсками – раввина с оплатой от казны [9, с. 734]. Но в Пермском гарнизоне должности раввина не было, что, скорее всего, определялось отношением самого командира.

Солдаты, призванные из западных губерний, не только охраняли и сопровождали своих проштрафившихся земляков, но и шили для них арестантскую одежду. Так, в 1861 г. на пошиве арестантской одежды было задействовано 154 человека батальона. За труды платили от 1 руб. 40 коп. до 3 руб. 80 коп. каждому в зависимости от вклада и мастерства (то ли парщик, то ли портной). Это было меньше, чем получали ссыльные на пропитание [6, л. 2,7]. Всего за первое полугодие 1861 г. было пошито для взрослых арестантов-мужчин 2500 рубах, 3000 портов, 1700 кафтанов, 400 шаровар, 500 шапок летних, для арестантов-женщин 900 рубах, 500 юбок летних, 800 платков. Кроме того, шилась одежда и для малолетних арестантов [6, л. 10, 11]. Те же солдаты под командованием уже подполковника Тальберга шили арестантскую одежду и в 1862 г., и в 1863 г. [7, л. 45].

Давно намеченная реформа внутренних войск была отложена именно из-за польского восстания, и только 6 августа 1864 г. император подписал указ об упразднении ОКВС с 1 января 1865 г. По этому указу был преобразован и Пермский батальон.

После подавления восстания император довольно-таки быстро стал смягчать репрессии. Так, уже в 1867 г. по Высочайшему повелению было разрешено лицам, находящимся под надзором полиции в административной высылке, вернуться к себе на родину. Однако такое благоволение не распространялось на лиц

духовного звания [10, с. 792–793]. К 1870-м гг. основная часть ссыльных за участие в восстании покинула пределы Пермской губернии. Остальные были освобождены только в 1894 г.

14 ноября 1894 г. манифестом императора разрешалось «всем лицам, отбывающим еще наказание за участие в польском мятеже 1863 г., державное освобождение от полицейского надзора с предоставлением права повсеместного жительства» [11, с. 642]. В документе, отложившемся в архиве Пермского края, это повеление императора имеет добавление, отсутствующее в официальном документе: «Приостановиться, впредь до особого распоряжения, разрешением им жительства в Царстве Польском, Северо- и Юго-Западных краях, а лицам, принадлежавшим к римско-католическому духовенству, еще и в Курляндской губернии» [5, л. 2]. Однако уездные начальники (Камышловский, Красноуфимский, Верхотурский, Чердынский) докладывали Пермскому губернатору, что к тому времени лиц, отбывающих наказание за польское восстание уже не было [5, л. 4, 6].

Таким образом, органы государственного управления на местах достаточно успешно справлялись со своими обязанностями в непростой обстановке и, в целом, контролировали ситуацию в регионе. Само население Пермской губернии, кроме небольшого числа чиновников и жандармов, вынужденных контактировать с ссыльными, осталось индифферентно к восстанию и его участникам. По социально-экономическим, политическим и культурно-религиозным причинам это выступление не вызывало сочувствия у населения глубинки России. Обособленность, замкнутость самих ссыльных не способствовали оказанию какого-то существенного влияния польского присутствия на местную жизнь.

Значительное количественное преобладание среди участников выступления (соответственно и среди понесших наказание) имели обеспеченные, зажиточные слои и интеллигенция, и относительно небольшим было количество участников-крестьян. Самодержавная власть строго стояла на позициях охраны частной собственности, даже если собственник являлся мятежником и выступал против самого государства, и применяла лишение

прав собственности только как крайнюю меру воздействия, предпочитая давать возможность вернуть движимое и недвижимое имущество в будущем за примерное поведение и верную службу.

Литература

1. Государственный архив Пермского края (далее – ГАПК). – Фонд 65. – Оп. 1. – Д. 345.
2. ГАПК. – Фонд 65. – Оп. 1. – Д. 346.
3. ГАПК. – Фонд 65. – Оп. 1. – Д. 1138.
4. ГАПК. – Фонд 65. – Оп. 1. – Д. 1141.
5. ГАПК. – Фонд 65. – Оп. 1. –Д. 1160.
6. ГАПК. – Фонд 299. – Оп. 1. – Д. 1.
7. ГАПК. – Фонд 299. – Оп. 1. – Д. 3.
8. ГАПК. – Фонд 504. – Оп. 1. – Д. 1.
9. Полное собрание законов Российской империи. II собрание. – Т. 2. – № 1330.
10. Полное собрание законов Российской империи. II собрание. – Т. 42. – № 44 601.
11. Полное собрание законов Российской империи. III собрание. – Т. 14. – № 11 035.
12. Поляки в Пермском крае: Очерки истории и этнографии / колл. авт. под ред. А. В. Черных. – СПб.: Маматов, 2009. – 304 с.

Рэзюмэ

М. В. ПАДПРАТАЎ

ОРГАНЫ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ ПЕРМСКАЙ ГУБЕРНІ І ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ССЫЛКІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ПАЎСТАННЯ 1863–1864 гг.

Аналізуецца дзейнасць розных службаў дзяржаўнага і ваеннага кіравання Пермскай губерні па арганізацыі і забеспячэнні прыёму асуджаных удзельнікаў паўстання, аховы і нагляду за імі, перадачы іншым ведамствам. Вылучаюцца агульнарасійскія рысы і асаблівасці гэтага працэсу ў рэгіёне. Паказваюцца катэгорыі рэпрэсаваных удзельнікаў паўстання, іх сацыяльны склад, агульная колькасць высланых у Пермскую губерню. Аналізуюцца іх маёмасны стан, харктэрныя рысы побыту, узровень грашовага ўтрымання, узаемаадносіны з мясцовым насельніцтвам. Выяўляецца ўдзел прадстаўнікоў рымска-каталіцкай царквы ў ідэалагічнай і матэрыяльнай дапамозе ссыль-

ным. Характарызуецца дзейнасць батальёна корпуса ўнутранай варты, укамплектаванага рэкрутамі з Паўночна-Заходняга краю і звязанай з аховай, суправаджэннем і матэрыяльным забеспячэннем арыштаваных.

Summary

N. PODPRYATOV

GENERAL GOVERNMENT OF THE PERM PROVINCE AND PROVIDING LINKS PARTICIPANTS IN THE UPRISING 1863–1864 YEARS

Article contains analysis of the activities of the various state and military departments of the Perm province in organizing and ensuring the reception of the repressed participants in the uprising of 1863–1864, their being under arrest, supervision and transfer to other offices. The underlined national traits and characteristics of these processes in the region. The article defines categories of participants in the uprising, their social structure, the total number of deported to Perm province. Analyses of their property status, lifestyle, level of emoluments, relationships with the local population. Revealed part of Catholic priests in the ideological and material assistance exiled and arrested. Special attention is paid to the activities of the battalion inner guards, staffed by recruits from the North-Western region and related to the protection and material support for the arrested.

Паступіў у рэдакцыю 12.12.2013

УДК 94 (476): 930.25 (474.5)

І. В. СОРКІНА

ПАЛІТЫКА ЦАРЫЗМУ Ў БЕЛАРУСІ ПАСЛЯ ПАЎСТАННЯ 1863–1864 гг. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ЛІТОЎСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ГІСТАРЫЧНАГА АРХІВА)

У дадзеным даследаванні разгляд палітыкі царызму пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. у беларуска-літоўскім краі будзе скіраваны на вырашэнне праблемы ўмяшальніцтва расійскіх уладаў у гістарычную памяць і ідэнтычнасць мясцовага насельніцтва. Дакументы, выяўленыя намі пераважна ў фондзе канцылярыі віленскага, ковенскага і гродзенскага генерал-губернатара (ф. 378) Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Вільні, адлюстроўваюць намаганні царызму канчаткова знішчыць культурна-прасторавае асяроддзе, якое склалася на землях Беларусі і Літвы ў часы Вялікага княства Літоўскага, ператварыць жыхароў краю ў паслухмяных падданых Расійскай імперыі з адпаведнай ментальнасцю і гістарычнай памяццю.

Значны комплекс дакументаў ЛДГА па этнаканфесійнай палітыцы паказвае драматычны працэс закрыцця кляштараў і касцёлаў альбо ператварэння іх у праваслаўныя храмы (справы аб закрыцці Валожынскага бернардзінскага кляштара ў 1865 г. [1], касцёлаў у м. Бездзеж [2], м. Дукора [3], ператварэнні касцёла ў царкву ў м. Расне [4] ды інш.[13] Адначасова ішло масавае будаўніцтва праваслаўных цэркваў (у Асвеі, Поразаве, Парэччы,

[13] У ЛДГА захаваліся падобныя дакументы аб Міры, Нягневічах, Снове, Вялікай Бераставіцы, Зэльве, Грозаве, Дзярэчыне, Воўпе, Песках, Моўчадзі, Крычаве, Лыскаве, Воўчыне, Мілейчыцах, Крэве, Рубяжэвічах, Вішневе, Смаргоні, Малой Бераставіцы, Ляхавічах, Поразаве, Росі, Васілішках, Стоўбцах і г. д.

Крынках, Маладзечне, Лебедзеве, Глыбокім, Старым Мядзелі, Дзятлаве, Хомску ды інш.). Захаваліся шматлікія прашэнні сялян і мяшчан аб дазволе застацца ў каталіцкай веры.

Выяўленыя дакументы праліваюць святло на спробы ўвядзення рускай мовы ў дадатковае касцёльнае набажэнства. «Непаслухмяных» ксяндзоў строга каралі. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць «Дело о заключении настоятеля копыльского костела ксендза Антония Глаза в Виленский кармелитский монастырь на шесть месяцев. 1882 г.» «Віна» капыльскага ксяндза заключалася ў непадпарадкаванні патрабаванню ўладаў весці дадатковае набажэнства на рускай мове. Антоній Глаз быў пазбаўлены духоўнага сана і высланы ў г. Праскураў Падольскай губерні «для водворение в тамошнее мещанское общество как обращенному в первобытное состояние» [5, арк. 3 – 3 адв.].

Забарона публічнага ўжывання польскай мовы даходзіла да такіх крайніх мераў, як прадпісанне М. Мураўёва ад 24 сакавіка 1864 г., якое прадугледжвала «обязать аптекарей, трактирщиков, содержателей магазинов, лавок и разных заведений в городах и местечках никаких вывесок, расчетов, счетов, ярлыков, сигнатурок на польском языке не допускать» [6, арк. 4 адв.].

Кантроль за недапушчэннем распаўсюджвання забароненых цэнзурай выданняў здзяйсняўся праз нагляд за кніжнымі крамамі і гандлярамі кніжнай прадукцыі ў разнос. Так, у лістападзе 1867 г. рабіліся агляды дробных крамаў з рэлігійнымі прадметамі. У Вільні былі канфіскаваныя 109 назваў кніг і брашур, з іх 12 – свецкага характару. Усе кнігі свецкага зместу, акрамя граматыкі, характарызаваліся ў перапісцы губернскай адміністрацыі як напісаныя «в совершенно польском духе». Творы «*Książeczki obrazkowi*» і «*Obrazki Historyczne*», выдадзеныя ў Варшаве ў 1862 г., змяшчалі «рассказы из польской истории, прославляющие с энтузиазмом своих королей и полководцев», былі «проникнуты духом польского патриотизма и католической религиозной экзальтации». «*Podarunek dla Ludu naszego*» (Варшава, 1862–1863) быў непрымальны для чыноўнікаў, бо напісаны «для поддержания польских преданий», а «*Ksiądz Wikary*» (Варшава,

1863) – бо «польская земля рассматривается как самостоятельное государство и внушается убеждение, что ксёндз есть источник мудрости и добра для народа» [7, арк. 6 адв., 37 адв., 38].

Сярод адукаваных жыхароў краю папулярнасцю карысталася не толькі падобная літаратура, але і творы мастацтва на гістарычныя тэмы. Так, улады мелі шмат клопатаў з праблемай распаўсюджвання праз разносны гандаль фотаздымкаў карцін вядомага мастака Яна Матэйкі, сярод якіх «*Прыняцце Стэфанам Баторыем Рускага пасольства*», «*Падзелы Польшчы*» і іншыя, а таксама выява біскупа Ледахоўскага ў турме. Чыноўнікі характарызавалі творы Я. Матэйкі як «польскую прапаганду». Аб гэтым сведчыць «Дело о продаже торговцами товаров в разнос в Виленской, Ковенской и Гродненской губерниях фотографических снимков с недозволенных в России картин известного польского художника Матейки. 1876–1878» [8].

У лісце віленскага генерал-губернатара ад 30 чэрвеня 1880 г. гродзенскі губернатар папярэджваў аб магчымым хуткім з'яўленні на Гродзеншчыне фотакопій карціны Яна Матэйкі, прысвечанай паўстанню 1863 г., якая пасля выстаўлення ў Кракаве на мастацкай выставе вельмі спадабалася публіцы і з якой было зроблена некалькі тысяч фотаздымкаў для распаўсюджвання іх у Прывісленскім краі і паўночна-заходніх губернях. У гэтым лісце твор Матэйкі апісваецца наступным чынам: «Варшавским генерал-губернатором получено сведение, что на открытой несколько недель тому назад в Кракове в здании «Сукенницы» художественной выставке польских живописцев появилась картина Матейки, принадлежащая к числу не удавшихся по художественному исполнению произведений и без сомнения писанная под влиянием желчного раздражения и патриотического фанатизма. Картина эта представляет внутренность тюрьмы, на стене обозначен 1863 г., граф Муравьев изображен стоящим в стороне, держа одну руку в кармане брюк, плащ на нем едва держится и он с улыбкою смотрит как палачи надевают кандалы на приговоренных к смерти польских патриотов: молодого мужчину и девушку, а на заднем плане виднеются русские солдаты со зверскими лицами. По

окончании в Кракове судебного процесса над социалистами публика особенно стала оказывать внимание к этой картине...» [14, арк. 1–2].

Спроба гвалтоўнага выцяснення з памяці былых грамадзянаў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай падзеяў і імёнаў іх мінуўшчыны праяўлялася, сярод іншага, і ў забароне святкаванняў гістарычных гадавінаў. Так, дакумент ЛДГА «Дело о манифестации, бывшей в м. Друскениках в память соединения Литвы с Польшей» пралівае святло на атмасферу святкавання мясцовай грамадскасцю ў 1862 г. гадавіны Люблінскай уніі, а таксама на рэпрэсіі гарадзенскіх уладаў у адказ на гэта. 8 жніўня з Гродна ў Вільню быў накіраваны ліст, у якім падрабязна апісвалася імпрэза, наладжаная ў м. Друскенікі 31 ліпеня 1862 г. (адзначалася, што падобнае ладзіцца ўжо ў другі раз). Удзельнікамі святкавання былі памешчыкі і каля 100 чалавек сялян і яўрэяў. У 11 гадзін у касцёле пачалося набажэнства з аркестрам музыкантаў. Мужчыны былі апранутыя ў чамаркі і светлыя жупаны, а жанчыны – у белыя сукенкі з малінавымі і блакітнымі стужкамі. Затым просты народ быў запрошаны ў публічны сад, дзе ў 16 гадзін для яго быў наладжаны абед. Перад абедам адстаўны тытулярны дарадца Махнаўр, які паводле следчай справы быў асноўным арганізатарам мерапрыемства, чытаў для гасцей Варшаўскую газету, робячы ўласныя тлумачэнні. Пасля абеду для сялян была разыграная бясплатная латарэя з танных рэчаў, якія дасталіся кожнаму ў памяць аб гэтым дні. У будынку вакзала ўвечары адбыўся музычны вечар з уваходам па платных білетах, на які быў дапушчаны просты народ. Пасля гэтага сялян і яўрэяў частавалі гарбатаю і цукеркамі. А 21-ай гадзіне быў феерверк з парома на Нёмане, на якім быў транспарант, «изображавший протянутые над Неманом с противоположных сторон одна к другой две руки, из коих одна была драпирована Польским кунтушем, а другая Литовскою сермягою» [9, арк. 3–5 адв.]

Напрыканцы апісання гэтага святкавання адзначалася: «Что же касается до г. Гродно, то день этот прошел совершенно спокойно, кроме того только, что вместо траура заметны были

цветные платья». З Гродна ў Друскенікі былі камандзіраваныя рота пяхоты, «расположенная по всем обывательским домам экзекуционным порядком», а таксама 20 казакоў пры афіцэры. Махнаўр быў высланы ў Петразаводск [9, арк. 5, 40].

Неабходна пракаментаваць узгаданы ў дадзеным дакуменце факт нашэння жалобнага адзення ў Гродне. Гэта быў адзін са спосабаў дэмаршу, асабліва папулярны сярод жанчынаў. Ён выяўляўся праз нашэнне рэвалюцыйных знакаў і адзення, спяванне забароненых гімнаў, прысутнасць на жалобных набажэнствах (па загінуўшых у 1830–1831 гг. або расстраляных у варшаўскай дэманстрацыі 15 (27) лютага 1861 г.). Асноўнымі відамі вопраткі былі чорныя сукенкі і капялюшыкі з белымі султанкамі, спражкі з выявамі злучанага герба Польшчы і ВКЛ, пераламанага крыжа ў цярновым вянку. Згодна з распараджэннем віленскага ваеннага, ковенскага, гродзенскага і мінскага генерал-губернатара з падпарадкаваннем Віцебскай і Магілёўскай губерняў ад 12 чэрвеня 1863 г. за жалобны ўбор пры затрыманні першы раз з жанчыны спаганялі штраф у памеры 25 руб. серабром, за другі – 50, на трэці раз – арышт, а іх мужоў звальнялі са службы. Жанчыны, у сваю чаргу, ішлі на хітрасць. Яны нашывалі каляровыя паскі на чорныя сукенкі, насілі хустачкі з такімі ж стужачкамі, завязвалі іх абавязкова пад падбародак. Выглядала ўсё як бы маскарад насуперак уладзе. Таму распараджэннем генерал-губернатара М. Мураўёва ад 4 лістапада 1863 г. усталёўваліся правілы для жаночай вопраткі: чорныя капялюшы патрабавалі ўпрыгожваць кветкамі, сукенкі – каляровымі пацеркамі і стужкамі. Чорныя вуалі, пальчаткі, шалі, белыя і чорныя пер'і забараняліся ўвогуле. Каптуры маглі быць чорныя на любой падкладцы, але толькі не на белай. Ужыванне спалучэння чорнага і белага лічылася рэвалюцыйным сімвалам [18, с. 60–61].

У 1883 г. улады, сярод іншага, былі заклапочаныя праблемаю прадухілення святкавання мясцовай грамадскасцю 200-годдзя разгрому туркаў пад Венаю Янам III Сабескім у 1683 г. У лісце да гродзенскага губернатара віленскі генерал-губернатар адзначаў: «Празднование годовщины сего события имеет

целью воскресить в памяти не только поляков, но и всего цивилизованного мира времена политической самостоятельности и могущества Польши, мужества и храбрости ее героев, которым в лице короля Яна Собеского христианство и цивилизация, по выражению польских заграничных газет, обязаны спасением от язычества и варварства. Опыт же прежнего времени свидетельствует, что польское население и римско-католическое духовенство Северо-Западного края, признавая оный нераздельною частию древней Польши, не только лично никогда не относились безучастно к подобного рода патриотическим польским торжествам, но всегда делали попытки тем или другим видимым способом ознаменовать дни таких торжеств в пределах здешнего края и привлечь местное население к участию в празднествах. В виду сего нельзя не ожидать, что и предстоящее ныне празднование <...> может вызвать у нас те или другие неуместные проявления демонстративного свойства» [15, арк. 1–2]. Ставілася задача не дапусціць ніякіх урачыстасцей, працэсій, публічных сходаў, чытанняў і прамоваў, а таксама распаўсюджвання выдадзеных за мяжою ў памяць гэтага юбілею кніг, медальёнаў, карцінаў, брашураў і асобных вершаў.

Не дазвалялі ўлады ўшаноўваць памяць класікаў польскай літаратуры. Так, 16 красавіка 1907 г. гродзенская гарадская дума пастанавіла хадайнічаць аб перайменаванні Палявой вуліцы ў Гродне ў вуліцу Элізы Ажэшкі. Гэта ініцыятыва выклікала жорсткую крытыку з боку губернскай адміністрацыі. Губернатар характарызаваў Э. Ажэшку як «ярую польскую националистку, крупную величину в лагере противников русского дела в Северо-Западном крае». У якасці доказаў гэтага губернатар успамінаў пра напісаную ёй падчас вайны Расіі з Турцыяй 1876–1877 гг. пракламацыю, якая ўтрымлівала заклік да антырасійскай барацьбы: «К оружию, к оружию! Везде повсеместно развейте знамена, шитые руками польских жен. Наступил удобный случай отбросить Россию за Днепр и Двину. Повторим же удары меча Болеслава Храброго на золотых воротах Киевских. Пусть теперь увидят москали наше королевское знамя на башне Варшавского замка». Губернатар сцвярджаў, што не

можа быць санкцыі на перайменаванне адной з галоўных вуліц «русского города и притом города, служащего ареной борьбы с вожделениями польских националистов, именем такой типичной польки и врага России...» Губернатар выказваў шкадаванне, што грамадскасць горада ўжо выпрасіла для Ажэшкі званне ганаровай грамадзянкі горада, і адзначаў, што гэтага «более чем достаточно для выражения сочувствия со стороны русского города польской писательнице» [10, арк. 2–2 адв.].

Адначасова адбывалася навязваннем жыхарам беларуска-літоўскага краю расійскага юбілейна-ўшанавальнага канона. Вялікая ўвага надавалася арганізацыі шматлікіх імпрэзаў, прысвечаных юбілейным датам расійскай гісторыі і расійскіх манархаў [17]:

1862 г. – 1000-годдзе Расійскай дзяржавы;
1872 г. – 200-годдзе Пятра Вялікага;
1877 г. – 100-годдзе Аляксандра I;
1888 г. – 900-годдзе хрышчэння рускай зямлі;
1889 г. – 50-годдзе з дня «ўз'яднання» ўніятаў з РПЦ;
1892 г. – 500-годдзе з дня канчыны св. Сергія Раданежскага;
1896 г. – 100-годдзе з дня нараджэння Мікалая I;
1896 г. – 100-годдзе з дня нараджэння Кацярыны II;
1899 г. – 100-годдзе з дня нараджэння А. С. Пушкіна;
1900 г. – 100-годдзе з дня смерці А. Суворава;
1902 г. – 100-годдзе Гродзенскай губерні;
1912 г. – 300-годдзе царавання Раманавых;
1912 г. – 100-годдзе вайны 1812 г.

У ЛДГА захоўваецца дакумент, які паказвае ўмяшанне расійскай улады ў мясцовы тапанімічны ландшафт. Гэта праявілася ў масавым перайменаванні назваў паселішчаў у 1864–1866 гг., калі пад перайменаванне падпалі ўсе назвы з «польскім», каталіцкім зместам. У лісце з Гродзенскага статыстычнага камітэта віленскаму генерал-губернатару ад 29 жніўня 1866 г. адзначалася, што падчас тапаграфічнай здымкі ў Гродзенскай губерні падпалкоўніку Штраўсу было даручана скласці спіс населеных пунктаў, назвы якіх «подверглись извращению во время польского господства в здешнем крае» і якім неабходна вярнуць

«местные русские названия», тым больш, што «в речи здешнего русского народа все почти названия удержали до настоящего времени свой русский характер» [11, арк. 1]. У назвах знікала дз (Грандзічы, Дзевятоўка), трансфармаваліся ўсе назвы паселішчаў, што заканчваліся на -шчызна (Крупаўшчызна стала Крупаўкай, Кунцаўшчызна – Кунцоўкай, Абрэмшчызна – Абрубаўкай і г. д.), Жукевічы ператварыліся ў Жукаўку, в. Юрыздыка стала «д. Поселок», Янаўшчызна – Іванаўкай, м. Казлаўшчызна – Казлоўкай, м. Здзенцел – Дзятлавам, м. Здзітава – Жытава, Пашкаўшчызна – Пашкоўка, Залускі Ксяндзоўскія – Залугі Папоўскія, Бельшчына – Бялоўка, Маркаўшчызна – Маркаўка, ваколіца Пухалы Новы – Новыя Бухалы, Пухалы Стары – Старыя Бухалы, Вінна-Касцёльна – Кацельная, Сморклічы – Маркоўка, Панасовічы – Апанасаўка, Юзэфполь – Осіпаўка, Дземянічы – Дзям'янаўка, Міхалін – Міхайлаўка і г. д. Па хадайніцтве генерал-маёра Пятра Дзяконскага набыты ім маёнтак Жыдомля ў Гродзенскім павеце быў перайменаваны ў «Благовещенское». Усяго пад перайменаванне падпадала 558 населеных пунктаў Гродзенскай губерні [11, арк. 1–24].

Умяшанне расійскай улады ў мясцовы ўрбананімны ландшафт праявілася ў масавым змяненні назваў вуліц беларускіх гарадоў у 1864–1866 гг. На думку ўладаў, «некоторые улицы и переулки носят устаревшие польские названия, лишенные смысла и значения, не сродные русскому духу и не соответствующие значению самых городов, как центров русской администрации» [12, арк. 1]. У Мінску плошча Высокага рынка стала Саборнай, вуліца Бернардзінская – Манастырскай, Валоцкая – Хрышчэнскай, Дамініканская – Петрапаўлаўскай, Зборавая – Турэмнай, Зыбіцкая – Балотнай, Феліцыянаўская – Багадзельнай, Францішканская – Губернатарскай, Лошыцкая – Базарнай, Школьна-Нямігская – Кацярынінскай, Плябанская – Шырокай і г. д. У Барысаве перайменавалі вуліцу Юрыздыцкую на Мала-Яраслаўльскую, у Ігумене – Касцёльную на Варонежскую, у Мазыры – Езуіцкую на Аляксандраўскую. У Пінску Дамініканская пераўтварылася ў Саборную, Францішканская – у Манастырскую, Бернардзінская – у Турэмную, Кармеліцкая –

у Шпітальную, Завальная – у Паліцэйскую, Замкавая – у Багадзельную. У Слуцку вуліца Судовая стала Садовай, а Войтаўская – Бабруйскай (расійскія ўлады хацелі такім чынам знішчыць напамін пра былую сістэму самакіравання). У Навагрудку зліквідавалі вуліцу Кавальскую (яна стала называцца Сямёнаўская), вуліца Валаўская стала Іванаўскай, завулак Базыльянскі стаў Барысаглебскім. У Бабруйску Маршальскую 1-ю перайменавалі ў Буйную, Маршальскую 2-ю – у Казначэйскую [12, арк. 2–6].

У Гродне вуліца Дамініканская была перайменавана ў Саборную, Баніфратэрская – у Татарскую, Басняцкая – у Паштовую, Брыгіцкая – у Купецкую, Златарская – у Палацкую, Магілковая – у Крывую. З'явіліся патранімічныя назвы вуліц, якія называліся мясцовымі ўладамі ў гонар рэальных асобаў: вуліцы Купецкая і Садовая ў Гродне былі перайменаваныя адпаведна ў Кутузаўскую і Мураўёўскую. Вельмі верагодна, што Аляксандраўская вуліца была названая ў гонар Аляксандра I [16, с. 367–368].

Палітыка, накіраваная на планамернае вынішчэнне тутэйшай ідэнтычнасці, праявілася і ў адносінах да мясцовых помнікаў гісторыі і культуры. Пэўная ўвага надавалася захаванню тых з іх, якія ўлады лічылі «рускімі». Гэта, напрыклад, Каложа ў Гродне. Калі ў выніку апоўзня ў 1853 г. абваліліся ў рэчку паўднёвая сцяна храма і частка заходняй, то ўлады шукалі магчымасці для яго аднаўлення і ўмацавання берага Нёмана. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць «Дело о возобновлении в г. Гродно Борисо-Глебской (Коложанской) церкви с укреплением берегов р. Неман. 1865–1872 гг.» [13]. Праўда, толькі ў 1897 г. бераг быў замацаваны, а на месцы разбураных сцен пастаўлены драўляныя.

Адначасова знішчаліся і перабудоўваліся да непазнавальнасці старажытныя каталіцкія святыні. Так, касцёл кляштару дамініканаў у Гродне пасля 1863 г. ператварылі ў праваслаўную царкву Ямбургскага ўланскага палка, а ў 1874 г. цалкам разбурылі. Кляштар кармелітаў босых пасля скасавання ў 1843 г. перайшоў да ваеннага ведамства, а ў 1903 г. на яго аснове пабудавалі казармы. Шматпакутную «Фару Вітаўта», мураваны летапіс гісторыі Гродна, расійскія ўлады прыстасавалі пад

праваслаўную царкву. У 1804–1807 гг. былі праведзеныя аднаўленчыя работы (у 1782 г. будынак касцёла моцна пацярпеў ад пажару), пасля чаго храм асвячоны як праваслаўны Сафійскі сабор. Першая праваслаўная рэканструкцыя ў стылі класіцызму не змяніла істотна архітэктуру касцёла. У 1892 г. у выніку чарговага пажару абваліліся склепы, што дало магчымасць пры новай рэканструкцыі значна панізіць алтарную частку і надаць пабудове кампазіцыйны лад псеўдарускіх цэркваў. У 1896–1898 гг. акадэмік архітэктуры М. Чагін перабудаваў храм у псеўдарускім стылі. Над дахам на маскоўскі капыл было пастаўлена пяць «цыбулінаў», вежа пераўтворана ў званіцу, завершаную высокім шатром. Выразную пластыку фасадаў здрабнілі бясконцыя броўкі, какошнікі, парэбрыкі і іншыя псеўдарускія дэкаратыўныя элементы. Гэтая перабудова пераўтварыла галоўную святыню ў макабрычную спаруду, што раптоўна прыдушыла сваім духам і памерам увесь горад. Такім чынам, на прыкладзе Гродна бачна, як у царскія часы закладваліся асноўныя прынцыпы каланіяльнай будаўнічай практыкі ў Беларусі: гвалтоўная змена функцыяў старых ансамбляў, брутальнае разбурэнне важных у духоўным і гістарычным сэнсах аб'ектаў, наўмыснае стварэнне эстэтычнага канфлікту праз радыкальную стылістычную змену альбо пабудову чужародных і несумаштабных аб'ектаў у традыцыйным высокамастацкім асяроддзі [19, с. 80–81].

З прыведзенага матэрыялу вынікае, што палітыка расійскай улады на землях Беларусі пасля паўстання 1863 г. цалкам адпавядала палітычным і ідэалагічным інтарэсам самадзяржаўя. Яна вызначалася барацьбой з польска-каталіцкім уплывам і пасляпдоўнай русіфікацыяй. Царызм імкнуўся ізаляваць беларуска-літоўскі край ад польска-еўрапейскіх уплываў і насаджаў тут расійска-візантыйскія культурныя традыцыі.

Літаратура

1. Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей – ЛДГА). – Фонд 378, агульны аддз. – 1861 г. – Спр. 865.

2. ЛДГА. – Фонд 378, агул. аддз. – 1864 г. – Спр. 1324.

3. ЛДГА. – Фонд 378, агул. аддз. – 1864 г. – Спр. 1446 а.

4. ЛДГА. – Фонд 378, агул. аддз. – 1864 г. – Спр. 1514.
5. ЛДГА. – Фонд 378, агул. аддз. – 1882. – Спр. 319.
6. ЛДГА. – Фонд 378, агул. аддз. – 1864. – Спр. 271.
7. ЛДГА. – Фонд 378, агул. аддз. – 1868 г. – Спр. 136.
8. ЛДГА. – Фонд 378, паліт. аддз. – 1876 г. – Спр. 30.
9. ЛДГА. – Фонд 378, паліт. аддз. – 1862 г. – Спр. 97.
10. ЛДГА. – Фонд 378, агул. аддз. – 1908. – Спр. 525.
11. ЛДГА. – Фонд 378, агул. аддз. – 1866 г. – Спр. 378.
12. ЛДГА. – Фонд 378, агул. аддз. – 1865 г. – Спр. 1977.
13. ЛДГА. – Фонд 378, агул. аддз. – 1865. – Спр. 1504.
14. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ у г. Гродна). – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 382.
15. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 951.
16. *Сацукевіч, І.* Гісторыя і сучаснасць урбананімікі Гродна і Мінска (параўнаўчы аналіз) / І. Сацукевіч // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры: зб. навук. арт. / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: І. П. Крэнь, І. В. Соркіна (адк. рэд.) [і інш.]– Гродна: ГрДУ, 2007. – С. 366–371.
17. *Соркіна, І.* Гістарычная палітыка ў Гродне ў другой палове XIX – пачатку XX ст. паводле матэрыялаў архіўных фондаў мясцовай адміністрацыі / І. В. Соркіна // Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV–XX стст. / пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. – Мінск: Зміцер Колас, 2012. – С. 291–311.
18. *Фірыновіч, А. Э.* «Жаночы фактар» у паўстанні 1863–1864 гг.: інфармацыйны патэнцыял беларускіх архівасховішчаў / А. Э. Фірыновіч // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2011. – № 2. – С. 59–65.
19. *Харэўскі, С.* Два стагоддзі руйнавання Горадні / С. Харэўскі // Горад святога Губерта: краязн. альм. – Варшава, 2007. – Вып. 3. – С. 80–86.
20. *Шыбека, З. В.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002) / З. В. Шыбека. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2003. – 490 с.

Резюме

И. В. СОРКИНА

ПОЛИТИКА ЦАРИЗМА В БЕЛАРУСИ ПОСЛЕ ВОССТАНИЯ 1863–1864 гг. (ПО МАТЕРИАЛАМ ЛИТОВСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО ИСТОРИЧЕСКОГО АРХИВА)

На основе документальных архивных материалов рассматривается политика царизма в Беларуси после восстания 1863–1864 гг., которая была направлена на превращение жителей края в послушных подданных Российской империи с соответствующей ментальностью и исторической памятью. Затрагиваются вопросы закрытия католических монастырей и храмов, массового строительства православных церквей, введения русского языка в дополни-

тельное костельное богослужение, запрета публичного употребления польского языка, вытеснения из памяти местных жителей событий и имен их прошлого, навязывания им празднования юбилейных дат российской истории, массовых переименований населенных пунктов, городских площадей и улиц, колониальной градостроительной практики.

Summary

I. SORKINA

TSARIST POLICY IN BELARUS AFTER THE UPRISING OF 1863–1864 (BASED ON THE LITHUANIAN STATE HISTORICAL ARCHIVES)

On the basis of documentary archival material the author examines the tsarist policy in Belarus after the uprising of 1863–1864, which was aimed at making the inhabitants of the region in the obedient subjects of the Russian Empire with the appropriate mentality and historical memory. The paper addresses the issues of closing Catholic monasteries and temples, mass construction of Orthodox churches, the introduction of Russian language in the churchyard additional worship, banning public use of the Polish language, repression from the memory of local residents of the events and names of their past, imposed on them celebrating anniversaries of Russian history, mass renaming settlements, city squares and streets, the colonial city planning practices.

Паступіў у рэдакцыю 18.12.2013

УДК 94(476)«1863/1864»:930.1(= 16)

А. Э. ФІРЫНОВІЧ

АДГАЛОСКІ ПАЎСТАННЯ 1863–1864 гг. У БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯХ

Пасля падзей 1863–1864 гг. адпраўным пунктам фарміравання атмасферы жыцця на беларуска-літоўскай тэрыторыі стала ўрадавая барацьба супраць праяў «польскасці». Яна базіравалася на тэзе, што сацыяльным ініцыятарам паўстання 1863–1864 гг. выступілі польскія паны і рымска-каталіцкае духавенства, якія выкарыстоўвалі «все усилия для истребления всего русского и православного, дабы через это поднять польское и католическое» [17, арк. 1]. Таму першачарговымі мерапрыемствамі па знішчэнні польскага ўплыву ў сваёй запісцы да Аляксандра II ад 5 красавіка 1865 г. М. Мураўёў прапаноўваў абраць:

– захаванне ваеннага палажэння на працягу наступнага пяцігоддзя, бо за ўсталяваным супакоем бачыў яшчэ «попел мяцяжу»;

– «біць па кішэні палякаў», г. зн. не адмяняць 5-працэнтнага збору з памешчыкаў польскага паходжання, як сродку для задавальнення неабходных выдаткаў па палітычнаму стану краю і для змяншэння іх матэрыяльнага дабрабыту;

– не вяртаць сасланых, калі і зрабіць паслабленні, то толькі праз пяць год тым, хто знаходзіцца ў Сібіры;

– заняцца канчатковым вырашэннем сялянскай справы ў накірунку стварэння ўсемагчымых умоў для фінансавай незалежнасці сялян ад уладальнікаў зямлі;

– увесці новыя адукацыйныя стандарты, асабліва ў выкладанні гісторыі і мовы, растлумачыўшы ўсім «рускую сутнасць Паўночна-Заходняга краю».

Імператар ухваліў прапановы цалкам, аддаўшы прыярытэт апошняй, так званай сферы грамадскага настрою або «состоянию умов» [1, с. 584].

Вызначальным стрыжнем паводзінаў прадстаўнікоў кіруючых органаў стала фобія перад «интригами иезуитского лжехристианства, ксендзов и шляхты» [1, с. 582]. У гэтым ідэйным сімбіёзе не размяжоўваліся нацыянальны і рэлігійны аспекты. У выніку, апазнавальнымі знакамі «паляка» выступалі наведванне рымска-каталіцкай царквы і ўжыванне польскай мовы. Зразумець сутнасць поглядаў афіцыйных улад дапамагае разважанне ваеннага начальніка Сакольскага павета: «В здешнем крае польские песни введены для того, чтобы навсегда удержать польский элемент в Русском народе, говорящим по-русски и чтобы всякий, в особенности простой народ видел, что «еще Польша не згинела», когда могущественная Россия не в силах изгнать из своих пределов вредного для нее польского языка» [11, арк. 4].

Пытанне «польска / каталіцкага засілля Паўночна-Заходняга краю» стала генеральнай лініяй пры наладзе функцыянавання ўсіх сфер жыцця беларуска-літоўскіх губерняў. Нават самая дэмакратычная і прагрэсіўная для таго часу рэформа судовай сістэмы набыла тут абмежаваны, палавінчаты характар. Увязенне валасных і міравых судоў ставіла за мэту максімальна прыблізіць суд да насельніцтва, пабудаваць сувязь грамадзян з дзяржавай праз удзел іх у прававых установах, а тым самым садзейнічаць развіццю прававой культуры і адзінай прававой прасторы. Але ў беларуска-літоўскім рэгіёне фарміраванне міравой юстыцыі засталося пад уплывам урада, што супярэчыла галоўнаму прынцыпу судовага рэфармавання імперыі. Так, міравых суддзяў прызначалі, але не выбіралі, ім надавался таксама права нязменнасці. Аргументавалася гэта фармальнай нагодай часовай адсутнасці земстваў у краі, а галоўнай прычынай служылі недавер і нежаданне дапусціць у адміністрацыю, да простага насельніцтва «полякующее» чыноўніцтва. Яго трапны партрэт намаляваў у сярэдзіне 1860-х гг. адзін з міравых пасярэднікаў Магілёўскай губерні І. М. Захар'ін: «Большинство

чиновников Могилевской губернии состояло все еще из поляков, между которыми была маса лиц, числящихся православними; это были местные уроженцы – «белорусы», как они стали называть себя после усмиренного восстания. В сущности же это были истые поляки, рожденные от смешаных браков, носившие даже польские фамилии, предпочитавшие для молитвы костелы церквам и вспоминавшие о своем православии лиш случайно – то есть тогда, когда это было выгодным» [2, с. 82].

У многім вышэйадзначанае ўспрыняцце палітычнай сітуацыі набывала неадэкватныя, абсурдныя формы. У 1870 г. брэсцкі павятовы спраўнік пісаў гродзенскаму губернатару: «Следует считать подозрительным не только лиц, находящихся под надзором полиции, но и все католическое население вообще, которое хотя и ведет себя осторожно, тем не менее того же образа мыслей, исключая лишь нескольких крестьян, которые несознательно увлечены в бывшие беспорядки, то обещаниями, то угрозами» [19, арк. 38].

Звярталася асаблівая ўвага на кніжную справу, бо яна служыла рэалізацыі важнейшай палітычнай мэты – распаўсюджванню «православно-христианского учения и возбуждения в народе, что он – русский» [1, с. 582], плюс развіццю хатняга навучання грамаце. Узамен забароненым кнігам (падручнік па гісторыі Аляксандра Здановіча «Нарыс гісторыі Польскай для дзяцей у двух курсах», выдадзены ў Вільні ў 1862 г., і малітоўнік «Залаты Алтарык», надрукаваны ў 1858 г.) папячыцель Віленскай навучальнай акругі І. Карнілаў склаў свой каталог: «Евангелле», «Малітваслоў», «Псалтыр», «Свяшчэнная гісторыя», «Буквар царкоўнаграмадзянскі», «Добрае чытанне для праваслаўных», «Масква, Кіеў і Варшава», брашура князя Львова пра Расію, «Заходня-Рускі каляндар». І ні ў якім разе ён прасіў не дазваляць пранікненню ў беларуска-літоўскія губерні «някрасаўшчыны, твораў адмоўнай школы» і сатыры пра Расію. Прапаноўвалася таксама рассылка праваслаўных абразоў, крыжыкаў, святых карцінаў, партрэтаў імператара і яго сям'і [1, с. 582–584].

Праўда, адмена ваеннага становішча 21 мая 1866 г. спарадзіла надзею на магчымасць дыхнуць лягчэй. Але гэта была надзея

вельмі аддаленага часу, бо ва ўрадавых колах замацавалася меркаванне: «...несмотря на восстановление всюду спокойствия, жители польского происхождения (дворянство и духовенство) неблагонадежно к правительству. <...> Это обязывает строгими и незамедлительными преследованиями, могущими проявиться как в польской партии, так и в крестьянской среде преступных замыслов <...> уничтожать зло в самом начале <...> удалять политически неблагонадежных, сохранять правила о секвестре и конфискации имущества, воспрещать католикам процессии без разрешения властей, оставить право за начальником края денежного штрафа на виновных в польской пропаганде, оставить в силе запрет на содержание оружия и т. д.» [23, арк. 1]. Адназначна на дэкларавалася, што «не должны ослабеть ни постоянные внимательные наблюдения за действием и благонадежностью местных жителей, ни строгость закона в наказании политических преступников, особенно за поляками» і да таго часу, пакуль «образованная здесь администрация из русских чиновников и возрождающаяся русская национальность приобретут необходимую твердость и достаточный перевес для успешного ведения борьбы с пришлым польским населением» [5, арк. 21].

Пасля фактычна поўнага захавання абмежавальных мерапрыемстваў пакацілася хваля дадатковых новаўвядзенняў. Яшчэ ў ліпені 1865 г. у запісцы аб «мяцежным становішчы Паўночна-Заходняга краю» генерал Патапаў адзначаў: «...в настоящее время мятеж потушен, польская пропаганда в Литовской Руси не умерла и требует мер радикальных, придав им форму правительственной системы» [26, с. 21]. Хаця перасцярогі ўрада наконт нядобранадзейнасці мясцовага насельніцтва не выглядалі безпадстаўнымі, што аргументавалася шэрагам выпадкаў, напраўленых, на думку ўладаў, супраць Расійскай імперыі. Напрыклад, у сувязі з пабегам з Гродзенскай турмы палітычнага арыштанта, тэлеграфіста Ферсбера (жыхар Царства Польскага), быў праведзены вобыск у наглядчыка турмы Маркіяновіча, якога падазравалі ў садзеянні. У доме знайшлі сшытак з яго вершамі на польскай і рускай мовах, пранікнутымі «польскім настроем»:

«Moskal nas bije / Маскаль нас б'е,
Moskal gniecie / Маскаль гняце,
Uciekajcie, bracie / Уцякайце, браты,
Gdzie chcecie / Куды хочаце» [22, арк. 1].

У 1866 г. начальства Мінскай і Віленскай губерняў рапартавала аб трох здарэннях выканання рэвалюцыйнага гімна на набажэнстве, аб фіксацыі выпадкаў «фанатычнай дзейнасці» ксяндзоў у час споведзі вернікаў, у следстве чаго апошнія пакідалі касцёл раней чытання малітвы за імператарскі дом [25, с. 659]. У Гродзенскай губерні распаўсюджваліся чуткі пра тайныя грашовыя складкі на «жалезны капітал», а ў Варшаве на – «благочинный». Па адной з адозваў гэты збор прызнаваўся паўсюдным «во всю длину и ширину Польши» і збіраўся па пятніцам ва ўсіх парафіях. Сустракалася таксама нашэнне жалобы, чорных крыжоў, шалікаў, чамарак і другіх эмблематычных выяваў [6, арк. 1, 7]. З'яўляліся звесткі і пра тайныя сходкі. Так, затрыманы Слонімскім спраўнікам селянін перавозіў ад свайго памешчыка сем лістоў на польскай мове і дзве недазволеныя цэнзурай кнігі на французскай мове з абведзенымі аўлоўкам старонкамі, пераклад якіх паказаў антырасійскі сэнс. Лісты прызначаліся ксяндзу Жалудокскага касцёла Ясінскаму, памешчыцам Яноўскай і Мікульскай. Са зместу лістоў вынікала інфармацыя аб правядзенні сходак у памешчыка Юрыя Пратасевіча, дзе чыталіся «вредные» кнігі [7, арк. 5].

Да антыўрадавых з'яў прыпісваліся розныя фінансавыя аперацыі па продажу, перапродажу маёнткаў мясцовымі ўладальнікамі, дзе значна завышаўся іх кошт, або меліся ўсемагчымыя абцяжарванні ў выглядзе дадатковых маёмасных кантрактаў: «...преднамеренно запутывают свои имения разными процессами контроверсами, контрактами и другими условиями самыми тягостными для хозяйства, как, например, отдают свои имения в аренду более чем на 12 лет, несмотря на то, что владение их имениями продолжится впредь лишь на 2 года, продают евреям леса, причем с умыслом делают такие условия, кои ведут явно к разорению имения» [1, с. 586]. У гэтым бачылася супрацьдзеянне дзяржаўнай палітыцы па засяленні беларуска-літоўскіх губерняў насельніцтвам з цэнтральных раёнаў Расійскай імперыі.

Увогуле, актывізацыю пратэстнай рэакцыі жыхароў беларуска-літоўскага рэгіёну ў адзначаны час можна патлумачыць падзеямі ў Галіцыі, пры назначэнні яе намеснікам Агенора Галухоўскага – аўстрыйскага палітычнага дзеяча польскага паходжання, што параджала надзеі на пэўную станоўчасць у вырашэнні польскага пытання. Самі ж урадавыя структуры спасылаліся на пралікі ніжэйшай адміністрацыі – няправільнае разуменне і выкананне распараджэнняў з цэнтру міравымі пасярэднікамі, членамі паверачных камісій, губернскіх па сялянскіх справах «присутствий» у шкоду інтарэсаў мясцовага дваранства; маральнае зневажанне жыхароў. Калі, напрыклад, замест прадпісання зняць з дарог і палёў крыжы «рэвалюцыйнага характару», у Мінскай губерні спраўнік загадаў зняць усе крыжы [25, с. 660].

Таму ў справаздачы Трэцяга аддзялення за другую палову 1860-х гг. вынікі «абрусення Заходняга краю» прызнаваліся зусім нікчэмнымі. Яны праявіліся толькі ў тым, што «крестьяне-католики обращаются в православие; что православные священники стали говорить по-русски, а жены некоторых из них, бывшие католички, обращены в православие» [25, с. 660].

Нязменнасць настойлівага характару насаджэння рускай мовы ў адзначаны перыяд пацвярджаюць спробы далучэння да рускай культуры нацыянальных меншасцяў беларуска-літоўскіх губерняў. Так, полацкі рабін, каб даказаць сваю добразычлівасць расійскаму трону, прапанаваў уладам свой праект па русіфікацыі яўрэйскага насельніцтва. У якасці аргумента правамернасці такіх крокаў ён зазначаў: «...в древние времена все Еврейско-религиозные книги были писаны на господствующем языке края, где они находились, и ныне в заграничных землях, Евреи совершают даже молитву на господствующем их языке, и одно исключение бывает только Россия» [4, арк. 1]. Добра ведаючы традыцыі сваіх адзінаверцаў, рабін меркаваў далучыць іх да вывучэння рускай мовы праз забарону шлюбаў тым маладым людзям, якія пасля праходжання пэўнага курсу навучання, суразмернага з іх матэрыяльным станам, не мелі атэстата аб засваенні дзяржаўнай школьнай праграмы па рускай мове. Каб пазбегнуць гэтай перашкоды бацькі адразу б аддавалі дзяцей у вучылішчы, што спрыяла б масавай русіфікацыі краю.

Зразумела, ломка традыцыйнага ўкладу жыцця беларуска-літоўскага рэгіёну не магла не выявіцца на адпаведнай рэакцыі насельніцтва. «Раздражительное настроение здешнего населения» ў сувязі з рэформамі каталіцкага касцёла, моўнай і школьнай палітыкай неаднаразова заўважала вышэйшае начальства [16, арк. 1]. Аднак, знаходзячыся ў цісках расійскага ўраду, грамадская думка і праявы раздражняльнасці знаходзілі сваё выражэнне пераважна ў сферы прыватнага (асабістага) жыцця праз пэўныя аднаактныя пратэсты і дэманстрацыі, часцей за ўсё на рэлігійнай глебе (парушэнне абраду праваслаўнай царквы, наведванне навярнуўшыміся праваслаўнымі касцёла, нараканні і зневажанні праваслаўнай веры і г. д.).

Напрыклад, адна выхаванка Беластоцкага інстытута высакародных дзяўчат была заўважана ў выплёўванні пасля ўдзелу ў службе прычасця. Як аказалася, так навучыла яе маці (полька), каб не здраджваць сваёй сапраўднай веры (каталіцтву) [9, арк. 1].

Некаторыя вернікі адмаўляліся выконваць хрысціянскія сакрамэнты па праваслаўным абрадзе. Так, сяляне вёскі Парозава не прыступалі да споведзі ў мясцовай царкве. На ўсе ўгаворы праваслаўнага святара яны адказвалі: «Пусть начальство даст нам бумагу, что мы имеем право исповедоваться у ксендза в Порозовском костеле, то мы все сейчас же отправимся к исповеди» [12, арк. 8].

Шэраг вернікаў, што перайшлі ў праваслаўе, працягвалі наведваць касцёлы і праваслаўныя святары прызнавалі, што нягледзячы на ўсемагчымыя стараннi з іх боку, адвучыць не атрымоўвалася. У якасці выхаду ўлады знайшлі толькі сістэму грашовых спагнанняў. На што жыхары знаходзілі сваю процівагу, напрыклад, распаўсюджванне сярод праваслаўных чуткаў аб дазволе заходзіць у касцёл пасля царкоўнага набажэнства [8, арк. 17].

Найбольш пашыраны былі зневажальныя выказванні ў адрас праваслаўнай веры і адмаўленні прысутнічаць на набажэнствах за імператара і яго сям'ю. Сялянку Ваўкавыскага павета Агаф'ю Барысаву нават арыштавалі за асабліва дзёрзкія нараканні. Падчас малітвы ў Сепіршкоўскай праваслаўнай царкве народ пачаў

спяваць «Ойча наш» па-польску, на забарону гэта рабіць, сялянка заявіла: «Чтобы Государю добра не было, что запрещает петь по-польски, а требует по-русски» [18, арк. 2]. Таксама яна называла праваслаўную веру сабачай і прасіла, каб гром забіў цара за закрыццё касцёлаў.

А сяляне мястэчка Картуз-Бярозы на просьбу ваеннага начальніка спыніць гаспадарчую працу ў час урачыстага набажэнства за жыццё імператара запярэчылі: «Пропадите вы все со своею церковью, у нас царя нет и праздника нет <...> как же нам идти в церковь, когда мы по-русски не умеем молиться Богу» [14, арк. 1].

Вышэй апісаныя выпадкі адназначна адносіліся расійскай адміністрацыяй да доказу «существующей еще католической пропаганды». Відавочна, такое адценне не патрабавала пранікнення ў сутнасць здарэнняў і выступала пацвярджэннем жывучасці ўплыву падзей 1863–1864 гг. на беларуска-літоўскіх землях. У вылучанай плоскасці існавала нават спецыяльная катэгорыя ***палітычных правінаў*** (вылучана аўтарам. – *А. Ф.*) «касающиеся Православной веры и за распространение нелепых и вредных слухов». Па ёй у 1866 г. у Ваўкавыскім павеце пад арыштам знаходзілася 12 чалавек (11 сялян, 1 аднадворца) за спакушэнне сялян перайсці з праваслаўя ў каталіцызм, за хрышчэнне ксяндзом дзіцяці ад праваслаўнай маці, за асуджэнне тых, хто прыняў праваслаўе, за кляцьбу праваслаўя, знаходжанне з польскім малітоўнікам у царкве [10, арк. 25].

У сваю чаргу, адначасова ў катэгорыю антыўрадавай дзейнасці ўключалася псаванне партрэтаў імператара, пропаведзі ксяндзоў, што не прайшлі цэнзуру, адкрытыя выказванні «антырасійскага» характару. Так, селяніна Марціна Казлоўскага і мяшчаніна Вікенція Шкварку арыштавалі за праколванне нажом вачэй на імператарскім партрэце, але паколькі яны былі непаўнагадовымі, выпусцілі з вытлумачэннем супрацьзаконнасці іх паводзінаў [13, арк. 12].

Перманентны кантроль за каталіцкім клірам пасля падзей 1863–1864 гг. фактычна яшчэ больш узмацніўся. Сітуацыя складвалася такім чынам, што святары не збіраліся губляць

сваіх вернікаў, таму ўсялякімі спосабамі супрацьдзейнічалі распаўсюджванню праваслаўнай веры: прымалі на споведзь «новаправаслаўных», хрысцілі іх дзяцей, давалі шлюбы, адмаўляліся праводзіць набажэнствы ў гонар імператара, уводзіць рускую мову ў літургію і г. д. У выніку любы крок па-за межамі парафіі ўспрымаўся як палітычны. Асаблівае назіранне вялося за пропаведзямі. У 1876 г. Віцебскі губернатар пісаў: «...системою бывшей Польши, ополячивать подвластный ей Белорусский и Литовский край посредством римско-католической проповеди и затем последующим воспитанием в этом духе через ксендзов, действующих преимущественно на женщину, вносившей все воспринятое ею в свою семью. Такое воспитание и влияние и теперь идет в том же направлении» [24, арк. 59]. Часта, не заўсёды адэкватна, у святарскіх навуках мясцовая адміністрацыя знаходзіла двухсэнсоўнасць і палітычнасць. Напрыклад, з ксяндза Чарнаўчыцкага касцёла Кярсноўскага спагналі грашовы штраф у 100 руб. за наступнае сцвярджэнне: «...во время Папы Пия V молитва только избавила от ига мусульман и способствовала одержанию над ними Поляками победы, а также во время царствования Сигизмунда III тоже молитва спасла от разорения край теми же наездниками напавшими» [15, арк. 1]. На гэта ў тлумачэнні ваеннага начальніка заключалася: «...между тем как гласит История, во время Папы Пия V и Короля Сигизмунда Поляки не вели никаких войн с мусульманами, а только с Русскими, затем Ксендз Керсновский явно порочит и посылает дух вражды в Католическом народе к Православным, называя его мусульманским – неверным; кроме того Ксендз Керсновский проповедовал о каком то единомыслии и общем согласии, с которым все возможно на свете, – эти выражения наводят на мысль политического содержания» [15, арк. 1].

Як бачна, дыферэнцыяцыі ў «палітычных злачынствах» ніякай не было. Усё праходзіла пад знакам «польскай інтрыгі паўстання 1863–1864 гг.», актывізацыя якой перапляталася са знешнепалітычнымі абставінамі. Па перыядызацыі В. М. Чарапіцы ў ёй вылучаюцца тры этапы: першы (1866–1868) звязаны

з антыўрадавымі выступленнямі ў Галіцыі і Царстве Польскім; другі (1870–1871) – з франка-прускай вайной і дзейнасцю Парыжскай камуны; трэці (1875–1878) з усходнім крызісам і руска-турэцкай вайной. І сапраўды, менавіта ў гэтыя гады ў беларускіх гарадах і мястэчках з'яўлялася шмат эміграцкай прэсы, брашураў, лістоў «крайне предосудительного содержания». Распаўсюджваліся розныя адозвы, пракламацыі тыпу «Небесное письмо Божей матери» з заклікам палякаў і абяцаннямі Божай дапамогі ў супрацьстаянні расійскаму ўраду [20, арк. 1], або заклікі адзначыць стагоддзе падзелу Рэчы Паспалітай у 1872 г. нашэннем цэлы год жалобы ці іншымі праявамі народнага смутку, акрэсліўшы, што і «части Польши (землі былой Рэчы Паспалітай. – *А. Ф.*), находящиеся под особым полицейским гнетом, должны делать то, что позволяют обстоятельства» [20, арк. 27]. Мясцовая адміністрацыя неаднаразова атрымлівала ананімныя лісты з пагрозамі. Каталіцкім святарам пасылаліся ананімкі ад імя Папы Рымскага не весці набажэнства на рускай мове і г. д. [3, арк. 1].

За многімі жыхарамі, як «праваднікамі польскіх ідэй», усталёўваўся сакрэтны паліцэйскі нагляд. Так, жонка міравога суддзі Кобрынскага павета Аляксандра Балбякова падвяргалася яму за захаванне кніг, «возбуждающих политические страсти поляков» тыпу «Преследование католической церкви в Литве», і 30-ці капеечнай манеты паўстання 1831 г. [21, арк. 5] У пачатку 1870-х гг. толькі па Ваўкавыскім, Кобрынскім, Пружанскім, Слонімскім, Гродзенскім паветах і гораду Гродна пад паліцэйскім наглядам знаходзіўся 241 чалавек, з іх (па наяўных указаннях) 20 – пад сакрэтным [19].

Вышэй адзначанае катэгарычна правакавала палітычны вектар урада Расійскай імперыі на поўным «распалячванні» беларуска-літоўскіх зямель. Ідэалагічную базу для яго фарміравала класічная формула агульнаімпераскага светапогляду: «католік-паляк, праваслаўны-рускі». Вось як гэта тлумачыў Віцебскі губернатар: «В силу политических событий и давления некоторое время Польши на Литву и Белоруссию, – давления по преимуществу религиозного, полонизм и католичество

так неразрывно связались между собою, что первый непременно предполагает другое и наоборот» [26, с. 62]. Згодна з афіцыйным меркаваннем, носьбітамі «польскасці» выступалі шляхта і рымска-каталіцкія святары, якія лічыліся галоўнай дзеючай сілай падзей 1863–1864 гг. Таму паўстанне 1863–1864 гг. стала своеасаблівым каталізатарам у актывізацыі барацьбы супраць «польскага элементу» беларуска-літоўскіх губерняў. З аднаго боку, яно ўключыла ў сябе інтэнсіўную фазу ў рэалізацыі мер па знішчэнні польскасці, з другога боку, стала апраўдальным аргументам распачатай палітыкі і ў наступныя гады пасля яго заканчэння. У многіх напрамках такая палітыка пераходзіла з афіцыйнага ўзроўню на прыватны.

Аднак, нягледзячы на хранічны страх перад «польскай змовай», расійскі ўрад не мог больш прыкрывацца толькі ёю і вымушаны быў прызнаць наяўнасць іншых форм і ідэйнага характару грамадскай думкі. Тым больш, што змены былі на твар: капіталізацыя, пралетарызацыя і інш. Пранікаючы на беларускія землі, яны падымалі новыя аспекты, расстаўлялі свае акцэнты.

Літаратура

1. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772–1903 гг.). Т. 2. – Мінск: Выд-ва Акад. навук БССР, 1946. – 938 с.

2. *Загорнов, А. А.* Организация волостной и мировой юстиции в Северо-Западном крае Российской империи (вторая половина XIX). – Рус. сб.: исслед. по ист. России. – 2012. – № 12. – С. 82–90.

3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 2182.

4. НГАБ. – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 31869.

5. НГАБ. – Фонд 2001. – Воп. 1. – Спр. 1017.

6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ у г. Гродна). – Фонд 1. – Воп. 6. – Спр. 556.

7. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 6. – Спр. 559.

8. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. – 6. – Спр. 626.

9. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. – 6. – Спр. 712.

10. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. – 6. – Спр. 726.

11. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 6. – Спр. 795.
12. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. – 6. – Спр. 821.
13. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. – 6. – Спр. 916.
14. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. – 6. – Спр. 922.
15. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. – 6. – Спр. 1142.
16. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. – 6. – Спр. 1292.
17. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 6. – Спр. 1337.
18. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. – 6. – Спр. 1658.
19. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 6. – Спр. 2057.
20. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 7. – Спр. 439.
21. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 7. – Спр. 1076.
22. НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 28. – Спр. 1031.
23. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (СПб.) (далей – РДГА). – Фонд 1282. – Воп. 1. – Спр. 267.
24. РДГА. – Фонд 1282. – Воп. 3. – Спр. 173.
25. Россия под надзором. Отчеты III отд. 1827–1869 гг. / сост. М. В. Сидорова, Е. И. Щербакова. – М.: РФК, 2006. – 703 с.
26. *Черепица, В. Н.* Польское национальное движение в Белоруссии (последняя треть XIX века). – Гродно, 1996. – 156 с.

Резюме

Е. Э. ФИРИНОВИЧ

ОТЗВУКИ ВОССТАНИЯ 1863–1864 гг. В БЕЛОРУССКО-ЛИТОВСКИХ ГУБЕРНИЯХ

Анализируется атмосфера жизни белорусско-литовских губерний в первое десятилетие после восстания 1863–1864 гг. Изучение жизненной ситуации ведется в двух направлениях: специфика правительственных мероприятий в данном регионе и реакция на них местного населения. Приоритетным здесь обозначена борьба с проявлениями «польскости», где определяющими чертами обозначались употребление польского языка и римско-католическое вероисповедание. Делается вывод, что 1863–1864 гг. стал своеобразным катализатором в активизации борьбы против «польского элемента» белорусско-литовских губерний, носителями которого, по мнению администрации Российской империи, выступали в первую очередь шляхта и римско-католическое духовенство. С одной стороны, включило в себя интенсивную фазу в реализации мер по уничтожению «польскости», с другой стороны, стало оправдательным аргументом начатой политики и в последующие годы после его окончания. Во многих направлениях такая политика переходила из официального уровня на частный.

Summary

A. FIRYNOVICH

ECHOES OF THE 1863–1864 REVOLT IN THE BELARUSIAN-LITHUANIAN PROVINCES

The article analyzes the atmosphere of the Belarusian-Lithuanian provinces in the first decade after the 1863–1864 uprising. Life situation is explored in two directions: the specifics of government activities in the region and the reaction of local population reaction to them. The priority is designated to the fight against «Polishness» where the defining features of them was use of the Polish language and the Roman Catholic faith. The author comes to the conclusion that the 1863–1864 uprising was a catalyst in the revitalization of the struggle against the «Polish element» in the Belarusian-Lithuanian provinces, carriers of which, according to the administration of the Russian Empire, were first gentry and the Roman Catholic clergy. On the one hand, it included an intensive phase of measures for the destruction of «Polishness» on the other hand, it was the acquittal argument to start this politics and after its ending. In many ways this policy was transformed from the official level to private.

Паступіў у рэдакцыю 19.12.2013

УДК 94(476)«18»+ 316.342.4(476)(091)«18»

К. С. ЦЕРАШКОВА

АСАБЛІВАСЦІ КРЫНІЦ ПАПАЎНЕННЯ МЯШЧАН БЕЛАРУСІ ВА ЎМОВАХ РАЗБОРУ ШЛЯХТЫ ПАСЛЯ ПАЎСТАННЯ 1863–1864 гг.

Паўстанне 1863–1864 гг. з'яўлялася важнай знакавай і рубежнай падзеяй, якая ў значнай ступені вызначыла далейшае грамадска-палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё беларуска-літоўскіх губерняў Расійскай імперыі. Ва ўмовах палітычнай рэакцыі і ўзмацнення працэсу разбору шляхты пасля паўстання 1863–1864 гг. адбывалася трансфармацыя саслоўнай стуктуры грамадства дадзеных губерняў, якая праходзіла па некалькіх накірунках: па-першае, непасрэдны перавод асобаў з ліку былой шляхты, незацверджанай Герольдыяй у дваранстве, у склад падатковых саслоўяў; па-другое, унармаванне сацыяльнай структуры саміх падатковых саслоўяў, звязанае са скасаваннем асобнага статусу тых сацыяльных катэгорый, якія складаліся са шляхты, залічанай у іх склад яшчэ пасля паўстання 1830–1831 гг., а менавіта – аднадворцаў у межах саслоўя сельскіх абывацеляў і грамадзян у межах саслоўя гарадскіх абывацеляў. У сваю чаргу працэсы ўладкавання шляхты, незацверджанай Герольдыяй у дваранстве, вызначылі асаблівасці крыніц папаўнення і сацыяльнага складу тых саслоўяў і саслоўных груп, да якіх яны былі залічаны.

Па заканадаўстве Расійскай імперыі ў акрэслены перыяд мяшчане ўяўлялі сабой складаючую частку саслоўя гарадскіх абывацеляў, да якой магчыма прымяненне такой катэгорыі, як саслоўная група ці саслоўны разрад [33, арт. 241]. У адрозненне ад іншых катэгорый гарадскіх абывацеляў, такіх, як купецтва і цэхавыя, мяшчане з'яўляліся саслоўнай групай у больш

вузкім сэнсе, прыналежнасць да якой перадавалася ў спадчыну і не была абумоўлена выкананнем пэўных умоў [34, арт. 488]. На працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст. захоўвалася тэндэнцыя да пашырэння кола асобаў, якія мелі права ці абавязак уваходзіць у катэгорыю мяшчан, што абумовіла дастаткова стракаты сацыяльны склад дадзенай саслоўнай групы.

Пры агульнай тэндэнцыі да павелічэння па абсалютных і адносных паказчыках дынаміка колькаснага складу мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў Расійскай імперыі ў 60-я гг. XIX – пачатку XX ст. адрознівалася дастаткова нераўнамерным характарам. Пры гэтым найбольшыя тэмпы прыросту назіраліся ў перыяд з 1858 па 1867 г. Калі па стане на 1858 г. налічвалася 662 723 мяшчан, якія складалі 12,3 % усяго насельніцтва, то на 1863 г. іх колькасць узрасла да 796 035 чал., а ўдзельная вага ў складзе ўсяго насельніцтва дасягнула 14,3 %, а па стане на 1867 г. – адпаведна да 1 072 818 чал. і 18 %. Магчыма падлічыць, што за перыяд з 1858–1867 гг. адноснае павелічэнне мяшчан складала 61,9%, у той жа час усяго насельніцтва – 10,1 % [38, с. 270–272; 36, с. 40–43, с. 46–47; 37, с. 80–81].

Дадзеныя абставіны ў гістарыяграфіі Расійскай імперыі традыцыйна звязваюць з павышэннем сацыяльнай мабільнасці сялян пасля прыняцця «Манифеста об отмене крепостного права» ад 19 лютага 1861 г. Сапраўды, у перыяд з 1858 г. да 1863 г. у беларуска-літоўскіх губернях назіралася пэўнае скарачэнне колькасці саслоўя селькіх абываценяў (з 4 033 440 чалавек да 3 999 281), удзельная вага якіх змянілася з 74,7 да 72,1 % [38, с. 272–274; 36, с. 80–81]. Разам з тым колькаснае павелічэнне мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў у значнай ступені вызначылі зрухі ў сацыяльнай структуры насельніцтва беларуска-літоўскіх губерняў у сувязі з працэсамі разбору шляхты пасля паўстання 1863–1864 гг.

Рэфармаванне заканадаўства ва ўмовах паражэння паўстання 1863–1864 гг. і разгортвання ахоўнага курсу ўрада Расійскай імперыі ў адносінах да беларуска-літоўскіх губерняў адыгралі ключавую ролю ў станаўленні крыніц папаўнення мяшчан у 60–70-я гг. XIX ст. і абумовілі іх асаблівасці ў параўнанні

з іншымі губернямі Еўрапейскай Расіі. Згодна з загадам ад 23 верасня 1864 г. «О мерах к успешному окончанию дел о правах лиц, доказывающих дворянское достоинство по происхождению от бывшей Польской шляхты», асобам, канчаткова незацверджаным дэпартаментам Герольдыі ў дваранстве, якія не знаходзіліся на дзяржаўнай службе і не мелі чыноў ці званняў, неабходна было да 1 студзеня 1865 г. запісацца ў падатковыя саслоўі, пры гэтым значна ўскладнялася працэдура доказу прыналежнасці да вышэйшага саслоўя [29, № 41 299]. Ужо ў перыяд з 1863 да 1867 г. у беларуска-літоўскіх губернях у сувязі са стратамі падчас паўстання 1863–1864 гг., рэпрэсіўнымі ўрадавымі мерамі ў адносінах да вышэйшага саслоўя, ссылкамі, міграцыяй за мяжу, пераводам у падатковыя саслоўі адбылося скарачэнне колькасці патомных дваран з 324 148 чалавек да 183 938. Пры гэтым іх ўдзельная вага ў структуры насельніцтва знізілася з 5,8 да 3,1 % [36, с. 40–43; 37, с. 72–73].

У 60-я гг. XIX ст. ва ўмовах узмацення працэсаў разбору шляхты пасля паўстання 1863–1864 гг. асобы, незацверджаныя дэпартаментам Герольдыі ў дваранстве, складалі адну з важнейшых крыніц папаўнення мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў. Паводле дадзеных аб залічэнні ў склад мінскіх мяшчан за першыя парэформенныя гады (1861–1866), не менш за 28,6 % усіх выпадкаў пераходаў у склад мяшчан складалі пералічэнні з ліку былой шляхты (не менш за 208 пераходаў). Пры гэтым самі пераходы ў акрэслены перыяд набылі дастаткова шырокія маштабы, у сувязі з чым паказчык колькасці і ўдзельнай вагі былых прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя сярод крыніц папаўнення мяшчан перавышаў абсалютную і адносную колькасць саміх пераходаў. Па стане на 1861–1866 гг. складаў каля 83 % ад усіх асоб залічаных у склад мяшчан (6 926 чал.) [15–20].

Як ужо было адзначана вышэй, прыняцце закону ад 23 верасня 1864 г. садзейнічала паскарэнню працэсу разбору шляхты. Толькі па Магілёўскай губерні за 1865 г. у падатковыя саслоўі было пераведзена 37606 чалавек з ліку былой шляхты [2, с. 37–38]. У той жа час у межах Мінскай губерні з 21 642 прадстаўнікоў былой шляхты, не даказаўшых дваранскае паходжанне, з пачатку

1865 г. да 1866 г. у склад грамадзян было пераведзена 10 620 чал., у аднадворцы – 9 184 чал., у мяшчане – 1 450 чал., у розныя катэгорыі сельскіх абываценяў – 388 чал. [22, арк. 3 адв.]. Дадзеныя аб прылічэнні ў склад мінскіх мяшчан за той жа перыяд (1865–1866 гг.) сведчаць аб тым, што 46,3 % пераходаў у склад мяшчан і грамадзян складалі асобы, незацверджаныя Герольдыяй у дваранстве (не менш за 201 выпадак пералічэння), пры гэтым удзельная вага прадстаўнікоў гэтай катэгорыі дасягнула 91,2 % ад усіх асоб, залічаных у мяшчане і грамадзяне (6 917 чал.) [19–20].

Важную ролю ў працэсах станаўлення крыніц папаўнення мяшчан адыграў загад ад 19 лютага 1868 г. «О введении однодворцев и граждан Западных губерний в общий состав сельских или городских обывателей» [31, № 45 505]. Такія сацыяльныя катэгорыі як аднадворцы і грамадзяне Заходніх губерняў паходзілі з ліку былой шляхты, незацверджанай дэпартаментам Герольдыі і пераведзенай па загаду «О разборе шляхты в Западных губерниях, и об устройстве сего рода людей» ад 19 кастрычніка 1831 г. у падатковыя саслоўі. У сувязі з прыняццем дадзенага загаду ва ўмовах паражэння паўстання 1830–1831 гг. у адносінах да былой шляхты адзначалася, што «...последние события в возвращенных от Польши губерниях доказали, что люди сии, по недостатку оседлости и собственности и по образу жизни многих из них, наиболее склонны были к возрастанию и к преступным действиям против законной власти» [25, № 4869].

Прадстаўнікі былой шляхты, якія пражывалі ў сельскай мясцовасці на казённых, уладальніцкіх ці ўласных землях, адносіліся да такой катэгорыі саслоўя сельскіх абываценяў як аднадворцы. Пры гэтым урадавая палітыка была накіравана на захаванне некаторай адасобленасці дадзенай катэгорыі насельніцтва ў межах саслоўя сельскіх абываценяў: «...во ибежание на будущее время всякого смешения, всем сельским обывателям сего сословия (былой шляхты. – *К. Ц.*) присвояется именование однодворцев» [25, № 4869]. У абавязак аднадворцаў уваходзіла выкананне натуральных і грашовых павіннасцяў, як і ў іншага сельскага насельніцтва, за карыстанне зямлёй, на якой яны пражывалі.

У межах беларуска-літоўскіх губерняў, па дадзеных Міністэрства ўнутраных спраў, толькі на ўладальніцкіх землях пражывала 10 517 аднадворцаў мужчынскага полу. Ва ўрадавых колах аднадворцаў разглядалі як «самый вредный, недовольный элемент в крае, который всегда был и теперь остается готовым материалом для всякого революционного движения и из которого по преимуществу пополнялись <...> мятежнические шайки» [32, с. 181]. У пачатку 60-х гг. XIX ст. на тэрыторыі Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў налічвалася каля 58 тыс. аднадворцаў. У сувязі з паскарэннем працэсу разбору шляхты, выкліканага падзеямі паўстання 1863–1864 гг. назіралася значнае павелічэнне колькасці гэтай катэгорыі насельніцтва: у сярэдзіне 60-х гг. XIX ст. толькі ў межах Мінскай губерні зафіксавана звыш 37 тыс. аднадворцаў [3, с. 97]. Згодна з заканадаўчым актам ад 19 лютага 1868 г., аднадворцы, якія пражывалі на казённых, уладальніцкіх ці ўласных землях, прылічваліся да сельскіх грамадаў, а тыя аднадворцы, якія пражывалі ў гарадах ці мястэчках і займаліся гандлёва-прамысловай дзейнасцю, – да мяшчанскіх грамадстваў [31, № 45 505].

Да грамадзян Заходніх губерняў загадам ад 19 кастрычніка 1831 г. былі аднесены асобы з ліку былой шляхты, якія не даказалі прыналежнасць да дваранства, якія пражывалі ў гарадах Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Падольскай, Валынскай, Кіеўскай, Ковенскай, Віцебскай, Магілёўскай губерняў. Новая хваля залічэнняў прадстаўнікоў былой шляхты ў грамадзяне, выкліканая працэсамі разбору шляхты пасля паўстання 1863–1864 гг. набыла дастаткова масавы характар і працягвалася да 1868 г. У сувязі з загадам ад 19 лютага 1868 г. грамадзянам заходніх губерняў, якія пражывалі ў гарадах, мястэчках і сельскай мясцовасці прадстаўлялася права на працягу аднаго года з дня выдання дадзенага нарматыўнага акта застацца ў саслоўі гарадскіх абывацеляў, прыпісаўшыся ў мяшчане ці купцы, або перайсці ў склад саслоўя сельскіх абывацеляў [31, № 45 505].

Паводле даных Мінскай казённай палаты, ужо на пачатак 1869 г. у склад мяшчан-хрысціян было пералічана 2 445 чалавек з ліку былых грамадзян [23, арк. 50–50 адв.]. Такім чынам,

у выніку ўпарадкавання саслоўнай структуры і скасавання асобнага статусу аднадворцаў і грамадзян заходніх губерняў у адпаведнасці з законам ад 19 лютага 1868 г. дадзеныя сацыяльныя катэгорыі былі ўключаны ў склад саслоўяў сельскіх і гарадскіх абывацеляў, у тым ліку – саслоўнай групы мяшчан.

Уладкаванне асоб, незацверджаных Герольдыяй у дваранстве, працягвалася да канца XIX ст. Па дадзеных слуцкага мяшчанскага ўпраўлення на 1883–1894 гг. каля 18,3 % (20 пераходаў) выпадкаў залічэння ў мяшчане ці 16,5 % (61 чал.) усіх, хто пералічыўся, прыходзілася на гэтую катэгорыю насельніцтва; па дадзеных мінскай казённай палаты на 1890-я гг. сярод крыніц папаўнення мяшчан зафіксаваны ў тым ліку прадстаўнікі былой шляхты [5–14]. Даныя віцебскай мяшчанскай управы сведчаць аб тым, што асобныя пералічэнні адбываліся да пачатку XX ст. Так, у снежні 1914 г. з незацверджанных Герольдыяй дваран у віцебскія мяшчане быў пераведзены Іосіф Адамаў Лукоўскі [24, арк. 119–119 адв.]. Разам з тым на працягу 1860-х – пачатку XX ст. адбываюцца карэнныя змены ў крыніцах папаўнення мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў. Калі ў 60–70-я гг. XIX ст. дадзеная катэгорыя насельніцтва выступала ў якасці адной з асноўных крыніц папаўнення мяшчан, то на працягу апошняй чвэрці XIX ст. назіралася рэзкае зніжэнне колькасці такіх пералічэняў, якія ў канцы XIX – пачатку XX ст. набылі характар адзінкавых пераходаў і не адыгрывалі прынцыповай ролі ў папаўненні мясцовых мяшчан. У выніку рэфармавання заканадаўства і трансфармацыі грамадства ва ўмовах мадэрнізацыйных працэсаў разам з павышэннем сацыяльнай мабільнасці насельніцтва беларуска-літоўскіх губерняў у працэсах фарміравання мяшчан узрасла роля іншых сацыяльных катэгорый.

Нягледзячы на страту прававога статусу прывілеяванага саслоўя, прадстаўнікі былой шляхты не здолелі інтэгравацца з падатковымі саслоўямі, як і ў папярэдні перыяд, захаваўшы адметную сістэму каштоўнасцяў, а таксама традыцыі, і фактычна склаўшы своеасаблівую маргінальную групоўку ў межах падатковых саслоўяў: «...Бывший шляхтич не станет родниться или

брататься с крестьянином; он нередко полуграмотен, но помнит предания и родословную своей фамилии, гордится своими предками. И в самом деле, в числе однодворцев, а также граждан (той же шляхты, приписанной к городским обществам, но не называющихся мещанами) есть и такие, у которых целые сундуки завалены старинными грамотами, привилегиями и разными документами, доказывающими не только их дворянское происхождение, но даже значительную роль, которую разыгрывали их предки в былое время» [1, с. 25–26].

На працягу 60-х гг. XIX – пачатку XX ст. прадстаўнікі шляхты, пераведзеныя ў падатковыя саслоўі, імкнуліся вярнуць прывілеяванае становішча і пацвердзіць прыналежнасць да дваранства. Як ужо адзначалася вышэй, у акрэслены перыяд значна ўскладнілася працэдура доказу прыналежнасці да дваран. За 1868–1869 гг. у Мінскай губерні былі зацверджаны дэпартаментам Герольдыі ў дваранстве 10850 чал. (53,4 % усіх, хто падаў дакументы), у той жа час 9492 чал. (46,6 %) было адмоўлена ў зацвярджэнні [2, с. 37–38]. Паводле звестак мяшчанскіх грамадстваў беларуска-літоўскіх губерняў, на працягу 60-х гг. XIX ст. – пачатку XX ст. зафіксаваны выпадкі пераходаў з мяшчан-хрысціян у дваране, якія звязаны з пацвяржэннем дэпартаментам Герольдыі прыналежнасці да дваран асобаў, што паходзілі з ліку былой шляхты і былі пераведзены ў падатковыя катэгорыі насельніцтва. Дадзеныя працэсы, якія асабліва заўважны ў 60–70-я гг. XIX ст., а ў канцы XIX – пачатку XX ст. насілі адзінкавы характар і працягваліся нават напярэдадні Першай сусветнай вайны. Так, 10 чэрвеня 1914 г. з грамадства мінскіх мяшчан-хрысціян казённай палатай быў звольнены Мікалай Алонзіеў Мінакоўскі з сям'ёй як прызнаны ў дваранскай годнасці [21, арк. 23].

Нягледзячы на значную трансфармацыю крыніц фарміравання мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў у 60–70-я гг. XIX ст., звязаную з працэсамі разбору шляхты пасля паўстання 1863–1864 гг., важнае значэнне ў папаўненні мяшчан адыгрывалі і іншыя сацыяльныя катэгорыі. У адпаведнасці з заканадаўствам Расійскай імперыі да асноўных крыніц папаўнення саслоўнай

групы мяшчан адносіліся сельскія абывацелі ўсіх найменняў, дзеці асабістых дваран, якія не мелі афіцэрскіх чыноў, іншародцы, а таксама асобы, якія мелі права ці абавязак «абіраць род жыцця», да якіх адносіліся дастаткова шырокія катэгорыі насельніцтва, што ў значнай ступені абумовіла неаднародны сацыяльны склад саслоўнай групы з існаваннем ў яе межах устойлівых маргінальных груповак [35, арт. 561–562].

На працягу акрэсленага перыяду розныя катэгорыі сельскага насельніцтва (у тым ліку – памешчыцкія і дзяржаўныя сяляне, вольныя людзі, аднадворцы, чыншавікі і іншыя) з'яўляліся адной з асноўных крыніц фарміравання саслоўнай групы мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў. Умовы выхаду з сельскай грамады, а таксама пераходу ў іншыя саслоўныя групы ці саслоўі рэгуляваліся «Общим положением о крестьянах, вышедших из крепостной зависимости» (раздзел V) ад 19 лютага 1861 г. і да канца XIX ст. прынцыпова не змяніліся. Для пераходу ў іншыя станы сярод іншых аспектаў найбольш складанай праблемай з'яўлялася ўрэгуляванне пазямельных адносінаў і выхад з сельскай грамады, якая па сутнасці з'яўлялася асноўнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай сялянскага самакіравання [26, № 36657].

У першыя парэформенныя гады ўласна сяляне з'яўляліся важнай крыніцай папаўнення мяшчан, аднак пераходы сялян насілі пераважна адзіночны характар (пералічэнне асобных прадстаўнікоў саслоўя ці сем'яў). Разам з тым існавалі і выключэнні. Згодна з рашэннем Мінскай казённай палаты ад 18 снежня 1861 г. у склад мяшчан-хрысціян м. Койданава Мінскага павета з утварэннем асобнага грамадства было пераведзена 238 асоб мужчынскага полу з ліку былых дзяржаўных сялян [15, арк. 477–484]. Нягледзячы на тое, што паводле даных аб крыніцах папаўнення мінскіх мяшчан на 1861–1866 гг., непасрэдна на сялян і дваравых прыходзілася 27,6 % выпадкаў пераходаў у мясцовыя мяшчане (201 пераход), сяляне складалі каля 8,1 % ад усіх асобаў, залічаных у гэтую сацыяльную катэгорыю (678 чал.) [15–20]. Неабходна падкрэсліць, што ў беларуска-літоўскіх губернях Расійскай імперыі, дзе ў межах ахоўнага ўрада-

вага курсу ў сувязі з разгортваннем паўстання 1863 г. (згодна з загадамі ад 1 сакавіка 1863 г. і 1 студзеня 1864 г.) адбылося рэфармаванне заканадаўства ў адносінах да сялян. Яно стварыла больш спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі палажэнняў 19 лютага 1861 г. Магчымасці выхаду з саслоўя сельскіх абывацеляў і пераходу ў іншыя саслоўі былі значна абмежаваныя [27, № 39 337; 28, № 40 172]. Рэфармаванне заканадаўства ў адносінах да дзяржаўных сялян згодна з загадам ад 16 мая 1867 г. прынцыпова не паўплывала на магчымасці практычнай рэалізацыі выхаду са стану сельскіх абывацеляў [30, № 44 590].

У склад крыніц папаўнення мяшчан уваходзілі таксама т. зв. асобы, абавязаныя абіраць род жыцця, да якіх па заканадаўстве Расійскай імперыі былі аднесены дастаткова шырокія і неаднародныя катэгорыі насельніцтва: незаконнанароджаныя, падкідышы, выхавальнікі Прыказаў грамадскага прызрэння, дзеці канцылярскіх служкаў, лекарскія вучні, асобы, зволеныя з духоўнага саслоўя, іншаземцы, якія перайшлі ў Расійскае падданства, яўрэі, якія прынялі хрысціянскую веру, і іншыя [35, арт. 561–562]. Па даных аб крыніцах папаўнення мінскіх мяшчан па стане на 1861–1866 гг. асобы, абавязаныя абіраць род жыцця, складалі 34,5 % усіх выпадкаў пераходаў (251) ці 3,7 % усіх асоб (308 чал.), залічаных у склад саслоўнай групы мяшчан, у тым ліку зволеныя з ваеннай службы, кантаністы і дзеці ваенных – 19,5 % пераходаў (142) ці 1,8 % усіх прылічаных у склад мяшчан (153 чал.), незаконнанароджаныя і непрыпісаныя ў іншыя станы – 11,6 % усіх пераходаў (84) ці 1,4 % усіх пералічаных (120 чал.), перахрышчаныя яўрэі – 2,1 % пераходаў (15) ці 0,2 % пералічаных (19 чал.), асобы, якія паходзілі з духавенства – 1,4 % пераходаў (10) ці 0,2 % усіх пералічаных (16 чал.) [15–20]. Нягледзячы на значную колькасць пераходаў у склад мяшчан прадстаўнікоў гэтых сацыяльных катэгорый, дадзеныя пераходы насілі, як правіла, адзіночны характар і не атрымалі прынцыповага значэння у структуры крыніц папаўнення мяшчан у першыя парэформенныя гады.

У якасці крыніц фарміравання саслоўнай групы мяшчан выступалі, у тым ліку непасрэдна прадстаўнікі саслоўя гарадскіх абывацеляў – купцы, якія не аднавілі гільдзейскія пасведчанні,

мяшчане пры змене месца жыхарства, а таксама іншыя сацыяльныя катэгорыі. Неабходна ўлічваць тыя абставіны, што паміж мяшчанамі і купцамі не існавала рэзкай і пастаяннай мяжы. Мяшчане, якія аб'явілі капіталы, адносіліся да ліку купцоў, у той жа час купцы, якія не працягвалі свае гільдзейскія пасведчанні, пераходзілі ў склад мяшчан. Паводле дадзеных мінскіх мяшчанскіх грамадстваў па стане на 1861–1866 гг. унутрысаслоўныя пераходы складалі каля 4,3 % усіх выпадкаў пералічэнняў у склад мяшчан (32) ці 0,6 % усіх пералічыўшыхся (51 чал.) [15–20].

Такім чынам, стракаты і неаднародны сацыяльны склад крыніц папаўнення мяшчан у 60–70 гг. XIX ст. быў абумоўлены спецыфікай прававога статусу дадзенай сацыяльнай катэгорыі і звязаны, з аднаго боку, з ахоўным характарам расійскага заканадаўства і неабходнасцю ўладкавання асоб, якія аказваліся па-за межамі саслоўнай структуры насельніцтва Расійскай імперыі (прадстаўнікі былой шляхты, незацверджаныя Герольдыяй у дваранстве; асобы, абавязаныя абіраць лад жыцця, і іншыя), з другога – з імкненнем пэўных катэгорый насельніцтва да змены свайго сацыяльнага і прававога статусу (сельскія абывацелі).

Ва ўмовах ахоўнага ўрадавага курсу і палітычнай рэакцыі пасля паўстання 1863–1864 гг. і працэсу ўладкавання саслоўнай структуры грамадства Расійскай імперыі, звязанай з актывізацыяй працэсу разбору шляхты і пераводам аднадворцаў і грамадзян Заходніх губерняў у падатковыя саслоўі, крыніцы папаўнення мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў характарызаваліся значнымі адрозненнямі ў параўнанні з унутранымі губернямі Еўрапейскай Расіі. Калі ў першае парэформеннае дзесяцігоддзе ў беларуска-літоўскіх губернях асноўная роля належыла пералічэнням з ліку былой шляхты, то ва ўнутраных губернях – у асноўным з саслоўя сельскіх абывацеляў.

На працягу 60-х гг. XIX – пачатку XX ст., у сувязі з вызначанай па заканадаўстве неабходнасцю прыпіскі асобы да таго ці іншага грамадства і фіксацыі саслоўнай прыналежнасці, а таксама з павышэннем сацыяльнай мабільнасці насельніцтва,

мяшчанам па сутнасці была адведзена роля своеасаблівага «прыёмніка»для тых катэгорый насельніцтва, якія аказваліся паза межамі саслоўнай структуры грамадства Расійскай імперыі і не маглі быць уключаны ў іншыя саслоўі ці саслоўныя групы. Спецыфіка крыніц папаўнення мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў разам з эканамічнай стратыфікацыяй дадзенай катэгорыі насельніцтва садзейнічала фарміраванню ў яе межах асобных маргінальных груповак, што выклікала паступовую страту такога прызнака саслоўнай прыналежнасці як агульны менталітэт і свядомасць.

Літаратура

1. Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. Т.3. Литовское и Белорусское Полесье / под общ. ред П. П. Семенова, репринт. воспроизв. изд. 1882 г. – Минск: Беларус. энцыкл., 1994. – 490, 24 с.

2. *Жытко, А. П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг. / А. П. Жытко. – Мінск: БДПУ, 2003. – 233 с.

3. *Каханоўскі, А. Г.* Саслоўная і сацыяльна-прафесійная стратыфікацыя беларускага грамадства ў 60–90-х гг. XIX ст. / А. Г. Каханоўскі // Выбраныя навуковыя працы Беларускага дзяржаўнага універсітэта: у 7 т. / адк. рэд. А. А. Яноўскі. – Мінск: БДУ, 2001. – Т. 2: Гісторыя. Філалогія. Журналістыка. С. 92–101.

4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Фонд 254. – Воп. 1. – Спр. 2.

5. НГАБ. – Фонд 254. – Воп. 1. – Спр. 5.

6. НГАБ. – Фонд 254. – Воп. 1. – Спр. 6

7. НГАБ. – Фонд 254. – Воп. 1. – Спр. 9.

8. НГАБ. – Фонд 254. – Воп. 1. – Спр. 10.

9. НГАБ. – Фонд 254. – Воп. 1. – Спр. 20.

10. НГАБ. – Фонд 254. – Воп. 1. – Спр. 21.

11. НГАБ. – Фонд 254. – Воп. 2. – Спр. 6.

12. НГАБ. – Фонд 254. – Воп. 2. – Спр. 10.

13. НГАБ. – Фонд 254. – Воп. 2. – Спр. 18.

14. НГАБ. – Фонд 254. – Воп. 2. – Спр. 19.

15. НГАБ. – Фонд 330. – Воп. 1. – Спр. 17.

16. НГАБ. – Фонд 330. – Воп. 1. – Спр. 21.

17. НГАБ. – Фонд 330. – Воп. 1. – Спр. 25.

18. НГАБ. – Фонд 330. – Воп. 1. – Спр. 32.

19. НГАБ. – Фонд 330. – Воп. 1. – Спр. 33.

20. НГАБ. – Фонд 330. – Воп. 1. – Спр. 44.
21. НГАБ. – Фонд 330. – Воп. 1. – Спр. 1779.
22. НГАБ. – Фонд 333. – Воп. 4. – Спр. 3756.
23. НГАБ. – Фонд 333. – Воп. 4. – Спр. 3901.
24. НГАБ. – Фонд 2511. – Воп. 1. – Спр. 46.
25. Полное собрание законов Российской империи (далее – ПСЗРИ). Собрание 2-е: в 55 т. Т. 6, отделение 2. – СПб.: Тип. II отд. собств. Е. И. В. Канц., 1832. – 693 с.
26. ПСЗРИ. Собрание 2-е: в 55 т. Т. 36, отд. 1. – СПб., 1863. – 1057 с.
27. ПСЗРИ. Собрание 2-е: в 55 т. Т. 38, отд. 1. – СПб., 1866. – 940 с.
28. ПСЗРИ. Собрание 2-е: в 55 т. Т. 38, отд. 2. – СПб., 1866. – 1017 с.
29. ПСЗРИ. Собрание 2-е: в 55 т. Т. 39, отд. 1. – СПб., 1867. – 976 с.
30. ПСЗРИ: Собрание 2-е: в 55 т. Т. 42, отд. 1. – СПб., 1871. – 1208 с.
31. ПСЗРИ. Собрание 2-е: в 55 т. Т. 43, отд. 1. – СПб., 1873. – 942 с.
32. *Самбук, С. М.* Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века / С. М. Самбук. – Минск: Наука и техника, 1980. – 221 с.
33. Свод законов о состоянии людей в государстве. – СПб.: Тип. II отд. собств. Е. И. В. Канц, 1833. – 373 с.
34. Свод законов Российской империи, [повеление Государя Императора Николая Первого составленный]: издание 1857 года. – СПб: Государственная типография, 1857. – Т. 9: Законы о состояниях. – 477, 88 с.
35. Свод законов Российской империи: издание 1899 года. – СПб.: Государственная типография, 1899. – Т. 9: Законы о состояниях. – 412 с.
36. Статистический временник Российской империи. Сер. 1. – СПб.: Тип. К. Вульфа, 1866. – 118 с.
37. Статистический временник Российской империи. Сер. 2. Вып. 1. Наличное население за 1867. – СПб.: Тип. В. Безобразова и комп., 1871. – 254 с.
38. Статистические таблицы Российской империи. Вып. 2. Наличное население империи за 1858 год. – СПб.: Тип. II отд. собств. Е. И. В. Канц., 1863. – 330 с.

Резюме

К. С. ТЕРЕШКОВА

ОСОБЕННОСТИ ИСТОЧНИКОВ ПОПОЛНЕНИЯ МЕЩАН БЕЛАРУСИ В УСЛОВИЯХ ПРОЦЕССА РАЗБОРА ШЛЯХТЫ ПОСЛЕ ВОССТАНИЯ 1863–1864 гг.

В условиях охранительного курса и политической реакции после восстания 1863–1864 гг., а также процесса упорядочения сословной структуры общества Российской империи, вызванного активизацией процесса разбора шляхты и перевода однодворцев и граждан Западных губерний в податные

сословия, источники пополнения мещан белорусско-литовских губерний характеризовались значительными отличиями в сравнении с внутренними губерниями Европейской России. Если в первые пореформенные десятилетия в белорусско-литовских губернях основная роль в источниках пополения мещан принадлежала перечислениям из числа бывшей шляхты, то во внутренних губерниях – в основном из сословия сельских обывателей.

Несмотря на потерю правового статуса, представители бывшей шляхты не смогли целиком интегрироваться в податные сословия, фактически образовав внутри них своеобразные маргинальные группы. На протяжении 60-х гг. XIX – начала XX в. данная категория населения стремилась вернуть свое привилегированное положение и подтвердить принадлежность к дворянству.

Summary

K. TERESHKOVA

THE «MESCHANIE»REPLENISHMENT SOURCES PECULIARITIES IN BELARUS IN THE CONDITIONS OF THE «SZLACHTA» REVISION PROCESS AFTER THE 1863–1864 YEARS UPRISING

In the conditions of the protective course and political reaction after the 1863–1864 years uprising, as well as the estate structure ordering process in the Russian Empire caused by the «szlachta»(nobility) revision process activization and the transfer of «odnodvortsy»and the Western guberniyas dwellers to the commoners status, the sources of replenishment of the «meschanie»(burgess class) in the Belarusian-Lithuanian guberniyas were characterized by significant difference from those in the inner guberniyas of the European Russia. During the first post-reform decades in the Belarusian-Lithuanian guberniyas the former «szlachta»replenished predominantly the «meschanie»unlike in the inner guberniyas where the rural commoners did. Although the former «szlachta»representatives lost their social position they failed to fully integrate into the commoners class having, in fact, formed thus peculiar marginal groups within it.

During the 60's of the XIX century – beginning of the XX century this social group intended to restore its privileged status and to confirm its belongness to the nobility.

Паступіў у рэдакцыю 17.12.2013

УДК 94 «1863/1864:930.1(= 16)»

В. С. ШАНДРА

СОЦІАЛЬНІ І ПОЛІТИЧНІ НАСЛІДКИ СІЧНЕВОГО ПОВСТАННЯ 1863 р. ДЛЯ УКРАЇНИ

Відстань у 150 років сприяє, аби незаангажовано з'ясувати наслідки Січневого повстання 1863 р. Тим більше, що сьогоднішня українська історіографія обходить це питання, яке стало небезпечно-дражливим, починаючи з Михайла Драгоманова. За пояснення, чому селяни підтримали російську армію, а не повстанців, того розкритикував Володимир Ленін. Зокрема і через це Драгоманівської спадщини було позбавлено кілька поколінь українців. Монографія історика Григорія Марахова [7] вже узгоджувалася з ленінською оцінкою повстання.

Якщо спробувати конкретизувати вплив повстання на Україну, то його варто розглядати не в одній, а у кількох площинах. Вже Драгоманов зауважив, що воно змусило владу переглянути заходи в соціально-економічній сфері, і найперше реформу 1861 р. [5, с. 63]. Збігання у часі реформи і повстання створювало атмосферу, коли селяни вважали, що польські поміщики піднялися проти царя, який звільняє їх від кріпацтва, а тому кинулися допомагати військам [4, с. 14]. Держава віддячила їм, сплативши за перебування у сільській стражі. Впродовж двох років ті практично викупили частину землі, плата за яку була понижена на 20 %. Цим була досягнута бажана підтримка з боку селянства, руськість та православ'я якого плідно використовувалися для зміцнення влади.

Можна стверджувати, що з часу придушення повстання імперія почала формувати нову політику на Правобережжі щодо користування землею. Боротьба за неї концентрувалася не лише у конфіскації маєтків, а й у правовій сфері. Цілою низкою ука-

зів верховна влада прагнула зменшити польське землеволодіння, створюючи поміщикам російського і малоросійського походження пільгові умови на придбання маєтків. Інструкція про продаж набула чинності закону, надаючи росіянам право її купівлі без завдатку, торгів та з розстрочкою. Втручання держави зафіксовано указами: від 10 грудня 1865 р., 10 жовтня 1869 р., 3 травня 1882 р., 27 грудня 1884 р. та ін. [8, с. 93, 342; 12, с. 11, 33, 35]. Натомість поляки позбавлялися вільного її продажу і купівлі, а успадкування здійснювалося лише по прямій лінії, що змушувало останніх порушувати закони. Зміна землевласника сформувала в краї атмосферу репресій й насилля, які надовго стали ознакою держави. Старі родинні «гнізда» втрачали колишню культуру господарювання, адже нові власники практично не мешкали у помістях, не розвивали їх, а здавали в оренду для швидкого збагачення. Про зацікавленість переходом землі свідчить вимога інформувати про її динаміку наверх [15, арк. 3].

Персональний перелік нових власників варто розпочати з генерал-губернатора О. П. Безака, співавтора закону від 10 грудня 1865 р., який вважав, що російське землеволодіння прив'яже край до імперії. Після невдалих спроб купити увесь маєток, він обмежився 2,5 тис. землі [24, с. 103]. Доповнюють список і землі набуті київським губернатором, управляючим державними маєтностями [6, с. 230], не кажучи вже про Олександра II, якому один із Браницьких продав за чверть вартості 100 тис. дес. аби зберегти за собою решту [1, с. 586]. Серед власників немало було й поміщиків місцевого походження, проте їхні надбання були скромнішими. Серед них такі постаті, як Петро Селецький, київський віце-губернатор, який придбав 979 дес. [14, арк. 27, 52]. Михайло Тулов, помічник попечителя Київського навчального округу, який співпрацював у Кулішівській «Основі», став власником 133 дес. Саме тоді голова мирового з'їзду Петро Косач (батько Лесі Українки) придбав 471 дес. [13, арк. 5–10]. З 1880-х років землю почали масово скуповувати селяни, міщани, священики, купці. Канцелярія генерал-губернатора контролювала придбання землі видачею посвідчень про непольське походження майбутніх власників [11, № 3985].

Оскільки спроби швидко русифікувати край зміною землевласника не принесли бажаного, було вирішено сконцентрувати їх у сфері державного управління, шляхом усунення поляків з керівних посад. Спершу були заборонені дворянські зібрання, адже ті обирали начальника повіту та суддів. Відновивши їх діяльність, предводителями дворянських зібрань призначали росіян. Актуалізувалося питання про звільнення поляків з державної служби. Аби з'ясувати їх число були укладені списки чиновників усіх трьох губерній. Як виявилося, серед них поляки становили майже половину, серед канцеляристів – більше половини. Підготовка списків відкрила не лише число поляків на державній службі. Немало росіян-чиновників, перебуваючи у польському середовищі, одружувалися на польках, переймали їх культуру. А серед поляків були добрі управлінці, котрі сприяли владі у втіленні реформ. Прикладом першого губернатор назвав секретаря Київської палати карного суду Івана Тарнавського, спадкового дворянина, щоправда, безземельного, який отримував за службу подяки і нагороди. Ілюстрацією іншого став в. о. судового слідчого Подільської губ. Пархоменко, який беручи шлюб з донькою повітового скарбника, поляка Добровольського, погодився на службу на півдні, аби його одруження не завадило кар'єрі [16, арк. 1, 19, 20; 18, арк. 17].

Ця ситуація, не зважаючи на протести губернаторів про поступову заміну, не зупинила генерал-губернатора та й Петербурга. І все ж, заперечення вплинули на корегування кадрової політики: благонадійні поляки могли розраховувати на службу у віддалених губерніях імперії. Звільнення розпочалося із стратегічних установ Міністерства фінансів митниць, акцизних управлінь, казенних палат. Пояснювалося це тим, що ці чиновники роз'їжджають у справах, а тому можуть об'єднувати поляків [17, арк. 3]. Найменшої заміни у порівнянні з адміністративними та судовими установами потребувала поліція, яка ще з Бібіковських часів комплектувалась росіянами [23, с. 284]. Навіть, коли з часу повстання пройшло 20 років, недопущення поляків до врядування набувало нового виміру через заборону утримувати оброчні статті [9, № 3173].

